# ТВОЙ ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ



ПЯТРО ВАСІЛЕЎСКІ

# ТВОЙ ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ

П'ЕСЫ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ» МІНСК 1968

Бел2
В 19

*Мастак І. Андрыянаў*

7-5
183-68

# ТВОЙ ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ

*П'еса ў дзвюх частках*

**ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:**

Касценя
Гваздзёў
Максім
Лена
Валодзя
Ірына
Каця
Садовіч
Штаўбе
Лізэр

*Савецкія людзі ў розныя гады, партызаны, іспанскія танцоркі, немцы, нямецкія паслугачы...*



# ЧАСТКА ПЕРШАЯ

*Быць чалавекам — значыць*
*адчуваць сваю адказнасць...*

Сент-Экзюперы

Кватэра Садовіча. З густам падабраная сучасная мэбля, на сценах — афорты ў простых рамках. На ўсім ляжыць адбітак наладжанага дабрабыту і парадку. Уваходзіць Садовіч.

Садовіч. Заходзь, заходзь, дарагі госць! *(Крычыць.)* Каця! Ты ў хаце? Паглядзі, хто да нас... Ну, чаго ты стаў на парозе?

Касценя *(уваходзіць)*. Твой парог не так проста пераступіць...

Садовіч. Пакінь!

Уваходзіць Каця.

Каця, ці пазнаеш ты гэтага валацугу?

Касценя і Каця, быццам заварожаныя, стаяць адзін перад адным.

Каця. Алёшка...

Касценя. Ён самы. А я думаў, ты ўжо зусім бабулька... А ты вунь якая!

Каця. Ты таксама не вельмі змяніўся. Крыху толькі скроні марозам прыхапіла...

Касценя. Гэта пасля Іспаніі. Прыхапіла, ды так і засталося...

Каця. Пасля Іспаніі я не паспела цябе разглядзець...

Садовіч. Успаміны потым, Каця! Цягні на стол усё, што ёсць у хаце... Такі госць! *(Падыходзіць да серванта.)* Ну, вось! Калі трэба — суха, як у Сахары... Каця, была ж бутэлька армянскага...

Каця. Мабыць, Ірына з Валодзькам...

Садовіч *(да Касцені)*. Чуў?! Дачка п'е бацькаў каньяк, і хоць бы хны! Ну і моладзь пайшла!

Каця. Нічога не зробіш — жаніх! А сучаснага жаніха інакш не ўтрымаеш...

Садовіч. Ох, не дай бог у наш век быць бацькам дарослай дачкі!

Касценя. У вас дачка... нявеста?

Каця. Ляціць час, Алёшка!

Садовіч. Ну, добра... Пакуль гаспадыня тое-сёе збярэ на стол, я збегаю. *(Выходзіць.)*

Паўза.

Каця *(ківае на пусты рукаў)*. Дзе руку згубіў?

Касценя. У гестапа пакінуў.

Каця. Добра — жывы застаўся...

Касценя. Застаўся...

Паўза.

Каця. Я ведаю, ты ніколі не даруеш мне. Гэта тваё права...

Касценя. Не трэба аб гэтым. Што пражыта — тое не вернем!

Каця. Але скажы: у чым мая віна? Скажы!

Касценя. Табе зараз добра?

Каця. Як бачыш...

Касценя. Калі добра — навошта шукаць апраўдання?

Каця. Значыць, не дараваў...

Касценя. Якое гэта мае значэнне цяпер?

Каця. Ды ніякага! *(Выцірае хусцінкай лоб.)* Ну і лета! Паліць і паліць... Прама Афрыка.

Касценя. У мяне ўраджай гарыць...

Каця. Які ўраджай? Дарэчы, дзе ты зараз працуеш? Пасля вайны пра цябе ні слыху ні дыху... Быццам у ваду сігануў.

Касценя. Працую старшынёй калгаса.

Каця *(здзіўлена)*. Звычайным старшынёй калгаса?

Касценя. Ну, не зусім звычайным — лепшым. Лепшым старшынёй лепшага калгаса ў раёне.

Каця. Разумею... Табе да гэтага часу не могуць дараваць...

Касценя *(рэзка)*. У калгас я паехаў добраахвотна. Быў ужо на пенсіі, неяк апынуўся ў тых краях на рыбалцы, ды і застаўся...

Паўза.

Каця. А жывеш адзін?

Касценя. Адзін.

Каця. З таго часу... адзін?!

Касценя. Так атрымалася...

Каця. А як сустрэўся з Садовічам?

Касценя. Выпадкова. Прыехаў у трэст клянчыць будаўнічыя матэрыялы. Гляджу — Мікола! Начальнік трэста...

Каця. Ён быў намеснікам міністра... Ці ты не ведаў, што мы жывём у Мінску? Яшчэ пасля вайны...

Касценя. Ведаў.

Каця. І ні разу не пацікавіўся?

Касценя. Навошта.

Паўза.

Каця. Прабач... Пайду закусь рыхтаваць.

Каця выходзіць. Праз некаторы час уваходзіць Садовіч. Нясе да стала «авоську», у якой поўна бутэлек, ставіць бутэлькі на стол.

Садовіч. Да прылаўка, вядома, не падступіцца! Алёшка! Усё ж растлумач, як гэта ты старшынёй калгаса зрабіўся?

Касценя. Я ж не пытаю, як ты начальнікам трэста зрабіўся.

Садовіч (*смяецца*). Параўнаў! Але скажы па шчырасці, ці меркаваў, калі ўваходзіў у кабінет, сустрэць мяне?

Касценя. Не. Думаў аднафамільцы...

Садовіч. Калі б аднафамілец — не відаць табе матэрыялаў, як сваіх вушэй!

Касценя. Вось гэта і кепска.

Садовіч. Нічога, голуб ты мой, не зробіш! Шмат будуем.

Касценя. Будуем то шмат. Ды вось кепска, што не заўсёды з розумам...

Садовіч. Ёсць, ёсць! Але лес сякуць — трэскі ляцяць.

Касценя. Задужа ў нас гэтых трэсак ляціць...

Садовіч. Ну, ты заўсёды быў крытычна настроены чалавек. Бачу, такім і застаўся. Значыцца, ёсць яшчэ порах у парахаўніцах! А то некаторыя саплякі ў вузкіх штоніках нас, старую гвардыю, ужо на звалку гісторыі валакуць! Далі, разумееш, волю, вось і цяўкаюць.

А некаторыя шустрыя дык і за жывое цаляюць ухапіць! Распусцілі, распесцілі...

Касценя. Самі вы тут і вінаватыя. Напладзілі дармаедаў, а цяпер справіцца з імі не можаце. Вунь ці амаль не на кожным другім доме шыльда. А пад кожнай шыльдай цэлая плойма абібокаў!

Садовіч. Расце гаспадарка, расце і ўпраўленчы апарат. Кіраваць жа трэба. Самацёкам справа не пойдзе. Вядзём, канечне, барацьбу. Узбуйняем, ушчыльняем, скарачаем...

Касценя. А потым зноў раздзяляем, павялічваем, пераліваем з пустога ў парожняе...

Садовіч. Займаемся і гэтым. Толькі ўсё гэта дробязі, не галоўнае. Галоўнае — будуем! Бачыў, які горад-прыгажун,— на папялішчах ды пустэчах узнялі!

Касценя. За горад дзякуй, а за...

Садовіч. Так, так! Мо чаго і не дагледзелі, не дарабілі і нават вінаватыя ў нечым... І ўсё ж! За такі горад павінны нашчадкі вялікае дзякуй сказаць. Бо яны павінны разумець, як нам было цяжка. А мы не здаваліся, ішлі наперад! Нават аглянуцца на зробленае не заўсёды быў час... Ці не так?

Касценя. Так. Толькі нашчадкам нашым на ўсе гэтыя сантыменты...

Садовіч. Не, не! Не маюць яны права быць такімі няўдзячнымі!

Уваходзіць Каця. Нясе паднос, ставіць на стол. Садовіч дапамагае ёй. Каця жэстам запрашае да стала.

Касценя (*працягвае руку*). Трэба было б...

Каця. У канцы калідора.

Касценя выходзіць.

Навошта ты яго прывёў?

Садовіч (*збянтэжаны*). Ну, не мог жа я...

Каця. Каб ты ведаў, як мне зараз цяжка! Каб ты толькі ведаў!

Садовіч. Прабач... Я ж думаў, усё перабалела...

Каця. Я таксама думала... І лічыла, што яго ў жывых даўно няма....

Садовіч. Такія людзі вельмі жывучыя... (*Праз акно чуваць пад'ехаўшую машыну. Садовіч выглянуў.*) Ірынка прыехала. З ёй Валодзя.

Каця. Як недарэчна!

Уваходзяць Ірына і Валодзя. Прыемна ўражаныя глядзяць на стол.

Ірына. Валодзька! Глянь, як нас сустракаюць...

Валодзя. А гэта, мабыць, шэф хоча мяне задобрыць. Але нічога не выйдзе! Пакуль не будзе поўны ажур — акт здачы не падпішу. Хоць рэжце мяне на кускі і ешце мяне з маслам, як кажа Райкін.

Садовіч. Вось упартая галава! Што рабочы клас скажа?

Валодзя. Рабочы клас скажа «дзякуй».

Садовіч. Той, што паселіцца ў тваіх дамах. А той, што гэтыя дамы будуе? Што скажа наш славуты маяк Клыкаў?

Валодзя. Ужо прыходзіў скардзіцца?

Садовіч. Яшчэ не прыходзіў, але прыйдзе.

Я яго ведаю. Чалавек прывык атрымліваць прэміі рэгулярна, без затрымкі...

Валодзя. Прывучылі! А вось мне здаецца, што гэты славуты маяк яшчэ свеціць, але ўжо даўно не грэе...

Садовіч. А маякі і павінны свяціць, шлях наперад паказваць...

Уваходзіць Касценя. Глядзіць на Ірыну.

Каця. Знаёмся, дачушка... Наш стары знаёмы...

Касценя (*працягвае руку*). Касценя... Аляксей Пятровіч. (*Падыходзіць да Валодзі.*) А вас я бачыў у трэсце...

Валодзя (*паціскае руку*). Верас. Завуць — Валодзькам. (*І да Садовіча.*) А вашага Клыкава я ўсё роўна выведу на чыстую ваду!

Садовіч. Ён такі мой, як і твой... Заўсёды слова трымае, план дае ў два-тры разы — больш ад яго нічога і не патрабуецца.

Валодзя. Дае! Як дае? Нацягвалі, прымалі з недаробкамі... Абы ў час адрапартаваць! Галоўнае — рапарт!

Садовіч. А зараз, думаеш, не галоўнае? І разумнае планаванне, і эканамічнае стымуляванне — усё гэта так! Але ж рапарт як быў рапартам, так і застаецца рапартам...

Ірына. Ну, хопіць вам! Не нагаварыліся ў сваім бюракратычным дэпартаменце...

Садовіч. Бачыш, Алёшка, як нас атэстуюць нашчадкі?

Каця. Сядайце, сядайце!

Усе сядаюць за стол. Каця і Ірына затрымаліся каля серванта.

І р ы н а. Я здагадалася, мама... Гэта твой першы муж.

К а ц я. І што ты скажаш?

І р ы н а. Скажу, што ты правільна зрабіла...

К а ц я *(хуценька агледзелася)*. Цішэй... *(Уздыхнула.)* Ты яго не ведаеш...

І р ы н а. І ні капелькі не шкадую. Я не хацела б, каб гэты вахлак быў маім бацькам...

К а ц я. Ты не бачыла яго маладым...

С а д о в і ч. Гаспадыні! Што ж вы? За стол пасадзілі...

К а ц я. Ідзём, ідзём!

С а д о в і ч. Першая чарка за такую неспадзяваную сустрэчу...

Усе чокаюцца з Касценем, п'юць, закусваюць.

К а ц я *(да Валодзі)*. Нешта вялы ты сёння. Мо не смачна?

В а л о д з я. Што вы, што вы, Кацярына Іванаўна! У вас заўсёды ўсё смачнае...

С а д о в і ч. Хвалі, хвалі будучую цешчу...

І р ы н а. Ну вось, у яго апетыт зусім прапаў...

С а д о в і ч. Гэта я яму апетыт псую... Але, малады ты мой паплечнік! Трэба вучыцца глядзець на справы рэальна. Трэба разумець вельмі простыя ісціны: мы з табой будаўнікі, а будаўнікі заўсёды працуюць на будучае. Таму ніхто нам не даруе, калі мы будзем займацца мышынай вазнёй вакол кожнага пускавога аб'екта замест таго, каб здаваць іх своечасова...

І р ы н а. Ой, як нудна! *(Да Касцені.)* Давайце з вамі вып'ем за маю маму...

Касценя. За вашу маму вып'ю!

Валодзя. Я з вамі згодны! Так, мы працуем на будучае. Вось таму я і не хачу, каб людзі, якія будуць жыць у маіх дамах, клялі мяне на чым свет стаіць. Не хачу, каб, не паспеўшы абжыць новую кватэру, пачыналі скардзіцца...

Садовіч. А цяпер усе скардзяцца! Мода пайшла такая. Хлебам не кармі — дай паскардзіцца. Неспакойны народ пайшоў!

Валодзя. А вы на вечны спакой разлічвалі? Скончыліся гэтыя біблейскія часы! Ці ж вы не прыкмецілі?

Садовіч *(да Касцені)*. Бач, як насядаюць нашчадкі? За дурняў нас лічуць... Ты што думаеш, мяне не турбуюць гэтыя вечныя недаробкі-пераробкі? Яшчэ як турбуюць! А што рабіць? Што? Калі з усіх бакоў ціснуць: гані метраж, давай кватэры працоўным, і баста. Вось і даю. І зараз гэта галоўнае. А ты ўскладняеш усё па маладосці...

Валодзя. А можа, вы спрошчваеце па старасці? Але як бы яно ні было, а камунізм трэба будаваць чыстымі рукамі. Ці не так?

Касценя. Так! Так!

Паўза.

Садовіч. Ну, вось што... Давайце паракулім яшчэ па адной ды выйдзем на балкон перакурыць...

Каця. Але... Вам трэба, мілыя мае, крыху ахаладзіцца...

Так і зрабілі. Каця і Ірына засталіся адны. Ірына падышла да фартэпіяна, кранула клавіш. Басовы гук паплыў па пакоі...

Каця. Паставіць каву ці абыдуцца... *(Падышла да Ірыны.)* Што гэта з Валодзем?

Ірына. Як што?

Каця. Навошта ён так груба з бацькам? Няўжо ён такі... празмерна прынцыповы?

Ірына. А гэта кепска?

Каця. Як табе сказаць, дачушка... У жыцці такая прынцыповасць заўжды шкодзіць. Праўда, бываюць такія хітрыя, што...

Ірына. Не, ён не хітры... Ён такі! *(Схілілася над нотамі, грае.)* Ён такі жорсткі, непрымірымы, як вось гэты эцюд... І аб гэтым я зусім нядаўна даведалася... І як позна!

Каця *(у трывозе)*. Ты нешта ад мяне тоіш...

Ірына. Таю тое, што яшчэ можна таіць...

Каця. Не гавары загадкамі...

Ірына. А што рабіць, калі ўсё жыццё аказалася загадкай...

Каця. Ірына! Што з табою робіцца ў апошні час? Я даўно пачала прыкмячаць... Ты ж сама не свая... Жывеш, быццам у сне.

Ірына. А ты здагадлівая, маці мая! Не чакала ад цябе такой назіральнасці... Так, так, тваю дачку замучылі сны... *(У такт музыцыраванню.)* Сны ў сне і сны наяву... Беспрабудны сон. Як дым, як туман. Цягучы, малочны, як ранняй восенню над рэчкай...

Каця *(у роспачы)*. І чым жа пужаюць цябе гэтыя сны?

Ірына. Сваім жудасным падабенствам на жыццё. На тое, што ўжо было, і на тое, што яшчэ будзе... і прадчуванне, як боль, як смяротная туга. І няма ўжо сіл, каб перажыць будучыя падманы і крушэнні... А жыць трэба!

Каця. Дачушка! Што здарылася?

Ірына. Нічога страшнага, мамачка. Проста я вырашыла зрабіць цябе бабулькай. Табе гэта даспадобы?

Каця. Калі гэта будзе?.. Нешта твой Валодзька ні мычыць ні целіцца...

Ірына. Памыляешся. Ён ужо мычыць...

Каця. Іра! Гэта груба для дзяўчыны... *(Глядзіць на дачку.)* Ты... Гэта праўда? Няўжо гэта праўда?!

Ірына. Калі прырода не хлусіць, дык праўда.

Каця. Дык трэба хутчэй у загс! Чаго вы цягнеце?

Ірына *(хлопнула крышкай фартэпіяна).* Загса не будзе, мама.

Каця. Я не разумею цябе!

Ірына. Думаеш, я разумею сябе?

Каця. А што здарылася? Ён падмануў цябе?

Ірына. Так, падмануў. Выдаў не за таго, кім ён на самай справе з'яўляецца... Ты ж хацела, каб твая дачка заўсёды жыла каля цябе, у вялікім горадзе, у вялікай кватэры... І я гэтага хацела. А ён не хоча!

Каця. Як гэта не хоча? Ты атрымаеш дыплом і застанешся ў Мінску, будзеш працаваць у бацькі... Разам з ім. Чаго ж ён не хоча?

Ірына. Заставацца ў Мінску...

Каця. Але ж у Маскву яго яшчэ не клічуць...

Ірына. Ён збіраецца ехаць у Сібір...

Каця. Ён што — здурэў зусім? Чаго гэта яму прыспічыла?

Ірына. Не хоча працаваць з бацькам. Прынцыпова.

Каця. Не хоча! Няхай знойдзе другое месца. Навошта ехаць?

Ірына. На любым месцы ён застанецца такім жа. А такі мне не падыходзіць... Не будзе ў нас жыцця з ім. Гэта я зразумела. Шкада, крыху позна. Але лепш позна, чым ніколі... А мацi-адзіночкі ў нас у пашане. Пражыву!

Каця. Дачушка мая! Пакінь гэтыя думкі. Так нельга...

Ірына. Ведаеш, мацi мая... Не вучы мяне жыць.

Каця. Чаму?

Ірына. Таму што пражыла жыццё за спіной у бацькі і не ведаеш пра многае ў жыцці. Табе вельмі лёгка жылося.

Каця. Дык я хачу, каб і табе...

Ірына. А вось аб сабе я паклапачуся сама. *(Пайшла.)*

Каця разгублена глядзіць услед. Уваходзяць Касцеия, Валодзя і Садовіч.

Садовіч. Знайшоў, чым дапячы! Жылі мы, брат, па-ўсякаму. Памятаеш, Алёшка, як мы да вайны жылі? Ты, малады чалавек, яшчэ пад стол пехатою хадзіў... Вось паверыш, цяпер нават смешна — я, дырэктар вялікага завода, жыў у адным маленькім пакойчыку. А мэбля якая была! Грэх і смех... *(Да Каці.)* Памятаеш наш скрыпучы ложак? *(Смяецца.)*

Каця. Пакінь. Будзеце каву піць?

Садовіч. Чакай, чакай! Дык вось я кажу... І жылі! Нават не заўважалі, што так жывём.

Па тры гады адпачынку не мелі. А як працавалі! Выходзілі на працу ў сем-восем раніцы і вярталіся апоўначы... А не, дык прама на канапе ў службовым кабінеце падрэмлеш крыху... Вось як! А ты папракаеш гэтымі харомамі...

Валодзя. Я не за харомы, а трэба, каб другія мелі такія ж добрыя кватэры, а не тое, што мы будуем... Людзям жа камунізм сустракаць у нашым «метражы»!

Садовіч. І сустрэнуць! Нічога страшнага...

Каця. Я пытаю: будзеце піць каву?

Садовіч. Будзем! Абавязкова будзем! Вось я толькі пахвастаюся сваімі спінінгамі. Алёшка, аказваецца, таксама заядлым рыбаком стаў! Хадзем! Я, братка, такія прылады з Лондана прывёз, закачаешся! *(Выходзіць з Касценем.)*

Валодзя. Дзе Ірына?

Каця. Валодзя... Што ж гэта вы?

Валодзя. А што ж гэта мы?

Каця. Не трэба так... пачынаць.

Валодзя. Не разумею, пра што вы гаворыце.

Каця. Усё ты разумееш! Як ты мог?! *(Валодзя апусціў галаву.)* Абяцай мне, што ўсё будзе добра, што вы не зробіце глупства...

Валодзя. А калі мы ўжо зрабілі?

Каця. Яшчэ не позна...

Валодзя. А калі позна?

Паўза.

Каця. Ты яе кахаеш?

Валодзя. Вельмі.

Каця. Гэта ж галоўнае!

Валодзя. Я ёй таксама кажу...

Каця. Ты павінен ёй уступіць. Яна жанчына!

Валодзя. Не, у гэтым нельга ўступаць нават жанчыне... Бо і жанчына не мае права патрабаваць здрады жыццю...

Каця. Гэтага ніхто ад цябе не патрабуе. Жыві як хочаш. Але ты бярэш на сябе клопаты аб сям'і і павінен чымсьці ахвяраваць...

Валодзя. Толькі не сумленнем.

Валодзя пайшоў. Каця кінулася следам.

Каця. Валодзя! Пачакай! Ірына, дзе ты? Валодзя, паслухай...

Уваходзіць Касценя. Садовіч нясе спінінг.

Садовіч. Я цябе прашу, вазьмі! Не крыўдзі...

Касценя. Не, дзякую. Такі падарунак занадта...

Садовіч *(совае ў рукі Касцені спінінг)*. Ён твой, баста!

Касценя. Не вазьму. І баста.

Садовіч. Зусім ты не змяніўся...

Касценя *(узяў з палічкі фатаграфію, разглядае)*. Калі ж гэта фатаграфаваліся?

Садовіч. Тады ты ў Іспаніі быў. Усім заводам на маёўку выбраліся. Гэта Лена. Шкада дзяўчыны... А гэтага мужнага дзецюка пазнаеш?

Касценя. Віктар Гваздзёў...

Садовіч. Ён самы. Геройскі чалавек...

Кніжку аб ім напісалі... Чытаў? Вельмі цікавая кніжка... Здаецца, толькі ўчора ўсё гэта было, а яно ўжо чвэрць веку ляснула! Калі ўсё ўспомніць! Божа ж ты мой!

Касценя (*задуменна*). Каму ўспомніць, а каму ніколі не забыць.

Касценя ўвесь напружыўся, быццам да чагосьці прыслухоўваецца. Нарастае мелодыя іспанскай песні «Но пасаран!». Святло паступова згасае. У мелодыю песні ўрываюцца каманды на розных мовах, растуць гукі вялікага бою. Гул самалётаў зліваецца з рокатам танкаў, і на гэтым фоне чуваць голас Касцені: «Іспанія... Мая маладосць, барацьба і пакуты... Мы ненавідзелі фашызм не толькі розумам і сэрцам, кожнай жывой клетачкай цела...»

Прамень высвятляе вінны склеп. Прытуліўшыся да днішча вялікай бочкі, сядзіць Касценя. Ён увесь змардаваны, неахайна перабінтаваны. Вось ён паварушыўся, працягнуў далонь да затычкі, пачакаў, пакуль капнула некалькі вінных кропель, злізаў і зноў падставіў далонь. Наверсе лесвіцы адчыніліся дзверы і яркі, асляпляючы прамень падае на твар Касцені. Ён зажмурыўся. Чуваць ліхія акорды хоты, смех, вясёлыя галасы. Па лесвіцы сыходзяць Лізэр, некалькі іспанскіх танцоўшчыц і два гітарысты.

Лізэр. Карамба! Цёмна, як у мараканца... Ало! Капітан Калараў, дзе вы тут? Жывы? Дарэчы, хопіць гуляць у хованкі. Вы такі ж балгарын, як я абісінскі негус... (*Смяецца, ляскае абцасамі.*) Обер-лейтэнант Лізэр! А як вас?

Касценя. Я — Калараў.

Лізэр. Давайце не будзем, як гэта гаворыце вы, рускія, валяць Ваньку! (*Смяецца.*) Лепш у такі дзень валяць вось гэтых прыгожых сін'ярын. (*Абняў танцоўшчыцу, яны рагочуць.*) Хімена! Сёння ты павінна папацець!

*(Чуваць стрэлы.)* Вы чуеце, капітан Каларау, ці як вас там... Гэта салют нашай перамогі. Радыё перадало — куадылья Франко са сваімі легіёнамі ў Мадрыдзе! Хімена! Паднясі нам добрага іспанскага віна! Пераможцы велікадушныя! *(Хімена працягвае кубкі з віном. Касценя адварочваецца.)* Пі, рус! Я дазваляю табе выпіць за нашу перамогу...

Касценя *(раптам выхапіў кубак)*. За вашу пагібель!

Лізэр. О, гэтага табе не дачакацца! За непачцівасць трэба было б цябе правучыць, але сёння я велікадушны. Хоту! *(Прыхлопвае далонямі.)* Оле! Оле! Оле! Хімена, тэмп! Не шкадуй сваіх прыгожых ножак! Ім цяпер прыйдзецца папрацаваць...

Хімена *(танцуе перад Касценем)*. А мне падабаецца гэты рускі. Сапраўдны мужчына! З ім я гатова хоць зараз пад коўдру!..

Лізэр *(смяецца)*. У чым жа справа? Цалуй яго! Я дазваляю! Можа ён зразумее нарэшце, у чым сэнс жыцця!

Хімена раптам садзіцца на калені да Касцені, абдымае яго за шыю.

Побач становіцца Лізэр, падымае кубак з віном. Вакол групіруюцца танцоўшчыцы. Хімена цалуе Касценю. Адзін з гітарыстаў робіць некалькі фотаздымкаў. Раз'юшаны Касценя спіхвае Хімену з каленяў, і яна падае...

Хімена. Карамба! За мае пацалункі такая плата?! Ганс! Забі гэтага рускага мядзведзя! Прашу цябе, забі! Ці я сама выдзеру яму вочы. *(Кідаецца да Касцені.)*

Лізэр. Хімена! Назад! Запэўніваю цябе,— ён яшчэ пашкадуе.

Штаўбе (*з'яўляецца наверсе лесвіцы*). Што тут за тлум? Шабаш?

Лізэр (*ляснуўшы абцасамі*). Свята з выпадку нашай перамогі, гер шэф!

Штаўбе. А пры чым тут палонны? Гэта ж не яго перамога. Трэба паважаць пачуцці пераможаных, Лізэр.

Лізэр. Але трэба, каб паважалі і пачуцці пераможцаў, гер шэф!

Штаўбе. Вы маеце рацыю... Калі вы зрабілі сваю справу, дык пакіньце нас... (*Усе выходзяць. Штаўбе ўважліва глядзіць на Касценю.*) Прашу вас прабачыць майго маладога калегу. Ён яшчэ не мае вопыту ў абыходжанні з пераможаным. Але войны яшчэ толькі пачынаюцца — навучыцца. Галоўнае перамагаць. І калі глядзіш вось на такія маладыя, сімпатычныя твары, як у вас, становіцца шкада... Цяжка думаць пра тых, хто назаўсёды асуджаны быць бітым толькі таму, што яны выбралі не той бок барыкады... І не трэба так з'едліва ўсміхацца. Я не цягну вас на сваю барыкаду, зусім не! Больш вам скажу. Я шчыра зайздрошчу вам. Вашай маладосці, вашай мужнасці. Вы біліся тут у Іспаніі, як леў. Трынаццаць знішчаных танкаў — гэта пачэсная лічба, хоць вам і не пашанцавала на яе... Паверце, я хацеў бы, каб мой сын — ён таксама будзе салдатам — быў падобны на вас. Вас, канечне, здзіўляе, што фашыст, як у вашых газетах пішуць, мацёры фашыст хоча, каб яго сын быў у чымсьці падобны на камуніста... Я паважаю камуністаў за іх фанатызм і адданасць, за іх цвёрдую і непахісную веру ў свае

заганныя ідэалы. Я прысутнічаў на працэсе ў Лейпцыгу. Паводзіны Дзімітрава мне шмат чаго падказалі. Змагацца з вамі будзе не так проста... Можа, вам нецікава мяне слухаць?

Касценя. Не, не, цікава. Першы раз слухаю трызненне жывога фашыста...

Штаўбе. Вы яшчэ малады чалавек. У вас усё жыццё наперадзе. І таму мне б хацелася, каб вы выслухалі мяне... Вы рускі, а я ведаю Расію. Бачыў яе і пры царах, і цяпер... Дзіўная краіна! *(Штаўбе дастае партсігар, працягвае Касцені.)*

Касценя. Дзякую.

Штаўбе. Курыце, курыце! Гэта вашы рускія папяросы... *(З асалодаю зацягнуўся.)* Расія! Цёмны, забіты народ... І ўсё ж... Як гэта ні дзіўна, але іменна там, у Расіі, я выбраў свой шлях і пайшоў за Гітлерам.

Касценя. Нічога не бачу ў гэтым дзіўнага...

Штаўбе. У фашызма вялікія ідэалы. І яны не такія прымітыўныя, як гэта ўяўляюць камуністы. Пакуль на зямлі існуе незадаволеная індывідуальнасць — фашызм будзе жыць! Камуністы заклапочаны лёсам так званага прыгнечанага класа. Мы прымаем у разлік толькі асобу. І ў гэтым наша перавага. І вам не стрымаць націск фашызму, бо ў яго радах лепшая частка чалавецтва... *(Касценя смяецца.)* Я разумею, для вас мае разважанні зараз здаюцца наіўнымі. Але час пакажа, на чыім баку ісціна! Іспанія — толькі рэпетыцыя. Спектакль скончан, заслона спушчана. Але яна вельмі хутка падымецца зноў, і гэта ўжо будзе са-

праўдная трагедыя! І калі мы сустрэнемся ў другі раз як ворагі — не зайздрошчу вам. А на гэты раз я дарую вам жыццё. Вас абмяняюць на нашага чалавека. Павінен вас папярэдзіць: там вас ужо пахавалі. Вас лічуць нябожчыкам. І наколькі мне вядома, зараз у вас не вельмі любяць уваскрэсшых... Але тут я нічым не магу вам дапамагчы... Выкручвайцеся самі. І рабіце высновы... *(Касценя стогне.)* Баліць? Вам трэба зрабіць перавязку. Я прышлю санітара. Фу! Які тут моцны вінны пах — пах перамогі. Але я стары салдат і не хачу п'янець ні ад віна, ні ад перамогі. У такі складаны час трэба мець на плячах цвярозую галаву. Вы згодны са мною?

Касценя. Пакуль вы жывы — не!

Штаўбе. Не трэба так. Мы салдаты і павінны паважаць адзін аднаго, нават калі і страляем адзін у аднаго...

Касценя. На гэта не разлічвайце, пан фашыст.

Зацямненне.

Узнікае бурная мелодыя, у якой чуваць характэрныя гукавыя адзнакі таго часу: першыя пяцігодкі, дыханне недалёкай вайны, іспанскія падзеі...

Б'юць Крамлёўскія куранты. Апошні дванаццаты ўдар. Маленькая паўза, і велічна грымнуў «Інтэрнацыянал».

Успыхвае святло. Мы бачым кватэру Касцені, якой яна была ў тую навагоднюю ноч. Павярнуўшыся да дзвярэй, застылі ў здзіўленні Каця, Садовіч, Лена і Гваздзёў. У праёме дзвярэй — Касценя. Ён у паношаным, з чужога пляча пінжачку, на галаве іспанскі берэт (такія носяць баскі), на нагах растаптаныя чаравікі на тоўстай падэшве. Каця пайшла насустрач, нібы сляпая, з працягнутымі рукамі. Але не падышла да Касцені, спынілася...

К а ц я. Не... Не, не! Гэтага не можа быць! Не можа быць...

К а с ц е н я *(усміхаецца)*. Кацюша... Супакойся... У наш век усё можа быць... Прашу цябе, супакойся... Я ведаю, што мяне тут ужо пахавалі, але... ввсь я!

Л е н а *(падбягае да Касцені, павісае ў яго на шыі)*. Алёшанька! Жывы! А яны цябе пахавалі! Паверылі паперцы... А я знала: ты жывы, жывы! Я ведала гэта...

К а с ц е н я. На гэты раз жывы, браточкі, жывы. Лянок, ці ў цябе вагі прыбавілася, ці я зусім аслабеў... *(Лена адпусціла шыю Касцені. Ён любуецца ёю.)* Глядзі, якая кучаравая бярозка вымахала... Нявеста!

Г в а з д з ё ў *(падыходзіць)*. Шкада, жаніха ніяк не падбяром. Вельмі ж пераборлівая... *(Працягнуў руку, абдымае Касценю.)* Алёшка, дружа, рад цябе бачыць на гэтым свеце. На тым свеце яшчэ паспеем...

К а с ц е н я. Ого! У цябе ўжо ромбы. Расцеш, таварыш Гваздзёў!

Г в а з д з ё ў. Расту, браток, расту. Пакуль ты па чужых краінах валэндаешся, мы тут ромбы хапаем, пасады высокія займаем...

С а д о в і ч. Гэта ў мой агарод... Дырэктарам нашага завода мяне прызначылі, Лёша...

К а с ц е н я *(абдымаюцца)*. Рад, віншую цябе. Спадзяюся, возьмеш зноў мяне на завод?

С а д о в і ч. Нават гатоў уступіць дырэктарскае крэсла!

К а с ц е н я. Не! Трэба пачынаць усё з самага пачатку... Дзякуй вам, сябры, што не пакінулі маё маленькае сямейства без увагі...

Л е н а. Нават некаторыя перастараліся...

С а д о в і ч *(хаваючы збянтэжанасць)*. Ты сядай за стол ды бяры чарку...

К а с ц е н я *(аглядае стол)*. А браточкі ж вы мае родныя! Якія прысмакі! Сто гадоў нічога гэтага не бачыў, нават забыў, як яно выглядае...

Г в а з д з ё ў. Сябры! Зараз дзесяць мінут Новага года. Вып'ем за тое, каб астатнія 52 550 мінут былі для нас шчаслівымі, каб мы ў гэтыя мінуты рабілі больш дабра, чым зла, любілі больш, чым ненавідзелі...

С а д о в і ч. Табе, мабыць, трымацца гэтага цяжэй за ўсіх...

Г в а з д з ё ў. Таму і падымаю такі тост! Вып'ем!

К а с ц е н я *(да Каці)*. Галубка мая... Цяпер усё будзе добра. Цяпер я ведаю: чалавек усё можа вытрымаць, калі ён верыць. Трэба верыць у жыццё. І верыць людзям, нават калі сумненні сціскаюць тваё сэрца. Вось таму я і вытрымаў... І цяпер мне часам здаецца, што смерць адступіла ад мяне назаўсёды... Даруйце, што разгаварыўся... Але так доўга я не быў сярод родных і сяброў!

К а ц я *(у роспачы)*. Алёша! Што нам рабіць? *(Плача.)*

К а с ц е н я *(разгублена)*. Каця!.. Не трэба плакаць! Нагледзеўся я слёз на ўсё жыццё...

С а д о в і ч *(да Лены)*. Трэба зараз жа сказаць яму ўсё...

Л е н а *(шэптам)*. Вы не зробіце гэтага! Чуеце? Ні зараз, ні пасля... Ніколі!

Паўза.

Касцеия. Падобна, што сапсаваў я вам свята...

Гваздзёў. Не тое кажаш... Сам павінен зразумець... Не кожны дзень бывае такое... *(З вуліцы чуваць тарахценне аўтамабіля. Гваздзёў насцярожыўся.)* Знаёмы гук... Быццам наша машына... Няўжо па мяне? Леначка, калі ласка...

Лена пайшла і праз некаторы час вяртаецца з вайскоўцам. Ён падыходзіць да Гваздзёва, яны адыходзяць убок, аб нечым размаўляюць. Потым Гваздзёў ідзе да тэлефона...

Гваздзёў. Дзяжурны? Гэта Гваздзёў... Я забыў дамашні тэлефон Васіля Пятровіча... Дзякую. *(Звоніць яшчэ раз.)* Калі ласка, 9-11... Прабачце, Алена Дзмітраўна, але тэрмінова патрэбен Васіль Пятровіч... А што рабіць? Такі ўжо наш лёс... Дзякую! Вас таксама віншую! І ўсіх вашых!.. Васіль Пятровіч... Гваздзёў у апарата... Я зараз знаходжуся ў кватэры Касцені... Слухаю. Я не магу ў гэта паверыць... Слухаю. Тады дазвольце мне зрабіць гэта... Слухаю. Добра. У кнізе? На нямецкай мове... Добра. Я перадам трубку... *(Працягвае трубку вайскоўцу.)*

Вайсковец. Кікладзе ў апарата. Слухаю! Не, яшчэ не сустрэў. Ёсць, сустрэць Новы год! *(Павесіў трубку, казырае Гваздзёву.)* Поўны парадак! Машына застаецца ў вашым распараджэнні...

Вайсковец пайшоў. Гваздзёў вяртаецца да стала. Усе на яго глядзяць, чакаюць, што ён скажа.

Гваздзёў. Вось так...

Касценя. Служба ў цябе — не пазайздросціш...

Гваздзёў (*уважліва паглядзеў на Касценю*). Не кажы... Але нічога не зробіш, павінен жа хтосьці чысціць выграбныя ямы капіталізму. Як пісаў Маякоўскі: «Я ассенизатор и водовоз, революцией призванный и мобилизованный...» Вып'ем!

З вуліцы чуваць музыка, песні, вясёлыя галасы. Лена падбегла да акна.

Лена. Нашы студэнты ідуць! На плошчы будзе карнавал... Мы збіраліся пайсці, пойдзем? Сёння не хочацца сядзець у хаце! Алёша, Каця, пойдзем!

Гваздзёў. Гэта ідэя! Вы ідзіце, а мы з Алёшам вас дагонім. У нас ёсць свае справы...

Усе пачынаюць збірацца. За сталом астаюцца Касценя і Гваздзёў.

Гваздзёў. Значыць, вярнуўся...

Касценя (*насцярожана*). Як бачыш!

Гваздзёў. А навошта?

Касценя. Дзіўнае пытанне!

Гваздзёў. А можа і не дзіўнае...

Касценя. Прывык ты загадкамі агаломшваць...

Гваздзёў. А што рабіць, калі навокал адны загадкі?

Касценя. Слухай, Віктар... Давай, брат, без загадак.

Гваздзёў. Можна і без загадак. Толькі спакойна, без шуму. Я павінен цябе арыштаваць. Гэта прыязджалі за табой. (*Рэзка.*)

У цябе спалоханыя вочы. Чаго ты спужаўся? Чаго? Дзе твае рэчы?

Касценя. Вунь каля парога рукзак...

Гваздзёў. Сядзець! Я сам. *(Бярэ рукзак, вяртаецца да стала.)* Цікава паглядзець, што чалавек адтуль з сабою захапіў... Глядзі ты! Кніга! Ды яшчэ на нямецкай мове...

Касценя. А! Гейнэ...

Гваздзёў. Адкуль яна ў цябе?

Касценя. На вакзале ў Берліне падыходзіць, разумееш, да мяне немец у форме чыгуначніка, совае мне гэтую кніжку і шэпча на ламанай рускай мове: у нас, кажа, паляць кнігі Гейнэ, а гэта мой любімы паэт... Няхай, кажа, едзе ў Савецкі Саюз. Ці мог я адмовіць? Пытаю: камуніст? Ён галавою ківае... Я і ўзяў кнігу.

Гваздзёў. Хочацца табе верыць, Алёша... Але... *(Дастаў з кішэні нож, ускрыў вокладку кнігі, дастае нейкія паперкі.)* Вось табе і Гейнэ... на нямецкай. *(Ускрывае другую корку — дастае фота.)* А тут, бачыш, ты ўласнай персонай сярод фалангістаў іспанскіх...

Касценя. Што за бязглуздзіца? Дай паглядзець!

Гваздзёў. На, паглядзі! *(Працягвае фота.)* Я пачытаю гэтыя паперкі...

Касценя. Віктар! Фотакартка — ліпа! Чыстая правакацыя! Ты паглядзі ўважліва, я цяжка паранены, а гэты агідны Лізэр здзекуецца з мяне... Потым была размова са Штаўбе... Цяпер я разумею... Усе яны, і гэты чыгуначнік — фашысцкія правакатары!

Паўза.

Г в а з д з ё ў. Ну, а як быць з інструкцыямі?

К а с ц е н я. З якімі... інструкцыямі?

Г в а з д з ё ў. Інструкцыямі германскай разведкі ваеннаму цэнтру.

К а с ц е н я. Якому цэнтру?

Г в а з д з ё ў. Разгромленаму. Я вёў гэтую справу. І адзін з кіраўнікоў гэтага цэнтра прызнаў, што чакае інструкцый з Берліна...

К а с ц е н я. Гэтых самых?

Г в а з д з ё ў. Можа і гэтых самых. Экспертыза скажа...

Паўза.

К а с ц е н я. Ты ведаеш, Віктар... Зараз нашы заклятыя ворагі задаволена паціраюць свае паганыя лапы.

Г в а з д з ё ў. Ты не думай зараз аб ворагах! Ты лепш думай пра сябе. А гэтыя паганыя лапы мы ўсё роўна адсячом!

К а с ц е н я. Чаго я толькі не перадумаў за тыя месяцы, што мардаваўся там у палоне... А цяпер не ведаю ўжо, што і думаць...

Г в а з д з ё ў. Алёшка! Я хачу табе верыць! Разумееш? Каб ты толькі ведаў, як мне хочацца верыць!

К а с ц е н я. Мы павінны верыць, Віктар. Бо інакш мы перастанем верыць у самае святое...

Г в а з д з ё ў. Самае святое ты зараз не чапай...

К а с ц е н я *(у роспачы)*. Ды разбярыцеся вы хутчэй у гэтым вялікім ашуканстве! Ды што гэта такое?!

Г в а з д з ё ў. Класавая барацьба, вось што гэта такое! Не ў бірулькі гуляем, сацыялізм

будуем. А фашызм тым часам дзевятым валам накатвае...

Касценя. А табе не страшна?

Гваздзёў. Чаго?

Касценя. Такога жыцця, калі застаецца толькі адна нянавісць.

Гваздзёў. А без нянавісці да нашых ворагаў грош цана нашай любві да народа.

Касценя. Значыцца... я вораг?

Паўза.

Гваздзёў. Разбяруцца.

Касценя. А ты мне, мне верыш?

Гваздзёў. Веру, Алёша. І зраблю ўсё, каб і другія паверылі...

Касценя. Дзякую табе, дружа. Бачу, факты супраць мяне. Можа табе і не трэба лезці ў гэтую справу, няхай другія разбяруцца. Але за давер вялікае табе дзякуй... А зараз пойдзем, ці што? Не будзем іх чакаць...

Зацямненне.

Прайшоў час. Каця сядзіць каля стала, паклаўшы галаву на складзеныя рукі, плача. Побач стаіць Лена, суцяшае яе.

Лена. Каця! Не трэба так раскісаць... Яго адпусцяць. Вось пабачыш! Гэта памылка...

Каця. Не, не! Калі б гэта была памылка, дык ужо б папраўілі яе. І з гэтым прыйдзецца прымірыцца...

Лена. Кацька! Ды як ты можаш нават думаць так?! Алёша не вінаваты! Ці такі чалавек можа здрадзіць?

Каця. Ты што, з неба звалілася? Вунь якія людзі апынуліся ў варожым стане...

Л е н а *(глядзіць на сястру ўважліва).* Каця... Ты гэта... сур'ёзна?

К а ц я. Леначка... Ты паслухай мяне ўважліва... Ты ўжо не маленькая, і я буду гаварыць з табою як жанчына з жанчынай... Нават не як сястра з сястрой, а як сяброўка з сяброўкай... Я ведаю, што табе падабаецца Алёша. Я гэта даўно прыкмеціла... Можа ты яго кахаеш нават больш за мяне. Вось таму ты так горача за яго стаіш... Я не віню цябе. Але зразумей жа мяне... Ці ж я не маю права на звычайнае чалавечае шчасце, тое самае, пра якое Алёша казаў — мяшчанства... Няхай сабе мяшчанства! А што я бачыла з гэтым чалавекам? Адны толькі непрыемнасці і пакуты... То ў яго страляюць кулакі, і я цэлых тры месяцы не адыходжу ад яго ложка, то ён начамі прападае на заводзе, і я яго не бачу нават па выхадных днях, то ён едзе ў Іспанію, і вось нарэшце ён у турме... Ну скажы, колькі можна так жыць? Год, два... Але пакутаваць усё жыццё — за што?

Л е н а. Калі б ты сапраўды яго кахала, дык ведала б, за што... Але ты ніколі яго не кахала. Ты звычайная здрадніца! А ў яго цудоўнае жыццё! Жыццё барацьбіта, рэвалюцыянера.

К а ц я. У твае гады і я так думала. Ён казаўся мне надзвычайным чалавекам! А потым я стала жанчынай і зразумела...

Л е н а. Ты стала бабай, а не жанчынай. Мяшчанкай. І нічога ты не зразумела. І нічога ты не разумееш! *(Пайшла.)*

К а ц я. Куды ты?

Л е н а. Да сакратара ЦК.

Каця. Не трэба гэтага рабіць, Лена! Ды ён цябе і не прыме.

Лена. Прыме! Я камсамолка, і ён павінен мяне выслухаць!

Лена пайшла. Каця паднялася, рашучым рухам рукі выцерла слёзы. Пачала наводзіць парадак у пакоі. Уваходзіць Садовіч.

Каця (*трывожна*). Што з табою? Што здарылася?

Садовіч. Мяне выклікалі... туды.

Каця. Што ім ад цябе трэба?

Садовіч. Хочуць, каб я быў сведкам на судзе...

Каця. А будзе суд?

Садовіч. Будзе. Закрыты. Вось я сябе і пытаю: а ці маю я права быць сведкам?

Каця. Ты ім сказаў пра нашы адносіны?

Садовіч. Прабач... Але інакш я не мог. Усё роўна яны ведаюць.

Каця. І што яны?

Садовіч. Сказалі, гэта наша асабістая справа і не мае ніякага дачынення да справы Касцені...

Каця. Ты даў згоду?

Садовіч. А што я мог зрабіць?

Каця. Ты паступіў правільна, Коля. Ты ж партыйны!

Садовіч. Гэта ўсё так... Але што я буду гаварыць на судзе?

Каця. Што ведаеш. Вы ж разам працавалі колькі гадоў...

Садовіч. Вось і працавалі поплеч, а што ён за чалавек, я так і не разабраўся... Ён заў-

сёды быў для мяне загадкай, хоць мы і лічыліся сябрамі... Але якія мы там сябры? Ён заўсёды кпіў з мяне, крытыкаваў за ўсялякія дробязі... Ці ўзяць з табою... Бачыў жа, што ты мне падабаешся,— узяў, ды і ажаніўся!

Каця. Гэта вінавата я... Так ужо здарылася, Коля. Як кажуць у народзе: тады дзеўка схамянулася, як у пузе страпянулася. Ён жа быў напорысты, энергічны... А я па маладосці думала, што гэта толькі і патрэбна для сямейнага жыцця. І як памылілася!

Садовіч (*рашуча*). Чаго я мушу сумнявацца? Яму ўжо нічым не дапаможаш... Ён аступіўся, зрабіў памылку, ці можа... Адным словам, там разбяруцца...

Каця (*падышла, абняла Садовіча*). Наша віна перад ім толькі тая, што мы любім адзін аднаго...

Садовіч (*пераканана*). І ніхто не мае права асуджаць нас за гэта, ніхто!

Зацямненне.

Яшчэ ў цемнаце чуваць завыванне самалётаў, выбухі. Потым манатонны радыёголас: «Грамадзяне, паветраная трывога! Да Мінска прарваліся варожыя самалёты. Выконвайце загады проціпаветранай абароны...»

У кватэры ўсё перавернута і зрушана са сваіх прывычных месц. Пасярод пакоя стаіць на каленях Каця, перабірае рэчы. Лена ходзіць па пакоі, баюкае малое. Здалёк чуваць частае, нарастаючае буханне гармат...

Каця (*прыслухалася*). Зноў бамбяць!

Лена. Не, гэта ўжо артылерыя. Дальнабойныя гаўбіцы...

Каця. Глядзі ты на яе! Яна ўжо ведае, што там б'е! Не жаночая справа — вайна... Ох і дурніца ты, Ленка! Ну, чаго ты не паехала

разам з інстытутам? Цяпер толькі будзеш замінаць...

Л е н а. Не буду я табе замінаць...

К а ц я. Ну, куды ж падзеўся Садовіч? Ой, чуе маё сэрца — не выберамся мы адсюль... Пакладзі Ірку ў калыску і збірай свае рэчы...

Л е н а. Паспею.

К а ц я. І каб ніводнай кнігі! *(Прыслухалася.)* О! Нарэшце...

Уваходзяць С а д о в і ч і стары рабочы М а к с і м. Абодва ў запэцканых спяцоўках, зарослыя шчаціннем па самыя вочы.

К а ц я. Коля! Мы гатовы!

С а д о в і ч *(апусціўся на крэсла)*. Машына зараз прыйдзе...

М а к с і м *(пульнуў ботам чамадан)*. Сабраліся ў дальнюю дарожку... Ну-ну! Зямелька руская неабсяжная... Ёсць куды бегчы... Толькі калі такімі тэмпамі будзем каціцца, дык да самага акіяна дакоцімся... *(Да Садовіча.)* А што будзем рабіць з заводам, таварыш дырэктар?

С а д о в і ч. Усё, што маглі зрабіць — зрабілі. А цяпер няхай чыгунка адказвае...

М а к с і м. А цяпер засталіся адны прыказчыкі і ні аднаго адказчыка... Толькі прыйдзецца камусьці адказ трымаць, прыйдзецца!

С а д о в і ч *(крычыць)*. На руках жа завод не вынесеш?!

М а к с і м. Гэта пры дурных галовах — адна надзея на рукі... Прыціснуць абставіны — сваімі рукамі пусцім заводзік на вецер...

С а д о в і ч. Узарваць? Ты ачумеў? Такога распараджэння не было!

Максім. Мала што не было, начальнічкі, дасцё драла, а мы тут без вас самі і распарадзімся...

Садовіч. Максім! Ты разумны, паважаны ўсімі чалавек... Павінен зразумець... Ну што мы можам зрабіць у такім становішчы?

Максім. Як дойме ліха, прарэжуцца зубы.

Садовіч. А пакуль яны прарэжуцца, хутчэй складвай манаткі і айда з намі. Гэта апошняя машына...

Максім. Не. Нікуды я не паеду... Не магу пакінуць усё гэтым ненажэрным вылюдкам...

Садовіч. Рабі як знаеш!

Максім. А што зробіш? Вунь бежанцы кажуць — цьма цьмушчая рускага народу пад немцам засталася... Халера яго ведае, мо так і лепш... Трэба ж будзе біць іх і тут. А з такою сілай, як мы ўсе гуртам, не саўладаць немцу... Пайду я. А то мая Мальвіна выкіне які-небудзь конік...

Садовіч (*абхапіў галаву рукамі*). Хаос! Грандыёзная катастрофа! Што гэта такое? Як магло так здарыцца?

Каця. Знайшоў час аналізаваць! Трэба хутчэй выбірацца адсюль. У мяне ад хваляванняў малако прапала... Яшчэ намучаемся з Ірачкай...

Садовіч. Кажаш — выбірацца... Паглядзела б, што робіцца на Магілёўскай шашы...

Каця. А што глядзець? Ехаць трэба! Там відна будзе. Разумныя людзі яшчэ ўчора гэта зрабілі...

Садовіч. Божа мой! Божа мой! Што ж

гэта робіцца?! Вораг ужо пад Мінскам! Каця... Ты разумееш што-небудзь?

Каця. Нічога не хачу разумець. Я ведаю адно — не хачу паміраць.

Садовіч. Я не магу ўявіць сваё жыццё без савецкай улады!

Лена. Калі цябе як след прыцiснуць — ўявіш.

Садовіч. Каця! Ты чуеш? Якая дрэнь! Яна лічыць мяне амаль як не здраднікам!

Каця. Пакіньце гэтыя бязглуздыя размовы! Знайшлі час... Трэба грузіць рэчы. *(Да Лены.)* Ты сабралася? Чаго стаіш?

Лена. Я з вамі не паеду.

Каця. А... з кім жа ты паедзеш?

Лена. Ні з кім.

Паўза.

Садовіч. Та-а-ак! Будзеш чакаць немцаў?

Лена. Буду. Павінен жа іх нехта сустрэць...

Каця *(падбягае да Лены, б'е па твары)*. Ах ты нягодніца! Што надумала! А яшчэ камсамолка!

Садовіч. Патрыёткай прыкідвалася! Хутка ж твой патрыятызм выветрыўся...

Лена *(глядзіць на Кацю, трымаючыся за шчаку)*. Ты мяне ўдарыла! Ты! *(Пабегла.)*

Каця *(кінулася следам)*. Лена! Прабач!.. Пачакай!

Гвяздзёў *(з'яўляецца на парозе)*. Чаго гэта яны ганяюцца адна за адной? *(Садовіч адмахнуўся.)* Ну, а што з табою загадаеш рабіць?

С а д о в і ч (*крычыць*). А пры чым тут я? З начальніка чыгункі патрабуй. Я сваё зрабіў. Завод дэманціраваны, станкі чакаюць пагрузкі, што ад мяне яшчэ трэба?

Г в а з д з ё ў. Ад цябе, бадай, нічога. А станкі прыйдзецца знішчыць. І неадкладна.

Паўза.

С а д о в і ч. Добра. Я пайду... Я застануся ў горадзе і зраблю гэта.

Г в а з д з ё ў (*глядзіць іранічна*). І што ты будзеш рабіць, калі я зараз скажу: заставайся?

С а д о в і ч. Віктар?!. Мы былі сябрамі... Я ведаю, табе не спадабалася маё выступленне на судзе Касцені... Ну, памыліўся! Ці я адзін у падобных абставінах памыляўся?

Г в а з д з ё ў. Зараз не час высвятляць абставіны. Давай хуценька грузі машыну...

С а д о в і ч. Не! Нікуды я не паеду. Я адказваю за завод!

Г в а з д з ё ў. Паедзеш. У мяне загад эвакуіраваць цябе разам з сям'ёй.

С а д о в і ч. А я не паеду.

Г в а з д з ё ў (*мякка*). Слухай, Садовіч... Не трэба! Вопытныя дырэктары патрэбны і там. Павінен жа хтосьці рабіць зброю, якой мы тут будзем біць немцаў...

С а д о в і ч. А як я буду глядзець у вочы сваім рабочым?

Г в а з д з ё ў. А ты не глядзі ім у вочы. Апусці іх пакуль. Пасля перамогі падымеш...

С а д о в і ч. Вось як ты са мною...

Г в а з д з ё ў. Я пакуль што па-добраму з

табою... І нечага табе ўпірацца. Ты павінен сам разумець, што тут трэба людзі крыху іншай загартоўкі. І, дзякуй богу, яны ў нас ёсць. Нават больш іх, чым думалі... Ну, збірайся! Немец ужо каля Лошыцы...

Гваздзёў пайшоў. Садовіч кінуўся да пісьмовага стала, корпаецца ў шуфлядках, совае ў кішэні нейкія паперы. Уваходзіць Каця.

Каця. Ну, што будзем рабіць? Збегла, дурніца...

Садовіч. Едзем! Хутчэй! Бяры Ірынку. *(Падхоплівае чамаданы.)* Ты мой выхадны касцюм, на якім ордэн, паклала?

Каця. Ой, не памятаю! Трэба праверыць...

Садовіч. Не трэба! Будзем жывы — будуць і ўзнагароды, і новыя касцюмы... *(Азіраецца.)* Ці вернемся сюды?

Садовіч і Каця выходзяць. Чуваць, як зараўла машына. І стала ціха. Потым захрыпеў рэпрадуктар. Бадзёры голас абвясціў: «Грамадзяне сталіцы ардэнаноснай Беларусі! Не верце панікёрам і правакатарам! Нашы часці спынілі ворага, і Мінску не пагражае ніякая небяспека. Падтрымлівайце парадак, выконвайце загады вайсковых улад».

На парозе з'яўляецца Лена. Пачынае наводзіць парадак. Зайшла за фіранку, нешта там робіць і не бачыць, што ў пакой увайшоў Касценя. На ім чорная целагрэйка, растоптаныя кірзавыя боты.

Касценя. Ёсць тут хто жывы?

Лена *(выглянула з-за фіранкі)*. Алёша! *(Кінуліся адзін да аднаго, моцна абдымаюцца. Зусім блізка чуваць стрэлы...)*

## ЧАСТКА ДРУГАЯ

*Пусть ярость благородная*
*Вскипает как волна!*
*Идет война народная,*
*Священная война!*

*З песні*

Калі не лічыць заклеенага крыж-накрыж пажоўклымі стужкамі акна і жалезнай пячуркі, якая стаіць пасярод пакоя, у кватэры нічога не змянілася. З вуліцы ўваходзяць Лена і Касценя. Лена адразу ідзе да пячуркі.

Касценя. Бррр... Холадна! Хоць і фрыцам мароз дае дыхту і жару, але і нам дастаецца... Асабліва ў лесе...

Лена. Зараз будзе цёпла. (*Працягвае венскае крэсла.*) Грэйся!

Касценя. Добрая мэбля. Шкада!

Лена. Жыцця не шкадуеш, мэблю пашкадаваў! Ды няхай яна гарыць яркім полымем! (*Яна грукнула крэсла аб падлогу. Касценя дакончыў справу. У пячурцы ўспыхнуў агонь.*) Ну вось, можна грэцца.

Яны селі на падлогу, працягнулі рукі і ногі да вогнішча.

Касценя. Крыху адышоў... Цяпер можаш паказваць свае бланкі...

Лена (*дастае з сумачкі бланкі*). Я і пячатку паставіла...

Касцен я. Што? Хто цябе прасіў?!

Лен а. А што тут такога? Я зрабіла лепш... Ці я не маю права на ініцыятыву?

Касцен я. Ты павінна строга выконваць тое, што табе загадана. А любая ініцыятыва з твайго боку будзе разглядацца як парушэнне дысцыпліны! Лена! Калі не шкадуеш сябе, пашкадуй мяне... Зразумей, Штаўбе хітры і каварны вораг... Я не магу нават падумаць, што застануся без цябе... Прашу цябе больш так не рабіць.

Лен а. Абяцаю... Больш не буду.

Касцен я. Скажы... Ты не заўважыла за Штаўбе нічога такога? Ён задаволены тваёй працай? Што ён кажа пра твой нямецкі?

Лен а. Пахваліў. Кажа: можна падумаць, што я нарадзілася ў Баварыі...

Касцен я. Ну вось і спатрэбіўся твой нямецкі.... Памятаеш, як не хацелася табе яго вучыць?

Лен а. Пра што ўспомніў! Я ўжо і забылася, калі была студэнткай...

Касцен я. Ці ж мы думалі-гадалі, што і такім вось дзяўчатам прыйдзецца стаць падпольшчыкамі, народнымі мсціўцамі... Якую мы камсамолію выпеставалі! Шмат нас загіне... Вельмі хачу, каб мінула цябе ліха...

Лен а. І цябе, мілы мой... Я не змагу жыць без цябе. Ты помні пра гэта... Не ведаю, што б я рабіла і што было б са мной, калі б не з'явіўся ты... А цяпер... Цяпер я нічога і нікога не баюся! Хоць жыўцом спаляць, рукі-ногі адсякуць, вочы...

Касцен я. Не трэба! Замоўкні!

Лена. Не баюся ні смерці, ні пакут! Верыш?

Касценя. Веру.

Лена. Скажы яшчэ раз.

Касценя. Веру. Веру.

Лена (*паднялася і стаіць перад Касценем на каленях*). Гэта такое слова, Алёша, такое слова! Як музыка. Сёння гэта галоўнае слова. Можна жыць без усіх астатніх слоў, а без гэтага нельга... (*Чуваць умоўны грукат у дзверы.*) Гэта дзядзька Максім!

Лена ідзе ў калідор і вяртаецца з Максімам.

Максім. Шанаванне, лясны браток! Ну, як там у вас?

Касценя. Ды так, як і ў вас...

Максім. Усюды адно... Ну нічога, перажывем ліха.

Лена. Дзядзька Максім, з чым прыйшлі?

Максім. З добрай навіной, дачка. Нарэшце аб'явіўся доўгачаканы Баравік. І ведаеце, браточкі, хто гэта? Гваздзёў!

Касценя
Лена (*разам*). Гваздзёў?!

Максім. Ён самы. Такі ж спрытны, толькі з барадой.

Касценя. Дзе ён?

Максім. Сядзіць у маёй хованцы. Пытае, калі можна сустрэцца з Ленай.

Лена (*паглядзела на Касценю*). Можа зараз?

Касценя. Добра. (*Да Максіма.*) Ідзі за

ім... *(Максім выходзіць.)* Мне трэба пайсці. Зараз я не магу з ім сустрэцца...

Лена. Чаму?

Касценя. Ёсць прычыны...

Лена. Разумею... Ты ведаеш... Не трэба адсюль ісці... Схавайся ў тым пакойчыку... А можа спатрэбішся, тады выйдзеш.

Касценя. Ну добра. Толькі пра мяне ніні! *(Выходзіць.)*

У калідоры чуваць голас Максіма: «Асцярожна... Лямпачка, разумееш, яшчэ пры савецкай уладзе згарэла, а цяпер пры «новым парадку» няма дзе здабыць...» Уваходзяць Максім, следам Гваздзёў.

Максім. Ну вось і дабраліся...

Гваздзёў. Добры дзень у хату...

Лена. Добры дзень... Ой, які ты смешны, Віктар, у гэтай світцы.

Гваздзёў. Які я табе Віктар? Я Баравік.

Лена. Ну, Баравік... Адкуль ты з'явіўся?

Гваздзёў. Адкуль жа цяпер з'яўляюцца? З неба.

Лена. Як Масква?

Гваздзёў. Масква стаіць і стаяць будзе...

Максім. Дык яны брэшуць тут у газетках, што стаяць ля самых варот Масквы? У біноклі, пішуць, Красную плошчу бачаць...

Гваздзёў. Можа і бачаць. Але Масквы ім усё роўна не ўбачыць, як сваіх вушэй... Як вы тут?

Лена. Як мае быць!

Гваздзёў. Ды штосьці не так. Бачыла павешаных каля Дома ўрада? Гэта ж усё нашы...

Лена. Я нічога не разумею...

Гваздзёў. Вось за гэтым я і прыйшоў...

Скажы, табе не даводзілася на допытах у Штаўбе бачыць трох тыпаў у чорных балахонах?

Лена. Аднойчы бачыла. Гэта нейкія важныя агенты Штаўбе. На каго яны паказваюць, тых звычайна расстрэльваюць...

Гвaздзёў. Чаму ж ты адразу не паведаміла?

Лена. Паведаміла...

Гвaздзёў. Аднаму чалавеку з лесу... Так. Гэтаму дзядзю Косцю? Не, хопіць гуляць у хованкі! Я павінен з ім сустрэцца. Гэты дзядзька дзейнічае з такім размахам, быццам у яго цэлая партызанская армія... Трэба наладжваць з ім кантакт... Ці можаш ты дапамагчы?

Лена. Спытаю...

Гвaздзёў. Тады так, пазвоніш па нумару 30-75. Спытаеш пана Дудко. Скажаш яму: «Вы абяцалі нямецкую швейную машынку». Ён адкажа: «Яшчэ не атрымалі. Як толькі атрымаем — ваша першая чарга». Калі ён скажа так, дык я ў горадзе. Калі скажа: «Ваша другая чарга»,— звані яму праз дзень...

Лена. Добра. Пытаць пана Дудко ці...

Гвaздзёў. Ён сам першы назаве сябе... Цяпер пра гэтых у балахонах. Іх трэба апазнаць. Можна гэта зрабіць?

Лена. Паспрабую.

Гвaздзёў. Толькі асцярожна! Ты для нас вельмі дарагі падпольшчык. І не маеш права рызыкаваць... Магу табе падказаць... Калі яны будуць утрох, скажы: Рогаў. І ўважліва сачы, можа каторы з іх якім-небудзь рухам выдасць сябе... Дамовіліся? І яшчэ прашу цябе

быць асцярожнай... Я пайшоў. (*Ідзе да дзвярэй. Да Максіма.*) Паглядзі там...

Максім і Гваздзёў выйшлі. Уваходзіць Касцеия.

Касцеия. Ну што ж... Прыйдзецца сустрэцца з маім былым следчым... А пан Дудко, мабыць, Максім?

Лена. Відаць, ён... Хі-ітры стары! Стаіць сабе і ў вус не дзьме. Я на яго гляджу — хоць бы хны!

Касцеия. І ўсё ж кепска з канспірацыяй... Правал за правалам. Гэтых у балахонах абавязкова трэба вывесці на чыстую ваду...

Зацямненне.

Каля зруйнаваных гмахаў нешта накшталт часовай барахолкі. Гандлююць усялякай дробяззю. Праходзіць хлопец. Праз шыю — латок з таварам.

Хлопец. Гэй, паны і паненкі! Грамадзяне вольнай Беларусі! Хто забыў наведаць мой універмаг? Калі ласка, налятай, што па сэрцу, выбірай! Купіў не купіў, а патаргавацца можна! Бо ўсё кірмашуе, пакуль грошы за пазухай чуе. Новы парадак! Змяніў быка ў Мінску на індыка ў Пінску.

Максім (*прыпыніўшыся каля хлопца*). Ух, і насабачыўся брахаць! Прыйдзецца табе пасля вайны ў гандаль падавацца... (*Узяў люстэрка.*) Сёння выйдзеш на сувязь...

Хлопец. Нам не да барыша — была б слава хараша. Бярэш ці толькі нюхаеш?

Максім. Нешта нічога ў тваім люстэрку не бачна... Я яшчэ раз падыду, і ты будзеш

купляць у мяне Біблію... Кепскае, братка, тваё люстэрка...

Хлопец. Не каркай на люстэрка, калі морда крывая! *(Разышліся.)*

На барахолцы з'яўляецца Лена ў суправаджэнні Лізэра. Яны падыходзяць да Максіма.

Максім. Каму Біблію... Каму святую кнігу...

Лена. Можна паглядзець?

Лізэр. Фрэйлен Гелена! Няўжо вы набожная? Вось не чакаў...

Лена. Не, я не набожная, але, ведаеце, ніколі не бачыла Бібліі.

Лізэр. Вядома. Краіна бязбожнікаў.

Лена. Колькі вы просіце?

Максім. Як аддаць, кветачка ясная, пяць соценных...

Лена. Савецкіх?

Максім. А якіх жа яшчэ? Біблія кніга святая... Як бог палажыў...

Лена. Спекулянт твой бог!

Максім. Бярэш — бяры, а бога не гняві...

Лізэр. А колькі на маркі?

Максім. Ваша міласць, на маркі не прадаецца.

Лізэр. Чаму?

Максім. Праваслаўныя мы... Кніга святая.

Лізэр. Дзікуны вы! Фрэйлен Гелена, вам вельмі хочацца?

Лена. Не, расхацелася. Пойдзем.

Адыходзячы з Лізэрам, Лена непрыкметна перадае нешта Максіму. Да Максіма падыходзіць хлопец.

Хлопец. Гэй! Хто грошы мае, падыходзь! Тавар першага гатунку! У каго грошы завяліся, не скупіся, наваліся! Каму каменьчыкі для запальнічак? Аж з самой вялікай Германіі! Першаму пакупніку скідка! Эй! Стары! Што гэта ў цябе?

Максім. Святая кніга. Біблія...

Хлопец. Во? Бібліі мне толькі і не хапала! Колькі просіш?

Максім. Каб не таргавацца — пяць соценных!

Хлопец. Атрымай!

Максім. Евангелле ад Лукі, шостая калонка знізу...

Яны разыходзяцца. Раптам да Максіма падыходзяць нямецкія салдаты, штурхаюць яго перад сабою...

Зацямненне.

Гестапаўскі засценак. Зараз тут Штаўбе, Лізэр. У глыбіні кабінета за столікам сядзіць Лена, ляпае на машынцы. Пасярод кабінета на стомленых нагах стаіць Максім.

Штаўбе. Спадзяюся, з вамі тут абыходзіліся карэктна?

Максім. Ага! Век памятаць буду і ўнукам накажу...

Лізэр. Калі яны ў вас будуць...

Максім. А яны ў мяне ёсць!

Штаўбе. Дзе ж яны?

Максім. Дзе ўсе. Вас б'юць.

Штаўбе. Ну, пакуль што мы вас б'ём. Вы просты рабочы чалавек. Вам патрэбна спакойнае, забяспечанае жыццё... і толькі! Ці не так? А што дала вам савецкая ўлада? Якую ўласнасць вы мелі? Вы асабіста...

Максім. Казу.

Штаубе. Ну, вось бачыце! А новы парадак гарантуе вам усё! Захочаце мець сто, тысячу коз — калі ласка!

Максім. Дзякую, ваша высокасць. Нам і ад адной казы жыцця не было...

Лізэр *(смяецца)*. Гер шэф! Яму хопіць і паловы казы. Дайце яму толькі адно тое месца, адкуль цячэ малако, і ён будзе на сёмым небе ад шчасця. Славяне — непатрабавальная парода рабоў...

Штаўбе. Не спяшайцеся з вывадамі, Лізэр. А вы ведаеце, мой бацька працаваў кляпальшчыкам на верфі ў Гамбургу. З вялікімі цяжкасцямі даў мне асвету. Так што мы з вамі браты па класу.

Максім. Заклятыя мы ворагі.

Штаўбе. Толькі таму, што я тут? Але я выконваю свой святы абавязак пралетарскай салідарнасці. *(Лізэр з цяжкасцю стрымлівае сябе, каб не зарагатаць.)* Лізэр... ваш настрой не адпавядае абставінам...

Лізэр. Прашу прабачэння!

Штаўбе. Мы дапамагаем рускаму народу навесці парадак у сваёй краіне. Ці ж гэта не высакародна? Ну, скажыце самі!

Максім. З табою гаварыць, як з пяску пугу віць.

Штаўбе. Як гэта — «пугу віць»? Я добра ведаю па-руску, але гэтага не разумею...

Максім. А пра што я і кажу. З дурнем размаўляць — і той розум страціш, што меў...

Штаўбе. Калі будзеш сябе так паводзіць, дык страціш не толькі розум.

Максім. Вось гэта знаёмы голас! Так бы адразу... А то пачаў прыкідвацца! Відзён жа сокал па палёту, а сава па погляду...

Штаўбе (*з упартай настойлівасцю*). Паслухай... Ты просты рабочы.

Максім. Чаму просты? Майстар я.

Штаўбе. Ну, майстар. Тваё адзінае багацце — твае мазолістыя рукі, якім, як сцвярджае вялікі нямецкі вучоны Маркс, няма чаго губляць, апрача сваіх ланцугоў... Так жа? Ну, дык якая табе розніца, які гаспадар будзе плаціць за твае рукі масцеравога чалавека? Важна, колькі ён будзе плаціць! А ці чуў ты, што ў шмат якіх краінах Захада і ў Амерыцы за рабочыя рукі плацяць значна больш, чым плацілі табе саветы?

Максім. Гэта мы чулі.

Штаўбе. Дык якая ж табе выгада ахвяраваць жыццём за ўладу, якая нічога табе не дала, апрача адной казы?

Максім. Дык гэта ж мая ўлада, курыная твая галава! Мая народная ўлада. А ты мне гітлераўскую на горб узвальваеш! Але што з табою гаварыць, калі ў цябе замест мазгоў крыважэрны звяруга сядзіць.

Штаўбе. Гэта не так! Мне зусім не хочацца цябе знішчыць. Ты моцны чалавек, разумны, у цябе працавітыя рукі. Гэтымі рукамі трэба будаваць новы парадак, а ты робіш глупства, за якое цябе трэба караць. Мне шкада цябе. Ты стары, паважаны чалавек, які так недарэчна трапіў у мой нерат. Ведай жа, усё так званае мінскае падполле — гэта мае людзі! І мне ўсё вядома з першых рук...

М а к с і м. А калі вядома — чаго чапляешся?

Ш т а ў б е. Ён не верыць! Ну, глядзі! *(Націскае кнопку званка. Уваходзіць чалавек у балахоне.)* Падыдзіце сюды. Паглядзіце на гэтага чалавека. Ён знаёмы вам? Вы сустракаліся з ім? *(Да Лены.)* Фрэйлен Гелена, вы маеце некалькі хвілін адпачынку... Прашу вас. *(Лена выходзіць.)* Цяпер кажыце...

Ч а л а в е к у б а л а х о н е. Так, я сустракаўся з ім. Ён перадаваў мне матэрыялы для радыравання ў цэнтр. Пры апошняй сустрэчы ён перадаў мне Біблію з шыфроўкай...

Ш т а ў б е *(бярэ са стала кнігу)*. Вось гэту?

М а к с і м *(кідаецца на чалавека ў балахоне)*. Ах ты падлюга!

Э с э с а ў ц ы цягнуць М а к с і м а з кабінета.

Ш т а ў б е. Лізэр! Цяпер чарга за вашай методай...

Л і з э р. Слухаю, шэф! І паверце, мая метода больш падыходзіць да гэтага быдла... Гэта ж вам не Францыя! Якія тут могуць быць тонкасці і далікатнасці?

Ш т а ў б е. Слухайце, вы! *(Чалавек сцягвае з твару балахон. Гэта Стась, хлопец-латошнік.)* Калі вы думаеце, што гэты спектакль з пераапрананнем я буду цярпець так доўга, дык вы жорстка памыляецеся, пан Стась. Мне патрэбны сапраўдныя кіраўнікі, а не сляпыя выканаўцы. Хто забіў Рогава і Бялова?

С т а с ь. Я думаю, што гэта выпадкова...

Ш т а ў б е. Вы яшчэ здольны думаць! Гэта

добра. І калі вы хочаце яшчэ крыху пакапціць неба...

Стась. Я ўсё зраблю, пан Штаўбе! Я дазнаюся пра Рогава і Бялова... У мяне будзе сустрэча з адным вялікім начальнікам...

Штаўбе. Калі?

Стась. Гэта будзе мне сказана за час да сустрэчы...

Штаўбе. Трымаць сувязь са мной! Быць на яўцы з ім да самага канца аперацыі. І нават страляць, калі дойдзе да страляніны... Вы зразумелі? Ён не павінен вас западозрыць... Марш!

Зацямненне.

Зімовы надвячорак. Руіны. Уваходзіць Гваздзёў, агледзеўся. Ціха свіснуў. З'яўляецца Стась.

Гваздзёў. Парадак?

Стась. Як у аптэцы.

Гваздзёў. Правільна. Як у аптэцы. Сёння выйдзеш на сувязь і перадасі, што Рогаў і Бялоў былі завярбаваны гестапа і адпушчаны «працаваць». Яны дзейнічалі на чыгунцы. Рогаў п'яны прыйшоў у госці да нейкай Лягушэвіч. Ён ведаў яе да вайны. Разам працавалі на чыгунцы. Яна на кадрах сядзела, прайдоха... Рогаў па п'янцы ляпнуў ёй: чаму яна не ў падпольнай арганізацыі. Ноччу яго цёпленькага прама і забралі з яе пасцелі... Потым арыштавалі Бялова і яшчэ некага... Ён і ёсць трэці...

Стась. А хто — невядома?

Гваздзёў. Ну, а як ты думаеш?

Стась. А што мне думаць? Мая справа — рацыя...

Гваздзёў. Зброя ў цябе ёсць?

С т а с ь. А што?

Г в а з д з ё ў. Дай сюды. Ну! *(Стась аддае пісталет.)* А цяпер скажы: чаму ты да гэтага часу не выдаў мяне? Баішся?

С т а с ь. Я не вінаваты! Яны мяне адразу запеленгавалі! Далі мне нейкую дапатопную рацыю... Схапілі мяне... Білі, агнём катавалі... А потым падаслалі Рогава... Ён сказаў, што Цэнтр ужо ведае аб маім правале і мяне ўсё роўна расстраляюць... Я не вінаваты!

Г в а з д з ё ў. А хто вінаваты, што ў цябе душа баязліўца і сволачы?

С т а с ь. Але ж вас я не выдаў! А мог!

Г в а з д з ё ў. Баяўся? Ці чакаў зручнага моманту, каб выслужыцца? У цябе ёсць гестапаўскі дакумент? Ну! Дай сюды!

С т а с ь *(працягнуў жэтон)*. Пашкадуйце мяне! Даруйце! Хочаце, я буду служыць у немцаў для вас... Вам жа патрэбны...

Г в а з д з ё ў. Не, нам не патрэбны халуі.

С т а с ь. Пашкадуйце! Я ж зусім яшчэ малады...

Г в а з д з ё ў. Сціхні, погань! Малады! А тыя не маладыя, што вісяць каля Дома ўрада?

С т а с ь. Я іх не выдаваў! Гэта Рогаў!

Г в а з д з ё ў. Косцю Тарсіцкага ведаў толькі ты. Малады... Як ты, малады савецкі чалавек, змог пайсці на такое? Што думаў, на што разлічваў, калі здраджваў сваіму народу, ішоў у паслугачы фашызму? І як я цябе не раскусіў яшчэ там, у Маскве? Такую чорную душу прагледзеў! Ніколі сабе гэтага не дарую... А цяпер пойдзем. І без выбрыкаў. Не хныч! Не люблю!.. Пайшлі!

Стась пакорліва ідзе паперадзе Гваздзёва. Яны хаваюцца сярод разбурэнняў. З'яўляецца Касценя. Ён у кажушку, махнатай шапцы-кучомцы. У руцэ пуга — прыехаў дзядзька з вёскі ды нечага шукае... Робіць выгляд, што чытае загады нямецкіх улад, якія наляпаны на ўцалеўшай сцяне зруйнаванага дома. З другога боку з'яўляецца Гваздзёў. Падыходзіць да сцяны.

Гваздзёў. Ну, здароў дзядзька Косця.

Касценя. Здароў, Баравік.

Гваздзёў. Як жа гэта ты, арыштант, тут апынуўся?

Касценя. Вельмі проста. Турму разбамбілі. Пагналі нас следам за адступаючымі, а ў дарозе немцы перахапілі. Ну, ноччу і даў я стракача. Ды не адзін я такі прыткі аказаўся... Сабралася нас у лесе чалавек дваццаць. Вось і стаў я дзядзькам Косцем...

Гваздзёў. Вось як, браток, бывае. А цяпер слухай... Давай хоць для блізіру цэглу складваць. Быццам немцы загадалі. Тым больш, усё роўна прыйдзецца нам гэтыя руіны разбіраць... Значыць, збег з турмы, не дачакаўшыся...

Касценя. Чаго?

Гваздзёў. Твая справа перагледжана. Ты рэабілітаваны.

Касценя. Ты пастараўся?

Гваздзёў. Не толькі я. Твой камандзір у Іспаніі генерал Рэут. Праўда, і яму прыйшлося быць пад следствам... Але такі чалавек! Не пра сябе клапаціўся, а пра сваіх баявых сяброў...

Касценя. Дзе ён цяпер — не ведаеш?

Гваздзёў. Танкавым корпусам каман-

дуе... Але давай па справе. Учора штабная машына з двума палкоўнікамі каля Трасцянца — твая справа?

К а с ц е н я. Наша.

Г в а з д з ё ў. Дзе гэтыя палкоўнікі?

К а с ц е н я. Вось я і хачу прасіць цябе дапамагчы адправіць іх на Вялікую зямлю. Шышкі вялікія! Карты з імі...

Г в а з д з ё ў. Добра. Гэта мы зробім. У цябе радыст ёсць?

К а с ц е н я. Радыстаў колькі хочаш. Рацыі няма. Была нямецкая — сапсавалася, і ніяк наладзіць не можам...

Г в а з д з ё ў. Рацыю атрымаеш... *(Прыслухаўся.)* Слухай, дзядзька Косця. Мы ўліплі. Вось гад! Паспеў навесці... Будзем прабівацца!

Я н ы бягуць у разваліны. Пачалася страляніна. Па развалінах слізгае прамень пражэктара...

Зацямненне.

У кабінет уваходзіць разгневаны Ш т а ў б е. За ім з вінаватым выглядам пляцецца Л і з э р.

Ш т а ў б е. Раз-зявы! Упусціць такую дзічыну!

Л і з э р. Але ж гэта д'ябал, а не чалавек... Ні адной кулі марна не пусціў.

Ш т а ў б е. Дзе ён? Я пытаю вас, дзе ён?

Л і з э р. Быццам скрозь зямлю праваліўся...

Ш т а ў б е. Жывога ці мёртвага, хоць з-пад зямлі. Лізэр, вы мяне зразумелі?

Л і з э р. Слухаю, гер обер-фюрэр! Вуліцы ачэплены...

Штаўбе (*па тэлефоне*). Доктар Вульферт? Перавязалі? Што? Калі трэба — ампуціруйце руку. Мне патрэбна яго галава! І каб у ёй было ўсё як трэба. Што? Зрабіце яму сотню ўколаў, пераліце цыстэрну крыві. Нават арыйскай! Ён павінен жыць! Мёртвы ён мне не патрэбны... Ведаю, ведаю, што вы не бог, тым не менш... Вось так! (*Кінуў трубку.*) Лізэр! А куды знік гэты крэтын Стась? Чаму яго не было на месцы аперацыі, як дамаўляліся? Праверце, можа мы яго падстрэлілі. Страта невялікая, але зараз ён мне вельмі патрэбны. Як толькі з'явіцца — да мяне!

Лізэр. Яволь! Магу ісці, гер шэф?

Штаўбе. Ідзіце! І памятайце, Лізэр, калі мы зараз не дакапаемся да гэтай праклятай арганізацыі, прыйдзецца нам збіраць рэшткі баявога духу, ён спатрэбіцца на фронце.

Зацямненне.

Кабінет Штаўбе. За столікам Лена. З'яўляецца Лізэр. Следам эсэсаўцы ўводзяць Касценю. Твар яго разбіты, губы сцятыя. Левы рукаў пусты. Лена глядзіць на яго, з цяжкасцю хаваючы разгубленасць. Штаўбе спадылба назірае за ёй і Касценем.

Штаўбе (*да Касцені*). Сядайце, мой добры знаёмы! Вось мы і сустрэліся зноў! Памятаеце, я гаварыў, што мы абавязкова сустрэнемся... (*Кіўнуў на пусты рукаў.*) Баліць? Паверце, я вам спачуваю... Віно? Цыгарэту? Не хочаце? Дарэмна. Падобная пагарда ў вашым стане — проста недарэчнасць. Тым больш, няма каму яе тут як належыць ацаніць. О! Я забыўся. Тут ёсць жанчына... Фрэйлен Гелена!

Гэта, мабыць, з-за вас мой стары знаёмы паводзіць сябе так неразумна. О, якія глупствы робім мы з-за жанчын! Але чарачка добрага французскага каньяку не пашкодзіць вашым прынцыпам... Гляньце, гэта стары мартэль... *(Налівае чаркі.)* Я прапаную выпіць за Іспанію!

Касценя. За Іспанію... віп'ю!

Штаўбе. Ну, вось мы і знайшлі нешта блізкае нам абодвум. Іспанія... Памятаеце бой за універсітэт?

Касценя. Можа абыдземся без успамінаў?

Штаўбе. Можна і без успамінаў. Тым больш, яны для вас не вельмі прыемныя. Тады давайце адразу да справы. Будзем гаварыць як салдат з салдатам... О, колькі іроніі і сарказму ў вашых вачах. Чаму вы не бачыце магчымасці для ўзаемаразумення? Без гэтага немагчыма далейшая цывілізацыя...

Касценя. Смешная ваша наіўнасць, Штаўбе. Ніколі не думаў, што жорсткасць і наіўнасць...

Штаўбе. Паверце, яны побач! Бо жорсткімі робяць нас толькі абставіны. Мы прыйшлі ў гэту краіну ў надзеі знайсці агульную мову. І мы знайшлі б яе! Бо большасць народа з намі. Вы ведаеце, колькі штыкоў у генерала Уласава? Тры мільёны! Гэтая лічба прымушае задумацца. Я разумею: свой шлях мы самі выбіраем. Яго нельга навязаць сілай. Бо ў такім выпадку чалавека трэба весці на ланцугу, нібы звера... Мы супраць гэтага. Нам патрэбны свядомыя будаўнікі новага парадку. Але, калі мы

не пойдзем адзін аднаму насустрач, то вымушаны будзем прыбегчы і да ланцугоў... Ну, вось вы! Чаму вы на тым баку барыкад? Чаму не з намі? Ці ж вы самі не бачыце: такая магутная дзяржава не вытрымала нашага націску, дапусціла нас да самых сцен Масквы? Як бачыце, не ваша, а мая ідэя ля самых варот Крамля.

Касцен я. Пад Масквой не твая мярзотная ідэя, а твае танкі. Пакуль што яны падмялі пад сябе маю зямлю. А мая ідэя ў маёй галаве, сэрцы, крыві! І знішчыць яе, перамагчы ты зможаш, толькі знішчыўшы мяне! Няўжо да цяперашняга часу ты не зразумеў гэтага?

Штаўбе. Гэта вар'яцтва! Нейкі славянскі фанатызм... *(Адышоў да акна, падзывае Касценю. Лізэр піхае яго.)* Вы гаворыце аб знішчэнні... О, гэта так проста! Паглядзіце на іх. Тут роўна тысяча. Праз нейкі час ад іх нічога не застанецца, апроч касцей... Дарэчы, гэта заложнікі. Яны ўзяты ў тым раёне, дзе былі захоплены вы... Яны будуць знішчаны! Але вы можаце іх не шкадаваць. Яны не варты гэтага... Паглядзіце на іх твары. Паспрабуйце хоць кагосьці выдзеліць. Страх смерці ўсіх ператварыў у жывёлін. Тупая, аморфная маса... І гэта з ёй вы хацелі пабудаваць нейкі там сацыялізм... Якая страшэнная і наіўная гістарычная недарэчнасць! Не, мой паважаны ідэйны антыпод! Калі чалавецтва ўсур'ёз разлічвае падняцца ў вышыню, яно павінна пазбавіцца падобнага баласту. І гэту вялікую місію мы, нацыянал-сацыялісты, узялі на сябе. Мы за панаванне моцнай, інтэлектуальнай і дысцы-

плінаванай асобы. Вось чаму мне шкада будзе знішчыць вас...

Касцена. Ну вось і прыступай да таго, што ўмееш рабіць лепш за ўсё. Кліч сваіх кастаправаў!

Штаўбе. Вы дарэмна спадзяяцеся на свае нервы. Ці вы думаеце, што камуністы з жалеза?

Касцена. Паспрабуй, даведаешся.

Штаўбе. Я вас разумею. Вы красуецеся перад гэтай маладой асобай. *(Падыходзіць да століка, за якім сядзіць Лена.)* О, бедная дзяўчынка! Мне шкада вас. Вы ашуканы. Злачыннай дэмагогіяй вас схілілі на дзейнасць не сумяшчальную з прызначэннем жанчыны, ды яшчэ такой маладой і прыгожай. *(Лена пацягнулася да сваёй сумачкі, але Штаўбе апярэдзіў яе. Дастаў з сумачкі пісталет, а сумачку працягнуў Лене.)* Калі ласка, фрэйлен Гелена. Можаце напудрыць свой цудоўны носік перад тым, як павядуць вас на шыбеніцу.

Касцена *(крычыць у роспачы)*. Лена!

Штаўбе. А! Закрычалі?! Наіўныя людзі! Яны хацелі абвесці вакол пальца старога Штаўбе! Можа толькі ў першую хвіліну я паверыў гэтай маладой і прывабнай асобе, калі яна вельмі натуральна скардзілася на савецкую ўладу... Але потым я злавіў неасцярожны яе позірк і ўсё зразумеў... *(Да Касцені.)* А як вы, спрактыкаваны падпольшчык, маглі паслаць такое горкае дзяўчо сюды, адкуль вельмі цяжка выйсці жывым? Дык ведайце! Гэта яна дапамагла ліквідаваць нам ваш так званы Мінскі гарадскі камітэт! Яна! За такі промах,

нават калі я вас адпушчу на свабоду — вам не даруюць! *(Лена кідаецца з крыкам на Штайбе. Лізэр хапае яе, моцна трымае.)* О, які тэмперамент! Зараз я шкадую, што не... Але гэта яшчэ не позна.

Л і з э р *(смяецца)*. Час яшчэ ёсць, шэф...

Ш т а ў б е. Лізэр, пагаварыце з ёй... як вы ўмееце.

Л і з э р. Яволь! *(Цягне Лену да дзвярэй.)*

Л е н а. Бывай, мой любы! Не хвалюйся і не думай пра мяне... Я ўсё вытрымаю...

Ш т а ў б е. Як бачыце, я прынцыпова супраць катаванняў. Гэтыя сярэдневяковыя метады я лічу ўстарэлымі. Ці да твару нам, людзям дваццатага стагоддзя, карыстацца спадчынай інквізіцыі? Ці можна параўнаць боль цела з болем душы і розуму? Шкада, мой погляд не раздзяляе мой малады калега... *(Ідзе да сцяны і распахвае фіранкі. Кліча пальцам Касценю. Ён падыходзіць.)* О, гэты Лізэр вялікі эстэт! Дзяўчат ён любіць катаваць зусім голымі... Мой бог! Якая яна цудоўная! Якое цела... Багіня! Жудасна нават уявіць сабе такую прыгажосць знішчанай, растаптанай... О, гэта нявінная ахвяра! І няўжо вы возьмеце на сваю душу такі недаравальны грэх? Не, гэтага вы не зробіце! Адно ваша слова, і яна будзе свабоднай! Ну! Даю вам на роздум пяць хвілін. Вы разумны чалавек.

К а с ц е н я *(адвярнуўся, заплюшчыў вочы)*. Лена... Даруй мне!.. Даруй!..

Ш т а ў б е. Не, не, не! Вы павінны глядзець! Гэта вы яе забіваеце! *(Глядзіць на гадзіннік.)* Але ў вас яшчэ ёсць цэлых дзве хвіліны... Лі-

зэр чакае майго сігналу... Вось і ўсё... Далей хвіліны адлічвае смерць! *(Штаўбе робіць знак.)* Што такое?

Л і з э р *(уваходзячы)*. Пракляцце! У яе быў яд. Імгненная смерць.

Касценя ў знямозе падае на падлогу. Раз'юшаны Штаўбе хватае Лізэра загрудкі.

Ш т а ў б е. Вы мне адкажаце, Лізэр, за ўсё разам.

Л і з э р. Гер шэф! Пры чым тут я?! Што за людзі, мой бог! Горш за звяроў! Бо звяры баяцца ж хоць болю!

Ш т а ў б е. На тое яны звяры, Лізэр. Ну, што ж цяпер рабіць?!

У дзверы пастукалі. Лізэр ідзе да дзвярэй.

Л і з э р. У чым справа, Ганс? *(Да Штаўбе.)* З'явіўся Стась.

Ш т а ў б е. Нарэшце! Давайце яго сюды!

Уваходзіць ч а л а в е к у ч о р н ы м б а л а х о н е, шпарка падыходзіць да Штаўбе і страляе. Штаўбе падае тварам на пісьмовы стол. Лізэр так і не паспеў выхапіць пісталет — Касценя б'е яго ў скроню. Нахіліўся над ім, даў некалькі добрых ляшчоў па шчацэ.

Г в а з д з ё ў. Ціха, Лізэр, толькі ціха... Не ў нашых з табой інтарэсах падымаць гвалт... *(Да Касцені, які прыпадняў галаву.)* Алёшка! Ісці ты можаш? *(Касценя падняўся на ногі.)* Трымай пісталет! *(Кінуў Касцені пісталет Лізэра.)* Слухай, Лізэр... Зараз мы ўдвух выведзем яго адсюль... Сядзем у тваю машыну і паедзем па Магілёўскай шашы... Калі ўсё будзе добра, гарантую табе тваё пага-

нае жыццё. Думаю, што табе няма ніякага сэнсу заставацца тут. Пайшлі, Алёша!

Музыка. Трагічная тэма. Прамень высвятляе твар Касцені. Толькі твар. І вочы. У глыбіні сцэны ў прамені ўзнікае твар Лены.

Лена. Алёша... Памятаеш наш паэтычны дыспут?

Касценя. Памятаю... Усё памятаю. Слухай! «Плевать, что нет у Гомеров и Овидиев людей, как мы от копоти в оспе. Я знаю — солнце померкло б, увидев наших душ золотые россыпи! Жилы и мускулы — молитв верней. Нам ли вымаливать милостей времени?! Мы каждый держим в своей пятерне миров приводные ремни». Сіла! Аж мурашкі па скуры. Вось гэта сапраўдная паэзія! Ленка! Няўжо ты гэтага не разумееш?

Лена. Разумею, што гэта барабанны бой. Я не скажу, што гэта дрэнна... Толькі вось паслухай сапраўдныя вершы. *(Дэкламуе.)* «Отговорила роща золотом березовым, веселым языком. И журавли, печально пролетая, уж не жалеют больше ни о ком. Кого жалеть? Ведь каждый в мире странник — пройдет, зайдет и вновь оставит дом. О всех ушедших грезит конопляник с широким месяцем над голубым прудом...» Алёшка! Ну ці ж гэта не здорава?

Касценя. Слязліва ж вельмі.

Лена. Ты... ты проста пень! Табе недаступна сапраўднае разуменне і пачуццё.

Касценя. А пра якое гэта пачуццё ты тут шчабечаш? Пра каханне?.. Дык ты сама тут ні бум-бум...

Лена. Дурань ты дурань, Алёшка...

Касценя. Пра вялікае пачуццё і гаварыць трэба па сапраўднаму, а не сюсюкаць... Вось так! *(Дэкламуе.)* «Мария! Имя твое я боюсь забыть, как поэт боится забыть какое-то в муках рожденное слово, величием равное богу. Тело твое я буду беречь и любить, как солдат, обрубленный войною, ненужный, ничей, бережет свою единственную ногу!»

Паўза.

Лена. Гэта, вядома, добра... І ўсё ж гэта — нібы выйсці на гарадскую плошчу і закрычаць: «Лю-ю-блю-ю-ю!»

Касценя. А чаму не закрычаць, калі сапраўды любіш?

Лена. І ты выйдзеш і вось так... закрычыш, напрыклад, для Каці?

Касценя. Для Каці? Каця, бадай, не зразумее... Вось можа для цябе?

Лена. Не трэба, Алёша... Не трэба! *(Знікае.)*

Прамень высвятляе твар Максіма.

Максім. Я забыўся ў цябе спытаць, Алёша... Ці проста не паспеў.

Касценя. Пра што ты хацеў у мяне спытаць?

Максім. Ну, ведаеш... Ты быў у Іспаніі, ваяваў там, а цябе ў турму... Ці не пакрыўдзіўся ты на савецкую ўладу?

Касценя. А пры чым тут савецкая ўлада?

Максім. Я так і думаў! Сапраўдны ты камуніст, Алёша... Вінаваты былі тыя людзі, якія

не ўмелі верыць і шанаваць праўду... З ёй вельмі асцярожна трэба! Праўда веры патрабуе. Вунь са мною ў грамадзянскую адна гісторыя прыключылася... Не памятаю, мо расказваў байку, як я беляка выпусціў? Тады слухай... Прыходзіць да нас у атрад бяляк. Штабс-капітан Лекараў. Аляксандр Львовіч... Праўда, пагоны скінуў, толькі афіцэрскі георгі на фрэнчы... Ну, прывялі яго да нашага камандзіра... Гэты Лекараў і кажа: хачу служыць рускаму народу і рэвалюцыі. А камандзір наш, Змітро Лыкаў, балтыйскі марак, быў вельмі ж злосны на контру — белякі ўсё яго лыкаўскае племя аж да сёмага калена пад корань... Вось ён і кажа: «Служыць рэвалюцыі ты ў мяне будзеш толькі на тым свеце!» І прыказвае: «Радніцай у штаб Духоніна!» Зачынілі яго ў лазні за хатамі ля рэчкі. А мяне вартавым паставілі. Ну, сцерагу беляка. Чую, закурыць просіць. Адсыпаў я самасаду на закрутку і сам задыміў. Рабіць няма чаго — разгаварыліся. Ён пытае, ці веру я яму? Глянуў яму ў вочы і баюся самому сабе прызнацца: «Веру!» Прамаўчаў я. Бо сам не магу зразумець — чаму я свайму заклятаму ворагу веру? Ён спахмурнеў і кажа: «Я цябе разумею — стагоддзямі накалялася народная нянавісць, а цяпер вось прарвалася, як лава з вулкана... І пад лавай гэтай вогненнай гінуць не толькі чорныя, але і чыстыя душы, бо яна не разбірае — цячэ сабе і ўсё на сваім шляху паліць... Гэта, кажа, заканамерны працэс». Мудрагеліста гаварыў бяляк, але ад чыстай душы. Ты, кажа, нават яшчэ і ўявіць сабе не можаш, якое жыццё наперадзе чакае

расіян, якая вялікая слава суджана Расіі. Таму беражы сябе, хлопча. Не шкада аддаць жыццё за светлую будучыню, але вялікае шчасце дажыць да заўтрашняга дня... Розныя шляхі вядуць да яго, розныя шляхі выбіраем мы, але ёсць адзін самы прамы і верны шлях — і трэба не абмінуць яго... А я вось, здаецца, і ўзышоў на свой верны шлях, ды спатыкнуўся... Глянуў я на яго, а на твары беляка слёзы... Не вытрымаў я. Дзверы насцеж і кажу: «Уляпётвай к ядронай мацеры!» А сам да камандзіра: «Судзі, кажу, рэвалюцыйным судом». Толькі гэта Змітро прыняўся суд нада мною ладзіць, уваходзіць бяляк... І што ж ты думаеш? Паверыў Змітро! Потым гэты Лекараў да камандзіра арміі даслужыўся... А Змітро камісарам у яго быў. Неразлучнымі дружбакамі сталі. А пад Каховкай іх адным снарадам накрыла. Ляжаць у адной магіле, і помнік ім паставілі адзін на двух... Людзі паверылі адзін аднаму і не памыліліся.

Прывід Максіма знікае. Прамень высвятляе твар Гваздзёва.

Гваздзёў. Смерць прыйшла да мяне нечакана. Маё жыццё не належала мне. Вось толькі не ведаю... Калі б усё спачатку... Не! Двойчы на такое жыццё не можа хапіць чалавека з адным сэрцам... На жаль, яно адно. Але я не шкадую — думаў, пакуль быў жывы, паспею... Але калі ўсё скончана, гэта не мела ўжо ніякага значэння. Час зруйнуе нашы магілы, зялёнай муравой і стромкімі бярозкамі зарастуць месцы, дзе лілася наша кроў. Час няў-

мольны, і гэта мы разумеем... Але будуць у свеце такія, што захочуць на нас забыцца. Ім будзе непрыемны нават напамінак пра нас і нашу барацьбу. Гэта заўсёды называлася раўнадушшам. А яно нараджае здраду. Таму наш наказ застаўшымся ў жывых і народжаным пасля нас: не забывайцеся на нас, шануйце нашу барацьбу, калі хочаце абараніць мір і шчасце нашага заўтрашняга дня...

Сціхае музыка. Толькі чуваць, як б'ецца трапяткое чалавечае сэрца...

Касценя (*ціха, праніknёна*). Не забудзем... Абаронім...

Зацямненне.

Гасцiная ў кватэры Садовіча. Вечар. Касценя, Садовіч, Каця, Ірына сядзяць у розных кутках. На стале чай.

Садовіч. Так, так... Наш час быў нялёгкі...

Касценя. Рознае было...

Садовіч. Як каму пашанцавала. Хоць і лічыцца, што свае шляхі мы выбіраем самі, але жыццё, бывае, так паверне...

Касценя. Паверне — слабага:..

Ірына. А хітры сам паверне...

Касценя. Такая хітрасць часцей за ўсё канчаецца подласцю.

Ірына. Калі разумны, дык тую подласць перахрысцяць у доблесць...

Касценя. Спадзяюся, што гэта толькі новы від дзявочага какецтва?

Ірына. А калі не?

Касценя. Тады шкада мне вас.

Ірына. А мне вас. Ну што ў вас за жыццё?

Каця. Ірына!

Ірына. Мама, не трэба быць ханжой. Ты ж са мной згодна...

Каця. Няхай сабе згодна! Але ж трэба быць разумнейшай...

Касцеия (*смяецца*). Табе вельмі хочацца пашкадаваць мяне? Дарэмна! Я ўсё роўна не стану зайздросціць...

Каця (*уздыхае*). Павер, Алёша... Мне вельмі хочацца, каб ты таксама меў у жыцці хоць невялічкае шчасце...

Касцеия. На невялічкае я не згодны... Смешная ты. Я шчаслівы! Нават магу падзяліцца...

Каця (*уздыхае*). Няхай будзе па-твойму... Калі ты сам так лічыш, дык няхай так яно і будзе! І ўсё ж я хачу табе сказаць — мяне заўсёды дзівіла тваё элементарнае неразуменне жыццёвых ісцін. Тое, што было зразумела ўсім, ты бачыў шыварат навыварат... Што ты глядзіш на мяне такімі вачыма?

Касцеия. Бо дзіўна мне...

Садовіч. Я цябе разумею! Паскубла цябе жыццё без жалю і літасці. Але ж за аднаго бітага двух нябітых даюць! Ты ўсё вытрымаў — пакуты, расчараванні, смерць дарагіх і блізкіх... Не здаўся, не зламаўся. Што ж, табе можна і пазайздросціць. Бо ўсім жа хочацца праскочыць праз жыццё на белым кані, размахваючы шабляй. Не ўсім гэта, канечне, удаецца. Але я ні аб чым не шкадую, ні на што, ні на кога не скарджуся. Шчыра табе прызнаюся: я задаволены сваім жыццём! І таму мне ўсе

гэтыя дамарошчаныя ныцікі проста агідныя. Нацягне, разумееш, які-небудзь смаркач штаны-дудачкі, распусціць патлы да самых плячэй і пачынае крытыканстваваць! І тое яму не так, і гэтае яму не тое! Адпусцілі гайкі, вось і развінціліся. Дарэчы, Ірына, ёсць крыху гэтай моднай гнілі і ў твайго Валодзькі! *(Да Касцені.)* Цяжка, брат, з моладдзю стала!

Касценя. Мабыць жа моладзі таксама не вельмі лёгка з табой.

Садовіч. А што ім ад нас трэба? Вунь якую спадчыну пакідаем! Гэта ж толькі падумаць: сярмяжная ды лапцюжная наша беларуская старонка стала краінай магутнай індустрыі! Свае трактары, аўтамабілі! Свая нафта, свая апрацоўка яе. Свае мінеральныя солі. Я ўжо не кажу пра розную дробязь: гадзіннікі, матацыклы, тэлевізары і нават лічыльныя машыны... І ўсё гэта ім, ім, дзеля іх дабрабыту!

Касценя. Гэта матэрыяльныя каштоўнасці...

Садовіч. Разумею! *(Іранічна.)* Іх, бачыш, не могуць задаволіць нашы духоўныя багацці...

Касценя. Чаму — нашы? Тут нельга абагульняць. Тут кожны адказвае сам за сябе.

Паўза.

Каця. Нешта невясёлая размова пайшла. *(Нехта звонку сыпануў па акну пяском. Каця павярнулася да акна.)* Хто гэта там балуецца? *(Да Ірыны.)* Ці не Валодзька?

Ірына *(падбегла да акна, выглядаецца)*. Іду! *(Пабегла.)*

Каця. Ой, хоць бы ў іх усё добра было!

С а д о в і ч. Нам бы іх турботы!

К а ц я. Ты ўжо лепш маўчы! З жаніхом мог бы быць крыху і мякчэйшым.

С а д о в і ч. Аб чым ты?

К а ц я. Сам ведаеш... Няўжо варта спрачацца з-за кожнай дробязі...

С а д о в і ч. Ну, ведаеш! У нашай рабоце няма дробязей...

К а ц я. Ат. Няма дык няма... Чай яшчэ будзеце піць?

С а д о в і ч. Я ўсё!

К а с ц е н я. Таксама.

Каця прыбірае стол. Панесла посуд на кухню. У дзвярах затрымалася.

К а ц я. Пераначуеш у нас?

С а д о в і ч. Ну пра што гаворка!

К а с ц е н я. Не, не! У гадзіну ёсць поезд — паеду.

С а д о в і ч. Куды ты, на ноч гледзячы?

К а с ц е н я. Заўтра ў мяне праўленне... Калгаснікаў сваіх прывучыў да парадку — не магу ж я сам парушаць яго...

К а ц я. Ну, як ведаеш. *(Пайшла.)*

Паўза.

С а д о в і ч *(уздыхнуў)*. Кажаш, кожны адказвае сам за сябе... Я цябе разумею, зразумей і ты мяне, Аляксей! Ці ж я адзін быў асеплены? Але ж я не даносіў, не паклёпнічаў!

К а с ц е н я. Ты маўчаў, там дзе трэба было гаварыць, крычаць...

С а д о в і ч. Маўчаў... *(З болем.)* Э-эх! Хацеў бы я паглядзець на вас, сённяшніх нашых суд-

дзяў, як бы вы павялі сябе на нашым месцы! Хацеў бы паглядзець! Ды калі хочаш ведаць, вы шчаслівейшыя за нас! Так, так! Таму што вы цярпелі фізічна, а мы — маральна! Вас калечылі фізічна, а нас духоўна! Думаеш, і мне не хацелася быць празрыстым, як кропля? Яшчэ як хацелася! Усе задаткі былі! Ці ты забыўся на нашу маладосць? Быў жа і я калісьці вось такім храбрым пеўнікам, як жанішок маёй Іркі, хвост натапырваў, дзюбу задзіраў угару... А жыццё павыскубла з хваста ўсе прыгожыя пярынкі, натаўкло па дзюбе... Вось цябе зараз і бянтэжыць гэты абскублены хвост. А ты не глядзі на хвост! Ты глядзі ў карань!

Касценя. Я гэта і раблю.

Садовіч. Дык тады павер! Павер, што я ніколі не хацеў рабіць зла! Ніколі!

Касценя. Адна справа — не хацець рабіць зла, і другая — як яно атрымліваецца.

Садовіч. Ну, няхай так! Але табе, Алёша, я смела магу глядзець у вочы...

Паўза.

Касценя. Ну, калі можаш, дык і спі спакойна. *(Падняўся.)* А я пайду... У мяне засталося мала часу і многа спраў...

Касценя не падаў рукі, толькі кіўнуў і пайшоў. Садовіч стаіць на месцы, не маючы сіл зварухнуцца. Уваходзіць Каця. Яна ў халаце, валасы распушчаны.

Каця. Паехаў? Ну, слава богу!

Садовіч *(у роспачы)*. Каця! Каця!.. Ну што гэта такое?! Чаму мінулае так ўладарыць

над цяперашнім. Вяртаецца чалавек, усімі забыты, амаль пахаваны... І вось...

Каця. Сам вінаваты. Навошта яго прывёў...

Садовіч. Так, так, прывёў... І ўсё, што было калісьці пераЖыта, ажывае зноў. І перажыць яго яшчэ больш балюча, чым было тады... Навошта?!

Каця (*абняла мужа*). Супакойся, мой дарагі... Гэта пройдзе!

Садовіч. Але ў чым жа мы вінаваты перад жыццём?

Каця. Ні ў чым! Выкінь гэтыя думкі з галавы!

Садовіч. Няўжо мы дзесьці аступіліся, пайшлі не тым шляхам?

Каця. Не-не! Ты заўсёды ішоў са сваім народам.

Садовіч. Так... так... Якая ты ў мяне... душэўная! Як добра разумееш мяне... Вось пагаварыў з табою, і стала лягчэй. Дзякуй табе, мая галубка! Якое шчасце, што ў мяне ёсць ты!

Зацямненне.

Высвечваецца прасцэніум. Абняўшыся, стаяць Валодзя і Ірына.

Ірына. Пусці. Хопіць лізацца. Трэба ад гэтага адвыкаць...

Валодзя. Чаму?

Ірына. Таму, што нічога ў нас з табою не выйдзе...

Валодзя. Выйдзе! Яшчэ як выйдзе!

Ірына. Чудзік ты, Валодзя! Няўжо ты не бачыш, што мы ўсё далей і далей адзін ад аднаго...

Валодзя. Не, не бачу.

Ірына. Гэта нічога не мяняе... Вось гэты чалавек, які, дарэчы, мог быць маім бацькам, чамусьці падобен на цябе... І я падумала, слухаючы яго: жыццё ніколі не стане спакойным, калі такія тыпы не пераводзяцца...

Валодзя. Нарэшце ты зразумела гэта! Прагрэс!

Ірына. А чаго ты ўзрадаваўся?

Валодзя. Твайму прасвятленню.

Ірына. Якому прасвятленню?

Валодзя. Раз ты зразумела, што жыццё ніколі не будзе спакойным балотам, дзе можна залезці жабай на кочку і праквакаць свае лепшыя гады,— дык мы нарэшце дамовімся!

Ірына. Аб чым?

Валодзя. Што інакш жыць нельга! Толькі вечны неспакой!

Ірына. Яшчэ як можна!

Валодзя. Гэта па прынцыпу: плюй на ўсё, беражыся насмарку?

Ірына. Вось іменна! Прынцып, па якому жыве кожны другі...

Валодзя. Слухай, старуха! І адкуль ты набралася гэтай муці!

Ірына. Калі набралася, выходзіць, яна існуе?

Валодзя. У бурнай рэчцы па краях заўсёды муць. Але ж увойдзе рэчка ў свае берагі, і муць асядзе на дно.

На другім канцы прасцэніума з'яўляецца Касцення. Закурыў. Глядзіць на гарадскія агні, аб чымсьці думае...

Ірына. Ай! Не гавары так прыгожа! Пакуль твая рэчка ў берагі ўваб'ецца — муць першай да берага прыб'ецца.

Валодзя. Няма ў яе берага!

Ірына. Той бераг яшчэ нікому не відзён...

Валодзя. Гэта не значыць, што да яго не трэба плыць...

Ірына. А калі я не ўмею плаваць?

Валодзя. Трэба вучыцца... Вось табе мэта ў жыцці! А інакш навошта капціць неба?

Ірына. А ты не знаходзіш, што гэтыя павучанні ў пользу бедных?

Валодзя. Правільна. У пользу бедных душою. Што ты глядзіш на мяне, як на малахольнага?

Ірына. А як жа інакш? Няўжо гэта ты... сур'ёзна?

Валодзя. А як жа!

Ірына. Валодзя! Так можна гаварыць з трыбуны, пісаць у газеце, але з каханай дзяўчынай...

Валодзя. А якая розніца? Я не аддзяляю любоў ад жыцця, асабістага і грамадскага...

Ірына. Ты страшны чалавек! Не, нічога ў нас з табою не будзе.

Валодзя. Будзе! Ты пойдзеш разам са мною па шляху, які я выбраў, нават тады, калі мне прыйдзецца цягнуць цябе сілком.

Ірына. Сілай хочаш ашчасліваць?

Валодзя. А што рабіць, калі я люблю?

Ірына. Думаеш, любоў дае права на насілле?

Валодзя. Насільна, канечне, любы не будзеш...

І р ы н а. Пакінь! Ты добра ведаеш, што я таксама цябе люблю...

В а л о д з я. Дык у чым жа справа?

І р ы н а. У тым, што адной любві ў наш век мала... Трэба яшчэ штосьці...

В а л о д з я. А можа я адналюб!

І р ы н а. Я не аб гэтым... Цяпер да гэтага пачуцця яшчэ столькі ўсялякага чапляецца, што як наваліцца на гэтую самую любоў, дык ад яе мокрага месца не застанецца...

В а л о д з я. А гэта залежыць ад нас саміх. *(Абдымае яе.)* Я бачу, што мне проста нельга выпускаць цябе з рук...

І р ы н а. У тваіх руках сапраўды становіцца ўсё проста. Я спакойная. Але ж ты не можаш вось так усё жыццё...

В а л о д з я. Магу!

Яны цалуюцца. Прамень высвятляе ў глыбіні твар Л е н ы. Касценя глядзіць прама перад сабою...

Л е н а. Чаму ты такі сумны? Гэта цябе ўстрывожыла сустрэча з мінулым.

К а с ц е н я. І сапраўды — мінулае! Але ж яно жыве побач. Вось таму мне і балюча... Бо ён жа, як і я,— камуніст. Як і я, прайшоў вялікі шлях, жыве ў гэтым жа вялікім часе, у якім жывём мы ўсе, хто застаўся ў жывых.

Л е н а. Такія людзішкі былі, ёсць і будуць...

К а с ц е н я. Тут я не згодзен з табою... Не павінна іх быць! Бо ніколі тады не збудзецца наша светлая мара, за якую мы пралілі столькі крыві і слёз, выцерпелі такія пакуты, вынеслі непамерныя цяжкасці... А колькі самых лепшых няма сярод нас!

Лена. Але мы з вамі. Не забывайце нас...

Касценя. Мы не забудзем, а яны хочуць забыць...

Прывід Лены знікае. Касценя цяжка ўздыхае. Ірына паглядзела ў яго бок — толькі зараз яны заўважылі Касценю.

Ірына. Пусці... Людзі глядзяць.

Валодзя. Гэта добры чалавек. Няхай глядзіць! І сапраўды, колькі пра любоў кніжак напісана, колькі добрых і кепскіх вершаў, колькі песень складзена! І колькі яна ўсялякіх вялікіх і маленькіх катастроф прычыніла... Але вось як падумаю, што жыццё маё без цябе будзе абкрадзеным, што ты мне патрэбна, як паветра, як вада, як хлеб...

Ірына. І таму ты гатовы абкрасці мяне?

Валодзя. Не! Я хачу цябе ўзбагаціць.

Ірына. Узбагаціў. Дзякую табе за такое ўзбагачэнне...

Паўза.

Валодзя (*глуха*). Ірка... Навошта ты так? Табе вельмі хочацца, каб я адчуваў сябе апошнім падонкам?

Ірына. Не ведаю, як ты, а я сябе адчуваю апошняй дрэнню!

Валодзя. Значыць... Не было радасці? Не былі мы шчаслівымі? Дык навошта тады...

Ірына. Ну вось... Я яшчэ і вінаватая!

Валодзя. Чаму ты шукаеш у гэтым віну? Чаму?

Паўза.

І р ы н а. Лепш я пайду... Мы сёння не дамовімся. Перасталі мы разумець адзін аднаго.

В а л о д з я. А разумелі?

І р ы н а. А што гэта зменіць?

В а л о д з я. Калі нічога, дык ідзі. Ідзі!

Ірына памкнулася да Валодзі, але ён адвярнуўся. І р ы н а пайшла. Каля Касцені прыпынілася.

І р ы н а. Ужо едзеце?

К а с ц е н я. Трэба! Бывайце!

І р ы н а. Бывайце. Скажыце... Вы любілі маму?

К а с ц е н я. Навошта вам гэта ведаць?

І р ы н а. Вы любілі маму?

Паўза.

К а с ц е н я. Любіў.

І р ы н а. Дзіўна...

К а с ц е н я *(згадзіўся)*. Дзіўна...

І р ы н а. Гэта ж я магла быць вашай дачкой... І была б я зараз, напрыклад, знатнай даяркай у вашым калгасе...

К а с ц е н я. А чым кепска?

І р ы н а. Чаму — кепска? Кепска тое, што я не ваша дачка...

К а с ц е н я. Дзівачка...

І р ы н а. Паслухайце... А калі я запрашу вас на сваё вяселле — прыедзеце?

К а с ц е н я. Прыеду! Абавязкова прыеду!

*Заслона*

# ЧАЛАВЕК ВЯРНУЎСЯ

*Драма ў чатырох дзеях*

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Раман Фёдаравіч Кацуба
Марфа Сямёнаўна
Віктар
Кацця
Маша
Сяргей Кацуба
Блавацкі
Вадзім
Мікола Шаркун
Нядбайла (Пятроў)

*Дзея адбываецца ў адным з гарадоў рэспублікі ў нашы дні. Ад першай дзеі да чацвёртай праходзіць год.*



# ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

## Карціна першая

Пакой у кватэры Кацубы. Стол, засланы абрусам. У кутку — шырокая тахта, застаўленая крыху шырмачкай, бо на ёй спяць. Побач з тахтой этажэрка з кнігамі. На століку каля акна — радыёпрыёмнік. На сцяне ў розных месцах — веерам фота славутых футбалістаў, акцёраў і актрыс. Крыху ў баку — старыя пажоўклыя сямейныя фота па некалькі ў адной рамцы.

Пасля таго як прагулі заводскія гудкі, са спальні выходзіць Раман Фёдаравіч. На ім піжамныя штаны і белая споднняя кашуля. Ён толькі што прачнуўся. Сівыя, коратка падстрыжаныя валасы тырчаць, як калючкі ў вожыка, пракураныя вусы абвіслі. Раман Фёдаравіч адкашліваецца, паціраe рукой адкрытыя грудзі. Па цяжкай шоргаючай хадзе, натруджанаму кашлю і незадаволеным хмурым тварам відаць, што Раману Фёдаравічу нездаровіцца.

З кухні выглядае Марфа Сямёнаўна з талеркай у руках і ручніком цераз плячо.

Марфа. Рамаша! Зноў з гудком прахапіўся? Спаў бы!

Раман. Гудуць, гудуць, родненькія.

Марфа. Адвыкаць ад гудкоў трэба, Рамаша. Ці ж не надакучылі за сорак год?

Раман. Ты мяне лепш не дапякай! А то зноў уцяку ў цэх!

Марфа. Адпрацаваў ты сваё, Рамаша. Цяпер няхай дзеці працуюць. *(Раман паціраe грудзі.)* Ные сэрца?

Раман. Ные, трасца яго бяры!

Марфа. Ты б у ванне паплёхаўся. Можа, лягчэй стане.

Раман. Мне б у лазню, ды на палок, ды венічкам!

Марфа. Нельга табе. Каця забараніла.

Раман. Каця! Каця!.. Бач ты яе! Забараніла...

Марфа. На тое яна і доктарка...

Раман. А нічога твая доктарка не разумее. Даўней людзі ад усякай хваробы лячыліся лазняй. Вып'еш гарэлкі з перцам — і на палок. Усыплеш сабе бярозавай кашы і — здаровы!

Марфа. Дык гэта ў стары час! Тады і хвароб такіх не было.

Раман. Лекараў надта шмат развялося, вось і выдумляюць... Ну дык вядзі ў твае начоўкі, паплёхаюся...

Абодва выходзяць.

Маша *(з-за шырмачкі, якая засланяе тахту)*. Бабуля! Чуеш, бабуля! Кінь мне халат... Ну, бабуля! *(Над шырмай з'яўляецца ўскудлачаная галава Машы.)* Ты глядзі! Няўжо ўсе яшчэ спяць? *(Ахінуўшыся коўдрай, выходзіць з-за шырмачкі. Соладка пазяхае.)*

Марфа *(з'яўляецца ў дзвярах)*. А божачка ты мой! Ці не захварэла?

Маша. Захварэла? Чаму?

Марфа. А ніколі ж так рана не прачыналася.

Маша. Скажы, калі ласка! Кашмар! Усе крытыкуюць!

Марфа. Ага, крытыкуюць... Бачыла, як

цябе размалявалі ў гэтым самым «боксе»! І гэтага твайго Вадзіма. Дажылася дзеўка!

Маша. Падумаеш, указчыкі паявіліся. Як хачу, так і апранаюся! Як хачу, так і танцую.

Марфа. Дык ты танцуй па-людску!

Маша. Лявоніху загадаеш танцаваць, ці што? Вось пацеха!

Марфа. Крый божа, дзед даведаецца! Я ж яго трымаю, не пускаю на вуліцу. А раптам вырвецца? Ой, дзеўка! Гля-я-дзі!.. Яшчэ год-два пустазеллем пакрасуешся, а потым і самой непрыемна стане. Пашкадуй нас, старых. Я ж таксама пакутую.

Маша. А чаго пакутаваць?

Марфа. Родная ты нам, вось і пакутуем.

Маша. Супакойцеся! Хутка пайду ад вас...

Марфа *(насцярожылася)*. Што гэта ты пляцеш недарэчнае?

Маша. Выходжу замуж. «Уж, замуж, невтерпёж». Дзіўна, чаму гэта ў рускай граматыцы выключэнне з агульнага правіла?

Марфа. За каго ж ты?

Маша. За мужчыну, бабуля.

Марфа. Ці не Вадзім Блавацкі мужчына гэты?

Маша. А чым ён не мужчына?

Марфа *(прыслухоўваючыся)*. Ай! Малако пабегла!

Выходзіць.

Маша *(падышла да фатаграфіі над тахтой)*. Чулі, мужчына Вадзім Блавацкі? І што ж вы сабе думаеце? Не-е, хопіць Рамеа і Джульету разыгрываць... Ну што ж, трэба апранац-

ца. *(Бярэ пантофлю.)* А гэта што: тыдзень не пранасіла — ужо кашы просяць! Вось каб той кашы ўсыпаць, ды яшчэ бярозавай...

Уваходзіць Раман Фёдаравіч, выціраючы мокрыя валасы ручніком.

Раман. Ты з кім тут ваюеш, каза-дзераза?

Маша. З дырэктарам абутковай фабрыкі, каб яму тыдзень ікалася!

Раман. Вось, вось. Нам з бабуляй перадыхнуць не даеш, вазьміся цяпер за дырэктара. Учора зноў да поўначы швэндалася?

Маша. Не швэндалася, а культурна праводзіла свой вольны час у парку культуры і адпачынку імя вялікага пралетарскага пісьменніка Максіма Горкага.

Раман. Падумай аб сабе, баламутка, падумай!

Маша. Аб сабе думаць — гэта перажытак капіталізму. Я думаю толькі аб грамадстве, дзядуля.

Раман. І ў каго ты такая пустая ўдалася?

Маша. Каб жа я ведала?!

Раман. Ах ты погань! Пачуў бы гэта родны бацька... Не шкадуеш ты яго светлай памяці... *(Схапіўся за грудзі.)* У-у, чорт...

Маша *(кінулася да дзеда, лашчыцца)*. Дзед, ну даруй! Вырвалася! Ты ж ведаеш... Ну, я такая! Што ж мне рабіць, калі ў мяне такі характар! Бывае, што мне і хочацца інакш, а не выходзіць... Ну, дзядуля... Я цябе больш за ўсіх люблю! Ты ж ведаеш... А татку свайго... Ды што казаць!.. *(Адштурхнуўшы Машу, Раман ідзе ў спальню.)* Вось зараз разрумзаю-

ся... А ўчора паўдня вейкі наклейвала. *(Усхліпнула.)* Не буду плакаць, і ўсё! Не буду! *(Плача.)* Не бу-у-у... *(За акном чуваць аўтамабільны сігнал. Маша схамянулася.)* А, каб цябе! Ужо прыкаціў! *(Падбягае да акна, расчыняе яго і звешваецца праз падаконнік.)* Пакінь дудзець! Можаш зайсці. Не з'ядуць. Ну, ідзі. *(Падыходзіць да люстэрка, прыхарошваецца.)* Трымайся, Вадзя! Літасці не будзе.

Паказваецца галава В а д з і м а з модным кокам.

Ну, уваходзь. Я адна.

В а д з і м *(адчыняючы дзверы)*. Твая старушэнцыя так на мяне паглядзела... Быццам я з таго свету з'явіўся. *(Памацаў пальцам каўнерык Машынай кофтачкі.)* Ух ты! Шэдэўральная ты сёння! Казка! Тысяча і адна ноч. Каралева Марго... *(Нечакана.)* Слухай! Мысля! Геніяльная.

М а ш а. У цябе? Жартуеш!

В а д з і м. Давай сёння запішамся! Адразу ў загс, га? Вось будзе пацеха! Усе раты паразяўляюць. Паехалі, га? Са сваім старым я дамоўлюся. Мой старыкан — кемлівы хлопец. Усё разумее.

М а ш а. Колькі табе год?

В а д з і м. Колькі ёсць — усе мае. Забылася? А колькі дасі?

М а ш а. Ад сілы — трынаццаць.

В а д з і м. Я табе здаюся такім маладым?

М а ш а. Такім блазнюком. Мусіць, праўду гаворaць: дасць бог прыгажосць, дык розум адбярэ.

В а д з і м. Слухай, надакучыў мне гэты

фальклор! Бач ты, народная мудрасць! Што з табою здарылася? «Бокс» гэты ідыёцкі пададзейнічаў, ці што? Перавыхавалася? Можа на цаліну махнеш? Ці адгукнешся на патрыятычны заклік: са школьнай парты — да станка? Уяўляю каралеву Марго ля такарнага станка! Умора!

Віктар *(з'яўляецца ў дзвярах)*. Чаму ўмора?

Маша *(жвава павярнуўшыся на голас)*. Віця! Са змены? Чаму так рана?

Віктар. Ат! Хутчэй позна, чым рана.

Маша. Зразумела. Мой дзядзя самых чэсных правіл з завода сам сябе адправіў... Так? Адгадала?

Віктар *(глядзіць на Вадзіма і Машу)*. Слухайце! А здорава вас размалявалі ў «боксе». Дастукаліся?

Вадзім. Э, не разумеюць маю паэтычную душу! *(Да Машы.)* Карэта пададзена, ваша каралеўская вялікасць. Мой старыкан зрабіў сёння боскую справу — адпусціў машыну на цэлы дзень... Едзем!

Маша. Нікуды я не паеду.

Вадзім. Марго! Ты ж абяцала!

Маша *(падштурхоўваючы Вадзіма да дзвярэй)*. Давай, давай! Прыязджай гадзінкі праз дзве. Паглядзім. Мо перадумаю.

Вадзім. Амба! Знікаю.

Віхляючы задам і выбрыкваючы нагамі, Вадзім знікае за дзвярыма, насвістваючы штосьці джазавае.

Віктар *(паціскаючы плячыма)*. Малахольны.

Маша. А цяпер мода.

Віктар. На малахольных?

Маша. Ага! Асуджаеш?

Віктар. Загадаеш песні пра вас спяваць? Не, даражэнькая, і казак пра вас не раскажуць, і песень пра вас не спяюць...

Маша. Падумаеш! Вельмі трэба. Надакучылі казкі. Не заплачам. Не маленькія. Выраслі. *(Звоніць тэлефон.)* Ало! Ну, я! Ды Маша, Маша! Не зайшла, і ўсё... А як жа мне з вамі размаўляць? Ведаеце што... А гэта хай вас не турбуе. Самі з вусамі. Што? З вусамі, кажу. З якімі вусамі? Звычайнымі. Як у Будзённага. Што? Які вы мне бацька? Вы — самы сапраўдны айчым...

Віктар. Маша... Яго не паважаеш — маці сваю пашкадуй... Нельга так.

Маша. А чаго ён ліпне як смала. *(У трубку.)* Што? Дзядзя Віця тут. Даю. *(Падае трубку.)* Ой, матухна родненькая! І як жа гэта ты церпіш пад бокам гэткую нудоту?

Віктар. Не ў сваю справу лезеш, пляменніца.

Маша. Трымай трубку, дзядзя. Хай ён яшчэ табе настрой на ўвесь дзень сапсуе...

Віктар. Слухаю. Добры дзень... Каму скардзіўся? Табе? А няхай хоць у суд падае. Ну і што, калі ён рэдактар? А я — рабкор. Не, нос я не задзіраў, а станавіўся да станка ды працу сваю паказваў... Я — рабочы чалавек і не пацярплю прайдзісветаў. Што? Вядома, я магу напісаць і пра гэта, але пакуль што я напісаў пра другое і патрабую, каб мой допіс

быў надрукаваны. Што? Няхай будзе ультыматум. Мне ўсё роўна, як гэта будзе называцца...

Р а м а н *(уваходзячы)*. Што ў цябе на заводзе здарылася?

В і к т а р. Ды нічога страшнага, тата.

Р а м а н. Які там ультыматум? Гавары!

В і к т а р. Тата, доўга расказваць. Пачакай крыху... Мне перакусіць бы ды падрамаць гадзінку-другую... Мату-у-ля!

М а р ф а *(уваходзячы)*. Я зараз, сынок...

Р а м а н. Віцька! Ты мне дурня не строй!

В і к т а р. Ну што я табе раскажу, што? Вось як пастаўлю на сваім, тады і расказаць будзе што.

Р а м а н. Не-е! Тут нешта цёмна... Сам пайду разбяруся!

М а р ф а. Рамаша! Абыдзецца. Першы раз з ім такое, ці што?

Р а м а н. Падай пінжак.

В і к т а р. Тата...

Р а м а н. Пінжак!

М а р ф а. А божухна мой! Ды куды цябе нясе?

Р а м а н. Пінжак, я табе сказаў! *(Марфа Сямёнаўна паслухмяна дастае з шафы пінжак, падае мужу.)* Не гэты. Па важнай справе іду. *(Марфа Сямёнаўна падае другі пінжак, на штрыфелі якога ордэны.)*

М а ш а *(любуючыся)*. Дзядуля ў нас, як той генерал у адстаўцы!

Р а м а н. Цыц!

М а р ф а. Рамаша, плюнь. Выраслі дзеці. Самі разбяруцца. Самі ўправяцца...

Раман. Вырасліі.. Радуйся! (*Стукнуўшы дзвярыма, выходзіць.*)

Паўза.

Марфа. Ты еш, сынок, еш! Напэўна прагаладаўся.

Віктар (*абняў маці за плечы*). Матуля, усыпала б ты сваёй ненаглядная унучцы...

Марфа. Позна ўжо. Ды і маці ў яе родная ёсць...

Віктар. Такую маці таксама не пашкодзіла б...

Маша. Мамку я вам у крыўду не дам! Мамка ў мяне — во! І татка герой...

Марфа (*па прывычцы ўсхліпнула*). Сыночак мой любы!

Віктар. Не трэба, мама...

Марфа. Вось ужо і дачушка яго — нявеста... Толькі ён ужо не пабачыць яе ніколі.

Маша. Мой тата жывы! Вось убачыце! Я яго кожны дзень сню... Ён такі ж, як на гэтай картцы. (*Узяла з этажэркі фота ў рамцы.*) І вось так усміхаецца... Быццам кажа: «Вы мяне пахавалі, а я жывы!»

Віктар. А каб вярнуўся... От было б табе тады, пляменніца, на арэхі...

Маша. За што?

Віктар. А за твае прыгожыя вочы. Такіх пустых ён цярпець не мог яшчэ ў школе. Такіх ён не любіў.

Маша. А мяне палюбіць!

Віктар. Гля-я-дзі, дзеўка. Яшчэ, чаго добрага, прападзеш.

Маша. Ці ж такія прападаюць? *(Прайшлася перад Віктарам.)* Паглядзі!

Віктар. Вось такія і прападаюць.

Марфа. Паслухай, унучачка. Мы ж цябе з дзедам не папракаем кавалкам хлеба, родная маці не прымушае нялюбай справай займацца. Хочаш — ідзі працаваць, хочаш — вучыся далей. Хочаш яшчэ пагуляць, гуляй сабе на здароўе. Хіба табе цяжка ў нас жывецца?

Маша. Наадварот, бабуля, вельмі лёгка. Так лёгка, што аж цяжка робіцца.

Марфа. Не разумею я цябе.

Маша. А гэта вечная гісторыя. Называецца — бацькі і дзеці. Мы ў школе праходзілі. *(З вуліцы даносіцца аўтамабільны гудок.)* От, дудзіць ужо! Балбес!

Маша выбягае, Марфа Сямёнаўна прыбірае са стала.

Марфа. Віцька... А на заводзе што?.. Пасварыўся?

Віктар. Пасварыўся, маці.

Марфа. З кім жа?

Віктар. З любым зяцьком вашым, грамадзянінам Шаркуном...

Марфа. І што ж вы з ім не падзялілі?

Віктар. А што мне з ім дзяліць? Розны ў нас інтарэс, матуля.

Марфа. Не любіш ты яго...

Віктар. Хопіць з яго Кацінага кахання.

Марфа. Віцька! Паслухай... Здаецца мне... Кідае яна яго...

Віктар. Даўно трэба было. Лепш удавой застацца, чым з такім жыць.

М а р ф а. Што ты гаворыш? Маладая яна... *(Уздыхнула.)* Ліха яго ведае, як тут быць. Дзякуй богу, дзяцей у іх...

В і к т а р. Правільна! Добра, што ў іх дзяцей няма. Я такім бы тыпам, як Шаркун, спецыяльным законам катэгарычна забараніў дзяцей мець.

М а р ф а. Няўжо так даняў? *(Прыслухоўваецца.)* Ідзе, ваяка. Па хадзе чую — злосны, як чорт. Ты ўжо з ім не надта...

В і к т а р. Я лепш уцяку. *(Выходзіць у спальню.)*

Уваходзіць Р а м а н Ф ё д а р а в і ч, моўчкі здымае пінжак, падае Марфе Сямёнаўне. Выцірае потны лоб.

Р а м а н. Гарачыня...

М а р ф а. І трэба было табе...

Р а м а н. Машка дзе?

М а р ф а. Паехала. Толькі што.

Р а м а н. З кім паехала? З доктарскім сынком? Дажыў стары дурань Раман Кацуба! Унучку яго родную, як пудзіла агароднае, на смех выстаўляюць!

Раман Фёдаравіч мітусіцца па пакоі. Схапіўшы халацік, кінуты Машай на тахту, шпурнуў яго ў кут. Потым узяўся зрываць фота над тахтой.

М а р ф а. Рамаша! Гэта ж артысты. А гэта — футбалісты.

Р а м а н. Артысты! Футбалісты! Культура! Выгадавалі, вывучылі! Бач, якая культурная...

М а р ф а. І чаго ты так разышоўся, Рамаша? Дай ты дзіцяці ў жыцці разабрацца. Яна ж яшчэ малая.

Р а м а н. Памаўчы. Бач, заступніца! А з хлопцамі цалавацца яна не малая? Прагледзелі мы з табой унучку, старая. І памяці сына не ўшанавалі. Вось так. А зяцёк наш таварыш Шаркун, хіба ён можа стаць ёй сапраўдным бацькам! Ліпкая ў яго натура. Як на пенсію мяне праводзілі, дык слязу пусціў. Дальбог! Ад рабачкома сунуў мне вудзільню гэтую з круцёлкай... Як яе!

М а р ф а. Спінінг.

Р а м а н. Во, во! Лаві, кажа, рыбку і вялікую і маленькую, Раман Фёдаравіч... Значыцца, як старэйшаму члену прафсаюза ўсучыў. Выдумаў жа, чым адзначыць... На гэта ж пугаўё, мабыць, і жаба не палезе.

М а р ф а. А што там такога страшнага Віця нарабіў?

Р а м а н. Ды нічога! Напісаў у заводскую шматтыражку пра беспарадкі ў сваім цэху. А рэдактар, шустры такі пеўнік у акулярах, гэты допіс да начальства. Не ведаю, якая там размова была, толькі вырашыў рэдактар допіс не друкаваць. Няправільна асвятляе, і ўсё такое... А Віктар на дыбкі! Гарачы...

М а р ф а. Па табе пайшоў, Раман.

Р а м а н. Э, не скажы, старая! Розуму ў яго не хапае. Трэба спакойна, па-гаспадарску. Хаця, падумаўшы, будзе і ён гаспадаром. Яму да ўсяго справа.

В і к т а р *(стаіць ля дзвярэй)*. Дзякуй табе, тата!

Р а м а н *(павярнуўшыся)*. А, ты тут!.. Вось што, бузацёр. Прыйдзецца табе, галубок, прасіць прабачэння.

Віктар. Не буду.

Раман. Хочаш, каб табе хуліганства прыпісалі?

Віктар. Ніякага хуліганства не было.

Раман. Як жа не было? Калі гэты рэдактар да сваёй заявы нават гузікі прычапіў.

Віктар. Ці я вінаваты, што гузікі ў яго на адной нітачцы трымаюцца...

Раман. Кінь зубы загаворваць! Бачыш, узяў моду людзей загрудкі хапаць!

Віктар. Каб жа людзей...

Раман. Замоўкні! Ты разумееш, чым гэта пахне? З заводам прыйдзецца развітацца. Ці табе ўжо родны завод — нішто? Камсамолец!

Віктар. Не станавіцца ж мне на калені!

Раман. Ніхто цябе не прымушае станавіцца на калені. Ты павінен папрасіць прабачэння ў чалавека, якога абразіў. Вось і ўсё. Па камсамольскай лініі табе, зразумела, дадуць дыхту... Але на заводзе пакінуць... Мне дырэктар слова даў... Зразумеў?

Віктар. Не, тата. Не разумею. Пазіцыя ваша для мяне незразумелая.

Раман. Пазіцыя! Герой! Грукнуць дзвярыма ў кожнага дурня розуму хопіць. А ты свайго дамажыся. Узяўся за гуж — дык цягні!

Віктар. А калі рвецца?

Раман. Вяжы вузлы! А цягні! Аднаму не пад сілу — таварышаў пакліч. А ганарыстасць сваю няма чаго паказваць... *(Схапіўся за сэрца і закашляўся.)*

Марфа. Не трапятаўся б ты ўжо, ваяка.

Раман. Пакуль дыхаю — трапятацца буду! Я гаспадар у доме! І, калі ласка, слухай-

цеся. Бач, распусціліся! Навяду парадкі! І не толькі ў сваёй хаце! *(Нечакана крычыць.)* Дзе сякера?

Марфа. Рамаша! Нашто табе сякера?

Раман. Дровы пайду шчапаць. *(Ідзе на кухню.)*

Віктар. Усхадзіўся стары. Ускіпеў.

Марфа. Растрывожылі, вось і ўскіпеў.

Марфа Сямёнаўна падбірае з падлогі шматкі фатаграфій. Некаторыя разгладжвае на калене і хавае ў буфет. Званок. Марфа Сямёнаўна выходзіць, хутка вяртаецца.

Марфа. Уваходзьце, доктар, уваходзьце!

Блавацкі *(увайшоўшы)*. Ды ўжо такая ў мяне недарэчная прафесія — усё жыццё ў чужыя дзверы ўваходзіць...

Віктар. Добры дзень, доктар.

Блавацкі. Добры дзень, малады чалавек.

Уваходзіць Раман Фёдаравіч з сякерай у руках.

Блавацкі. Рад вас бачыць, грамадзянін хворы, у такім ваяўнічым настроі. *(Бярэ з рук Рамана Фёдаравіча сякеру.)* А вось такое ўзбраенне вам ужо супрацьпаказана.

Раман. Бязлітасны вы народ, дактары. Не адразу, а патрошку адбіраеце жыццё ў чалавека. Спачатку курыць кінь, потым піць, потым працаваць... Потым у пасцель пакладуць. І ў труну.

Блавацкі. Не пахвальна, не пахвальна вы нашага брата атэстуеце. Але я прывык... У вас спрадвеку да лекарскага саслоўя такія адносіны. Толькі я адмысловы лекар. Нічога не адбіраю. Курылі — курыце. Пілі — піце.

Р а м а н. Нарэшце, хоць адзін сапраўдны доктар! *(Да Марфы Сямёнаўны.)* Гаварыў я табе — лякарства! Чула?

М а р ф а. Доктар жартуе.

Б л а в а ц к і. Жартую, жартую, паважаная Марфа Сямёнаўна. Ну-с, хворы, пакажыцеся...

М а р ф а. Калі ласка, сюды, за шырмачку...

Б л а в а ц к і і Р а м а н Ф ё д а р а в і ч ідуць за шырму.

Б л а в а ц к і *(з-за шырмачкі)*. Ну-с, дыхніце...

Р а м а н. Ды дыхаю яшчэ, дыхаю...

Б л а в а ц к і. А цяпер пакашляем. *(Раман Фёдаравіч кашляе.)* Вось так! Яшчэ разок. Добра. Лячыцца трэба сур'ёзна.

Р а м а н. Э, доктар. Лячыся не лячыся — канец адзін. Ды і час. Дзеці павырасталі. Вось толькі ўнучка...

Б л а в а ц к і *(выйшаўшы з-за шырмы)*. Дарэчы, наконт унучкі вашай... Здагадваецеся?

Р а м а н. Ды здагадваюся. А што рабіць? Задраць спаднічку ды ўсыпаць? Позна. Не паможа. Вы мне вось што скажыце, доктар. Мы са сваёй старой людзі простыя. Можа таму і дзяцей выхавалі дрэнна. Вы — чалавек інтэлігентны, адукаваны, а сын ваш...

Б л а в а ц к і. Так. Сын — шалапай! А калі, як і чаму гэта здарылася, забіце мяне *(развёў рукамі)*, не ведаю. Маці ў яго рана памерла... А мне з-за чужых хвароб і балячак нават дыхнуць няма часу. Сноў людскіх не бачу. Усё нейкія мікробы сняцца.

Раман. Сынок у вас, прабачце, як тая мікроба.

Марфа. Рама-а-аша!..

Раман. Памаўчы, маці. Мужчынская гаворка. Доктар не стане злаваць за шчырае слова... І вось што я вам скажу... Вельмі ж нам са старой балюча, што нашу ўнучку на ўвесь горад ганьбяць... А пачалося гэта, калі яна з вашым сынком здружылася... Не, не, вы паслухайце! Мо ваш хлопец не такі ўжо і благі, толькі, відаць, волю вы яму вялікую далі... А мы за ўнучку нашу строгі адказ нясём перад памяццю бацькі яе, сына нашага, воіна храбрага... Ён сваё маладое жыццё за яе шчасце аддаў, дык мы павінны берагчы гэтае шчасце... І таму не хачу крывіць душой — не падабаецца мне, што яна з вашым сынам дружыць... Вось так. І не крыўдуйце!

Блавацкі *(глуха)*. За шчырае слова крыўдаваць неразумна. Людзі мы з вамі пажылыя, і крывіць душой нам не да твару. *(Зірнуў на гадзіннік.)* Ну-с, грамадзянін хворы, будзьце ласкавы строга выконваць усе прызначэнні вашага ўрача. Нявестка ваша — урач талковы, яе слухаць трэба... Дамовіліся? Ну, бывайце здаровенькі, не хварэйце. А з сынам я абавязкова пагавару.

Блавацкі паціскае руку Раману Фёдаравічу і выходзіць разам з Марфай Сямёнаўнай. Раман Фёдаравіч ідзе ў свой пакой.

*Заслона*

## Карціна другая

Надвячорак. Са спальні выходзіць заспаны Віктар. Уключае радыё. Падыходзіць да акна, расчыняе яго насцеж. З кухні выходзіць Марфа Сямёнаўна, уключае люстру.

Марфа. Чаго гэта вецер па хаце гуляе?

Віктар. Душна, матуля. Няхай праветрыцца крыху.

Марфа. Дождж збіраецца. А гулёны нашай няма. Вымакне...

Віктар. Не цукровая — не растане. *(Здалёку даносіцца заводскі гудок.)* Чуеш! Гэта наш падае голас! Іду, іду!

Марфа. Бяжы, сынок. Дождж хутка ліне. Вунь якая хмара паўзе. *(Зачыняе акно.)* Бура пачынаецца...

Віктар. Нічога! Нас ніякай бурай не спалохаеш!

Віктар выходзіць. Маці глядзіць яму ўслед.

Марфа. Усё табе з бурамі ваяваць. Неспакойны...

Маланка чыркanула па сінім шкле акна. Ударыў гром зусім блізка, і лінуў дождж. Убягае мокрая да ніткі Маша. Кінулася да акна. Глядзіць. Памахала камусьці рукой, засмяялася.

Марфа. А божачка ты мой.

Маша. Разбойнік божачка твой. Не мог пачакаць — адразу як з вядра лінуў. Дзе мой халат?

Марфа. Ды куды ж ты? Ідзі на кухню...

Маша бяжыць на кухню. Марфа Сямёнаўна, узяўшы халат, ідзе следам.

Марфа *вяртаецца з чайнікам).* Хутчэй пі чай і спаць!

Маша *(выходзячы следам у халаціку).* Выдумала!

Марфа. Дзед бачыў, як цябе размалявалі. Вярнуўся з завода — нібы тая хмара... Вунь, усю тваю культуру са сцяны пазрываў...

Маша. Ой! Столькі збірала! І Жэрара Філіпа парваў?

Марфа. Не хныкай. Пазбірала я, схавала. Гора ты наша горкае...

Маша смяецца.

Чаго ты?

Маша. Так! *(Смяецца яшчэ мацней.)*

Марфа. Дальбог, звар'яцела дзеўка!

Маша *(бяжыць да акна).* Ідзі сюды, бабуля. Бачыш балбеса? Вунь сярод вуліцы стаіць...

Марфа. І праўда! Чакай! Дык гэта ж Вадзім!

Маша. Ён. *(Смяецца.)*

Марфа. Адпусціла б ты яго...

Маша. Не! Няхай стаіць. Абяцаў да раніцы. *(Ідзе да тахты.)* Я спаць буду. А ён няхай стаіць. *(Смяецца.)*

Марфа. Ды кінь ты рагатаць. Дзеда разбудзіш. Цэлы дзень так хваляваўся, ваяка. Кладзіся і ты, разбойніца. Кладзіся. Чуеш?

Маша. Я цяпер усё чую, такая дзіўная цішыня вакол... *(Грукат грому.)* Хоць і гром, а цішыня...

Марфа *(пазяхае).* Стамілася я сёння. *(Ідзе ў спальню.)*

М а ш а *(ціха заспявала)*:

Да, Мари всегда мила...
Всех она с ума свела...

Ой, Машка, што з табою робіцца? А можа, ты ўжо сама з глузду з'ехала? *(Бяжыць да акна.)* Стаіць, дурань! *(Смяецца.)*

Уваходзіць Кац я, спыняецца ля парога, асцярожна здымае з сябе цэлафанавую накідку. У Каці крыху паўнаватая, але стройная фігура маладой, у самым расквіце жанчыны. Апранута строга, але з густам, па модзе.

Мамачка! Залатая рыбка мая!

К а ц я. І праўда, рыбка. Ледзь даплыла.

М а ш а. Дзякуй табе! Ведаеш, я сабе загадала: калі мамачка сёння прыйдзе — значыць, усё будзе, як я задумала.

К а ц я. А што ж ты задумала?

М а ш а. Сакрэт! Мама, ты мяне любіш?

К а ц я. Дурненькая. Каго ж мне яшчэ любіць?

М а ш а. А тату? Не, не! Я не пра гэтага прыкрага чалавека, твайго мужа... Я пра майго тату...

К а ц я. Не трывож ты маё сэрца... Хапае яму і так!

Маша цягне маці да тахты, абедзве садзяцца.

М а ш а. Раскажы, мамачка, пра яго... Як ты кахала?

К а ц я *(уздыхнуўшы)*. Цяпер мне часта здаецца, што нічога гэтага не было... Не было Сярожы, не было нашага кахання... Тры дні адпусціла нам вайна. Усяго тры дні, дачушка... Потым прыйшла позва... За гадзіну

да адыходу эшалона пабеглі мы ў загс... А на месцы загса — руіны... Так і засталіся не распісаныя...

Маша. Што ты, мама! Ён распісаўся з табой сваёй крывёю. На ўсё жыццё! І ты павінна кахаць яго вечна! *(Яны моцна прыціснуліся адна да адной. Замоўклі.)*

Званок.

Пачакай. Я зараз... *(Выходзіць і вяртаецца з Мікалаем Шаркуном.)* Мама, не едзь! Застанься!

Мікалай. Ты гаварыла з ёй? Так, так! Лібэральнічаеш. А я не пацярплю кампраметацыі! Мяне ўсе бачаць. І ўсе ведаюць — я ёй айчым... І таму я патрабую... Катэгарычна патрабую...

Каця. Мікола! Прашу цябе...

Мікалай. Гэта я прашу цябе заклікаць да парадку сваю дачку! *(Да Машы.)* Як табе не сорамна! Ты ж камсамолка!

Маша. Была.

Мікола. Як гэта была?

Маша. Так, была. Была і выбыла. Аўтаматычна.

Каця. Дачушка... Што ж ты нарабіла!

Мікола. Сорамна стала?

Маша. Так! Сорамна! Вам, вядома, не знаёма такое чалавечае пачуццё?

Каця. Маша!

Мікола. Едзем! Я больш не магу цярпець выбрыкі гэтага сапсаванага дзяўчаняці.

Каця. Мікола! Яна мая дачка, і я прашу цябе...

Мікола. Едзем! Пагаворым дома.

Маша. Мама! Застанься! Пабудзь сёння са мною! Я вельмі прашу цябе... Мама! Мне вельмі трэба... *(Да Шаркуна.)* А вы едзьце! Чуеце? Едзьце! Пакіньце нас з мамай!

Каця. Мікола, я застануся. Ты ж бачыш... Ідзі, ідзі! Маша, супакойся.

Маша павалілася на тахту, плача. Шаркун выходзіць. Каця падсаджваецца да дачкі.

Дачушка... Супакойся... Маша!

Маша *(плача)*. Мамачка! Ты паверыла, што я ўжо не камсамолка. Паверыла? Ну, як жа ты магла? Гэта я для яго сказала, каб пазлаваць.

Каця. Але ж цябе выклікалі ў райком... Я ведаю.

Маша. Выклікалі. На бюро слухалі. Мамачка! Каб ты ведала, як мне было сорамна! Хацелася скрозь зямлю праваліцца. Асабліва сакратар балюча дапёк. Ты, гаворыць, дачка чалавека, які аддаў сваё жыццё за наша шчасце... Паверыш, мамачка, ён гаворыць, а ў мяне з вачэй слёзы самі цякуць... Пачалі выступаць... Мне аж страшна стала... Думаю, няўжо выганяць мяне з камсамола? Што ж я тады буду рабіць?! *(Плача.)*

Каця. Я вельмі рада... Рада, што ты ў мяне такая... Ты ўся ў свайго бацьку... І жыццё тваё будзе прыгожае, як ты сама...

Маша. Ведаеш, мама... Мо мне цяжка таму жыць, што я такая прыгожая...

Каця. Чаму, дурненькая?

Маша. Вось таму, што дурненькая... Іншы

раз задумаюся, што рабіць далей... Думаю, думаю ды гляну ў люстэрка, а з люстэрка глядзіць на мяне такая цаца... каралева Марго, як Вадзька кажа... Ну і падумаеш: ці ж такая каралева прападзе? Выйдзе замуж за якога-небудзь яшчэ не вельмі старога генерала ці акадэміка і будзе плаваць, як сыр у масле...

Каця (*смяецца*). Думаеш, я табе і паверыла! Не такая ты ў мяне...

Маша. А калі такая?

Каця. Не веру!

Маша. А калі я заўтра выскачу замуж, што скажаш?

Каця. Пачакай... Дык ты... сур'ёзна?

Маша. Гэта ж мне не зусім забаронена іншы раз быць сур'ёзнай?

Каця. Ведаеш... Для мяне гэта нечакана... Давай адкладзём гэтую размову, га?

Маша. Давай. Бо я і сама яшчэ баюся яе...

Каця. Адно толькі памятай: вельмі адказны крок у жыцці збіраешся рабіць... І ой як лёгка аступіцца! Як лёгка! Сябе часам кепска ведаеш... А гэта ж другі чалавек! Вось я... Жыла адна. Чакала Сярожу... А тут Шаркун. Ведаю, ты яго не любіш... Вініць цябе за гэта я не магу. Разумею, што табе не лёгка. Гэта мая віна... Не, не, маўчы! Я вельмі вінавата перад табою... Пакінула цябе адну.

Маша. Не, не! Гэта ты добра зрабіла. Я ніколі, чуеш, мама, ніколі не палюблю і не прывыкну да гэтага чалавека...

Каця. Я ж прывыкла...

Маша. Пакінь яго, мама! Пакінь! Мы будзем жыць адны. Ты і я. Гэта будзе так добра!

Каця *(туліць Машу да сябе)*. Дачушка мая... Каб ты ведала, як мне цяжка...

Маша. Пакінь яго і ўсё! *(У пярэдняй — званок.)* Гэта зноў ён! Не пушчу! *(Бяжыць да дзвярэй.)*

Каця. Маша!

Маша *(вяртаецца)*. Уваходзьце, калі ласка... Нашы старыя ўжо спаць паляглі, а дзядзя Віця на заводзе...

Уваходзіць Сяргей. Нямая сцэна.

Каця. Сярожа!

*Заслона*

# ДЗЕЯ ДРУГАЯ

## Карціна трэцяя

Усё ў кватэры Кацубаў засталося на сваіх месцах. І толькі некаторыя рэчы ды пінжак дзіўнай расфарбоўкі на спінцы крэсла, разгорнутая кніга і газеты на тахце даюць зразумець, што ў кватэры з'явіўся новы чалавек.

Сяргей, задумаўшыся, стаіць ля акна. Віктар схіліўся над разгорнутымі і раскладзенымі па ўсім стале лістамі чарцяжоў. Але вось ён адхіліўся і ўважліва зірнуў на Сяргея.

Сяргей. Усё прыглядаешся, брат мой меншы?

Віктар. А я яшчэ як след не паспеў цябе разгледзець, брат мой старэйшы. Калі ты ў ар-

мію ішоў, я пацаном быў. Адно толькі памятаю, як я за вамі з Кацькай падглядаў...

Сяргей. Ох і паскудны ты быў!

Віктар. А я і пацаноў з усёй вуліцы прыводзіў глядзець, як вы цалуецеся. Здорава гэта ў вас выходзіла.

Сяргей. А ў цябе яшчэ не выходзіць?

Віктар. Як сказаць... Практыкі, шчыра кажучы, малавата... Разумееш, запарыўся! Вось у рацыяналізатары падаўся. Няма калі цалавацца!

Сяргей. Ну і дурань.

Віктар. Сам ведаю, што дурань.

Сяргей. Потым пашкадуеш.

Віктар. Наганю.

Сяргей. У гэтай справе наганяць цяжка.

Віктар. Было б з кім.

Сяргей. У тым і загваздка. Можна застацца ў адзіноце...

Віктар. Ну што ты!

Сяргей *(стаіць ля этажэркі з кнігамі)*. Па токарнай справе? *(Віктар кіўнуў галавой.)* А гэта што за коміксы?

Віктар. Гэта пра бокс. Таксама, разумееш, навуковыя працы пішуць...

Сяргей. Захапляешся?

Віктар. Захапляўся, пакуль морду разы тры не размалявалі.

Сяргей. Глядзі, захавалася! «Як гартавалася сталь»... *(Чытае з тытульнага ліста кнігі.)* «За паспяховую вучобу і добрую дысцыпліну ў апошняй вучэбнай чвэрці вучню 10 «Б» класа Сяргею Раманавічу Кацубу... Дырэктар школы...» Та-ак. А праз два месяцы пайшлі

мы на вайну. Тыя, што паспяхова, нават хто і непаспяхова скончылі апошнюю чвэрць... Прама са школьнай парты...

Віктар. А ведаеш, гэтая кніга разам з намі ў эвакуацыі была. Маці брала. Памятаю, ад'ехалі за Маскву, і зноў усё мірна, ціха, быццам і вайны ніякай няма. Бабы ў полі працуюць, на агародах корпаюцца... Каровы пасуцца. Дзеўкі адвячоркамі пад гармонік пра каханне спяваюць. Бацька ў дарозе зусім засумаваў. Паслухае зводку — як хмара стане, аж зубамі скрыгоча. Зрабіў сабе будан паміж скрынямі і станкамі ды цэлымі днямі адлежваўся, як той мядзведзь у бярлозе. Нават есці не вылазіў. Маці яму прама ў будан перадавала. Знайшоў я ў матчыным клунку кнігу гэтую. Дай, думаю, бацьку падсуну. І што ты думаеш? Узяўся наш стары чытаць. Чытае! Цямнець стала, вылез са свайго будана, да дзвярэй перасеў... Чытае! Цікавая кніжка, пытаю? А мне ўсё роўна, адказвае. Толькі пра рускага чалавека, пра яго вялікую душу тут правільна напісана. Рускі чалавек ніколі на калені не стане!

Сяргей (*задумліва*). Бачыў я і рускіх на каленях.

Віктар. Калі ўжо рускага паставілі на калені, дык з яго душу выбілі. А без душы... які ён рускі?

Сяргей. Вельмі цяжка было там рускаму чалавеку. Бо для ворагаў ён самы ненавісны.

Віктар. Гэта таму, што рускі — савецкі чалавек. І калі хочаш застацца савецкім чалавекам — трымайся!

Званок у пярэдняй.

Сяргей. Відаць, Шаркун. Мы на гэты час дамовіліся...

Віктар *(згортвае чарцяжы)*. Я, бадай, пайду, га?

Сяргей. Як хочаш. А мне трэба пагаварыць...

Віктар. Забраў бы ад яго Кацю, і ўся размова! Яна ж толькі цябе любіць, павер мне!

Сяргей. Кацю не чапай!

Віктар з чарцяжамі ідзе ў суседні пакой. Сяргей ідзе адчыняць. Чуваць галасы. Уваходзяць Мікалай Шаркун, доктар Блавацкі, следам спяшаецца Марфа Сямёнаўна.

Шаркун *(працягваючы размову)*. Гэта я — бюракрат? Глупства! Ведаю, адкуль дзьме вецер. Пісакі! Гнілая інтэлігенцыя! Паслабілі за імі кантроль, вось яны і распусцілі языкі. Я карыстаюся даверам. Я працую сумленна, самааддана выконваю свой абавязак. А гэта безадказныя крыкуны бюракратам мяне абзываюць. Ніхто не дазволіць ганьбіць адказнага работніка!

Блавацкі. Значыць, бюракратаў крыкуны выдумалі?

Шаркун. Яны, ціпун ім на язык! Дзіўны народ, разумееш.

Блавацкі. Паслухайце, Шаркун. А як гэта называецца: я пасылаю да вас хворых, якія маюць патрэбу ў санаторным лячэнні...

Шаркун. А пуцёвак няма, дарагі доктар. І высмоктваць іх з пальца я яшчэ не навучыўся.

Б л а в а ц к і. Але збываць пуцёўкі чужым людзям...

Ш а р к у н. Галаслоўныя заявы не прымаю. Факты, доктар, факты! Будуць факты, разбяром, зробім вывады. А як жа!

Б л а в а ц к і. Але мне скардзіліся рабочыя...

Ш а р к у н. Рабочыя! Ёсць такія рабочыя — ой-ой-ой! Ты яго хлебам не кармі — дай толькі пабурчаць ды паскардзіцца. Эх і любіць наш абывацель скардзіцца! Калі зваліць у кучу ўсе кнігі скаргаў — Казбек атрымаецца.

Б л а в а ц к і. Арыгінальна разважаеце. Вельмі.

Ш а р к у н. Становішча абавязвае.

Б л а в а ц к і. Я спяшаюся. Але наконт размеркавання пуцёвак мы яшчэ пагутарым. *(Да Марфы Сямёнаўны.)* Ну-с, як наш хворы?

М а р ф а. І не кажыце, доктар! Аніякага ладу! Калі ласка, сюды.

М а р ф а С я м ё н а ў н а і Б л а в а ц к і выходзяць.

Ш а р к у н. Бачыў? Таксама, разумееш, гнілая інтэлігенцыя — усюды нос суне. Пад усе бочкі — шпунт. Распусціліся, разумееш. Крытыкуюць, вешаюць на цябе ўсіх сабак.

Уваходзіць М а р ф а С я м ё н а ў н а з патэльняй у руках.

М а р ф а. Што вы пасярод хаты пасталі? Сядайце за стол. Вось і яечня свежанькая. Закусвайце.

Ш а р к у н. Ды вы не турбуйцеся, Марфа Сямёнаўна. Мы народ вынослівы, да любой закускі прызвычаены. *(Садзіцца за стол.)* Даўненька я ў вас не гасцяваў, дарагая цешча!

Марфа. Наш дом заўсёды гасцям рады.

Шаркун. Ды я не крыўдую!

Марфа. А і крыўдаваць няма за што. (*Выходзіць.*)

Увайшоў Віктар і накіраваўся да люстэрка, каб прычасацца.

Сяргей. Віктар, ты куды?

Віктар. Прайдуся. Свежага паветра глынуць.

Сяргей. Пасядзі з намі.

Шаркун. Кінь ты злаваць! Сам жа ва ўсім вінаваты. Крытыка, брат, як тая брытва вострая. Карыстацца ёю трэба з розумам, асцярожна, каб самому не парэзацца. Ты крытыкуй, але не забывай, што і цябе пакрытыкаваць могуць. Ну, вып'ем! (*Выпівае, закусвае.*) Я рад тваму вяртанню на родную зямлю, дружа! Прыемна прыгадаць юнацтва... Памятаеш, як мы да Кацькі заляцаліся? Пацеха!

Сяргей (*нецярплівы рух*). Не трэба. Забыў я ўсё.

Шаркун. Маўчу, маўчу. Усё-такі добрымі сябрамі мы былі.

Сяргей. Былі... Шмат што было, ды сплыло. І часу быццам не так многа прайшло, а ўсё вакол — непазнавальнае.

Шаркун. Ідзём наперад! Сямімільнымі крокамі ідзём наперад! Толькі паспявай!

Віктар (*збіраючыся, выходзіць*). Хто наперад, а хто і назад.

Шаркун. Што ж, ёсць і такія. У вялікай сям'і, ясная справа, не без выродка. Праўда, ёсць яшчэ і такія, што памыляюцца. Жорстка

памыляюцца! Накшталт цябе, Віця. Так, так! Думаюць, ідуць наперад, а на самай справе, як тыя ракі, паўзуць назад. Гарлапаняць, не разабраўшыся! *(Віктар бразнуў дзвярыма.)* Гарачы! Нічога. Пасталее, дык і паразумнее, астыне... Ды і без увагі не пакінем. Прывядзём да нормы.

Сяргей. Слухай, скажы, калі ласка, як ты ў начальства выбіўся?

Шаркун. А што тут дзіўнага? Галаву на плячах маю...

Сяргей *(пільна глядзіць на Шаркуна, налівае ў шклянкі гарэлку).* Вып'ем! *(Выпіваюць.)* Вось так. А цяпер давай начыстату. Ці можаш ты зрабіць для мяне сапраўдную сяброўскую паслугу?..

Шаркун. Дапамагчы на працу паступіць? Калі ласка! Прыходзь заўтра ў любы час да мяне, я загадаю сакратаршы, каб цябе без чаргі... Заходзь.

Сяргей. Пачакай... Ты мне спачатку дапамажы разабрацца...

Шаркун. Лічу сваім грамадзянскім абавязкам. Вядома, табе цяжка адразу...

Сяргей. Ты скажы шчыра: гад ты ці не? Фальшывая ў цябе душа ці не?

Шаркун. Ты п'яны!

Сяргей. Я яшчэ ніколі не быў такім цвярозым.

Шаркун. А ну цябе! Заўсёды ты быў такі...

Сяргей. Які?

Шаркун. Не як усе людзі. Яшчэ ў школе... Занадта ты мудроны. Мудрагеліш, дружа! А ў нашым сучасным жыцці гэта залішне.

А таму кажы шчыра: гутарка пра Кацю — давай пра Кацю. Я, братка, прывык да яснасці. Каб усё было канкрэтна. Вось і стаў пытанне рубам: Каця. І давай паслядоўна абмяркоўваць і вырашаць гэтае пытанне...

Сяргей. Мо яшчэ на агульны прафсаюзны сход вынесем?

Шаркун. А што? Я чалавек сучасны, без усялякіх хітрыкаў, адкрыты для ўсёй грамадскасці. Калі трэба, дык і на сходзе. Толькі я мяркую, што ў гэтым выпадку можна і без сходу. Пытанне не такое складанае. Як-небудзь і самі разбяромся, што да чаго. Вось давай яшчэ пацягнем па каліву...

Сяргей. З мяне досыць...

Шаркун. Як хочаш. *(П'е.)* Значыцца, Каця... Дык ведаеш, што я табе скажу... Усе яны, дружа, аднолькавыя. Так! Ты думаеш яна доўга сумавала па табе? Ну, першы год пагаравала. А потым, бачу, расцвітае бабка! З кожным днём прыгажэйшая робіцца. Цвіце бабка, як тая ружа ў садзе... Ну, для блізіру, канечне, калючкі... Трымае сябе як мае быць. Але ты ж ведаеш мяне. Калі я ўжо прыняў рашэнне, дык ты ў зямлю мяне закапай — выканаю!

Сяргей. Бач ты які!

Шаркун. Такі, дружа, такі! Доўга яна трымалася, цану сабе набівала... Чаго ты моршчышся? Усе яны аднолькавыя! З год шурымуры мы з ёй разводзілі і запісаліся... Вось жывём. Дзяцей, праўда, пакуль што няма... Я нават падазраваць яе пачаў...

Сяргей. У чым жа?

Шаркун *(даверліва)*. Не хоча яна дзяцей.

А што ёй? Сама ўрач. Ведае, што як...

Сяргей. Як табе не сорамна...

Шаркун. А чаго? Мы ж з табою мужчыны...

Сяргей. Паскуднік ты, а не мужчына... І як яна з табой жыве...

Шаркун. Жыве, дружа, не скардзіцца. Жывём, як усе жанатыя людзі. І калі пайшла ўжо такая размова, дык я табе скажу... Скажу. Закарціць ёй вярнуцца да цябе — калі ласка! Не буду плакаць. І лезці да твайго горла не стану. Не! Дзяліць, як бачыш, нам няма чаго. Гэты інцыдэнт можна вырашыць шляхам перагавораў.

Сяргей. Мо і пачнём гэтыя перагаворы?

Шаркун. Са свайго боку я заўжды гатовы.

Сяргей. Гатовы?

Шаркун. Ага! Ты разумееш, у чым тут справа... Шчыра кажучы, занадта яна для мяне мудрая... Разумееш, прыгожая, але вельмі ж патрабавальная. Ёй, разумееш, каб мужчына ды быў яшчэ і вялікім філосафам. А я так гляджу: ці мужчына, ці філосаф! Ніяк жа ёй не дагадзіць! Па-рознаму, братка, думаем мы. Табе яна больш падыходзіць, павер. Цяжка мне з ёй...

Сяргей. Ты кахаеш яе?

Шаркун (*смяецца*). Сказаў! Ну, якое ў мае гады каханне. Хлапчо я, ці што? Няма, братка, часу ў мяне на падобныя рамантычныя пачуцці. Ніяк такое мерапрыемства ў план жыцця не ўкладваецца. Ёсць справы больш важныя.

С я р г е й. А яна... Яна цябе кахае?

Ш а р к у н. Калі жыве, дык кахае...

С я р г е й. Ну і логіка!

Ш а р к у н. Жалезная!

Паўза.

С я р г е й. Слухай. *(Нахіліўся да самага твару Шаркуна.)* Слухай уважліва, калі ты яшчэ здольны на гэта... Ды не лыпай ты вачыма. Біць цябе яшчэ не буду...

Ш а р к у н. А ну цябе!

С я р г е й. Слухай. Шануй Кацю. Зразумеў? Шануй. Калі ўжо ўхітрыўся ты задурыць сваёй... жалезнай логікай, дык шануй. Не дай божа, пачую, што крыўдзіш ты яе...

Ш а р к у н. Дазволь! Якое ты маеш права...

С я р г е й. Маю! Пакуты мае даюць мне гэтае права...

Ш а р к у н *(устаў з-за стала, афіцыйна)*. Вось калі мы разыдземся і яна вернецца да цябе, тады і рабі з ёю, што хочаш. А пакуль што твае ЦУ для мяне ніякай сілы не маюць.

С я р г е й. Дырэктывы! Эх ты... Закарэлая твая душа. І што гэта з табою здарылася? Быў жа і ты calісьці на чалавека падобны.

Ш а р к у н. Ну, ведаеш! Хопіць крытыкі! Хопіць! Бо я чалавек! Ча-ла́-век! І яшчэ які! Калі хочаш ведаць, твая Каця павінна на мяне маліцца...

С я р г е й. Ідзі прэч!..

Ш а р к у н *(здзіўлена)*. Што-о?

С я р г е й. Прэч!

Ш а р к у н. Лягчэй, лягчэй... Гэта табе не там...

Сяргей наступае на Шаркуна, той падаецца да дзвярэй. З другога пакоя выходзяць Б л а в а ц к і і М а р ф а С я м ё н а ў н а.

Б л а в а ц к і. Вось што, паважаная, трымайце хворага ў пасцелі.

С я р г е й. Хіба бацька так сур'ёзна хворы?

Б л а в а ц к і. Не, сур'ёзна хварэць, малады чалавек, сэнсу няма. *(Дастае з кішэні пакецік.)* Няхай прымае.

М а р ф а. Не любіць ён парашкоў гэтых. Доктар! Можа атамамі якімі-небудзь яго палячыць?

Б л а в а ц к і. Механічнае сэрца ўжо стварылі, засталося толькі атамнае...

М а р ф а С я м ё н а ў н а махнула рукой і выходзіць.

С я р г е й. Доктар, а душу механічную не стварылі яшчэ?

Б л а в а ц к і. Душу? А што гэта за орган такі? Чацвёрты дзесятак заглядваю ў нутро чалавечае, а такога органа не заўважаў.

С я р г е й. А чаму ж яна баліць, доктар?

Б л а в а ц к і. Людзі схільны іншы раз выдумляць сабе боль.

С я р г е й. А калі іх прымушаюць верыць у гэты боль? *(Мнагазначна.)* Там гэта ўмеюць рабіць! Падсунуць газетку на рускай мове — іх там многа выдаюць,— пачынаем чытаць, злосць разбірае!

Б л а в а ц к і. Так. Цяжка нашаму чалавеку быць на чужыне...

С я р г е й. Калі б толькі цяжка! Усё можна перанесці: катаванні, голад і холад, усё! А вось калі табе плююць у самую душу, у сэрца...

Б л а в а ц к і. Я разумею вас. *(Зірнуўшы на ручны гадзіннік.)* О! Час які спрытны... Ніяк яго не ўтрымаеш... Мне яшчэ абавязкова аднаго хворага грамадзяніна наведаць трэба.

М а р ф а *(з'яўляецца з кухні)*. Ды пасядзіце, доктар! Хутка самавар закіпіць...

Б л а в а ц к і. Не спакушайце, Марфа Сямёнаўна! Даўненька я не каштаваў чаю з гэтага агрэгата! І на смак забыўся. А смак жа асаблівы! Але як-небудзь іншы раз. Пайду. Да пабачэння, Сяргей Раманавіч...

С я р г е й. Да пабачэння, доктар. Дзякую за гутарку.

Б л а в а ц к і. Што ж... Хоць і невялікая, ды шчырая.

С я р г е й. Вось за гэта і дзякую.

М а р ф а  С я м ё н а ў н а праводзіць д о к т а р а. Сяргей устаў з-за стала, падышоў да тахты, хацеў закурыць, але раптам скамячыў папяросу, кінуў яе і кінуўся ніцма на тахту... Увайшла Марфа Сямёнаўна і ўзялася наводзіць парадак на стале. Са спальні данёсся голас Рамана Фёдаравіча: «Марфа! Ідзі сюды...» Марфа Сямёнаўна спяшаецца на голас. Раман Фёдаравіч пытаецца: «Ты куды штаны схавала?» Голас Марфы Сямёнаўны адказвае: «Нельга табе, Рамаша! Доктар загадаў ляжаць...»

Р а м а н *(выходзячы)*. Вось няхай сам і ляжыць... *(Падышоў да стала.)* Чэрці! Самі гарэлку жлукцяць, а мяне ў пасцель палажылі. *(Налівае чарку.)*

М а р ф а *(са спальні)*. Нельга табе!

Р а м а н. Калі чарка ў руках трымаецца — можна. *(Выпівае. Убачыў Сяргея.)* Спіць? Усё ніяк не адаспіцца... Яно, вядома, з такога пекла вырваўшыся...

М а р ф а *(уваходзячы)*. Табе парашок прымаць...

Р а м а н. Та-а-к... Капіталізм! Слова якое цяжкае. Быццам чыгунная балванка. *(Наліў з графіна вады ў шклянку, усыпаў у рот парашок, запівае.)* Дрэнь!

М а р ф а. Доктар кажа: дапамагае.

Р а м а н. Як мёртваму прыпаркі. *(Падышоў да двух чамаданаў каля буфета.)* Навошта ён такі груз цягнуў?

М а р ф а. Не думалі, не чакалі жывога...

Р а м а н. Целам жывы. А душу, відаць, пакарабацілі хлопцу. Капітальны рамонт патрэбен.

М а р ф а. Нічога. Абы жывы. У сваёй сям'і ачуняе.

Р а м а н. Э, старая! Тут прычына больш складаная... Ты вось што... Ідзі. Ідзі па сваёй справе...

М а р ф а. Хай бы паспаў...

Р а м а н. Я пачакаю, пакуль прачнецца...

С я р г е й. Не сплю я... *(Падняўся з тахты.)*

М а р ф а. Дык я пайду... У магазін схаджу.

М а р ф а С я м ё н а ў н а выйшла. Паўза.

Р а м а н. Сынок... Ты зразумей мяне... Амаль пятнаццаць год не было цябе з намі. Гэта ж вялікі час, цэлае чалавечае жыццё...

С я р г е й. Я разумею. Табе хочацца ведаць, як твой сын пражыў гэтае жыццё... Што ж, законнае жаданне. Дык я табе скажу: кепска пражыў. Нават успамінаць прыкра. Не хочацца...

Р а м а н. Гэта так, сынок... Але ж, скажы,

па-людску ты пражыў гэтыя гады? Не страціў сумленне?

Сяргей. Гледзячы што лічыць сумленнем. Мо і страціў. Бо нормы чалавечага сумлення там зусім іншыя.

Раман. Але ж ты рускі, савецкі чалавек! Сын рабочага!

Сяргей. Пра гэта я ніколі там не забываў, тата.

Раман. Тады добра. Гэта самае галоўнае. Ну... І скажы ты мне, што далей рабіць збіраешся?

Сяргей. Пакуль што выспацца і наесціся ўдосталь.

Раман. А потым?

Сяргей. Потым відаць будзе. Працаваць пайду. А калі ўсё добра будзе, дык завочна вучыцца пачну... Трэба ж скончыць пачатае яшчэ да вайны...

Раман. Вось гэта ты правільна вырашыў. Так і трымай! А мяне прабач, што ўсё дапытваюся... Сын жа ты мой старэйшы. Гордасць мая рабочая... Пайду я. Лягу...

Раман Фёдаравіч выходзіць. Сяргей зноў лажыцца на тахту. Уваходзіць Каця.

Каця (*падышла да тахты*). Спіш і нічога, нічога не чуеш... Не чуеш, што тут робіцца. (*Дакранулася да сэрца.*) Ну і спі. Спі...

Сяргей (*паварочваючыся*). А я і не сплю. І ўсё чую. Дзень добры, Каця.

Каця. Дзень добры. А я Машу зайшла праведаць...

Сяргей. З раніцы панеслася недзе з жаніхом...

Паўза.

Каця. Вадзім табе не падабаецца?

Сяргей. Яшчэ не разгледзеў.

Каця. А Машу?

Сяргей. Прыглядаюся.

Каця. Ну, а... мяне ты ўжо разгледзеў? Я перамянілася?

Сяргей. Для мяне — не.

Паўза.

Каця. Ты мяне дакараеш?

Сяргей. За што?

Каця. Ну-у... Што *(з націскам)* так цябе чакала...

Сяргей. Хіба важна *(з націскам)* як ты мяне чакала? Па-мойму, важней *(з націскам)*, каго ты дачакалася?

Каця. Як жа далей?

Сяргей. Паеду.

Каця *(голас яе задрыжаў)*. Паедзеш? Куды?

Сяргей. Свет вялікі.

Каця. Не надакучыла бадзяцца па свеце?

Сяргей. Абрыдла.

Каця. Што ж цябе гоніць, што?

Сяргей. Калі скажу страх — паверыш?

Каця. Але што цябе страшыць? Што?

Сяргей. Калі скажу жыццё — паверыш?

Каця. Жыццё? Наша жыццё?

Сяргей. Не ваша — маё.

Каця. Зноў загадкі...

Сяргей. Дай час...

Паўза.

Каця. Відаць, я не дачакаюся Машы... Толькі навошта хлусіць? Я ж да цябе ішла... Вырашыла шчыра пагаварыць...

Сяргей. Я зразумеў.

Каця. Вось мы і пагаварылі...

Сяргей (*рэзка, нечакана*). Ты кахаеш Шаркуна?

Каця. Навошта ты пра гэта пытаеш?

Сяргей. Скажы.

Каця. Сказаць? Не кахаю.

Сяргей. А жывеш!

Каця. Што ты патрабуеш ад мяне?

Сяргей. Я нічога не патрабую. Не маю права.

Каця. Чаму? Чаму ж?

Сяргей. Так. Ты... ідзі. Так будзе лепш.

Каця. Ты мяне гоніш?

Сяргей. Так трэба. Прашу цябе...

Каця. Добра. Я пайду.

Сяргей. Бывай, Каця.

Каця. Чаму «бывай»?

Сяргей. На ўсякі выпадак. Глядзі нашу дачку. І забудзь усё. Усё!

Каця, закрыўшы твар рукамі, хутка выходзіць. Уваходзіць Марфа Сямёнаўна, дастае з сумкі хлеб, кладзе яго ў шуфлядку буфета, цішком назірае за Сяргеем.

Марфа. Ты на Кацю не крыўдуй, сынок. Не вінавата яна. Доўга ён яе абходжваў. А як атрымалі паведамленне аб табе, зусім пасмялеў... Нямала пагаравалі мы з ёю, паплакалі...

А той усё над душой стаіць. Падумала я тады, не прападаць жа такой жанчыне... І не ўдава, і не дзеўка. Так што ва ўсім я вінаватая. Мяне карай. А яе не вінаваць.

Сяргей. Нікога я не віню, мама. Дзякуй, што дачку выгадавалі.

Марфа. Чалавек ты яшчэ малады...

Сяргей. Стары я! Ох, які стары.

Марфа. Гэта ты дарэмна, сынок.

З пярэдняй даносяцца галасы.

Чуеш? Гулёна наша з'явілася... Пасварыўся б ты на яе...

Сяргей. А ці варта? Ды і права я такога не маю.

Марфа. Твая дачка?

Сяргей. Мая... Але...

Маша (*убягае*). Татка! Любы мой татка! Цэлы дзень адзін. Ой, якая я дрэнь! Праўда? Давай я цябе пацалую... (*Увайшоў Вадзім.*) Татка, даручаю табе гэтага балбеса. Пайду пераапрануся...

Марфа. Перакусіла б, непаседа.

Маша. Не хачу! Бабуля, ідзі сюды. Чуеш? Ідзі!

Марфа выходзіць следам за Машай. Вадзім топчацца ў дзвярах.

Сяргей. Прысаджвайцеся да стала, малады чалавек. Можа вып'ем? Для знаёмства.

Вадзім. З вамі?

Сяргей. А то з кім жа? (*Выпіваюць.*) Закусвайце, закусвайце.

Вадзім. Дзякую.

Сяргей. Яшчэ па адной?

Вадзім. Яшчэ... А... можа не варта?

Сяргей. Вам больш ідаць.

Вадзім. Тады не варта. Мы з Марго... выбачайце, з Машай у тэатр сабраліся...

Сяргей (*нечакана*). У вас сур'ёзна?

Вадзім. Вы пра што? А? Намёртва. Не верыце?

Сяргей. Я — што? Яна верыць?

Вадзім. Шчыра?

Сяргей. А як вам лепш?

Вадзім. З вамі? Толькі шчыра.

Сяргей. Дзякую за давер.

Вадзім. Ведаеце... І верыць і не верыць!

Сяргей. Чаму гэта так?

Вадзім. Не прыстасаваныя мы з ёю.

Сяргей. Не прыстасаваныя? Да чаго?

Вадзім. Да жыцця. Ну і аглядваемся.

Сяргей. А чаго?

Вадзім. Ды так... Вы не глядзіце, што я такі... (*Зрабіў рух пальцамі.*) Я таксама перажываю. Яшчэ як! Іншы раз аж моташна стане. Бацька пачне сароміць — вочы няма куды дзець. Ну і прыкідваешся гэтакім Пячорыным... Героем нашага часу...

Сяргей. Правільна — не героем?

Вадзім! Які ўжо тут герой! Дзесяць класаў скончыў і стоп! Тата кажа: перад табою ўсе шляхі адкрыты, ідзі!

Сяргей. А ці не так?

Вадзім. Так! Вельмі проста: калі ласка, на завод, дарагі дзесяцікласнічак, мятлу ў рукі і арудуйце са стружкамі!

Сяргей. Што ж тут страшнага?

Вадзім. Страшнага нічога, але і прыемнага мала.

Сяргей. Толькі гультаю праца — непрыемнасць. Гэта так.

Вадзім. Ды я не гультай! Але што рабіць?

Сяргей. Я вам скажу. Скажу.

Вадзім. Буду вельмі ўдзячны за добрую параду.

Сяргей. Трэба мазгі прачысціць. Смецця ў вас там шмат.

Вадзім. Мае мазгавыя звіліны і ў школе, і ў камсамоле чысцілі, чысцілі, а што карысці? Кот наплакаў. Прыкладаў не бачу...

Сяргей. Не хочаце бачыць. Вось жа мой брат Віктар. Ды ці ён адзін працуе на заводзе. Звычайны токар — і шчаслівы.

Вадзім. Кожнаму сваё шчасце.

Сяргей. Бач ты, якая патрабавальнасць! Сустракаў я такіх звышчалавекаў. Толькі ў тых бацькі мільянеры. А ў вас — простыя працаўнікі. Жыць на іх капейкі, бадай, не вельмі прыемна, га?

Вадзім. А я на работу паступаю. У тэатр.

Сяргей. Прызванне?

Вадзім. Неабходнасць. Вы ж самі гаворыце, сорамна жыць на бацькавы капейкі...

Сяргей. Гляджу я на вас, малады чалавек, і ўспамінаю: у вашыя гады мы былі больш сур'ёзныя, самастойныя. Нас менш песцілі, відаць...

Вадзім. Значыць, вы супраць...

Сяргей. Чаму ж? Наадварот. Жаніцеся. Можа вам удваіх лягчэй будзе...

Вадзім. Вы... Вы сур'ёзна?

С я р г е й. Зусім. Калі яна вас кахае...

В а д з і м. Кахае! Кахае! *(Ускочыў з-за стала.)* Ведаеце што... Я пайду. Буду чакаць яе ў пад'ездзе... А вы, калі ласка...

С я р г е й. Ёй сказаць?

В а д з і м. Так! Прашу вас! Вы — сапраўдны чалавек!

С я р г е й *(іранічна)*. Што вы кажаце? Ну, добра. Ідзіце. Чакайце ў пад'ездзе сваё шчасце... *(Вадзім бяжыць з пакоя.)* Дзіцячы сад!

Уваходзіць М а ш а. На ёй белая лёгкая сукенка. І ўся яна перапоўнена радасцю.

М а ш а. А дзе ж мой рыцар?

С я р г е й. Чакае цябе ў пад'ездзе.

М а ш а. Ты... яго прагнаў? Так?

С я р г е й. А трэба?

М а ш а. Як хочаш...

С я р г е й. А ты?

М а ш а. Пераджыву.

С я р г е й. Не кахаеш?

М а ш а. Калі ён дурнем прыкідваецца — не кахаю, а калі раптам задумаецца — кахаю.

С я р г е й. А часта ён задумваецца?

М а ш а. Саромеецца.

С я р г е й. А можа баіцца?

М а ш а. Можа...

С я р г е й. Як жа ты будзеш жыць... з баязліўцам?

М а ш а. А можа ўдваіх мы смялейшыя станем.

С я р г е й. А хіба ты ў мяне таксама баязлівіца?

М а ш а. Таксама, разумееш, задумваюся!

С я р г е й. Задумваешся?.. Скажы шчыра... Чаму табе ў інстытут не паступіць...

М а ш а. З маім атэстатам? Толькі па трупах медалістаў! А іх ведаеш колькі развялося... І ведаеш, татка, прызнаюся табе шчыра. Не хочацца мне больш вучыцца. Ламаносава з мяне ўсё роўна не атрымаецца.

С я р г е й. Дык чаго ж ты хочаш?

М а ш а. Хачу быць толькі маці! І ўсё! Ці не маю права?

С я р г е й. Значыць, замуж закарцела...

М а ш а. Ды не закарцела, стаіць жа над душой. Вось чакае... Што яму адказаць?

С я р г е й. А што табе тваё сэрца падказвае?

М а ш а. Ведаеш, тата, не хачу я свайму сэрцу давяраць. Яно ў мяне дурное...

С я р г е й. А ці будзеш ты шчаслівая?

М а ш а. Не ведаю... Але чамусьці мне здаецца, што гэта прынясе мне спакой... Думала я, думала...

С я р г е й. У такой справе сем раз падумай...

М а ш а. Ды я ўжо сто разоў падумала!

С я р г е й. Ну дык рэж!

М а ш а *(смяецца)*. Каго? Жаніха?

С я р г е й *(смяецца)*. Няхай жыве! Хлопец ён, відаць, неблагі, толькі шмат смецця ў галаве. Ды нічога! Жыццё — добрая мятла. Усё вымеце!

М а ш а. А калі... не вымеце?

С я р г е й. Тады цяжка вам будзе. З жыццём жарты кароткія.

М а ш а. Гэта мяне і палохае...

С я р г е й. Ад цябе будзе шмат залежаць. Трымай яго ў руках!

Маша. Гэта будзь упэўнен! Я за яго вазьмуся — не пікне!

Сяргей (*смяецца*). Не зайздрошчу я твайму рыцару! (*Званок тэлефона, Сяргей бярэ трубку.*) Алё! А, гэта вы... Лёгкі на ўспамін... (*Да Машы.*) Рыцар твой хвалюецца ў пад'ездзе.

Маша. Хай хвалюецца!

Сяргей. Ідзі. Пакутуе хлопец.

Маша. Тата, хадзем з намі ў тэатр! Пасумуем разам, га?

Сяргей. Не, не! Сумуйце без мяне. Дом для мяне самае жаданае месца на зямлі. Ідзі, ідзі!

Цмокнуўшы бацьку ў лоб, Маша выбягае з пакоя. Уваходзіць Марфа Сямёнаўна. Запальвае верхняе святло.

Глядзі ты! Ужо вечар... Як час ляціць.

Марфа. Паляцела птушка? І Віці няма... Усе загулялі! А ты чаго сядзіш у хаце? Вечар такі добры...

Сяргей. Хачу адсядзецца, мама, за ўсе гады.

Марфа. Фу! Замарылася... На сон штосьці хіліць.

Сяргей. А вы ідзіце адпачываць.

Марфа. Віцю дачакацца трэба. На змену выправіць...

Сяргей. Што ён, маленькі? Кладзіцеся!

Марфа. Ну, добра. Захоча чаю — у духоўцы чайнік... Пайду. Трэба Рамана Фёдаравіча накарміць.

Застаўшыся адзін, Сяргей уключае радыё на самае ціхае гучанне. Льецца задуменная мелодыя «Асенняй песні» Чайкоўскага.

Сяргей (*ціха*). Добры дзень, Пётр Ільіч. Вось мы і сустрэліся зноў. Каб вы толькі ведалі, як не хапала вас там, на чужыне...

Віктар (*уваходзячы*). Ты што мармычаш? Молішся?

Сяргей. Малюся, брат мой малодшы! Малюся Чайкоўскаму. А ты дзе бадзяўся?

Віктар. Не бадзяўся, а працаваў, брат мой старэйшы!

Сяргей (*смяецца*). Глядзі, прыесца!

Віктар. Не! У самы смак убіўся! (*Смяецца.*) З заўтрашняга дня пераходжу на першую змену, каб вечары былі свабодныя. (*Глянуў на гадзіннік.*) Ого! Трэба бегчы...

Сяргей. Чай у духоўцы.

Віктар. Які чай! Пазнюся! Да заўтра!

Віктар выходзіць. Сяргей падышоў да акна, звесіўся праз падаконнік, глядзіць на вуліцу. Са спальні выходзіць Раман Фёдаравіч. Ён у сподняй сарочцы і піжамных штанах.

Раман. Адзін ты ў хаце...

Сяргей. Тата... Ці можна табе?

Раман (*бурчыць*). Мне ўжо нічога не можна... Усё забаронена. У арыштанта ператварылі. Дык вось, пакуль уласная міліцыя спіць, крыху пасяджу. Чалавекам сябе адчую. (*Глядзіць на цыгарку ў руках Сяргея.*) Закурыць даў бы...

Сяргей. Нельга табе...

Раман. Ну дык і сам не куры! Не спакушай. (*Сяргей раздавіў акурак аб край попель-*

*ніцы.)* Сынок... Скажы ты мне... Няўжо ўсе гэтыя гады ты сядзеў у лагеры?

С я р г е й. Спачатку трымалі ў лагеры, потым выпусцілі. Бадзяўся, як валацуга, па Мюнхене...

Р а м а н. А жыў як?

С я р г е й. Так і жыў. Рабіў самую брыдкую работу. А потым і яе не стала... Аднойчы ноччу схапілі мяне ў парку эмпі... Так паліцэйскія там завуцца. Месяц трымалі ў адзіночнай камеры, потым зноў выкінулі на вуліцу. А ўжо восень. Хоць ідзі ды кідайся з моста. Можна, я закуру?

Р а м а н. Куры! Куры, сынок.

С я р г е й. Мабыць, і сігануў бы я з моста...

Р а м а н. Што ты, сынок! Чалавек павінен трымацца да апошняга. Вось бачыш жа, вытрымаў!

С я р г е й. Загінуў бы я, калі б не адзін выпадак... *(Задумаўся.)* А мо лепш, каб і не было яго. Адным словам, сустрэўся я з адным знаёмым. Разам у лагеры сядзелі. Таксама беларус, з Магілёва родам. Нядбайла яго прозвішча. Разгаварыліся. Ён і кажа: «Хадзем да нас у ЦАПЭ...»

Р а м а н. А што гэта за ЦАПЭ такое?

С я р г е й. Цэнтральнае аб'яднанне пасляваенных эмігрантаў... Я адмовіўся. А гэты Нядбайла не адстае. Не хочаш, кажа, членам стаць, я цябе прызначу рассыльным пры рэдакцыі часопіса «Свабода». Выдаецца там усялякай друкаванай брыдоты шмат... Не хацеў я. Але і здыхаць ад галадухі таксама не хацелася...

Раман. Вядома, сынок, голад — не цётка. І ніхто цябе не мае права папракнуць...

Сяргей. Ды я рабіў сваю маленькую справу — разносіў розныя паперкі па горадзе і ні ў якую палітыку не лез. Але месяцы праз тры клічуць мяне да самога гаспадара ЦАПЭ Рыгора Клімава... Ён жа і рэдактар гэтай «Свабоды»... Прыходжу ў кабінет. Пачаставаў ён мяне амерыканскай цыгарэтай, аб працы пытае, аб жыцці... Да мяне, гаворыць, дайшлі звесткі, што вы вучыліся на гістарычным факультэце беларускага універсітэта. Кажу — вучыўся. Гэта вельмі добра, кажа. Ці не здолееце вы прачытаць некалькі лекцый для нашых суайчыннікаў па гісторыі Беларусі? Вельмі людзі хочуць паслухаць пра сваю родную старонку. Згадзіўся я...

Марфа (*выглядае з дзвярэй спальні*). А божачка мой! Што гэта ты сабе думаеш? Зараз жа кладзіся ў пасцель! Чуеш?

Раман. О! Прачнулася міліцыя. Іду, іду!

Марфа. Сярожа, кладзіся і ты... Я табе зараз пасцялю.

Сяргей. Я сам! Сам. Не турбуйся.

Марфа. Спакойнай табе ночы.

Сяргей. Табе таксама.

Раман Фёдаравіч і Марфа Сямёнаўна выходзяць. Сяргей пачынае слаць пасцель на тахце. У пярэдняй звініць званок.

Сяргей (*усміхаецца*). Ідзе нявеста...

Сяргей выходзіць і праз хвіліну вяртаецца з немаладым чалавекам, у руках якога невялікі чамаданчык. Госць насцярожана азіраецца. Гэта — Нядбайла.

Н я д б а й л а. Што, не пазнаеш? Няўжо я так змяніўся?

С я р г е й. Нядбайла!

Н я д б а й л а. Ён самы! Прызнаў?

С я р г е й. Ты... адтуль?

Н я д б а й л а. Адтуль, братка, адтуль. Следам за табою пацягнула на радзіму. З вялікімі цяжкасцямі, братка, вырваўся ад іх.

С я р г е й. Ты... сядай! Мо есці хочаш?

Н я д б а й л а. Ад ежы ніколі не адмаўляюся. Ты ж памятаеш, у лагеры... Ежа, братка, галоўны стымул жыцця. *(Са спальні выходзіць Марфа. Нядбайла падняўся.)* Здагадваюся: гэта твая маці.

М а р ф а. Так, маці. Вельмі рада...

С я р г е й. Гэта мой знаёмы... Разам сядзелі ў лагеры, потым па Мюнхене бадзяліся, працу і прытулак шукалі...

Н я д б а й л а. Хапіла гора горкага!

М а р ф а. Дзякуй богу, што вырваліся. Як вас...

Н я д б а й л а. Завуць Іванам. Па-бацьку Пятровіч. І прозвішча — Пятроў. У нас уся вёска — Пятровы...

М а р ф а. Дык вы тут пагутарыце, я вам зараз чаго-небудзь перакусіць...

Н я д б а й л а. Ды вы не турбуйцеся, маці!

М а р ф а. Не, не! У гэтай хаце добрых гасцей заўсёды шануюць.

М а р ф а выходзіць на кухню. Сяргей падазрона глядзіць на Нядбайлу. Той усміхаецца.

Н я д б а й л а. Цябе здзівіла маё новае імя? Так, я вымушан быў змяніць сваё «дзявочае»

прозвішча... Гучыць яно не вельмі мілагучна: Нядбайла... Зусім іншая справа — Пятроў. Га?

Сяргей. І пашпарт у цябе... ёсць?

Нядбайла. А як жа! Гэта я яшчэ не забыў — чалавек у нашай айчыне павінен мець пашпарт. Чалавек без пашпарта — не чалавек. Дарэчы, ты ўжо, вядома, працуеш? Дзе?

Сяргей. Яшчэ не працую. Думаю пайсці на завод...

Нядбайла. Правільна! І мне дапаможаш. Таксама хачу на завод. Дык дамовіліся?

Сяргей. А што я за шышка такая, каб дапамагаць?

Нядбайла. Ты не шышка, дык твой бацька шышка. Ганаровы пенсіянер! Нашчадак вялікай рабочай фаміліі Кацубаў!

Сяргей. Адкуль ты ўсё гэта ведаеш?

Нядбайла. Як адкуль? Сам расказваў. Забыў? Ну, а калі бацьку не хочаш турбаваць, хай дапаможа гэты тып, што тваё месца ў шлюбным ложку заняў... Га?

Сяргей. А гэта адкуль ведаеш? Пра гэта я табе ніколі не расказваў, бо і сам не ведаў...

Нядбайла. А я шмат чаго ведаю. Зразумеў?

Сяргей. Не. Не зразумеў.

Нядбайла. А ты не спяшайся. Не лезь раней за бацьку ў пекла... Вось маці падсілкавацца нясе. Навошта нам на галодны страўнік сур'ёзную размову пачынаць? *(Марфа ставіць патэльню з яечняй на стол.)* Дзякуй, мамаша. Не пашкадавалі для лепшага сябра вашага сына. Бачу, ад усёй душы...

Марфа. Чым багаты, тым і рады. Каштуйце, не саромейцеся.

Сяргей. Маці, ідзі, калі ласка, спаць. Позна ўжо...

Нядбайла. Мамаша! Ідзіце. Ідзіце! Мы ўжо тут самі... Выбачайце за турботы... Вельмі ж хацелася сёння сустрэцца з сябрам. Проста з вакзала да яго.

Марфа. А ў вас сваякоў тут няма?

Нядбайла. Нікога ў мяне няма. Адзін застаўся на белым свеце. Вайна!

Марфа. Дык дзе ж вы прытулак знойдзеце на ноч гледзячы?

Сяргей. Не турбуйся, мама. Я ўсё зраблю. Ідзі. *(Марфа, паглядзеўшы на сына і на яго госця, выходзіць.)* Ну, еш!

Нядбайла. На гэтую справу нас не трэба доўга ўгаворваць.

Нядбайла з прагнасцю налягае на ежу. Сяргей глядзіць на яго. Адышоў да акна. Думае.

Сяргей. Скажы, як табе ўдалося адтуль вырвацца?

Нядбайла. Усімі праўдамі і няпраўдамі.

Сяргей. Хітруеш?.. Кажы шчыра.

Нядбайла. А ты што — пракурор?

Сяргей. А не хочаш шчыра, дык вымятайся. Знаць цябе не хачу.

Нядбайла. Ты не хочаш, а я хачу. Зразумеў?

Сяргей. Патрабуеш?

Нядбайла. Вядома, калі ты не згодзішся па-сяброўску...

Сяргей. Кінь! Які ты мне вялікі сябар?

Н я д б а й л а. Мала я табе дапамагаў там? Га? Кепская ж у цябе памяць. Але калі трэба будзе, я напомню, напомню... Факты вось тут у кішэні. Ты лепш не гарачыся, а падумай як след... Падумай!

С я р г е й. Вось я і думаю... Нездарма ты з'явіўся сюды.

Н я д б а й л а. Вядома, нездарма! Гэта ж мая вялікая радзіма! Сюды так сабе нечага з'яўляцца...

С я р г е й. Хопіць загадак! Што ты ад мяне хочаш?

Н я д б а й л а. Я? Пакуль што нічога страшнага. *(Жорсткім тонам.)* Трэба прыхаваць да часу вось гэты чамаданчык. Зразумела?

С я р г е й. Пайшоў вон.

Н я д б а й л а *(нядобра ўсміхаецца)*. Які зайздросны тэмперамент!

С я р г е й. Вон!

Н я д б а й л а. Ай-ай-ай! Так нявстліва абыходзіцца з дарагім госцем, з чалавекам, які зрабіў шмат дабра... *(Дастае з бакавой кішэні кіпу фотаздымкаў.)* Аб чым сведчаць вось гэтыя фотадакументы... Палюбуйцеся, сэр! Якія прыемныя ўспаміны. Ці не так? Звярніце ўвагу, сэр, вось на гэтага высакароднага джэнтльмена, што стаіць побач з вамі... Ведаеце што гэта за джэнтльмен? Сусветна вядомы Гары Крок, ён жа Вілі Шрайдар, ён жа Гасан-ібн-Зейнаб і яшчэ шмат розных імён... О, гэта вялікі чалавек! Яго ведаюць разведчыкі ўсяго свету. Вы, вядома, здагадаліся, шаноўны сэр, што гэта ў яго шпіёнскай школе вы чыталі свае красамоўныя лекцыі па гісторыі Беларусі. Яны вельмі

былі карысныя, і шэф быў задаволены вамі, сэр... *(Узрушаны Сяргей ірве фотаздымкі.)* Сэр! Якая наіўнасць! Фотаздымкі можна і знішчыць, а як быць са сваім мінулым? Яго вось так не распатроніш! Не-е! *(Іншым тонам.)* Таму ты будзеш рабіць усё, што я загадаю. Зразумеў? Ну! *(Сяргей наступае на яго.)* Што ж, я не варвар. У мяне чулая душа... *(Адступаючы да дзвярэй.)* Даю вам, сэр, дваццаць чатыры гадзіны на вашы ўласныя перажыванні. У наш век шалёных хуткасцей гэта дастаткова, каб прыняць разумнае рашэнне. *(Прыўзняў капялюш.)* Адзью! Заўтра роўна ў дзесяць гадзін раніцы я буду чакаць цябе на вакзале, у рэстаране на другім паверсе... Глядзі, не пазніся! *(Ужо ад дзвярэй.)* Ды не ўздумай ад мяне хавацца! Пад зямлёй знайду.

Нядбайла выходзіць. Сяргей кідаецца да акн глядзіць. Ходзіць па пакоі. Збірае шматкі парван фотаздымкаў. Падышоў да дзвярэй спальні, паслу Дастаў з-пад тахты чамадан, ліхаманкава збірае св рэчы, пхае іх у чамадан. Зноў падышоў да стала, штосьці піша на паперцы, вырванай з блакнота.

Сяргей. Вось і ўсё...

Сяргей доўгім позіркам акідае пакой, гасіць верхняе святло, бярэ ў рукі чамадан і выходзіць. Сцэна нейкі час пустуе. Потым дзверы ціха адчыняюцца, паказваецца вясёлы твар Машы.

Маша *(ціха)*. Спяць! *(Ідзе на пальчыках праз увесь пакой да акна.)* Дурань цара нябеснага. Ідзі дамоў! Што? Ну і стой! Вунь міліцыянер ідзе. Яшчэ падумае, што злодзей пад вокнамі бадзяецца... Што? Запалкі? Зараз пашукаю... *(Падыходзіць да стала, бачыць*

*запіску.)* Што гэта? «Дарагія тата і мама! Дарагая мая дачушка... У імя вашага шчасця я павінен пакінуць вас... Не хвалюйцеся за мяне... Усё будзе добра...» Нічога не разумею! Татка! Што гэта? Чаму?

*Заслона*

# ДЗЕЯ ТРЭЦЯЯ

## Карціна чацвёртая

За акном зіма. Ціхі і сонечны дзень. Чуваць гудок аўтамабіля. У пакоі ўсюды сляды паспешлівых збораў. Марфа Сямёнаўна старанна захутвае шалікам Рамана Фёдаравіча. Доктар Блавацкі стаіць пасярод пакоя і ад нецярплівасці стараецца дапамагчы Марфе Сямёнаўне.

Раман. Адчапіся, Марфа! Што я — дзіця малое? *(Хоча сарваць шалік.)* Што ты мяне хутаеш? Едзем!

Марфа. Без шапкі?

Блавацкі. Ну вось! Цяпер шапку будзем шукаць. *(На вуліцы зноў загудзеў аўтамабіль. Доктар падбег да акна, пагразіў камусьці кулаком.)* Замоўкні! Хочаш штраф атрымаць? Дзе ж шапка?

Марфа. Трымала ў руках... А куды дзела?..

Усе бяруцца шукаць шапку. Раман Фёдаравіч падыходзіць да буфета і пазірае ў каструлю.

Раман *(выцягваючы шапку з каструлі)*. Ты што, варыць яе надумала?

Марфа. Зусім з глузду з'ехала. Гэта ж я збіралася каструлі на кухню занесці...

Раман. Паехалі!

Блавацкі (*мацае ў кішэнях*). Паедзем, калі знайду ключ.

Марфа. Вы стаялі вось тут і круцілі ключ на пальцы. Я добра памятаю.

Блавацкі. Круціў і скруціў.

Раман. Ну і добра. Паедзем аўтобусам. Не прывык я на «Пабедах» раз'язджаць...

У дзвярах з'яўляецца Вадзім. Ён у моднай кароткай куртачцы з вялікім каўняром і ў фетравым зялёным капелюшы.

Вадзім. Продкі! Колькі можна чакаць?

Блавацкі. Згубіў ключ ад машыны... (*Вадзім моўчкі тузае ланцужок з ключом, які вісіць на гузіку доктарскага паліто.*) Гм... Чартаўшчына нейкая. Паехалі!

Усе накіроўваюцца да дзвярэй. Насустрач — Віктар.

Марфа. Вось і Віктар. Хутчэй збірайся. Мы едзем у радзільны дом.

Віктар. Ай-ай-ай! Вось няўдача! Без мяне ўнука прынясуць у дом! Сёння ж прафсаюзны сход. Справаздача таварыша Шаркуна...

Марфа. А без цябе не могуць?

Віктар. Не-не! Я гэтага сходу доўга чакаў! Без мяне ніяк нельга.

Вадзім. Ну, ведаеце, грамадзяне продкі! З такімі зборамі нованароджаны сам продкам стане.

Віктар. Усе бацькі такія нервовыя?

Вадзім. Паспрабуй, будзеш ведаць. (*Выходзіць.*)

Марфа. Абед у духоўцы. Даставай сам. Не перакулі каструльку з малаком. Іду, іду, іду! Ох і нецярплівы ў мяне зяцёк!

Усе пайшлі. Віктар дастае з шафы касцюм, хутка пераапранаецца. Бяжыць на кухню, вяртаецца з каструлькай, таропка есць. Падыходзіць да люстэрка, завязвае на сабе гальштук. У пярэдняй раздаецца званок. Віктар ідзе ў сенцы. Адтуль даносіцца шум вясёлай мітусні.

Віктар (*уваходзіць з двума чамаданамі*). Як хочаш. Хоць ты і брат мой старэйшы, а свіння. Хіба так можна? Паехаў — і ні слыху ні дыху...

Сяргей. Так атрымалася. А дзе ўсе?

Віктар. Толькі што паехалі. А куды — не скажу. Ух, гісторыя! Здзівішся! Не, не! Не прасі. Не скажу. Няхай табе сюрпрыз будзе. (*У дзверы.*) Уваходзьце, чаго ж вы засталіся ў калідоры?

Нядбайла (*з'явіўся ў дзвярах*). Не маю права перашкаджаць радаснай сустрэчы. Сяргей многа гаварыў пра вас.

Віктар. А гэта ён дарма. Ну, уладжвайцеся. Есці хочаце — глядзіце на кухні і ў буфеце.

Сяргей. Ты ўжо ідзеш?

Віктар. Пазнюся! Хлопцы мяне чакаюць...

Сяргей. А што ў вас такое?

Віктар. Сёння Шаркуна перавыбіраем!

Сяргей. Што ты кажаш! Цікава.

Віктар. Ну, я пабег! (*Выходзіць.*)

Нядбайла. Жадаю поспеху на грамадзянскай ніве!

Сяргей. Слухай, Нядбайла, я цябе прасіў трымаць язык за зубамі.

Нядбайла. Сэр, хоць мы і адны ў гэтых камунальных палатах, не называй мяне маім дзявочым прозвішчам. Так, так! Я памяняў яго. Ты існуеш на гэтым свеце з законным пашпартам. А ў мяне...

Сяргей. Пашпарт — ліпа?

Нядбайла. Смярдзючая. Такі паскудны дакумент я ўпершыню нашу ля свайго хворага сэрца. Таму мне хутчэй трэба акапацца на заводзе. Хопіць бадзяцца! І спадзяюся, ты ўжо зразумеў, што ад мяне не схаваешся. Хоць і вялікая наша маці Расія, але схавацца няма дзе. Бо, зразумей, дружа, не адзін я тут. Не-не! Таму я цябе і не баюся. Калі што — усё роўна табе не жыць! Зразумеў? Не баюся я цябе.

Сяргей. Не, баішся. І мяне. І самога сябе. Усяго баішся. А ці доўга можна жыць такім жыццём?

Нядбайла. Што ты клапоцішся аб маім жыцці? Ты аб сваім падумай!

Сяргей. А я думаю. Увесь час думаю...

Нядбайла. Ты думай, думай! Ды толькі памятай — мяне загубіш, сам загінеш. Не, братка, звязаў нас чорт вяровачкай — нікому цяпер не развязаць! Узялі мы, братка, чужую вяроўку ды на сваю шыю! Так з гэтай вяроўкай і жыць трэба...

Сяргей. Не хачу так жыць! Зразумей гэта, калі ў цябе хоць кропля сапраўднага чалавека засталася.

Нядбайла. А калі не засталася?

Сяргей. Ну дык зацягні на сваёй шыі вяроўку гэтую! Не замінай другім жыць!

Нядбайла. Бач чаго захацеў! На ціхае жыццё шмат ахвотнікаў знойдзецца. А ты вось жыві, як лёс табе падказвае. Як абставіны патрабуюць. Прывыкай падпарадкавацца.

Сяргей. Табе?

Нядбайла. А хоць бы і мне. Нада мной жа таксама ўладары ёсць. А як жа! Людзі, братка, дзеляцца на рабоў і ўладароў. Мы з табою рабы.

Сяргей. Не! Я не раб. Гэта ты хочаш зрабіць мяне рабом. Толькі нічога ў цябе не выйдзе.

Нядбайла. А якая табе асалода быць вольным, ды ў труне?

Сяргей. Пакінь мяне палохаць трунай, чуеш? Лепш не дражні!

Нядбайла. А ты мяне не дражні!

Сяргей. А ты адчапіся ад мяне. Ідзі сабе...

Нядбайла. Аб гэтым не можа быць і размовы. Ты павінен мне дапамагаць. І ты будзеш! Памятай, тваё жыццё гэта яшчэ не ўся расплата... Падумай аб сваіх родных. Аб сваім бацьку, маці, брату. Аб сваёй дачцэ...

Сяргей. Змоўкні!

Нядбайла. Гэта калі ласка. Хоць, шчыра кажучы, я супраць маўчання...

Сяргей. А я кажу — змоўкні!

Нядбайла *(знімае паліто і капялюш)*. Мяркуючы па колькасці дзвярэй у калідоры, у гэтым камунальным раі прадугледжаны клазет і ванная? Я з асалодай наведаў бы абодва гэтыя месцы.

Сяргей. Ідзі, ідзі. Хоць там памаўчыш.

Нядбайла. Так, гэта адзінае ва ўсім свеце месца, дзе можна і памаўчаць. *(Выходзіць.)*

Застаўшыся адзін, Сяргей ходзіць па пакоі, мацае рэчы, разглядае фатаграфіі. Убачыў фатаграфію Машы і Вадзіма.

Сяргей. Ах ты разбойніца! Выскачыла ўсё-такі за свайго лыцара. А як жывеш? *(Звоніць тэлефон. Сяргей уздрыгнуў, працягнуў руку да трубкі, але не ўзяў... Званок не змаўкае. Сяргей бярэ трубку.)* Алё... Куды вы звоніце? Так, кватэра Кацубы. Яго няма. А хто гэта пытаецца? Ты, Шаркун? Не пазнаў. Навошта табе стары? Ну, прыехаў, прыехаў. Дзень добры. Навошта табе стары? А што такое? Ну, прыходзь, калі такая пільная патрэба...

Нядбайла *(увайшоўшы, падазрона)*. Тэлефон? Хто?

Сяргей. Прыйдзе адзін знаёмы... Ты пры ім не вельмі язык распускай.

Нядбайла. Наадварот! Зусім наадварот! Поўная ілюзія сумленнага жыцця, да краёў напоўненага гераічнай працай на карысць дзяржаве. Сябры-цалиннікі.

Сяргей. Шэры воўк табе сябар.

Нядбайла. Людзі горшыя за ваўкоў.

Сяргей. Ат! Надакучыла мне гэтая воўчая філасофія!

Нядбайла *(дастае з чамадана закуску, бутэльку віна)*. Не філасофія, а найгалоўнейшы закон жыцця. Сядай, перакусім.

Сяргей. Не хачу.

Нядбайла. А я прагаладаўся.

Сяргей. Закон жыцця... Брэшаш! Няма такога закону. Я цяпер усюды пабываў. Шэф вялікае глупства зрабіў, дазволіўшы нам на яго грошы па Саюзу разгульваць.

Нядбайла. Пашкадаваў яго тугрыкі?

Сяргей. Смяюся з яго глупства. Хіба за свае грошы я змог бы аб'ездзіць усю краіну, паглядзець, як жывуць людзі, як працуюць, што будуюць?

Нядбайла. А вось гэта і цікава нашаму шэфу! На гэта тугрыкаў ён не шкадуе.

Сяргей. Ну і чорт з ім! А толькі жыццё я паглядзеў.

Нядбайла. І што ты ўбачыў?

Сяргей. А тое, што жыццё непераможнае. Зразумеў? Колькі б ні шалелі твае заакіянскія гаспадары, нічога ў іх не выйдзе! Такі народ не зламаць! І не па твайму звярынаму закону жывуць тут людзі, не-е! Яны працуюць не шкадуючы сіл, каб лепш жыць сёння, і жывуць з надзеяй на яшчэ лепшае заўтра.

Нядбайла (*закусваючы*). А як жа! Яны будуюць камунізм.

Сяргей. На жаль, акрамя будаўнікоў камунізма на гэтым богам праклятым свеце існуюць яшчэ і будаўнікі капіталізму.

Званок.

Нядбайла. Чорт вазьмі. Пабіць бы морду за такое нахабства...

Сяргей (*накіроўваючыся ў пярэднюю*). Ідзі ў той пакой.

Нядбайла, паслухаўшы, што адбываецца ў калідоры, ідзе ў спальню і зачыняе за сабою дзверы на ключ. Сяргей вяртаецца з Шаркуном.

Шаркун. Стары мне вельмі патрэбен. Куды яны ўсе пайшлі?

Сяргей. Не ведаю. Віктар не сказаў...

Шаркун. Ну як ты?

Сяргей. Як бачыш...

Шаркун. Дык кажаш — цаліна! Цікава, цікава! Цяпер там снег. Мароз. Завіруха. Бураны. Паэзія!

Сяргей. Паэзія, дык давай! Чаго ж да крэсла прыляпіўся?

Шаркун. Сам я, ці што? Народ! Вось перавыберуць, тады...

Сяргей. Усё-такі могуць! А гаварыў...

Шаркун (*махнуўшы рукой*). Могуць! Усё яны могуць. Сітуацыя змянілася. Памятаеш гісторыю з артыкулам? Артыкул прыйшлося надрукаваць. Я прымушаны быў рэагаваць. Ледзь выкруціўся ад вымовы. А цяпер, мой дарагі сваячок, твой брат Віктар разгарнуў супраць мяне такую кампанію, што добрая палавіна членаў прафсаюза на мяне ваўкамі глядзяць. Глядзі, што могуць з'есці, не дачакаўшыся вынікаў галасавання. Усе чакаюць выступлення Віктара. Падумаеш, аратар!

Сяргей. Няўжо ад яго выступлення так многа залежыць?

Шаркун. А як жа! Час такі. Гуляем, разумееш, у дэмакратыю. Лёс вопытнага, перспектыўнага работніка залежыць ад гарлапана.

Сяргей. Брэшаш! Не ад гарлапана лёс твой залежыць, а ад рабочага чалавека! Ад гаспадара жыцця! Гаспадар жыцця Віктар Кацуба не жадае мець з табою справы. Зразу-

меў? Э, ні чарта ты не разумееш. І вельмі добра будзе, калі цябе з трэскам пракоцяць.

Шаркун. Ну і сямейка! Толькі не выйдзе! Шаркуна голымі рукамі не возьмеш. Ёсць у яго яшчэ порах у парахаўніцы! Мы яшчэ паваюем! *(Выходзіць.)*

Сяргей. Будзеш біты!

Нядбайла *(выходзячы са спальні)*. Бойку ніколі не варта адкладваць.

Сяргей. Ды спі ты!

Нядбайла. Паспрабуй заснуць, калі ў цябе пад бокам б'юцца.

Сяргей. Хто б'ецца?

Нядбайла. Цёмныя сілы. Смешна. Ты так заўзята выкрываў гэтага таварыша, быццам ён кроўны твой вораг.

Сяргей. А калі вораг?

Нядбайла. Тады я табе не зайздрошчу. Шэф не любіць такіх жартаў. На ўсякія душэўныя непаладкі ў яго нюх востры.

Сяргей. А мне напляваць! Мне б толькі разабрацца...

Нядбайла *(схапіў Сяргея загрудкі)*. Ты што задумаў?

Сяргей *(адарваў яго рукі)*. Што задумаў — пры мне.

На вуліцы загудзеў аўтамабіль.

Нядбайла. Хто? Хто пад'ехаў? *(Абодва кідаюцца да акна.)*

Сяргей. Спакойна. Гэта мае... Вунь бацька, маці...

Нядбайла. Спадзяюся, што пры іх ты будзеш паводзіць сябе джэнтльменам... Вазьмі

сябе ў рукі. Чуеш? У нашым становішчы так распускаць нервы...

Сяргей, адмахнуўшыся, ідзе ў пярэднюю. Нядбайла — следам за ім. Сцэна некаторы час пустая. За сцэнай — галасы і шум сустрэчы. Каця і Сяргей уводзяць Рамана Фёдаравіча. Яму млосна, але стары трымаецца. Следам ідуць Марфа Сямёнаўна і Нядбайла, які ўвесь час імкнецца дапамагчы весці Рамана Фёдаравіча. Апошнім пляцецца, падвыпіўшы, з блазнаватаю ўсмешкаю Вадзім.

Давайце вашу шапку. *(Бярэ з рук Рамана Фёдаравіча шапку.)*

Раман *(глядзіць на Сяргея)*. Прыехаў... Што ж ты, га? Мы хвалюемся тут, а ад цябе ні слыху ні дыху...

Марфа. Адзін ліст напісаў, ды і ў тым адрас свой прыпісаць забыўся. Ці ты на нас злуешся за што, сынок?

Раман. Дык сказаў бы... А так хіба можна?

Сяргей. За што ж мне крыўдаваць на вас?

Нядбайла. Пасаромце, пасаромце яго! Заслужыў. Гаварыў яму: напішы дамоў. Паабяцае і забывае. Яно, вядома, вольнага часу там мала. Працы шмат. Асабліва для тых, хто ідзе наперадзе мас... *(Асекся, злавіўшы позірк Сяргея.)* Саромце яго, саромце!

Вадзім. Падумаеш, пісьмы! Хто цяпер піша пісьмы! Перажытак. Можна ж па тэлефоне...

Марфа. А ты памаўчы. Па тэлефоне... Сам ты гэты самы перажытак і ёсць.

Вадзім *(жартуючы)*. Паважаная пра-прабабуля! Дазвольце вам заўважыць, што я ця-

пер сам бацька і ў свой адрас крытыкі не пацярплю.

Р а м а н. Бацька... *(Хоча прысесці на крэсла.)* Такога б бацьку...

К а ц я. Вам трэба легчы...

Р а м а н. Дай жа з сынам пагутарыць.

С я р г е й. Вы кладзіцеся, і пагутарым...

*С я р г е й і К а ц я адводзяць Р а м а н а Ф ё д а р а в і ч а ў спальню. Захапіўшы графін з вадою, следам спяшаецца М а р ф а С я м ё н а ў н а. Нядбайла, жмурачыся, нядобрымі вачыма разглядае Вадзіма.*

Н я д б а й л а. Дык вы ўжо шчаслівы тата, аказваецца? Па старарускаму звычаю з вас належыць!

В а д з і м *(дастае з кішэні паліто бутэльку).* Усё прадугледжана.

Н я д б а й л а. Вы — свой у дошку! Я рад сустрэць вас на сваім цярністым шляху. *(Раскладае закусь.)* Прашу! Вып'ем за здароўе новага грамадзяніна, законнага нашчадка адной шостай часткі свету! Выбачайце, род нованароджанага?

В а д з і м. Хлопчык! Во мужчына! Чатыры кіло дзвесце грамаў, як у аптэцы!

Н я д б а й л а. Хлопчык, гэта добра. Мы таксама былі хлопчыкамі. Вып'ем за хлопчыкаў, пакуль яны хлопчыкі. Калі яны вырастуць, не заўсёды хочацца за іх піць...

В а д з і м. Вып'ем. *(П'юць.)*

Н я д б а й л а. Другую — за прыемнае знаёмства!

В а д з і м. На брудэршафт, га?

Н я д б а й л а. Ёсць прапанова выпіць на брудэршафт. Хто «за»? *(Абодва падымаюць ру-*

*кі.)* Хто «супраць»? Няма. Хто ўстрымаўся? Няма. Прымаецца аднагалосна. Дэмакратыя! *(Выпіваюць.)*

Вадзім *(закусваючы).* Ну, як там наша гераічная цаліна?

Нядбайла. Дыхае.

Вадзім. Ты па якой частцы штурмаваў?

Нядбайла. Культурна-масавая.

Вадзім. Дык мы калегі! Я працую ў тэатры.

Нядбайла. Артыст? Я так і думаў...

Вадзім. Сказаў! Артыст цяпер апошняя асоба ў тэатры. Я — упаўнаважаны па распаўсюджванню білетаў.

Нядбайла. Працвітаеш?

Вадзім. Дзе там! Тая ж цаліна. Адных народных — шэсць штук. Паспрабуй, пракармі такую зграю. Пры нашым рэпертуары. А хто гэта робіць? Мы! На нас трымаецца тэатр! А нас не цэняць.

Нядбайла. Трымайся, брат! Мастацтва патрабуе ахвяр.

Вадзім. За мастацтва!

Нядбайла. Можна. За яго ўжо столькі выпіта, што наша кропля не пашкодзіць.

Вадзім *(разглядаючы Нядбайлу).* А ты стыльны! *(Узяў за адварот пінжака.)* Ад той мамы?

Нядбайла. Толькі — ша! Ёсць сякія-такія знаёмствы...

Вадзім. Пазнаём, га? Пазнаёміш? Па-сяброўску!

Нядбайла. Добра. Толькі — ша!

Вадзім. Магіла!

Н я д б а й л а. Замётана. Фінансы дазваляюць?

В а д з і м. Чэсна? Фінансы пяюць рамансы. Прыйдзецца зноў прасіць доўгатэрміновую пазыку ў майго старога.

Н я д б а й л а. Не трэба турбаваць старых. Пад маё слова можна і без грошай... Будзеш часткамі выплачваць...

В а д з і м. Ну-у! Здарова! Дамовіліся?

Уваходзіць М а р ф а С я м ё н а ў н а, шукае штосьці ў буфеце.

М а р ф а. І куды я сунула гэты валідол?

В а д з і м. Паважаная, самая старажытная мая сваячка! Прашу выпіць!

М а р ф а. Хопіць піць!

В а д з і м. За маю жонку — за нашу каралеву Марго і нашага наследнага прынца...

М а р ф а. Ну, панёс! Што з табою, баламутам, зробіш. За праўнука вып'ю!

М а р ф а С я м ё н а ў н а прыгубіла чарку, узяла карабок з парашкамі і пайшла ў спальню.

В а д з і м. Продкі. Можна цярпець. Бываюць, ведаеш, якія? А ў мяне, бачыш, якія карцінныя? Гістарычныя тыпы.

Н я д б а й л а. Штосьці гэтыя гістарычныя тыпы не вельмі цябе шануюць.

В а д з і м. А я пляваў! Цешча мяне паважае. Марго мяне кахае. Кропка! А ведаеш, якая яна разумная? Якая прыгожая! *(Сарваў са сцяны фота.)* Вось! Каралева, га?

Н я д б а й л а. Упаўне. Шкада, без трона.

В а д з і м. Эпоха! *(Уключае прыёмнік.)* Паслухаем музычку...

Каця *(выглянула з дзвярэй спальні)*. Вадзім! Не шумі. Прашу цябе.

Вадзім. А, цешча! Жадаю выпіць з уласнай цешчай! *(Каця зачыніла дзверы.)*

Нядбайла. Не жадае.

Вадзім. Не жадаюць! Так. Ага. Нас не жадаюць. Тады пойдзем, дзе нас жадаюць. Пайшлі! Не пашкадуеш. *(Абодва апранаюцца.)* Я табе кажу — не пашкадуеш.

Нядбайла. Трэба папярэдзіць...

Вадзім. Цешча! Ну! Не чуюць. Гу-та-раць. Ці-ха!

З перабольшанай асцярожнасцю, расставіўшы рукі, на дыбачках ідзе да дзвярэй. Нядбайла — следам. Уваходзяць Сяргей і Маша.

Сяргей. Дачушка мая мілая! Вось ты і маці... А я дзед. *(Пакланіўся.)* Дзякуй табе! Ад шчырага сэрца...

Маша. Татка! Скажы... Чаму ты паехаў ад нас? Мне так цябе не хапала гэты час. І мамка без цябе вельмі сумавала. Яна ж цябе кахае! Толькі аднаго цябе... Ты больш не паедзеш ад нас?

Сяргей. Эх... Каб ты ведала, як мне хочацца быць разам з вамі! Ніколі не пакідаць родны дом...

Маша. Больш мы з мамкай нікуды цябе не пусцім!

Сяргей. Ну, як ты жывеш са сваім рыцарам?

Маша. Добра! Ён мяне паважае, слухаецца. Вось толькі работа яго мне не падабаецца. Абяцаў пакінуць і знайсці добрую пасаду... Ён

вельмі змяніўся... Хоць і дурэе іншы раз... Хлапчо!

С я р г е й. Маці! Мая Маша маці!

М а ш а. О, я зусім цяпер іншая! Нават сама сябе не пазнаю. Як успомню, якой цацай была — не верыцца! Мо гэта ўжо старасць, ці што?

С я р г е й (*смяецца*). Далёка табе яшчэ да старасці... Ну, вядома, крыху пасталела...

М а ш а. Вось падрасце мой хлопец, і пайду я працаваць на завод. Раней баялася, а цяпер лепшага месца і ўявіць сабе не магу... Ляжала я ў палаце, і там усе заводскія былі... Якія гэта жанчыны! І не ўсім жывецца лёгка, дзе там! Паверыш, мне сорамна стала, што год таму назад я шмат чаго не разумела...

С я р г е й. А калі б людзі адразу ўсё разумелі, дык вельмі б сумна было. Жыццё вучыць. А бывае і мучыць...

М а ш а. Татка! Не муч ты сябе. Усё будзе добра. Вось паглядзіш. Мамка цябе любіць. Толькі клікні — на край свету за табою пойдзе.

С я р г е й. У яе ёсць муж...

М а ш а. Татка! Ты ж нічога не ведаеш... Яны жывуць у розных пакоях... З таго дня, як ты прыехаў... Шаркун толькі прасіў яе, каб не адразу ў суд... Усё чакаў перавыбараў. Кажа, не выберуць больш. Зноў у цэх трэба будзе ісці. Усё спачатку пачынаць. Тады, кажа, і разыходзіцца будзем... Бо я табе не пара, кажа. Быццам маме вельмі патрэбна была яго пасада...

С я р г е й. Усё гэта, дачушка, больш складана...

М а ш а (*прыслухалася*). Ой! Плача! Ты

чуеш, які галасісты? Іду, іду, крыкунчык мой дарагі! *(Паспешліва ідзе ў спальню. Насустрач ёй — Каця.)*

Каця. Бяжы, бяжы, дачушка. Толькі не перакармлівай...

Сяргей. Як бацька?

Каця. Спіць. Не трэба было браць яго з сабою...

Марфа *(уваходзіць з кухні)*. Як жа! Утрымаеш яго!

Каця. Дзе ж мой зяцёк? Дзе шчаслівы бацька?

Сяргей *(спалохана)*. Дзе? Дзе яны? Я і забыў пра яго... Дзе гэты... Дзе госць? Куды яны пайшлі? *(Кінуўся да дзвярэй.)* Іх трэба вярнуць...

Марфа. Чаго ты хвалюешся? Маленькія яны, ці што? Ну, выпілі лішку, хай праветрацца...

Каця. Гэты твой таварыш... Не надта прыемны тып. Лепш пабыць без яго ў гэтыя хвіліны. Дзень які ў нас сёння!

Сяргей *(разгублена ўсміхаецца)*. Сапраўды... Мая Маша маці... *(Заглянуў у адкрытыя дзверы спальні.)* Мая дачка корміць свайго сына! Сон нейкі... Не верыцца... Пацеха!

Марфа. Вам, мужчынам, пацеха, а нам — турботы. Кацюша, ты пасядзі, а мне ў аптэку трэба...

Марфа Сямёнаўна выходзіць.
Каця падышла да акна, прыціснулася лбом да шкла.

Сяргей *(са штучнай бесклапотнасцю)*. Што засумавала, бабуля?

Каця *(яму ў тон)*. Нявесела, дзядуля.

Паўза.

Сяргей *(збянтэжана)*. Та-ак... Вось мы з табою дзядуля і бабуля...

Каця *(павярнуўшыся да яго, рэзка)*. Ты чаго вярнуўся?

Сяргей *(разгубіўся)*. Я думаў...

Каця. Падобна на тое, што ты развучыўся думаць. Не, я не пра сябе. Пра мяне ты можаш не думаць. Але ў цябе дачка. Родная. Яна любіць, верыць і паважае цябе. А ты паехаў, нават не развітаўшыся... Божа мой, як ты змяніўся!

Сяргей. Ты толькі цяпер заўважыла?

Каця. Пакінь гэты тон! Як не сорамна? Ты ніколі не крыўляўся...

Сяргей *(горка смяецца)*. А ўяві сабе, што я і цяпер не крыўляюся. Што тады?

Каця. Цябе ніхто не прымушаў вяртацца зноў.

Сяргей. Ты... выганяеш мяне?

Каця. Ты сам ідзеш ад нас.

Сяргей. Каця... Паслухай! Паслухай...

Каця. Я слухаю... Сяргей! Гавары...

Сяргей. Можаш ты яшчэ крыху пацярпець?

Каця. А што зменіцца?

Сяргей. Ты мне абяцай, абяцай пачакаць. Я прашу цябе, Каця...

Каця. Я столькі чакала... Мне не прывыкаць.

Сяргей. Прабач мне за ўсё. Можаш?

Каця. Ці магу я? Ах, Сярожа... *(Уваходзіць узбуджаны і вясёлы Віктар.)* А вось і Віця, слаўны наш...

Сяргей. Мы ўжо бачыліся. Ну, як?

Віктар. Парадак, Каця! Можаш павіншаваць мяне. Разлажыў твайго шаноўнага мужа на абедзве лапаткі. Радуйся!

Марфа *(увайшла следам за Віктарам)*. Вось узрадаваў! *(Працягвае Кацы кулёчкі.)* Трымай. Тут прысыпка. А вось соска на ўсякі выпадак... Ды ты не хвалюйся, дачушка! Без працы не пакінуць...

Каця. Хоць дадому не вяртайся...

Віктар. А чаго ты?

Каця. Ах, абрыдла яго вечнае ныццё...

Марфа. Заставайся ў нас... Месца хопіць.

Каця. Не, паеду. Трэба ехаць. *(Хутка выходзіць.)*

Сяргей *(задуменна)*. Значыць, правалілі Шаркуна...

Віктар. З трэскам!

Марфа. Чаго ж ты радуешся? Як жа яны цяпер на адну Кацііну зарплату?!

Віктар *(абхапіўшы маці за талію, кружыць)*. Ох і жаласлівая ты ў нас! Усіх ты шкадуеш, за ўсіх заступаешся.

Марфа. Пусці, разбойнік! І адкуль у цябе толькі сіла бярэцца? Ля станка змену адстаіць, на сходзе да ночы...

Віктар. У мяне цяпер сіл удвая прыбавілася! Таму — паверыў у сілу сваю, маці. Віцька Кацуба — токар вышэйшага разраду — усё можа! Усё!

Марфа. Сядай, чай пі, а я спаць пайду.

Віктар. Правільна! Ідзі спаць. Спі спакойна, наша маці! Ды не глядзі ты на мяне так...

Марфа. Вось дурань! *(Усміхнулася.)* І ўсе вы ў мяне такія. *(Выходзіць.)*

Сяргей. Значыць, зляцеў Шаркун?

Віктар *(сеў за стол, п'е чай)*. Зляцеў! Добры сход быў! Мне гэтыя сходы раней — во! *(Чыркануў рабром далоні пад падбародкам.)* Усё стараўся як бы змыцца. А сёння зразумеў — вялі-і-ка-я сіла наш сход!

Сяргей. Слухай, Віктар... А што, калі я да вас на завод папрашуся — возьмуць?

Віктар. Вядома! Давай да нас у цэх! Будзем разам працаваць. Я цябе такарнай справе навучу. Здорава, га?

Сяргей. Угаварыў. А нашто мяне ўгаворваць? Можа для мяне гэта самае вялікае шчасце, стаць ля станка і працаваць. Ты што ж мне пра ўнука адразу не сказаў?

Віктар. Сюрпрыз! Вось табе і Маша!

Бярэ з этажэркі згорнутыя ў трубку чарцяжы і накіроўваецца да дзвярэй.

Сяргей. Ты куды?

Віктар. Пайду да Сашкі Скакуна. Усё роўна спаць не хочацца... Пасядзім, памазгуем над сваім рацыяналізатарствам. Ну, добрай табе ночы.

Сяргей. А-а... якая яна добрая...

Застаўшыся адзін, Сяргей у хваляванні прайшоўся па пакоі. Пастаяў ля акна, узіраючыся ў цемру. Схапіў сваё паліто, стаў паспешліва апранаць яго. Пайшоў да дзвярэй, але дзверы адчыніліся і на парозе з'явіўся Н я д б а й л а.

С я р г е й (*злым шэптам*). Ты? Як ты ўвайшоў?

Н я д б а й л а. А я думаў, усе ўжо спяць. Не хацеў турбаваць.

С я р г е й. Як ты адчыніў дзверы?

Н я д б а й л а. Хіба гэта праблема ў наш час?

С я р г е й. Дзе быў?

Н я д б а й л а. У розных месцах, сэр.

С я р г е й. Ты што задумаў, агідная твая душа? Нашто табе Вадзім?

Н я д б а й л а. Чыста сяброўскія пабуджэнні. Хлопчыку цяжка жыць. Яго запатрабаванні перараслі яго магчымасці. Супярэчнасць!

С я р г е й (*наблізіўся да Нядбайлы ўшчыльную*). Ты пакінеш Вадзіма ў спакоі. Пакінь Вадзіма! Чуеш?

Н я д б а й л а. Мне патрэбны людзі. Жывыя людзі. Са слабасцямі і недахопамі, з радзімымі плямамі капіталізму. Ты можаш гэта зразумець? Мне патрэбны жывыя людзі!

С я р г е й. Не крычы. Людзі спяць.

Н я д б а й л а. Так, спяць! У мяккіх пасцелях, на чыстых просцінах. Спяць спакойна, не ўздрыгваюць у сне і не прахопліваюцца ад самага нязначнага шораху...

С я р г е й. Баязлівец! Падлюга!

Н я д б а й л а. Так, я баязлівец! Некалькі разоў на дзень я паміраю ад страху. Я адчуваю сябе трупам. Я бачу сябе ў сырой магіле і адчуваю, як магільная тля жрэ маё цела. Але ведаеш, што я табе скажу: ты таксама труп. І не прыкідвайся, калі ласка, жывым. Не ашуквай сябе. Кінь свае перажыванні. Прадалі мы ду-

шу д'яблу, і няма нам вяртання на чыстую зямлю. Няма! *(Бярэ чамадан.)* Я пакідаю твой сямейны рай. Мне тут агідна. *(Ад дзвярэй.)* I запомні: вяртання няма! *(Пайшоў.)*

Сяргей *(адзін)*. Брэшаш, гад! Я вярнуся. Няхай мёртвым, але вярнуся. Я вярнуся! Чуеш? *(Хутка апранаецца.)*

*Заслона*

# ДЗЕЯ ЧАЦВЁРТАЯ

## Карціна пятая

Нядзеля. У пакоі адзін Сяргей. Ён стаіць ля радыёпрыёмніка. Гучыць усхваляваны, хрыплаваты голас: «...затым нас павезлі ў Данцыг. Змясцілі ў загарадным доме. Дом стаяў у вялікім парку, які быў абнесен высокай каменнай сцяной. За гэтай сцяной пратрымалі нас два месяцы. Нас добра кармілі, прымушалі займацца фізкультурай. Асабліва боксам і стральбой з пісталета. Кожны дзень нас наведвалі розныя людзі. Прозвішча свайго яны ніколі не называлі, прадстаўляліся як госці гаспадара дома. Яны прыносілі нам газеты на рускай і беларускай мовах. Памятаю, што ў гэтай бібліятэцы было некалькі экземпляраў кнігі «Мая барацьба» Гітлера на рускай мове. «Госці» падоўгу гутарылі з намі. Размовы звычайна вяліся вакол Савецкага Саюза. Асабліва цікавіліся яны тымі месцамі, з якіх мы былі родам. Мы хутка зразумелі, у якую страшэнную пастку трапілі. Адзін з нашых таварышаў паспрабаваў вырвацца з гэтай пасткі і быў забіты, як потым пісалі ў газетах, пры невядомых абставінах. Хутка нас усіх перапраравілі ў Мюнхен і прызначылі ў разведвальную школу. Так стаў я здраднікам сваёй Радзімы. Стаў ім у выніку прымусу амерыканскай ваеншчыны».

У пакой уваходзіць Віктар. У руках у яго баксёрскія рукавіцы. Сяргей выключае радыё.

Віктар. Што там? Зноў шпіёны каюцца?

Сяргей. Куды сабраўся?

Віктар (*узмахнуў баксёрскімі рукавіцамі*). На трэніроўку.

Сяргей. Зноў пацягнула?

Віктар. Ага! Крыўдна, разумееш, кідаць. Трэба ж расквітацца. І наогул, у жыцці можа спатрэбіцца. Мне ж восенню ў армію.

Сяргей. Як? Табе ўжо ў армію?

Віктар. А што? Чым не салдат? А ну, станавіся ў пазіцыю!

Сяргей. Хочаш? Ну, трымайся...

Сяргей і Віктар пачынаюць бой. Сяргей дакладным прафесіянальным ударам б'е Віктара. І той кулём коціцца ў кут. Здзіўлена глядзіць на Сяргея. Падымаецца, паціраючы пабітыя мясціны.

Віктар. Ух ты, чарцяка! Спрытна! Дзе ж ты навучыўся?

Сяргей. Навучылі...

Віктар. Сяргей! Разыграем штуку! Ідзём са мною. Я скажу трэнеру, што ты першы раз. А навічку ён перш за ўсё дае дыхту, каб, значыць, меў уяўленне, на што ідзе... А ты яму і змажаш пару разоў, га? Вось смеху будзе! Пайшлі! Ну што за радасць у нядзелю сядзець дома?

Сяргей. Няма часу. Пільная справа ёсць.

Віктар. Добра. Сядзі. Я пайшоў. Кацьку чакаеш? Так бы і сказаў...

Хітра падміргнуўшы, Віктар выходзіць. Сяргей, пачакаўшы, пакуль бразнулі ў пярэдняй дзверы, зноў

уключыў прыёмнік... Але перадаецца ўжо музыка. Велічныя гукі паланеза Агінскага напаўняюць пакой. Сяргей ніцма кідаецца на тахту. Са спальні выходзіць Раман Фёдаравіч. За апошні час згорбіўся, калматая галава пабялела.

Раман. Разбегліся? А ты зноў дома...

Сяргей. Вам трэба ляжаць.

Раман. Не пад сілу. Ляжаць чалавеку цяжэй за ўсё, аказваецца. *(Прысаджваецца да стала, падсоўвае слоік з кветкамі.)* Бач, якія вясёлыя! Зямлёй пахнуць. Хто ж гэта прынёс кветкі! Акрамя Каці, аматараў у нас...

Сяргей. Гэта Каця прынесла.

Раман. Каця! Ці даўно бегала такая даўганогая дзяўчынка з касічкамі, а цяпер, бач, якая важная дама... Доктарка! Свавольніца была дзяўчынка! Ад вас, хлапчукоў, не адставала... *(Павярнуў галаву, слухае.)* Прыгожая музыка... Цяпер я часта музыку слухаю. У доме цішыня — Віктар на заводзе, маці ў магазін пойдзе,— а я адзін і слухаю... Іншы раз так за сэрца возьме, паверыш, аж слёзы выступаюць... Да таго хораша! Гэта хто прыдумаў такую музыку?

Сяргей. Кампазітар Агінскі. Называецца — паланез.

Раман. Паланез. Прыгожае слова. Сяргей, а яшчэ такая чартаўшчына са мною робіцца. Гаварыць мне хочацца. Усё жыццё маўчальнікам быў, слова з мяне абцугамі не выцягнеш, а то хачу гаварыць, і кропка. Адзін я ў доме. Дык, паверыш, сам з сабою пачынаю размаўляць. Відаць, зусім стары Кацуба, дурнець пачаў... Яно ўжо і час! Час! Хоць наша кацубаў-

ская парода вельмі жывучая, а хварэць нада-кучыла...

Званок. Сяргей ідзе ў сенцы і вяртаецца з Кацяй. Дапамагае зняць светлы макінтош, беражліва вешае яго на спінку крэсла.

Каця. Што гэта такое? Зараз жа ў пасцель! Зараз жа! (*Дапамагае Раману Фёдаравічу.*) Ох і дагуляецеся вы ў мяне! Дальбог, пакладу ў бальніцу.

Раман. Эх, шкада, што ў маленстве крапівой цябе не частаваў. Усё ж цяпер было б лягчэй такую катаргу пераносіць...

Каця вядзе Рамана Фёдаравіча ў спальню. Сяргей падыходзіць да люстэрка, зачэсвае ўскудлачаныя валасы. Задумлівы, падыходзіць да акна. Каця выйшла са спальні, ціха падыходзіць да яго. Маўчанне. Каця працягнула руку, каб пагладзіць Сяргея па валасах, але ён зварухнуўся, і яна імгненна адхапіла руку, быццам апяклася.

Сяргей. Гэта праўда, што Шаркун...

Каця. Так. Учора прыслаў па рэчы...

Сяргей. Як жа ты цяпер?

Каця. Як раней. Ты ж нічога не ведаеш... Ніхто не ведае. Мы ўжо даўно жывём паасобку. Ён утойваў. Аўтарытэт, бачыш, баяўся падмачыць. Я таксама маўчала...

Сяргей. Як ты магла?

Каця. А чаму не магла?

Сяргей. Ты ж была такая...

Каця. Якая? Скажы... Ну, якая?

Сяргей. Ты была незвычайная.

Каця. Не, Сяргей. Я была, як усе, звычайная. Проста мы кахалі адзін аднаго... А можа

і не было ніякага кахання. Адна дзіцячая гульня ў каханне... Мо кахалі мы адзін у адным тое, чаго на самай справе ў нас і не было. Выдумалі саміх сябе...

Сяргей. А калі гэта і ёсць каханне?

Каця. Не! Цяпер я ведаю — не! Каб пакахаць, не трэба нічога выдумляць. Кахаеш чалавека, які ён ёсць... І гэта сапраўднае каханне. Сярожа, скажы, чаму мы з табой такія нешчаслівыя?

Сяргей павярнуўся да Каці, узяў яе за плечы, уважліва глядзіць у твар. Яна пакорліва замерла ў яго руках.

Сяргей. Што табе трэба для шчасця?

Каця. Вельмі мала. Можа і многа. Не ведаю...

Сяргей. Калі б ведаць!

Каця. Хіба ты не бачыш, Сяргей, хіба ты не бачыш?

Сяргей. Я баюся гэтаму верыць. Цяпер я баюся.

Каця. Я разумею. І нічога ад цябе не патрабую. Нічога не навязваю. Бачыш, я спакойная. Мне не сорамна. І не балюча. Я ведала, што мне ўжо не прабіцца да твайго сэрца.

Сяргей. А навошта гэта табе?

Каця. Што ты гаворыш?

Сяргей. Я не хачу рабіць табе горка, зразумей.

Каця. Горка? Мне ўсё роўна, кахаеш ты мяне ці не, зразумей! Я ведаю, ты жывеш на зямлі, ты тут, побач... Больш мне нічога не трэба.

Сяргей. Калі б ты ведала, як балюча мне слухаць усё гэта!

Каця. Але чаму? Чаму?

Сяргей. Я не маю права на каханне. Маё каханне прынясе табе гора! Я не хачу гэтага.

Каця. Але чаму гора? Каханне — гэта шчасце. Гэта заўсёды шчасце. *(Сяргей застагнаў ад нейкага ўнутранага болю.)* Я яшчэ да твайго ад'езду заўважыла. Цябе штосьці мучыць. Сярожа, даверся мне. Я нічога не баюся. І ты не бойся. Я гатова на любую ахвяру.

Паўза.

Сяргей. Ну, Каця, ведай, ты ўзяла на сябе вялізную ношку. Ты будзеш несці яе адна. Табе ніхто не паможа. Толькі ты адна. Зусім адна...

Каця. Я гатова. Мы разам...

Сяргей. Мяне не будзе. Ты застанешся адна.

Каця. Гавары. Няхай будзе самае страшнае...

Сяргей. Самае жудаснае. Каця, перад табой першай я вымаўляю ўголас гэтыя страшэнныя словы... Слухай жа, Каця. Я здраднік Радзімы. Перад табою вораг.

Паўза.

Каця. Як жа гэта?

Сяргей. Цяпер я сам часта пытаюся ў сябе: як жа гэта магло здарыцца? Але гэта здарылася...

Каця. Не гавары! Не трэба!

С я р г е й. Мае мазгі атручвалі агіднай хлуснёй, плявалі ў душу. Яны хацелі хутка пазбавіць нас веры і ў Радзіму і ў саміх сябе... Там я ўсімі сродкамі цураўся гэтых прайдзісветаў. Яны дабраліся да мяне ўжо тут, на Радзіме... Цяпер я разумею, чаму яны лёгка адпусцілі мяне дамоў... Я хацеў уцячы... Але не здолеў. І вось я праехаў амаль па ўсяму Савецкаму Саюзу. Быў на цаліне, на Каховскім моры, на будаўніцтве Брацкай ГЭС... Я зноў бачыў наша жыццё, памяць аб якім так старанна хацелі выбіць з маёй галавы. Я ўбачыў наша жыццё яшчэ прыгажэйшым за тое, якое я памятаў. І мне стала страшна... Я павінен узняць руку на гэтае жыццё, на жыццё майго народа, маіх блізкіх і родных... Я вярнуўся ў Мінск з цвёрдым намерам прызнацца ва ўсім уладзе. Але калі зноў убачыў сваіх: цябе, Каця, хворага бацьку, пастарэлую маці, брата Віцю, калі ўбачыў Машу, маю дарагую дачку, і яе дзіця, майго ўнука, які яшчэ нічога не разумее, але ўжо чалавек,— я не здолеў... Мужнасць яшчэ раз здрадзіла мне...

К а ц я. Не гавары так! Нашы людзі не звяры. Шчырае раскаянне яны прымуць. Прымуць! Павер! Скажы, Сярожа... Ты ўжо... Ну...

С я р г е й. Я разумею, Каця. Не, ад мяне яшчэ нічога не патрабавалі. Нічога! Але разумееш... я звязаны з чалавекам, які дзейнічае... Ён тут, у Мінску... Ён знік. Калі я не затрымаю яго, мне няма з чым вяртацца. Ён вельмі небяспечны.

К а ц я. Ты павінен усё расказаць. Ты сёння ж, зараз пойдзеш і ўсё раскажаш... Вось

так, як расказаў мне. І не бойся. Нічога не бойся! Нам усім будзе цяжка. Вельмі цяжка. Але ты не маеш права больш ашукваць сваю Радзіму і ўсіх нас. Ты не маеш права маўчаць!

Сяргей. Дзякую табе, Каця! І што б са мною цяпер ні здарылася, я буду думаць, што ты верыла мне... Верыш?

Каця. Веру. І калі ты кахаеш мяне, не апагань гэтую веру. Ты сам цяпер ведаеш, як гэта страшна.

Сяргей. Я абяцаю табе. Ты... будзеш чакаць мяне?

Каця. Я ўжо дачакалася! Ты назаўсёды са мною. Назаўсёды, што б ні здарылася...

Сяргей. Можна цябе пацалаваць? (*Беражліва цалуе ў лоб.*) А цяпер ідзі. Ідзі, Каця. Я пабуду адзін. Падрыхтуюся...

Каця. Добра. Я пайду... Да пабачэння, Сярожа.

Павольна ідзе да дзвярэй. Павярнулася, глядзіць на Сяргея.

Сяргей. Да пабачэння, Каця. Я хачу спадзявацца...

Закрыўшы твар рукамі, Каця выбягае з пакоя. Сяргей імгненне стаіць нерухома, потым кідаецца да тахты, падымае верх, выцягвае чамадан і з ліхаманкавай паспешлівасцю выкідвае з яго проста на падлогу пачкі грошай, скрыначкі, флаконы, мініяцюрны фотаапарат. Загортвае ўсё выкінутае ў газеты. З бакавой кішэні дастае маленькі браўнінг, правярае яго... У гэты момант у сенцах шчоўкнуў замок. Сяргей здрыгануўся і паспешліва схаваў браўнінг у кішэню. Уваходзіць Маша. У яе на руках загорнутае дзіця. Твар яе страшны — ён

быццам застыў, акамянеў. Вочы ззяюць дзвюма цёмнымі бяздоннымі ўпадзінамі. Яна глядзіць прама перад сабой, але нічога не бачыць. Марфа Сямёнаўна, якая ўвайшла следам, асцярожна, нібы сляпую, вядзе яе да тахты, усаджвае.

Марфа. Вось мы і дома. Дай малога. Пакладзем на ложак, няхай спіць, дзіцятка... Маша, дай мне дзіцё...

Маша (*прыціскаючы да сябе дзіця*). Не дам! Гэта мой. Сыночак мой... Не дам! Яго не дам! Хопіць... Гэта мой! Мой!

Сяргей. Што з ёю? Маша! Што здарылася?

Маша. Не трэба, не трэба! Ён мой!

Марфа. Машанька, гэта ж тата. Не пазнала? Ты паглядзі. Твой тата. Ну, дай дзіцё...

Маша. А, тата... Мілы мой тата... А я гляджу — хто гэта?

Марфа Сямёнаўна ўзяла дзіця і панесла яго ў спальню. Маша плача.

Сыночак мой...

Сяргей (*схапіўшы яе за рукі*). Маша! Супакойся! Машанька! Дачушка мая... Што здарылася? Скажы, што здарылася?

Маша (*глядзіць на Сяргея*). Што здарылася? Так. Здарылася. Татачка, мілы... Вадзіма... Мужа майго...

Сяргей. Забілі!

Маша. Ты ўжо ведаеш... Вось і ўсё... Удава я, татка. Гэта ты можаш зразумець?

Сяргей. Калі гэта... адбылося? Дзе?

Са спальні выходзяць Марфа Сямёнаўна і Раман Фёдаравіч.

Марфа. Яго знайшлі сёння раніцаю за горадам, на шашы...

Сяргей. Яго забіла машына? Так? Машына?

Маша. Татка... Якая машына? Я бачыла. Я ўсё бачыла. У яго прастрэленая галава. І на валасах... вось тут... кроў. Кроў! *(Рыдае.)* А твар... Твар белы, зусім белы. І вочы расплюшчаныя... Глядзіць, як жывы. Вочы ясныя такія, чыстыя. Я ніколі не бачыла... Ці, мо, увагі не звяртала. Вочы і вочы... Татка! Ведаеш, апошнія дні ён хаваў ад мяне вочы... Хаваў! Чаму? Чаму ён хаваў вочы? *(Крычыць.)* Чаму ён хаваў вочы?

Сяргей. Дзе ён... цяпер?

Марфа. Павезлі ў бальніцу ўскрываць. Вось яно як — увечары на сваіх нагах пайшоў, а раніцаю павезлі.

Раман. Дзе мой пінжак?

Марфа. Ты што выдумаў?

Раман. Пінжак!

Марфа. А божачка ты мой! Ну куды ты спяшаешся? Доктар абяцаў заехаць. І ўсе паедзем...

Маша. Паедзем? Куды? Туды? Я не паеду! Не паеду! Я баюся.

Марфа. Ты адпачні. Не бойся. Пойдзем. *(Вядзе Машу ў спальню.)*

Раман. Што ж гэта робіцца на белым свеце, га? Што ж гэта вы, маладыя, робіце?

Уваходзіць Віктар. Спыніўся на парозе. Шпурнуў у кут баксёрскія рукавіцы. Падышоў да тахты, сеў побач з Сяргеем.

Віктар. Цёмная гісторыя. На мінулым тыдні гулялі мы ў парку з Сашам Скакуном.

Зайшлі ў «Лета». Селі за столік. Гляджу — у кутку састаўленыя сталы, сядзіць за імі цёплая кампанія. Вадзім убачыў мяне, падсеў. П'яны, ледзь языком варочае. Пачаў несці бязглуздзіцу. Нічога я не разумеў, але адну фразу запомніў. Ён яе ўвесь час, як папугай, паўтараў. «Капут,—кажа,— Вадзьку. Заблытаўся Вадзька». Я кажу: ніякая халера цябе не возьме. А ён раптам быццам цвярозы стаў. Глядзіць на мяне такімі вачыма і кажа: «Возьме! І хутка». Сказаў і пайшоў...

Марфа (*пад канец расказу Віктара яна выйшла са спальні*). А Маша мне таксама скардзілася, што з Вадзькам штосьці робіцца незразумелае... Учора ён прызнаўся ёй, што вінен вялікую суму грошай. Гэтыя грошы трэба аддаць, інакш будзе вельмі дрэнна.

Сяргей. Каму ён вінен?

Марфа. Маша таксама дапытвалася — не прызнаўся. Пасварыліся яны... Пераапрануўся ён у свой лепшы касцюм, пагаліўся і кажа Машы: «Бывай. Можа, не вярнуся...» (*У сенцах званок. Віктар ідзе адчыняць.*) Машу шкада... Усё-такі кахала яна...

Раман. Шалапут. У яго на лбе было напісана, што блага скончыць...

Марфа. Позна цяпер асуджаць, Рамаша...

Уваходзіць Блавацкі. Моўчкі кіўнуў галавой у знак прывітання. Цяжка апусціўся на крэсла пасярод пакоя. Маўчанне.

Блавацкі. Маша ў вас?

Марфа. Спіць.

Блавацкі. Яго прывезлі ўжо дадому...

Сяргей. Доктар, як гэта здарылася?

Блавацкі. Недарэчнае жыццё, недарэчная смерць... Хтосьці страляў у яго. З далёкай адлегласці прама ў скроню. Куля замежнага паходжання.

Сяргей. Дзе яна?

Блавацкі. Забраў следчы. А сына няма. Застаўся я адзін. Назаўсёды.

Марфа. Чаму ж так гаворыце, доктар? У вас унук... Людзі свае вакол...

Блавацкі. Так, так. Людзі... *(Устаў.)* Пойдзем? *(Да Рамана Фёдаравіча.)* А вам Раман Фёдаравіч, не варта...

Раман. Паеду. Нічога...

Марфа. Віця, дапамажы бацьку...

Усе пайшлі. Сяргей кідаецца да акна, глядзіць. Потым таропка збіраецца: апранае пінжак, правярае ў кішэнях дакументы. Падыходзіць да тэлефона, здг. трубку і пачынае набіраць нумар. Нячутна ўвахс Нядбайла. Паўза.

Нядбайла. Я бачыў, твае ўсе паехалі...

Сяргей *(насоўваючыся на Нядбайлу)*. Навошта ты гэта зрабіў?

Нядбайла *(істэрычна)*. А што я павінен быў рабіць? Што? Гэта ж такі гад! Рашыў мяне абвесці вакол пальца... Прыкідваўся піжонам, свойскім хлопцам, а як дайшло да справы, дык ледзь не здаў у лапы следчых. Ну і народ! Гэта ж трэба, Нядбайлу магло правабіць такое шчанё! Дык што мне было рабіць? Што? Не было ж ніякага выбару: ці я, ці ён! Я, вядома, рашыў, што лепш я, чым ён... Я больш пакутаваў на гэтым праклятым свеце,

каб так, ні за панюшку тытуню, аддаць богу маю шматпакутную душу... Не-е! Я абараняў сваё жыццё! Зразумеў? Ты што? Ты што? Здурэў? Нам неабходна зараз жа змотваць вуды. Трэба знікаць, пакуль не позна! Пойдзем!

Сяргей. Нікуды мы не пойдзем!

Нядбайла. Ты што задумаў? Ідыёт! Думаеш, даруюць? Крэцін! Балда цара нябеснага! У гэтай краіне ніколі не даруюць. Чуеш? Ніколі! І помсцяць аж да сёмага калена. Я ведаю! На сабе адчуў. Павер... Пойдзем! Трэба ...утчэй выбрацца з горада... Паедзем на поўнач. Там спакайней...

Сяргей. Нікуды мы больш не паедзем. Хопіць! Наездзіліся.

Нядбайла. Ты што? Звар'яцеў? Га?

Сяргей схапіў Нядбайлу. Ён вырваўся з рук Сяргея. ...уся да дзвярэй. Сяргей следам. Барацьба. Жорст... ...асмерць. Сяргей зверху. Б'е некалькі разоў Ня... Той слабее.

...яргей падняўся, цяжка дыхае. Падыходзіць да тэлефона і рашуча набірае нумар.

Сяргей. Мне дзяжурнага... Таварыш дзяжурны? Слухайце... На кватэры па Даўгабродскай, дом 7, кватэра 5, затрыман невядомы... Што? Так, так, падазроны... Добра, буду чакаць. *(Апусціў трубку.)*

Сяргей стаіць, падняўшы галаву, нібы да чагосьці прыслухоўваецца. У пакой уваходзіць Каця. Кідаецца да Сяргея, абдымае яго.

Каця. Сярожа! Дарагі мой! Усё будзе добра! Я з табою... Усё будзе добра...

Яны стаяць, моцна абняўшыся, напружана прыслухоўваючыся. Вось к дому пад'ехала машына. Чутны крокі... Рэзкі, патрабавальны званок. Сяргей і Каця зрабілі крок насустрач.

*Заслона*

# ЛЮБОЎ, НАДЗЕЯ, ВЕРА...

*Драма ў трох дзеях*

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Час
Вера
Любоў
Надзея
Васіль Корань
Сяргей Зорын
Ганна Корань
Іван Кісялёў
Аляксей Каляда
Мікола Лыкаў
Сямён Гальчэня
Нюра Люцікава
Акуліна Нічыпаровіч
Жора Цуканаў
Дэраш
Жур
Хлопцы, дзяўчаты, рабочыя.

*Падзеі адбываюцца ў нашы дні на будаўніцтве хімічнага камбіната.*



# ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

Ноч. Зорнае неба. Далёка, да ледзь акрэсленай лініі гарызонта, бяжыць роўная шырокая дарога — светлы шлях, які вядзе нас у прыгожае заўтра. Яркія сузор'і зіхацяць над дарогай з крыштальным звонам, і ў бязмежных прасторах, нібы з электронных апаратаў, нараджаецца дзіўная, незвычайная мелодыя. Мелодыя шырыцца, і ў яе ўліваюцца знаёмыя гукі — пазыўныя Спадарожніка. І тады даносіцца голас Часу...

Час. Вы чуеце? Гэта ў прадонні сусвету б'ецца стальное сэрца нябеснага цела, зробленага, закінутага ў касмічныя вышыні тваім геніем, слаўны савецкі чалавек. Слухай жа голас Спадарожніка! Сёння гэта мой голас, голас Часу. Чалавек! Я выклікаю цябе на душэўную і сур'ёзную размову...

Узнікаюць фігуры Зорына і Любы. Яны стаяць побач і глядзяць на зоркі.

Люба (*нечакана*). Загадай жаданне!

Зорын (*здзіўлена*). Якое жаданне?

Люба. Згарэла...

Зорын. Што згарэла?

Люба. Зорачка.

Зорын. Дзівачка. Гэта ж была твая зорачка. Сама б і задумвала.

Л ю б а. Пакуль збярэшся з думкамі, зорачка і згарыць.

З о р ы н. Ты, відаць, зашмат чакаеш ад жыцця.

Л ю б а. О, калі б спраўдзіліся ўсе мае мары!

З о р ы н. Мары часта астаюцца марамі.

Л ю б а. Але ж можна жыць і аднымі імі.

З о р ы н. Вось я і кажу — фантазёрка ты.

Л ю б а. Табе гэта не падабаецца?

З о р ы н. Шчыра сказаць?

Л ю б а. А ты можаш быць і няшчыры?

З о р ы н. Я ж чалавек! Звычайны мужчына... Зямны, жывучы, хоць у партызанах жыццём і не даражыў. Я ніколі не адрываюся ад нашай матухны-зямелькі. А ты... Ты ўвесь час дзесьці там, у паднябессі.

Л ю б а. Дык падыміся да мяне!

З о р ы н *(уздыхнуў)*. Вельмі ж цяжкі груз мінулага нясу я праз жыццё...

Паўза.

Л ю б а. Ты думаеш пра яе?

З о р ы н. Не магу не думаць! Яна ж ні ў чым не вінаватая.

Л ю б а. Ну і думай! *(З іроніяй.)* Ці ж я маю права забараніць?

З о р ы н. А калі б магла — забараніла б?

Л ю б а. Не ведаю... Я ведаю толькі адно: люблю, люблю, люблю! І калі гэта эгаізм, чым жа я вінавата? *(Памаўчаўшы.)* Вось яшчэ зорачка ўпала... Не глядзі на мяне так! Я не люблю, калі мяне вывучаюць... *(Раптам з напеўнай інтанацыяй пачынае чытаць вершы.)*

О, не гляди так легко и приветно!
Я так боюсь забыться как-нибудь.
Твоей души мне глубина заветна,
В свою судьбу боюсь я заглянуть...

Зорын. Хто гэта?

Люба. Фет.

Зорын (*задуменна*). «В свою судьбу боюсь я заглянуть...» Не! Не трэба баяцца! Трэба смела ісці насустрач свайму лёсу.

Люба (*з надзеяй*). Тады вазьмі мяне з сабою на будаўніцтва! Вазьмі!

Зорын. Ты ж вучышся!

Люба. Няміла мне ў інстытуце, нецікава... Сяргейка! Мілы! Я хачу быць з табою, толькі з табою!

Зорын (*цвёрда*). Гэта немагчыма. Зразумей жа, Люба!

Люба (*у роспачы*). І гэта наша апошняя ноч?

Зорын. Ноч канчаецца. Глядзі, світае... Скончылася ноч!

Люба (*глядзіць на неба*). Не... Для мяне яна толькі пачынаецца... Завязаў ты мне белы свет. (*Плача.*)

Зорын. Люба, дурненькая, не трэба... Хадзем! Мяне ўжо чакаюць... Хадзем... (*Выходзяць.*)

Уваходзіць Жора Цуканаў. У руках у яго стары пацёрты чамадан і гітара. Спыніўся, глядзіць на дарогу.

Жора (*сеўшы ўскрай дарогі і разглядваючы дакументы*). «Дадзена гэта пасведчанне

гр. Цуканаву Георгію Мікалаевічу ў тым, што ім закончаны шасцімесячныя курсы шафёраў і тарыфікацыйнай камісіяй Дзяржаўнай Аўтаінспекцыі нададзена яму...» *(Сунуў дакумент у кішэню курткі.)* Будзь здароў, гр. Цуканаў, не кашляй. Прывет! Руль у рукі — і газуй! Дарожка роўная, жыццё крывое! *(Узяў гітару і з фальшывым надрывам спявае.)*

Ходзіць Гамлет з пісталетам,
Хоча сам сябе забіць.
І стаіць пытанне прад Гамлетам:
Быць альбо не быць?..

Але-е... Быць альбо не быць? Вось у чым пытанне. Начхаць! Пражывём! *(Падхоплівае чамадан, ускідвае гітару на плячо. Азірнуўся, уздыхнуў, памахаў рукой і знік.)*

Убягае Вера. На ёй чорны шынель фабрычна-заводскай вучаніцы, на пышных залацістых валасах — чорны берэт.

Вера. Вось яна, дарога! Роўненькая, простая! Па такой ісці ды ісці! Далёка-далёка!

Каляда *(ідзе следам, накульгваючы, абапіраючыся на палку)*. Не вельмі радуйся, сястрычка. Яна хоць і простая, але ісці па ёй цяжка. Сцеражыся, каб не збочыць.

Вера. Добры мой брацік, ты за мяне не бойся. Вера Каляда не збочыць. Ніколі! Хапіла мне гора сіратою гадаваўшыся, а цяпер можна і парадавацца!

Каляда. Цяпер мы будзем разам. Дай руку. Вялікая справа чакае нас. *(Узяўшыся за рукі, выходзяць.)*

Уваходзяць К о р а н ь і Г а н н а. Абое задуменныя, маркотныя. Спыняюцца, глядзяць, як на ўсходзе разгараецца неба.

Г а н н а. Сядзем пасядзім... *(Садзяцца.)*

К о р а н ь. Вось я думаю, чаму нам так часта прыходзіцца развітвацца. Гады ж ідуць...

Г а н н а *(уздыхнуўшы)*. Ідуць...

К о р а н ь. Жыць бы і працаваць разам... Каб ведаў, што ты такая, не жаніўся б.

Г а н н а *(усміхаецца)*. А мне здаецца, што толькі таму і жаніўся. Ты лепш глядзі Любу, нешта яна зусім ад рук адбілася. Думкі дзявочыя — цёмны лес.

К о р а н ь. А скажы, хто за намі глядзеў? Нічога, скончыць інстытут, пачне працаваць, дарогу знойдзе.

Г а н н а. Ох, боязна мне за яе!

К о р а н ь. А я за яе зусім спакойны.

Г а н н а *(дакараючы)*. Ты за ўсіх спакойны... Мне гаварылі, што ў міністэрстве амаль усе супроць Зорына і толькі ты адзін заўзята яго бараніў. А калі падвядзе? Кіраўнік ён яшчэ малады, гарачы...

К о р а н ь. Але здольны. І не адзін жа ён на будаўніцтве. Такую гвардыю туды рушылі. Хі-мі-я. Слова ж якое!

Г а н н а. І Дэраш даў згоду к Зорыну намеснікам?

К о р а н ь. А што яму аставалася рабіць? Няхай дзякуе і за гэта... А вось табе, Ганначка, можна было б...

Г а н н а. Не-не! Сам гаворыш — вялікая будоўля. І для ўрача там месца знойдзецца.

К о р а н ь *(замілавана)*. Эх, старэнькая мая энтузіястка! Як убачыў цябе першы раз стрыжанай у юнг-штурмаўцы на камсамольскім суботніку, такой ты і асталася на ўсё жыццё...

Г а н н а. І ты для мяне не змяніўся. *(Абняліся.)*

К о р а н ь. Што ж гэта Люба позніцца?

Г а н н а. Можа яна і не прыйдзе?..

К о р а н ь. Чаму?

Г а н н а. Ёсць прычына...

К о р а н ь. Значыцца, гэта праўда?

Г а н н а. Праўда.

К о р а н ь. Што ж ты мне раней не гаварыла?

Г а н н а. Я сама не ведала.

К о р а н ь. А! Мімалётнае захапленне. Ён паедзе на будоўлю, а яна агледзіцца — і пройдзе гэты чад.

Г а н н а. Можа... Але ж хочацца, каб яна была шчаслівая.

К о р а н ь. Шчасце... А ведаеш, што ў наш век трэба для сапраўднага чалавечага шчасця? Любіць, спадзявацца і верыць.

Г а н н а *(задумаўшыся)*. Любоў, надзея, вера...

Г о л а с Ч а с у. Любоў, надзея, вера...

У музыцы тэма Часу. Спачатку гучыць яна ў струнных інструментах. Мякка, лірычна. Потым чуваць некалькі глухіх, трывожных акордаў, але іх перамагае светлая, радасная мелодыя. Корань і Ганна глядзяць на дарогу.

І вось дарога нібы знікае ў прасторах Часу. Усходзіць сонца. Сціхае музыка. Паступова вырысоўваюцца контуры інтэрната будаўнікоў хімкамбіната. Хоць ён

ужо і заселен, але не закончан. У кутку прасторнага вестыбюля яшчэ стаяць сталюгі: ён пабелены толькі напалавіну. Мэбля расстаўлена абы-як, відаць, нядаўна прывезлі, частка яе яшчэ не распакавана. Вокны без фіранак. Замест іх — старыя пажаўцелыя газеты. А за вокнамі шырока раскінулася вялікая будаўнічая пляцоўка.

Ноч, але на мачтах гараць пражэктары, чырвоным колерам выбліскваюць сігнальныя агні на стрэлах будаўнічых кранаў — работа не спыняецца і ўночы. І таму, што за вокнамі жывы, кіпучы свет, тут, у вестыбюлі марнедабудаванага інтэрната, асабліва непрытульна і маркотна. Ледзь відна ў змроку лесвіца на другі паверх, цьмяная лямпачка гарыць толькі пад лесвіцаю — тут адгароджаны куток для дзяжурнага. Цёмна ў двух пакоях інтэрната, размешчаных па правы і па левы бок вестыбюля. За бар'ерам, палажыўшы галаву на край стала, моцна храпе А к у л і н а. Стукае маятнік сценнага гадзінніка. Цішыня і спакой. Але вось з другога паверха сходзяць уніз н е к а л ь к і х л о п ц а ў з чамаданамі і куфэркамі. Спыняюцца сярод вестыбюля, азіраюцца, нібы развітваючыся з тым месцам, дзе яны жылі некаторы час. Настрой у іх пануры, прыгнечаны.

М і к о л а *(з няшчырай бесклапотнасцю)*. Бывайце здаровы, жывіце багата, а мы ўжо...

С я м ё н. Ціха ты! Спяць жа...

М і к о л а *(зірнуўшы на Акуліну)*. А ёй хоць з гарматы над вухам страляй... Цётка Акуліна!

А к у л і н а *(прачынаючыся)*. Чаго табе?

М і к о л а. Спіш ты, цётка, як пшаніцу прадаўшы!

А к у л і н а. А ну цябе, баламут... Чаго вы сярод ночы?

М і к о л а. На шпацыр сабраліся, цётачка.

А к у л і н а. Э-э! Уцякаць надумаліся... Ну і чорт вас бяры! Без вас спакайней будзе.

*(Шпурнула ключы на стол.)* Можаце!.. На ўсе чатыры бакі!.. Летуны бессаромныя...

Сямён *(бярэ ключ)*. Не лайся, цётка... І без цябе моташна. *(Да хлопцаў.)* Пайшлі!

Хлопцы кіруюцца да дзвярэй. На лесвіцы з'яўляецца Кісялёў. Ён без рэчаў, пінжак вісіць на плячы.

Кісялёў. Стойце, хлопцы!

Хлопцы аглядваюцца на Кісялёва.

Пачакайце!

Сямён. Што ж гэта ты? Познімся!

Кісялёў *(спускаючыся ўніз)*. Хлопцы... Не магу!

Сямён. Ты што? Сам жа...

Кісялёў. Сам! А не магу. Учора першая шахта соль пачала даваць. Падумаць трэба, хлопцы.

Сямён. Мы падумалі. А от пра нас не падумалі. *(Падыходзіць да Кісялёва.)* Іван, друг... Ты што ж гэта? Пакідаеш нас?

Кісялёў. Я сур'ёзна.

Мікола *(вывернуў кішэні)*. Які ж тут сур'ёз, калі ў кішэні вецер гуляе?

Па лесвіцы спускаецца Дэраш і падыходзіць да хлопцаў, следам за ім бяжыць трушком заспаны Жур. Дэраш дастае з фрэнча, накінутага на сарочку, грошы і працягвае іх Міколу, які ўсё яшчэ выварочвае пустыя кішэні.

Дэраш. На! Трымай!

Мікола. Міласціны не бяру.

Сямён. Не строй з сябе дабрадзея, начальнічак!

Кісялёў. Доўга думаў, таварыш Дэраш?

Жур *(да Дэраша)*. Ён, ён... Сам чуў, як дамаўляліся. Брыгадзір, называецца. Анархія!

Мікола. Сам ты анархія!

Кісялёў. Не задзірайся, Мікола.

Дэраш. Дурні. *(Стукае ў пакой да Зорына.)* Спіш, таварыш Зорын? Салодкія сны бачыш? Уставай!

Акуліна *(уздыхае)*. Хоць бы далі падрамаць чалавеку. А другой гадзіне лёг.

З'яўляецца Зорын.

Зорын. Што такое?

Мікола. Глядзі! Не разумее.

Сямён. Прыкідваецца.

Дэраш *(да Кісялёва)*. Гавары, куды народ вядзеш?

Кісялёў. На станцыю.

Мікола. Пакрыўджаны рабочы клас.

Дэраш *(гнеўна)*. Рвач ты, а не рабочы клас.

Кісялёў. Таварыш намеснік, гэта вы дарэмна. Я ў сваёй брыгадзе рвачоў не трымаю.

Сямён. А ну іх! Хадзем, хлопцы!

Зорын. Што такое, пытаю?

Дэраш. Працаваць не хочуць. Гультаі, абібокі!

Сямён. Гэта мы гультаі?! Ты работу давай!

Зорын. Работы непачаты край!

Кісялёў. Вось што, начальнік. Не магу я ў вочы хлопцам глядзець. Механізмы прастойваюць. Грошай у хлопцаў ні капейкі.

Сямён *(да Зорына)*. Таварыш начальнік, дазвольце запытацца. Колькі вы ў гэтым месяцы пецi-мецi агрэблі?

З о р ы н (*ухіляючыся*). Колькі належыць, столькі і агроб.

С я м ё н. А іменна? Колькі соцень?

З о р ы н. Ну-у... дзве.

С я м ё н. Чулі, грамадзяне рабочы клас?

К і с я л ё ў. І мы б маглі, каб быў толк на будоўлі.

М і к о л а. Гэта каб быў толк, а раз яго няма — адлічылі мне адзінаццаць рублікаў, нават за бяздзетнасць не ўзялі. Па такім заробку жыў будзеш, а дзяцей...

С я м ё н. Такія грошы я дзе хочаш зарабіў бы.

Д э р а ш. Па доўгі рубель прыехаў?

С я м ё н. А што? Стымул!

Д э р а ш. Будаўнікі, называецца. Цьфу! Распуста! Прывыклі на гатовенькае.

С я м ё н. Вербавалі — горы залатыя абяцалі...

З о р ы н. Няпраўда! Не абяцаў я залатых гор, а стварыць іх клікаў!

Д э р а ш. А каб стварыць, папацець трэба.

С я м ё н. Пацеем! Толькі ад бязладдзя.

М і к о л а. Клуб абяцалі. А ён вышэй фундамента ніяк падняцца не можа.

Д э р а ш. Клуб! Падумаеш,— праблема!

М і к о л а. А што? Мне і клуб і народны тэатр трэба. А як жа! Я ж табе не лапцюжнік які-небудзь, а кваліфікаваны рабочы... Дрэнныя вы арганізатары, вось што я вам скажу, таварышы начальнікі.

Д э р а ш. А гэта не тваіго розуму справа. Смаркач ты яшчэ вучыць. Ці абсохла малако на губах?

Кісялёў. Вось што, таварышы начальнікі! У вас свой розум, а ў нас свой. Савецкі Саюз вялікі. І работы — абы толькі ахвота!

Дэраш. Вось і будуй камунізм з такімі кісялямі.

Зорын. Слухайце, хлопцы, ну чаго вы? Давайце па-добраму.

Кісялёў. А табе, таварыш Зорын, скажу — чалавек ты можа і добры. А толькі нецікава мне з табой будаваць. Уткнуў вочы ў зямлю і далей свайго носа не бачыш. Не па сіле ношу на сябе ўзваліў. Мая брыгада калісьці грымела! А цяпер... Ганьба!

Зорын. Чакайце, чакайце... Таварышы!

Дэраш. А я кажу — даволі ліберальнічаць! Слухай, Кісель...

Кісялёў. Між іншым, прозвішча маё — Кісялёў. Іван Мацвеевіч Кісялёў. Вось так. Бывайце здаровы.

Мікола. Жывіце багата!

Хлопцы выходзяць. Прыкрае маўчанне. Кісялёў, махнуўшы рукою, ідзе следам за хлопцамі. Жур шмыгануў на другі паверх. Зорын і Дэраш астаюцца адны.

Дэраш. Ты бачыў? Зусім ад рук адбіўся народ. Як яны з намі гаварылі! Гэта ж развал, поўны развал! А ты, таварыш Зорын, не ў той бок гнеш. Няма ў цябе хваткі.

Зорын (*насмешліва*). А што, калі сапраўды няма?

Дэраш. Раз начальнікам прызначылі, павінна быць.

Зорын. І што ты раіш?

Дэраш. Быць строгім і рашучым. Мы як

будавалі? Гадамі ў зямлянках жылі. Кавалак звычайнага мыла — самая высокая прэмія за ўдарную работу! І цярпелі!

Зорын. Цяпер жа не той час!

Дэраш. І цярпелі!..

Трывожна завыла сірэна. Усе насцярожыліся.

Акуліна. А божа! Няўжо бяда якая?

Дэраш. Не каркай!

З вуліцы ўбягае Каляда. На ім інжынерская куртка. Ён цяжка дыхае. Хоча нешта сказаць і не можа. Зорын хапае яго за грудзі.

Зорын. Што здарылася?

Каляда. Прарвала!.. Плывуны!.. Шахту залівае...

Зорын. Якія плывуны? Чаму прарвала?

Каляда. Хутчэй!.. Не пытайся... Потым!

Зорын. Гавары, душа з цябе вон! За праходку ты адказваеш, у цябе і пытаюся!

Каляда. І адкажу, калі вінаваты. Трэба людзей... і доктара.

На лесвіцы з'яўляюцца Ганна і Жур.

Ганна. Я тут!

Зорын (*спужаўшыся*). Як? Ёсць ахвяры?

Каляда. Калі няма, дык могуць быць. Гэта ж... стыхія!

Ганна. Я зараз! (*Бяжыць наверх.*)

Зорын (*разгублена*). Што ж гэта такое? Я ж кожны цюбінг сам праверыў, са штрэкаў не вылазіў...

Каляда. Кажу, стыхія! (*Да Жура.*) Слухай... Як гэта ў пакоі да дзяўчат прабрацца?

Жур. Што гэта табе раптам... да дзяўчат?

Каляда. Ідзі ты к чорту! Сястра зусім голая... Прыбегла проста з танцулек у лёгенькай сукенцы і ў шахту кінулася... Адзежу б ёй якую...

Акуліна. Хадзем!

Акуліна адчыняе пакой дзяўчат і заходзіць туды разам з Калядой.

Дэраш (да Зорына, шматзначна). Усё гэта звенні аднаго ланцуга. Май на ўвазе...

Зорын. Ох, разарву я гэты ланцуг, разарву! *(Спяшаецца да выхада.)*

Дэраш *(услед)*. Пазнавата рваць сабраўся. *(Выходзіць.)*

Інтэрнат апусцеў. Дзверы адчынены насцеж, і на парозе з'яўляецца Люба з чамаданам у руцэ.

Люба *(агледаючыся)*. Людзі! Хто тут ёсць? Нікога. Як у лесе. Адзін гэты дом на чалавечае жыллё падобны... і ні душы. Я да людзей, а яны ад мяне. *(Глядзіць у акно.)* Світае. *(Пазяхнула.)* Фу! Спаць хочацца страшэнна. *(Апускаецца ў крэсла, мармыча.)* Палову жыцця спім і ніяк адаспацца не можам... Якое глупства!

Акуліна *(з'яўляючыся з калідора)*. А божа! І як улезла? *(Бярэ Любу за плячо.)* Эй, грамадзянка! Прыехалі!

Люба *(расплюшчыўшы вочы)*. Прыехалі? Куды?

Акуліна. А табе куды трэба?

Люба. Сюды.

Акуліна. Камандзіровачная?

Люба. Не.

Акуліна. Па камсамольскай пуцёўцы?

Люба. Не. Сама па сабе.

Акуліна. Цяпер так не бывае. Аслабані жылплошчу. Тут толькі для начальства і перадавікоў. Бач, расселася! Не для цябе мэбля!

Люба. А куды ж мне?

Акуліна. У кантору ідзі. Начальства разбярэцца. Ездзяць тут усякія фіфы. Круцьверць хвастом і — фью! Толькі яе і бачылі. Адна цякучасць праз вас...

Люба. Цякучасць? Якая цякучасць?

Акуліна. Цякучасць кадраў. Вось якая. Дзе твае рэчы? Памагу да парога данесці.

Люба. Нікуды я адсюль не пайду. Мне патрэбен начальнік будаўніцтва таварыш Зорын.

Акуліна. А ты хто яму?

Люба (рашуча). Хто? Жонка.

Акуліна (*недаверліва*). Жонка? (*Прыглядаецца.*) Я ў яго пакоі кожны дзень прыбіраю. На стале фатаграфія ў рамцы. Аніколечкі не падобна!

Люба. Змянілася, відаць.

Акуліна. Бывае, бывае... І мяняюцца, і мяняюць. Толькі без яго я цябе ў пакой усё роўна не пушчу.

Люба. А я і не спяшаюся. Дзе ў вас памыцца можна?

Акуліна. Хадзем пакажу.

Люба дастае з чамадана ручнік, ідзе следам за Акулінай. З вуліцы ўваходзіць Жур. На твары ў яго давольная, яхідная ўсмешачка.

Ж у р. Вось гэта факцікі! Як ні прыкінь, а Зорыну труба. Разгільдзяйства — раз, недагляд — два, бяздушнасць да людзей — тры... Таго трошкі, таго трошкі — і анкета на ўсё астатняе жыццё сапсаваная. Ай-яй-яй! Квартальны план усяго на сорак тры працэнцікі, дзяржаўныя грошыкі замарожаны... матэрыялаў няма, рабочыя ўцякаюць. Ай-яй-яй! Што робіцца! Труба! Капцы на месцы! Нядоўга ён будзе мяне ў чорным целе трымаць. А калі Цімафея Фядотавіча начальнікам прызначаць, бо каго ж больш? То пойдзе ў гору і таварыш Жур. Пойдзе!

З вуліцы ўваходзіць Ж о р а Ц у к а н а ў, адзеты з прэтэнзіяй на франтаватасць. У зубах папяроса.

Ж о р а *(нядбайна махнуўшы рукою)*. Былой наменклатуры — наша персанальнае!

Ж у р *(хмурачыся)*. Трапло ты пустапарожняе. І як гэта цябе начальства цярпіць каля сябе?

Ж о р а. Узаемна. Яно мяне, а я яго. *(Нахіліўся, ціха.)* У багажніку ваша кантрабанда, грамадзянін быт.

Ж у р *(паспешна)*. Цвікі?

Ж о р а. Першага гатунку. Хоць у труну заганяй. Цэлая скрынка.

Ж у р *(нездаволена)*. Начарта мне скрынка! Я ж прасіў...

Ж о р а. Буду я на драбязе пэцкаць сваё крыштальна чыстае сумленне. Кепска вы ведаеце Жору Цуканава, будучы грамадзянін падсудны. І, між намі, дзяўчаткамі, кажучы, тугрыкі на бочку.

Уздыхнуўшы, Жур дастае кашалёк, корпаецца ў ім, працягвае Жору грошы.

Усяго?

Ж у р (даючы яшчэ некалькі паперак). Грабіш, Цуканаў! Бязбожна грабіш!

Ж о р а. Вы ж, можа, не дзяржава.

Ж у р. Ох, звязаўся я з табою сабе на бяду! Хадзем, завязеш да мяне.

Ж о р а. Айн мамент! Перш чым кідацца ў прорву злачынства, хачу пабачыцца з каханай дзяўчынай. *(Стукае ў вушак дзвярэй да дзяўчат.)* Вера, Верачка! Радасць мая халасяцкая! Зірні на ахвяру ўласных пачуццяў. Адгукніся! Пачуй мяне, харошая... Ах, якая бяздушнасць!.. А можа, я загіну ў дарозе пры выкананні службовых абавязкаў... Урэжуся ў сустрэчны транспарт... *(Спявае.)* «И никто не узнает, где могилка моя...»

Ж у р. Дурань! Там нікога няма.

Ж о р а (збянтэжана). А я... рэпеціраую.

Ж у р і Ж о р а выходзяць.

Світае. Каля дзвярэй з'яўляюцца В е р а і Н ю р а. Выхадныя плацці ў гразі, падраныя. На плячах целагрэйкі. Нюра ледзь трымаецца на нагах. Дзяўчаты ўваходзяць у свой пакой. Нюра, як сляпая, дабіраецца да свайго ложка, валіцца на пасцель.

В е р а (смяецца). Ну і ночка! А ты, дзеўка, зусім расклеілася. Кволыя вы нейкія... Чуць што, дык і лапкі ўгору!

Н ю р а (жаласна). Ну, што ты з мяне насміхаешся?

В е р а. Смешна! *(Заходзіць за шырму, адкручвае кран.)* Ух і вадзічка сцюдзёная! Проста як з крыніцы. У нас за дзетдомам дубро-

ва была, а ў ёй крыніца... Мы туды бегалі кветкі рваць. Такая слаўная крынічка...

Н ю р а *(разглядвае свае рукі)*. Ой, ручкі мае, ручанькі-і-і...

В е р а *(выходзіць з-за шырмы ў халаце, з распушчанымі валасамі)*. Нічога, жывая будзеш! Ідзі спаласніся.

Н ю р а паслухмяна ідзе за шырму.

Ну і ночка! Як заліло мяне вадою — прапала, думаю. Каб не брат, захлынулася б. Выцягнуў, як утопленую. *(Смяецца.)* А Кісялёў са сваімі хлопцамі — бачыла? Так дружна ўзяліся... Між іншым, ён усё на цябе паглядаў. Вачэй не зводзіў: а раптам нырца дасі... Ох і любіць жа ён цябе, Нюра!

Н ю р а *(выходзіць з-за шырмы)*. Падумаеш, патрэбен ён мне!

В е р а. Дарэмна фыркаеш. З такім не прападзеш. *(Дастае з тумбачкі ежу.)* Зараз перакусім і — спаць. Хочаш, чарачку дам? Ад Жоры Цуканава капелька асталася. Нацадзіць? Кажуць, памагае. *(Узяла з падаконніка бутэльку, наліла трошкі ў шклянку.)* Пі! Толькі адразу. Як рыцыну.

Нюра глытнула і папярхнулася.

Дзіўлюся! І якi ў ёй смак мужчыны знаходзяць? Цьфу! Ты закусвай, закусвай! Сама бяры. Рэж больш.

Нюра раптам заплакала.

Чаго румзаеш? Хопіць на сёння вады.

Н ю р а. Ну, чаго ты прычапілася як смала?

Вера (*суха*). А чаго ехала сюды? Думала, на будоўлі так сабе — хаханькі? Сядзела б дома на печы. У цябе ж і бацька, і маці...

Нюра. Бацька! Маці! Ёсць жа яшчэ разумныя дзядзькі там. (*Падняла вочы.*) Прыдумалі ж: у інстытут з вытворчасці прымаць.

Вера. І правільна! А то прыязджала тут да нас адна інжынерка... Смех і грэх! Збегла праз тыдзень. А я вось з самага першага дня — і нічога! Трымаюся.

Нюра. Табе што? Ты прывыкла. А я не магу. Не магу... Ах, Вера! Ты проста не бачыла другога жыцця.

Вера. Бачыла. Усё бачыла. А толькі не зайздрошчу я тым, што на шыі ў бацькоў сядзяць альбо за мужаву спіну хаваюцца. Сама праб'юся. Я — работніца, і ў гэтым мая гордасць. І нікому ў крыўду сябе не дам!

Нюра. А чаму ж ты Жору Цуканаву дазваляеш?

Вера. Ну і што? Ён мне падабаецца.

Нюра. Ён многім падабаецца. А я б яму такому вочы выдрала.

Вера. І мне ён часамі агідны. Але ведаеш, Нюра... Ёсць у ім нешта чалавечнае...

Нюра. Морда прыгожая, вось і ўся яго чалавечнасць. (*Падымаецца з-за стала.*) Ох, як усё баліць! Мабыць, я захварэю. (*Ідзе да ложка.*)

Вера. Эх! І да чаго ж вы, татавы ды мамішы, да жыцця не прыстасаваны. Але нічога! Жыццё — нянька добрая. Выняньчыць!

За вокнамі развіднела. Перапэцканыя, у мокрай адзежы, уваходзяць хлопцы з брыгады Кісялёва, па-

волі падымаюцца на другі паверх. Мікола спыніўся на верхняй пляцоўцы, дэкламуе.

Мікола. «Мой родны кут, як ты мне мілы! Забыць цябе не маю сілы...» Якуб Колас. «Новая зямля».

Сямён. Цішэй ты! Артыст з пагарэлага тэатра...

З вуліцы ўваходзяць Зорын і Кісялёў. У Зорына абвязаны лоб. Спыніліся, закурваюць.

Зорын *(прыціснуўшы далонь да скроні)*. Чорт...

Кісялёў *(спагадліва)*. Вельмі трэба было першаму туды лезці?

Зорын. Трэба, брат!

Кісялёў. Навошта? У камандзіра сваё месца ёсць.

Зорын. Калі гарыць — яго месца ў агні. А хіба ты з хлопцамі не рызыкаваў? Сёння ж вынесу падзяку ў загадзе. Малайчына! Але ж *(уважліва паглядзеў на Кісялёва)*... ці перадумаў?

Кісялёў. Перадумаў.

Зорын. Правільна. І давай жыць мірна.

Кісялёў. Мірна? Не.

Зорын. Тады... не затрымліваю.

Жора *(заглядвае ў дзверы з вуліцы)*. Таварыш начальнік, паедзем яшчэ куды? Перакусіць бы вінегрэту якога...

Зорын *(зірнуў на ручны гадзіннік)*. Даю трыццаць мінут. На станцыю паедзем.

Жора хаваецца.

Так што... не затрымліваю, Кісялёў. Магу нават да станцыі падкінуць.

Кісялёў. Нікуды я не паеду. Пагарачыліся. Дэраш, намеснік твой, дапёк. Але я думаю так: павінны ж прыняць нейкія меры, раз ты не спраўляешся. А як жа? Закон нашага жыцця!

Зорын. Вось які ты, Кісялёў!

Кісялёў. Такі!

Зорын. Ну-ну.

Кісялёў. Пакрыўдзіўся, начальнік?

Зорын. А ты як думаеш?

Кісялёў. Думаю, што чэсны камуніст не павінен крыўдзіцца на праўду.

Зорын. Правільна думаеш. Што ж! Можа і дачакаешся — будзе табе новы начальнік.

Кісялёў. Мне не начальнік, мне парадак патрэбен.

Шпурнуўшы недакурак у сметніцу, Кісялёў падымаецца на другі паверх. Зорын нервова курыць. Стаіць, задумаўшыся. Уваходзіць Люба.

Люба. Сяргей... Сяргейка! *(Кінулася да яго.)* Мілы!

Зорын *(уражаны)*. Ты? Тут? Што здарылася? Чаго ты прыехала?

Люба. Па шчасце.

Зорын. Ты... кінула інстытут?

Люба. Пацалуй жа мяне!

Зорын. Дзеля гэтага ты і прыехала?

Люба. І дзеля гэтага. *(Цалуюцца.)*

Зорын *(бярэ Любін чамадан)*. Хадзем да мяне.

Люба ідзе следам за Зорыным і спыняецца ў дзвярах.

Што ж ты стала каля парога?

Л ю б а. Пераступіць парог не так лёгка.

Абое ўваходзяць у пакой.

Вось так ты і жывеш?

З о р ы н. Так і жыву.

Л ю б а. І ты хацеў прагнаць мяне?

З о р ы н. Думаеш, нам будзе лягчэй удваіх?

Л ю б а *(ускінуўшы рукі яму на плечы)*. Не ведаю, лягчэй ці цяжэй... Мне ўсё роўна. *(Прыслухоўваецца.)* Чуеш?

З о р ы н. Нехта ходзіць наверсе...

Л ю б а. Гэта наша шчасце! Яно тут! Яно просіцца да нас у дом!

Люба падбягае да дзвярэй і адчыняе іх. Ж у р, які падслухоўваў каля дзвярэй, схапіўшыся за лоб, адыходзіць да лесвіцы. Збянтэжаная Люба глядзіць на Зорына.

З о р ы н *(горка ўсміхнуўшыся)*. Пакуль тое шчасце, дык няшчасце ўжо тут.

Л ю б а. Не-не! Мы абаронім сваё шчасце. *(Туліцца да Зорына.)*

Ж у р, паціраючы рукі, ідзе да выхада.

Ж у р. А вось і новы факт — бытавое разлажэнне.

Зорын адышоў да акна, разгублена кудлачыць свой чуб. Люба стаіць сярод пакоя, прыціскаючы да грудзей сашчэпленыя рукі.

Л ю б а *(з запалам)*. Што я магу зрабіць, калі такі свет! Калі адзін чалавек можа стаць для цябе ўсім: і жыццём, і розумам, і радасцю, і жаданнем!

Зорын. Ты думаеш толькі пра сябе.

Люба. Я думаю толькі пра цябе! Толькі пра цябе! Скажы — любіш? Любіш?

Зорын. Калі скажу не люблю — паедзеш?

Люба. Не! *(Кідаецца да яго, абняла за шыю.)* Сяргейка, я не магу без цябе!.. Я буду разам з табою... Пайду на самую цяжкую работу. Толькі не гані мяне...

Зорын *(уздыхнуўшы)*. Калі б я мог... Цяжка нам будзе, ох цяжка.

З вуліцы ў вестыбюль уваходзіць усхваляваная Ганна. За ёю — Жур. Лёгкі шаль упаў з плячэй — не заўважыла. Кінулася да пакоя Зорына.

Жур. Там, там! Сам бачыў. Карцінка, я вам скажу! Казка! Тысяча і адна ноч...

Ганна рашуча адчыняе дзверы ў пакой Зорына. Люба і Зорын стаяць абняўшыся, са здзіўленнем глядзяць на Ганну. Ганна ў замяшанні прыхілілася да вушака.

Ганна. Люба! Дачушка!

Люба. Мама!

Ганна. Лепш аслепнуць, чым убачыць гэтакае.

Люба. Мамачка, паслухай...

Ганна. Маўчы! Зараз жа выйдзі адгэтуль! Чуеш? Зараз жа!

Люба. Мамачка! *(У роспачы.)* Не чую і слухаць не хачу.

Паўза.

Ганна *(падышоўшы да Зорына)*. Сяргей! Прашу цябе... Апамятайся...

З о р ы н *(тужліва)*. Ганна Рыгораўна! Зразумейце!.. Я люблю...

Г а н н а. А Надзя? Ты ж жанаты! Як ты смееў разлюбіць Надзю? Ты ж з ёю ўвесь фронт прайшоў. Разлюбіць Надзю! І гэта ты, ты! Не магу паверыць, Сяргей. Апамятайся, прашу цябе. Не губі дзяўчыны.

Л ю б а. Мама!

Г а н н а. Маўчы. Распусцілася!.. Як вы не разумееце? Вы ж абое будзеце няшчасныя. Гэта ваша дурасць пройдзе.

Л ю б а *(цвёрда)*. Гэта не дурасць, мама.

Г а н н а. Маўчы.

З о р ы н. А калі б Люба не была вашай дачкой?

Г а н н а *(упарта)*. Усё роўна!

Л ю б а. Мама! Ты добрая... і такая бессардэчная!

Г а н н а. Я маці!

З о р ы н *(стомлена)*. Рабіце, што хочаце. Праўда на вашым баку. Але я люблю, і ніхто — чуеце? — ніхто не адбярэ ў мяне права любіць.

Г а н н а. Ах, які ты эгаіст! Хто табе даў права на такую любоў? Хто? Маўчыш?

Люба падышла да Зорына, абняла, прытулілася да яго. Ганна ў знямозе апусцілася на канапу, плача. Зацямненне. Парывістая бурная мелодыя. У навальнічным небе клубяцца хмары.

Ч а с. Шчасце. Звычайнае чалавечае шчасце... Колькі сіл, натхнення, адвагі і баязлівасці, волі і бязволля штодзённа праяўляе чалавек у пошуках шчасця! Чалавек упарта ве-

рыць у шчасце, нават калі яго абяцаюць на тым свеце. І кожнаму хочацца ведаць, што рабіць, як жыць, каб шчасце не абмінула яго...

Музыка сціхае. Сонечная раніца. Вестыбюль інтэрната. У расхінутым плашчы шпарка ўваходзіць Дэраш. Следам за ім подбежкам — Жур. Скінуўшы шапку, Дэраш абмахваецца ёю, як веерам.

Дэраш. Фу! Горача!

Жур. Афрыка. Дык вы кажаце, едзе?

Дэраш. Едзе. Вось і прыехалі да нашага калодзежа напіцца!

Жур. Дачакаліся!

З вуліцы чуваць шум аўтамашыны.

Мабыць, ён! *(Падбягае да акна. Расчаравана.)* Не, не ён... Жонка яго на сваім санітарным драндулеце падкаціла...

Дэраш. Ганулія? Ты вось што... *(Робіць Журу знак, каб той знік.)*

Уваходзіць засмучаная Ганна.

Ганна. Цягнік прыйшоў, а яго няма.

Дэраш. Відаць, прыедзе на машыне. Чакаеш? Ну, вядома. Вось прыедзе Корань, Корань нас рассудзіць...

Ганна. Ох, не ведаю, не ведаю, як ён рассудзіць.

Дэраш. Нічога! Гэта справа не аднаго Кораня датычыцца, хоць ён і бацька...

Ганна. Я цябе не разумею.

Дэраш. Яна мяне не разумее! Загадкі ёй

задаю. Гні дрэва, пакуль гнецца; вучы дзіцятка, пакуль слухаецца.

Г а н н а *(уздыхнула)*. Позна. Дзіцятка ўжо жыве сваім розумам.

Д э р а ш *(безапеляцыйна)*. Яна ж камсамолка!

Г а н н а *(устрывожана)*. Што ты надумаў, Фядот Цімафеевіч?

Д э р а ш *(з запалам)*. Ануля, я цябе не пазнаю! Ты ж была заўсёды прынцыповая. І тут пытанне такое, што думаць няма чаго. Тут дыктуе партыйнае сумленне.

Г а н н а. І што яно табе дыктуе?

Д э р а ш. Не давай спуску, Ануля! Змагайся за чалавека, за дачку! Ці барацьбы спужалася?

Г а н н а. Не барацьбы, а брудных плётак. І, калі ласка, не павышай голасу, я не глухая.

Д э р а ш *(з дакорам)*. Дзіўлюся! Адкуль ты набралася такога? Хочаш, каб я маўчаў? Не магу! Завод моладзь будуе. А які прыклад яна бачыць? Распуста! Так што гэта не ваша сямейная справа, а грамадская! *(Рэзка нацягвае шапку на вушы і, глянуўшы строга на Ганну, выходзіць.)*

Ганна стаіць, апусціўшы галаву. Потым падыходзіць да пакоя Зорына і нерашуча стукае ў дзверы. У лёгкім летнім халаціку выходзіць Л ю б а.

Л ю б а. Мама? Заходзь.

Г а н н а. Не-не. Пагаворым тут. Ты чула? Прыязджае бацька.

Л ю б а. Бацька? Чаго?

Г а н н а. А хіба ты не хочаш, каб ён прыехаў?

Л ю б а. Мама, зразумей. Няма такой сілы, каб разлучыць нас. Няма!

Г а н н а *(тужліва)*. Ты стала зусім чужая. Чужая! І як, калі гэта здарылася?

Л ю б а. Даўно. Я вырасла, мама. А ты не заўважыла.

Г а н н а. Не заўважыла.

Л ю б а *(не вытрымаўшы, з плачам кідаецца да маці)*. Мамачка! Ну чаго ты так гаруеш? Я ж шчаслівая! Зразумей, я такая шчаслівая! Ну чаго ты так гаруеш?

Г а н н а. Гарую, дзіцятка маё, што ты ў няшчасці бачыш сваё шчасце.

Паўза.

Л ю б а. Мамачка, вось я думаю — жыве чалавек, нешта робіць. І раптам яго жыццё азараецца ярка-ярка. І адразу перад ім раскрываюцца такія прасторы, аб якіх ён і не марыў. Сяргей для мяне — усё. За яго я гатова пайсці на любыя пакуты.

Г а н н а. Гэта — страшна! Я ніколі, чуеш, ніколі не дарую яму. *(Падымаецца на другі паверх.)*

Л ю б а. Мама!

Г а н н а. Ніколі!

З вуліцы ўваходзіць Н а д з е я, чамадан ставіць каля парога, аглядваецца.

Н а д з е я. Ганна Рыгораўна...

Г а н н а *(рэзка павярнулася)*. Надзя! Ты прыехала?

Н а д з е я. Але, прыехала. Хоць мяне тут ніхто не чакае.

Зацямненне. Са змроку паволі выступаюць рэдкія сасёнкі, ускапаная зямля. Здалёку відаць контуры вялікай будоўлі. На першым плане — цэгла, жалезабетонныя блокі, арматура. У шырокую, імклівую мелодыю ўліваецца тэма Часу. З'яўляюцца Карань і Дэраш.

Дэраш. Агледзеў?

Карань. Агледзеў.

Дэраш. Ну і як?

Карань. Як бы ні было, а будуем! *(Шырокі жэст у прастор.)* А гэта галоўнае. Ехаў да вас — аж кіпеў ад злосці. А паглядзеў на гэта хараство — адлягло.

Дэраш. Добры ты вельмі.

Паўза.

Карань. З'еў Зорына?

Дэраш. Ён сам сябе з'еў.

Карань. А я думаў, ты прыціх, супакоіўся.

Дэраш. Дрэнна ж ты пра мяне думаў. Ёсць яшчэ порах у парахаўніцах! Яшчэ магу! Магу! Не тое, што твой Зорын. Адразу ж выдахся.

Карань. Тваімі намаганнямі. Замест таго каб памагаць...

Дэраш. Калі б было каму памагаць. Пустое месца! І сумленне не дазваляе мне маўчаць. Вось я і ўдарыў ва ўсе званы.

Карань. Сумленне. А ты хоць раз пытаўся ў свайго сумлення: ці не падводзіць яно цябе?

Дэраш. Пытаўся.

Карань. І што ж яно табе адказала?

Д э р а ш. А кажа, лепш дзесяць разоў памыліцца ў чалавеку, чым адзін раз недаглядзець.

К о р а н ь. А ці не замнога — дзесяць разоў? Цябе не пужае такая прапорцыя?

Д э р а ш. Я вельмі люблю савецкую ўладу, каб пужацца.

К о р а н ь. Пры такой любві, Дэраш, можна астацца без узаемнасці.

Д э р а ш (*насцярожыўшыся*). А што... ёсць рашэнне?

К о р а н ь. Пакуль што няма. Але можа быць.

Д э р а ш. Эге! Зноў мае ворагі хвост падымаюць.

К о р а н ь. Усё яшчэ шукаеш ворагаў? Ты лепш сабою займіся! Энергіі ў цябе хоць адбаўляй, а накіроўваеш яе не туды, куды трэба.

Д э р а ш. Дэраша голымі рукамі не возьмеш! Не!

Уваходзіць К а л я д а.

К а л я д а (*крычыць*). Ганна Рыгораўна! Сюды ідзіце! Яны тут.

Уваходзіць Г а н н а. Спынілася, прыціснула рукі да грудзей, Корань падышоў да яе, паклаў ёй рукі на плечы.

К о р а н ь. Аня... Ну што ж ты!

Г а н н а. Як заўсёды... Быццам з неба.

К о р а н ь. Ты мяне не чакала?

Г а н н а. Я цябе ўсё жыццё чакаю... Надоўга да нас?

К о р а н ь. Зусім!

Г а н н а. Не жартуй!

К о р а н ь. Якія могуць быць жарты? Наламалі вы тут дроў.

К а л я д а. У лесе жывём... Добры дзень, Васіль Пятровіч!

К о р а н ь. Відаць, што ў лесе... Добры дзень! *(Глядзіць на Каляду.)* Нешта ты, хлопча, схуднеў.

К а л я д а. Ад вясёлага жыцця.

К о р а н ь. Дык у чым жа ўсё-такі загваздка?

К а л я д а. У чым загваздка? У Зорыне.

Уваходзіць З о р ы н.

З о р ы н. Гавары, гавары...

К а л я д а. Сам скажаш.

З о р ы н *(моўчкі паціскае руку Кораню)*. Магу і сам.

К о р а н ь. Давай.

З о р ы н. Думаеш, апраўдвацца буду?

К о р а н ь. Не думаю.

З о р ы н. Табе як рапартаваць: вусна ці ў пісьмовай форме?

К о р а н ь. Адна халера — ці савой аб пень, ці пнём аб саву.

З о р ы н. Тады слухай. План гэтага квартала — дай божа, калі напалавіну асілім.

Д э р а ш. Вось іменна: дай божа!

З о р ы н *(цвёрда)*. Цэментны завод на фундаменце застыў, а з будаўнічымі матэрыяламі... *(Махнуў рукою.)*

К о р а н ь. Бачыў.

З о р ы н. Адсюль — цякучасць кадраў..

К а л я д а. Ну-у... І яшчэ цэлы кош розных грахоў: голае адміністраванне і глушэнне кры-

тыкі і самакрытыкі... Гэта ўсё ў пратаколе партсходу запісана — можаш сам пазнаёміцца.

Дэраш. Пра бытавое разлажэнне забыў...

Паўза.

Корань (*да Зорына*). Як далей жыць думаеш?

Зорын. Яшчэ не думаў.

Корань. Чаму?

Зорын. Няхай цяпер за мяне другія думаюць.

Дэраш. Бач ты яго! Не, браток! Рана цябе начальнікам зрабілі... Прывык кіраваць і ўжо інакшай жыць не можа...

Зорын. Магу. (*Да Караня.*) Калі прымаць справы будзеш?

Корань. Такія справы і прымаць не захочацца.

Зорын. Відаць, у міністэрстве табе сказалі: ты абараняў Зорына, ты і выручай. Ці не так?

Корань. Прыблізна так.

Дэраш. Та-а-ак...

Каляда. Не ведаю, як хто, а я рад твайму прызначэнню, Васіль Пятровіч. Такі завод будуем! І няма чаго тут міндальнічаць.

Дэраш (*да Караня*). Значыць, развітваемся?

Корань. Да заўтра.

Дэраш. А заўтра?

Корань. Працаваць будзем, Дэраш. Зразумеў?

*Заслона*

## ДЗЕЯ ДРУГАЯ

Прайшоў час. На дрэвах за вокнамі інтэрната — рэдкае пажоўклае лісце. У сіняватай асенняй смузе — панарама будоўлі. Над трыма капрамі шахтаў загарэліся рубінавыя зоркі. Інтэрнат будаўнікоў ужо абжыты. У вестыбюлі з'явіліся стандартныя адзнакі казённага шыку — кадушкі з пальмамі, дывановыя дарожкі, вялізныя мяккія крэслы. На вокнах — плюшавыя шторы з фестончыкамі. І толькі ў пакоях абсталяванне больш разнастайнае, у залежнасці ад густаў жыхароў. Вечарэе. Людзі вяртаюцца з работы. Праз вестыбюль праходзіць гаварлівая чарада дзяўчат.

Першая дзяўчына. А ён і гаворыць: «Мяне,— кажа,— усё роўна не пусцяць у камунізм. Я гарэлку люблю. А там — па патрэбнасці! Сап'юся!..» Вось дурань!

Дзяўчаты смяюцца.

Другая дзяўчына. А я вам, дзяўчаткі, так скажу: у дурной галаве — дурны розум. Патураем мы мужчынам. Вось яны і здзекуюцца з нас. *(Рашуча.)* Я свайго біць буду.

Першая дзяўчына *(смеючыся)*. Даведаюцца хлопцы — пачнуць за кіламетр абыходзіць.

Другая дзяўчына. Нічога, падчаплю якога-небудзь. Ім толькі закінь вудачку...

Першая дзяўчына. Ой, дзяўчаты! Забыла... Сёння сход камсамольскі.

Трэцяя дзяўчына. Зноў сход? Не пайду. Хопіць мне галаву тлуміць. Я ўжо свядомая.

Першая дзяўчына. Начальнікаву дачку будуць пясочыць.

Трэцяя дзяўчына. За што?

Першая дзяўчына. За тое самае!

Трэцяя дзяўчына. А калі яна любіць?

Першая дзяўчына. Камсамольскі сход вырашыць.

Трэцяя дзяўчына. Такія справы сэрца вырашае.

Першая дзяўчына. Вось ты на сходзе пра сэрца і скажы.

Трэцяя дзяўчына. І скажу! Скажу!

Дзяўчаты выходзяць. З вуліцы ўваходзіць Корань. Следам — подбежкам Жур. Ён увесь час стараецца выскачыць наперад.

Корань *(гнеўна)*. Будаўніцтва задыхаецца без матэрыялаў, а ты асабняк будуеш?!

Жур *(прыціскаючы рукі да грудзей)*. Што вы, Васіль Пятровіч! Які асабняк? Тры маленькія катушкі і кухня... Васіль Пятровіч! Паслухайце...

Корань. Нічога не хачу слухаць.

Жур. Ясна... Выходзіць, не заслужыў Жур за столькі гадоў працы мець сабе прытулак пад старасць? Так яму і трэба, старому дурню! Што ж! Рэпрэсіруйце Жура за два кілаграмы цвікоў.

Корань. Рэпрэсіруйце... Якое слова цяжкае! Эх, Жур! Не тым жыццём жывеш... Колькі табе да пенсіі асталося?

Жур. Год, два месяцы і трынаццаць дзён.

Корань. Падлічыў! Ну, вось што... За матэрыял выплаціш усё да капейкі па камерцыйнай цане.

Жур. Выплачу! Дзякуй вам, Васіль Пятровіч. Выплачу! Пашкадавалі мяне...

К о р а н ь. Не цябе, пенсію тваю пашкадаваў. Падобных табе даўно на пенсію спісваць трэба. Раннія вы пенсіянеры.

Ж у р. Яшчэ папрацуем!

К о р а н ь. Працуй! А толькі намеснікам па быту больш не будзеш.

Ж у р *(уражаны)*. Як?

К о р а н ь. А так. Не ўмееш ты клапаціцца аб людзях.

Ж у р. Ва... Васіль Пятровіч! Як жа... А?

К о р а н ь. Вырашана! І не хныкай. Не люблю.

Ж у р *(мяняючы тон)*. А я хныкаць не буду. Я скардзіцца буду.

К о р а н ь *(глянуўшы яму ў твар)*. Гэтаму цябе не вучыць.

Ж у р *(жаласна)*. З семнаццатага года, не разгінаючы спіны, савецкай уладзе служу...

К о р а н ь. Вось гэта і дрэнна, што не разгінаючы спіны. Савецкая ўлада ў лакеях патрэбы не мае. Усё, Жур! *(Ідзе да лесвіцы.)*

У дзвярах з'яўляецца Ж о р а.

Ж о р а. Таварыш начальнік!

К о р а н ь *(аглядваючыся)*. Чаго табе?

Ж о р а. Я наконт канстытуцыі... Права на адпачынак не адменена? Другі тыдзень без выхаднога...

К о р а н ь. Адпачывай, Цуканаў. Даю табе адгул.

Ж о р а. Мерсі.

К о р а н ь выходзіць.

Ж у р *(услед Кораню)*. Нічога. Знойдзем

управу. Не ты першы, не ты апошні на Журы паслізнешся...

Жора. Наступіўшы на слімака, сапраўды можна паслізнуцца.

Жур. Што-што? Паўтары!

Жора. Ты лепш не рыпайся. Скончылася тваё свята. Улез, як жук, дык сядзі і галавы не высоўвай. Адарвуць.

Жур. І ты хвост падымаеш? Мала я табе дабра зрабіў?

Жора. Тваё дабро горш за ліха. Ад яго ўчадзееш. А я хачу свежым паветрам дыхаць. І каб неба светлае над галавою...

Жур. Бач ты які? Табе ж пры святле горш будзе.

Жора. Прыладжуся.

Жур. Яно то так. Ты спрытны! Давай у згодзе жыць.

Жора. Няма міру пад алівамі. Кропка.

Жур. Не, яшчэ не кропка... Ты мне шыферу павінен прывезці...

Жора *(дастае з кішэні грошы, падае Журу)*. Бяры назад свае тугрыкі і не псуй мне апетыту.

Жур. Я табе, байструку, біяграфію сапсую.

Жора. Мне мой апетыт даражэй.

Жур. Глядзі, Цуканаў! Пакусаеш сабе локці!

Жора. Што я — ідыёт, свае кусаць? Калі што — я ў твае зубамі ўчаплюся.

Жур хацеў нешта адказаць, пазяхнуў і, махнуўшы рукою, выйшаў. Жора, пераканаўшыся, што нікога няма, падыходзіць да пакоя дзяўчат. Стукае.

О-го-го! Верачка-Вярунчык, адчыніся! Не муч

хлопчыка. Ало! Ёсць хто жывы альбо мёртвы ў гэтай камунальнай кватэры?

Жора спрабуе адчыніць дзверы. На верхняй пляцоўцы з'яўляецца Акуліна.

Акуліна. Куды ломішся? Не прыйшлі яшчэ з работы. І што гэта на цябе, баламут, упынку няма! Нешта вельмі часта хадзіць пачаў...

Жора. З самымі добрымі душэўнымі намерамі, цётка.

Акуліна. З душэўнымі намерамі? Ой, глядзі! Паламае табе рэбры за Веру брат яе. Ён чалавек гарачы. Гэта табе не з іншымі круціць.

Жора. У мяне, цётка, рэбры даўно паламаныя.

Акуліна. Хто ж гэта цябе?

Жора. Жыццё.

Акуліна *(з пагардай)*. Блазнюк! Жыцця ты яшчэ не бачыў.

Жора. Правільна! Не бачыў.

Акуліна. Мудруеце вы! Вам цяпер толькі жыць ды радавацца.

Жора *(прыклаўшы руку да шапкі)*. Слухаю, цётка Акуліна! *(Маршыруючы да выхада, спявае.)*

Легко на сердце от песни веселой,
Она скучать не дает никогда!
И любят песню деревни и села,
И любят песню большие города!.. *(Выходзіць.)*

Акуліна. А каб табе громам па жываце, маланкай па патыліцы! Праўду кажуць: на хлапца не шкадуй дубца... *(Выходзіць.)*

Інтэрмедыя

Гучыць лёгкая, празрыстая мелодыя. На ярка асветленую дарогу выбягаюць дзеці ў школьнай форме. У руках восеньскія кветкі і жоўтае лісце. На дарозе паказалася задуменная Надзея. Убачыўшы сваю настаўніцу, дзеці вясёлай чародкай акружаюць яе, працягваюць кветкі і лісце. Штосьці шчабечуць усе разам. Усхваляваная Надзея падымае на рукі самую маленькую дзяўчынку, туліць да грудзей, цалуе. Яна шчаслівая ў гэтую хвіліну. Гэта той непарушны і дарагі свет яе жыцця, у якім яна знаходзіць заўсёды спакой і радасць.

З'яўляецца Дэраш. Крыху насмешліва назірае за гэтай, на яго думку, сентыментальнай сцэнай.

Прыціскаючы да грудзей кветкі, Надзея ідзе да дзвярэй. Дэраш ідзе следам.

Дэраш. Так-так... бачу... Восень! Як гэта там... у Пушкіна? А мы, рабочыя, працуем, і няма нам часу прыглядвацца. Зімою і летам — адным цветам. Хіба толькі вясною, калі сонца добра прыгрэе, успомніш — пара на летнюю амуніцыю пераходзіць. Дык, значыцца, восень? Так-так. Паганы настрой, кажаш?

Надзея. Восень... Восень... «Унылая пора, очей очарованье».

Дэраш (*строга*). Перастань хандрыць!

Надзея (*не слухаючы*). І не заўважыла, як прыйшла... Заўтра першы дзень заняткаў у школе. Дзесяты год настаўніцкай работы. А першы дзень — ён заўсёды першы. Не ведаю, што б я рабіла без гэтага першага дня. Забярыце ад мяне і гэта, тады...

Дэраш. Ніхто нічога ад цябе не забірае, калі сама не аддасі. Помні, партыя цябе заўсёды абароніць. Дык вось, афіцыйна паведамляю, што выношу гэту справу на грамадскі

суд. Ён партыец, яна камсамолка. Народ арганізаваны. Разбяромся!

Надзея. Не трэба, Фядот Цімафеевіч. Разбяромся як-небудзь самі.

Дэраш. Каб жа так! Але, выбачай за шчырасць, сэрца ў цябе бабскае. Ты яму не паддавайся. Змагацца за сям'ю трэба. Ваяваць! А ты — восень, восень...

Надзея. Змагацца... А можа, мне трэба з сабою змагацца, са сваёй непрызнанай любоўю.

Дэраш. Так-так... Выдумляй сама сабе пакуты. Ох, гэтыя мне... інтэлігентныя хлюпікі! *(Строга.)* Паводзіны камуніста Зорына — справа партыйная. І паколькі статут партыі асуджае падобныя ўчынкі, дык дазволь нам дзейнічаць так, як патрабуе наш партыйны абавязак. Няўжо не ясна?

Надзея. Табе заўсёды ўсё ясна.

Дэраш. Кваліфікуеш як недахоп?

Надзея *(паглядзела на лісце, прыгарнула да твару)*. Восень... Восень... *(Павольна ідзе да дзвярэй пакоя Зорына.)*

Дэраш *(паціскае плячамі, з пагардай)*. Занылa... Восень! Восень! На вечную вясну спадзявалася?

Надзея *(каля дзвярэй)*. Вясны ў мяне ніколі не было... *(Знікае ў пакоі.)*

Дэраш. Што робіцца з людзьмі! Была ж баявой партызанскай разведчыцай, а цяпер...

З вуліцы ўваходзяць Каляда, Ганна і Кісялёў.

Каляда *(апусціўшыся ў крэсла, папраў-*

*ляе новы пратэз).* Ох, гэтыя косці... Мабыць, разваляцца, не даскрыпеўшы да пенсіі.

Ганна. Косці ў цябе моцныя. А вось сэрца... лячыць трэба. Ніяк да цябе не дабяруся.

Каляда *(махнуўшы рукой).* Лячыцца будзем пазней.

Ганна. Ну, не! Мы, медыкі, будзем дабівацца закону, каб нядбайныя адносіны да свайго здароўя разглядваліся як крадзеж дзяржаўнай маёмасці.

Кісялёў *(усміхаецца).* Ад вас, дактароў, усяго можна чакаць.

Ганна. А як жа іначай? Была я сёння ў бараках. Жывуць у іх цудоўныя людзі. Залатыя рукі! А жывуць так, што глядзець агідна. Непрытульнасць. Бруд. Антысанітарныя ўмовы. Пытаюся, як церпіце? Адказваюць, жыць можна. Старая песня!

Каляда. Хай сабе старая, а слоў з яе не выкінеш. Дрэвы, ведаеце, дзяды садзяць, а іх ценем унукі карыстаюцца. Закон прыроды.

Ганна. Але ж мы мяняем законы прыроды!

Дэраш. Э, Ганулят! Каб гэта можна было адным махам пакончыць з усімі непаладкамі!..

Ганна. Усё ў нашых руках! Не трэба апускаць іх!

Каляда. Калі ж во часам самі апускаюцца. Месяц гавару Журу, каб адрамантаваў дах у інтэрнаце мантажнікаў — як гарох аб сцяну! Абяцае, а не робіць!

Кісялёў. Такіх работнічкаў з воза — кабыле лягчэй...

Корань *(спускаючыся па лесвіцы).* Вось і

добра. Мы з табою аднае думкі, Кісялёў. Будзеш намеснікам па быту.

К і с я л ё ў (*збянтэжана*). Я? Ды што вы, Васіль Пятровіч... Што гэта вы так раптам... несур'ёзна жартаваць пачалі...

К о р а н ь. Ніякіх жартаў. Заўтра ж прымай у Жура справы.

К і с я л ё ў. Браткі! Чым я праштрафіўся? Які з мяне намеснік?! Ды яшчэ па быту! У нашым быце чорт нагу зломіць!

К о р а н ь. Чорт зломіць, а ты не павінен. Наладжвай быт і забеспячэнне рабочага класа.

К і с я л ё ў. Займацца забеспячэннем... Ды я не ўмею. Я чалавек сумленны.

К о р а н ь. На гэта і разлічваем. Навучышся. Пара, браток, узяць на свае шырокія плечы груз цяжэйшы, чым брыгада. Тым больш, у кандыдаты партыі цябе прынялі.

К і с я л ё ў. Васіль Пятровіч... Падумайце...

К о р а н ь (*паклаў руку яму на плячо*). Смялей, смялей, Кісялёў! (*Да Дэраша.*) Заўтра аформіш загадам звальненне Жура і прызначэнне Кісялёва. (*Да Каляды.*) Чаму не пачынаеце мантаж чацвёртага агрэгата?

Паўза.

К а л я д а. Разумееш, якая гісторыя... Даручыў дакументацыю маладой практыкантцы. Ну, яна і запарылася. Пасаромелася да мяне звярнуцца, а калі прыйшла, было позна. Заўтра раніцай пачнём.

К о р а н ь. Заўтра раніцай ты атрымаеш суровую вымову.

К а л я д а. Я ж табе тлумачу...

К о р а н ь. А мне не трэба ніякіх тлумачэнняў. І так усё ясна: чацвёрты агрэгат не будзе здадзены ў час праз цябе. Вось і ўсё тлумачэнне.

К а л я д а. Ну, ведаеш...

К о р а н ь. Ведаю. Я сякі-такі, гэтакі... У далейшым, даручаючы важную справу навічкам, будзеш глядзець за іх работай, а не пускаць на самацёк. А Зорын яшчэ не паяўляўся?

Д э р а ш (*нядобра ўсміхаецца*). Днюе і начуе на сёмым...

К о р а н ь. Вось яшчэ... упартая душа. Таго і глядзі, захварэе, тым і скончыцца. Быў я ў яго сёння на аб'екце. Стаіць на самай верхатуры пад усімі вятрамі, голымі рукамі за жалеза сцюдзёнае трымаецца...

Г а н н а (*добразычліва дакараючы*). А я гляджу, дзе ты дзеў свае рукавіцы...

Д э р а ш (*іранічна*). Клопаты аб жывым чалавеку! Амаль зяцю... Прабач. Пажартаваў.

Паўза. Агульная збянтэжанасць.

К о р а н ь. Развучыўся ты жартаваць, Дэраш. Вось што... З заўтрашняга дня тры брыгады з сёмага на чацвёрты. Кроў з носа — праз дзесяць дзён цэх павінен уступіць у строй!

Д э р а ш. Не ведаю, як цэх, а кроў з носа будзе. Наконт брыгад сам з Зорыным дамаўляйся.

К о р а н ь. А мне няма чаго дамаўляцца. Я загадваю.

Д э р а ш. Гэта іншая справа.

К о р а н ь. Усё.

Усе ўстаюць і накіроўваюцца да лесвіцы. З калідора выходзіць Жур і робіць знакі Дэрашу, каб той затрымаўся.

Дэраш. Ты чаго мне грымасы строіш? Што гэта цябе так перакрывіла?

Жур. Бяда, Фядот Цімафеевіч! Без верных саюзнікаў Корань пакідае вас. Поўная блакада вам... Самага шчырага вашага прыхільніка і памочніка праганяе. Ратуйце!

Дэраш. І пальцам не паварушу.

Жур (*разгубіўся*). Фядот Цімафеевіч!.. Што я чую? Вашага вернага паслугача, а вы...

Дэраш. Паслугач... Праз такіх вось паслугачоў і вешаюць цяпер на нашага брата ўсіх сабак. Як я цябе, падхаліма, раней не разгледзеў. Я за праўду, за строгасць змагаюся, а ты... дошкі крадзеш. Ды яшчэ, мабыць, маім імем спекулюеш? А? Гавары.

Жур. Ні-ні! Усё сам! На сваю рызыку. (*З плачам у голасе.*) Хоць пахадайнічайце, каб пасаду мне без вялікай розніцы ў зарплаце... Пенсія ж лясне. Па старой дружбе, Фядот Цімафеевіч!

Дэраш. Канец нашай дружбе, Жур!

Жур. Фядот Цімафеевіч! Зрабіце ласку! З чалавекалюбства...

Дэраш. Чалавекалюбства? А што гэта такое?

Жур. Ну-у... Чалавекалюбства! І ўсё...

Дэраш. І ўсё? Для мяне ўсё гэта — пусты гук. (*Выходзіць.*)

Жур. Ай-яй-яй! А я ж на яго спадзяваўся! Як на бога маліўся. Пераступіў і нагой адшпурнуў... (*Выходзіць.*)

На ганку інтэрната вясёлая мітусня. Некалькі хлопцаў пад камандай Сямёна ўцягваюць у вестыбюль канцэртны раяль.

Нюра з цікавасцю назірае і ўваходзіць следам.

Сямён. Куды ты вернеш, цецярук сляпы! Занось, занось, кажу! Цяпер сюды... Сюды, кажу!

Мікола. Гаварыць лёгка! А ты сам паспрабуй! Кіраваць кожны дурань зможа, толькі дазволь!

Сямён (*смяецца*). Дазваляю! Давай, кіруй!

Мікола. Гэта мы можам, гэта як плюнуць. Трымайце... Зараз абдумаем, як лепш...

Хлопец. Адыдзі, чорт! Мы трымаем, а ён думаць будзе!

Мікола. Адставіць крытыку! А то паўгадзіны думаць буду. А ну! Узялі! Ра-зам! Дружна! Пайшла... Пакацілася...

Падаткнуўшы падол, з анучай у руцэ з калідора з'яўляецца Акуліна.

Акуліна. Толькі музыкі нам і не хапала.

Кісялёў. Няхай пастаіць, пакуль клуб закончаць.

Нюра. Доўга яму стаяць прыйдзецца.

Акуліна. Што гэта вам тут — склад, ці што?

Кісялёў крануў клавішу. Пачуўся нізкі, працяжны гук. Хлопцы ў захапленні прыслухоўваюцца.

Сямён. Сіла! Вось гэта бандура! Пудоў на сто!

Мікола. Ох ты! Бандура! Раяль. Паважаць трэба.

С я м ё н. А! Па мне — трохрадачка ў самы раз! *(Робіць выгляд, што іграе на гармоніку.)* Захацела стара баба дый разбагацеці — пасадзіла курапату, каб вывела дзеці.

Кісялёў нацягвае яму на твар шапку.

А што? Для настрою музыка ў самы раз. А такую гаргару... куды ты яе возьмеш? Ды і сімфоніяў гэтых я не разумею. Як завядуць — вушы вянуць.

К і с я л ё ў. Ты сабе камунізм якім уяўляеш?

С я м ё н. Якім? Есці — во! Ад пуза. Адзежы — на выбар! Тры выхадныя на тыдзень.

М і к о л а *(задуменна)*. Не, браткі... Каб быць толькі сытым і абутым, я за камунізм змагацца не буду. Для мяне камунізм, браткі, гэта каб я разумней стаў. Каб я паслухаў сімфонію альбо гэтую самую... як яе... «Лунную санату» і зразумеў яе. Або каб і сам мог сыграць яе на раялі.

К і с я л ё ў. Правільна.

С я м ё н *(фыркнуў)*. Тэарэтыкі! *(Да хлопцаў.)* Хадзем лепш у сталоўку. Кажуць, піва свежае прывезлі.

Х л о п ц ы ідуць да выхада.

М і к о л а *(стаў у позу)*. Яна мяне за мукі палюбіла! *(Выходзіць.)*

Н ю р а. Смешны гэты Мікола.

К і с я л ё ў. Нішто хлопец. Толькі клёпкі адной не хапае. Хварэе на артыста.

Н ю р а *(хітравата)*. А ведаеш... Ён мне сімпатызуе.

К і с я л ё ў. Зялёны! Што ён разумее ў каханні...

Н ю р а. Разумее, ды яшчэ як разумее.

К і с я л ё ў. Ат! Не дражніся. *(Дастае з кішэні флакон духоў.)* На...

Н ю р а. Ой! «Агні Масквы»! Дзе дастаў?

К і с я л ё ў. Дзе дастаў, там няма.

Н ю р а. І як здагадаўся, што гэта мае любімыя?

К і с я л ё ў. Бачыў, як ты ў магазіне прынюхвалася і ўздыхала.

Н ю р а. Дзякую. Вось не думала, што ты такі ўважлівы.

К і с я л ё ў. Гляджу я на цябе...

Н ю р а. І што бачыш?

К і с я л ё ў. Звычайная ты... А вось жа ўбілася ў сэрца, і ніяк не вырвеш. Няўжо гэта і ёсць тое, што завецца каханнем?

Н ю р а. Пра каханне я і думаць не хачу. Няма ніякага кахання.

К і с я л ё ў. А што тады паміж намі?

Н ю р а. Не ведаю... Узаемная павага.

К і с я л ё ў. Павага, няхай павага. Можна пацярпець. Паглядзім, чым гэта ўзаемная павага скончыцца. Пасля сходу ў кіно пойдзем?

Н ю р а. Зноў упоцемку цалавацца будзеш?

К і с я л ё ў *(упарта)*. Буду.

Н ю р а. Не пайду.

К і с я л ё ў. Не падабаецца?

Н ю р а. Яно то падабаецца, але хіба можна?

К і с я л ё ў. Добра. Калі падабаецца — можна і ўстрымацца. Яшчэ нацалуемся. Наперадзе жыццё доўгае...

Н ю р а. Ну, глядзі! Каб без гэтых самых... Парушыш слова — усё...

Нюра ідзе ў свой пакой. Кісялёў ухмыляецца, разводзіць рукамі і, засаромеўшыся, выходзіць.

За вокнамі цямнее. Далёка мігцяць дробныя агеньчыкі. З вуліцы ўваходзяць Вера і Люба ў целагрэйках, ватовых штанах, каляровых шарсцяных хустках. На руках велізарныя рукавіцы.

Люба. Раяль! Божа мой! Адкуль ён узяўся? *(Падбягае да раяля, адчыняе века.)* Сапраўдны раяль! *(Развязвае хустку, скідае целагрэйку, садзіцца і бярэ некалькі акордаў.)* Сто гадоў не дакраналася. *(Іграе «Элегію» Рахманінава.)*

З пакоя Зорына, накінуўшы на плечы белы пуховы шаль, выходзіць сумная Надзея. Яна робіць знак Веры, і тая ціхенька хаваецца ў сваім пакоі, Люба абрывае іграу, паварочваецца да Надзеі і моўчкі глядзіць на яе.

Надзея. Што ж ты перастала іграць? Я перашкодзіла? *(Горка ўсміхнуўшыся.)* Перашкаджаю... А ў чым мая віна? За які грэх прыходзіцца мне пакутаваць?

Люба. Хіба вы адна пакутуеце?

Надзея. Якое ж ты маеш права на яго любоў?

Люба. На любоў усе маюць права.

Надзея. Бач, якая ты разумная! Вядома! Я — простая баба. На раялі не вучылася іграць. І музыкі гэтай не разумею. Не да музыкі мне было... Басаногаю дзяўчынкай вайна застала. Бацьку, маці, сясцёр маіх крывапівец Гітлер знішчыў, а я ў лес уцякла да партызанаў. Там і Сяргея сустрэла.

Люба. Нашто вы ўсё гэта мне расказваеце? Я ўсё ведаю.

Н а д з е я. Ведаеш... Табе што, свет на ім клінам сышоўся? Маладая, прыгожая, разумная...

Л ю б а. Але вы зразумейце! Жыццё і ён — для мяне адно. Не будзе яго — не будзе і мяне. *(З запалам.)* Ведаеце, вось я стаю на рыштаваннях, і халодны вецер пранізвае мяне наскрозь... Стынуць рукі... Замірае сэрца. Здаецца, вось-вось упаду. І няма ў мяне сілы цярпець! І тады, ведаеце, што я раблю? Я клічу яго. Так-так. Ціха-ціхенька. Сяргей... Сяргейка... *(Засаромеўшыся, змоўкла.)* Даруйце... Не трэба было гэтага гаварыць...

Н а д з е я. Дык вось чым ты яго прывaражыла! Паэзіяй. Казачкамі. Што ж? Я так прыгожа любіць не ўмею.

Л ю б а *(шчыра)*. Каб я магла што-небудзь зрабіць дзеля вас, то...

Н а д з е я *(з раптоўным спадзяваннем)*. Едзь адсюль! Прашу цябе, едзь. На калені гатова перад табою стаць.

Л ю б а. Ну, паеду... Але як жа вы будзеце з ім...

Н а д з е я. А гэта ўжо не твой клопат.

Л ю б а. Не разумею...

Н а д з е я. Не разумееш!.. За ўсе мукі мае аднаго табе жадаю, разлучніца... каб ты тое самае мела!

Л ю б а. Развaжаеце вы неяк... па-старасвецку. Разлучніца.

Н а д з е я. Затое ты надта сучасная. Сораму ў вас няма, у цяперашніх дзяўчат! Ні сораму, ні сціпласці. Жанаты не жанаты, малады не малады — вам усё роўна.

Л ю б а. Калі б мяне разлюбілі...

Н а д з е я. Што? Што б ты зрабіла? Што?

Л ю б а. Не ведаю. Але я ніколі не дазволіла б сабе прыніжацца.

Н а д з е я. А я сабе дазволіла! Дазволіла! Таму што ведаю — адчэпішся ты ад яго, і ён забудзе цябе! І любоў яго вернецца.

Л ю б а (*журботна*). Не... Страчаная любоў не вяртаецца.

Н а д з е я. Бач ты яе, якая спрактыкаваная! Брэшаш! Маю гордасць растрывожыць хочаш? Дарэмна! Пабачым, хто з нас мацнейшы. Пабачым, які ў цябе выгляд будзе сёння на камсамольскім сходзе...

Л ю б а. Чаму вам так хочацца, каб я не паважала вас?

Н а д з е я. А мне не патрэбна твая павага! Мяне людзі паважаюць! А вось ты паспрабуй дабіся, каб цябе паважалі! Паспрабуй!..

Л ю б а. Калі ласка... Не ўніжайцеся перада мною.

Н а д з е я. Ах ты! Дрэнь... Дрэнь! І як такая гадзюка магла вырасці ў добрай савецкай сям'і?

Л ю б а. Не трэба так! Лепш ударце мяне.

Уся раптам панікшы, нацягваючы на сябе шаль, Н а д з е я паспешна, нібы ўцякаючы ад Любы, хаваецца ў сваім пакоі. Люба, закрыўшы твар рукамі, апускаецца на ступеньку лесвіцы.

Паварот сцэны. Пакой дзяўчат. На стале, прысунутым да Верынага ложка, закуска і бутэлька віна. Ж о р а, крыху падпіўшы, сядзіць на ложку побач з В е р а й. Раззлаваная Н ю р а стаіць каля акна.

Ж о р а. Падумаеш! Грэбуе... Каралева Марго не хоча выпіць з Жорам Цуканавым!

Н ю р а. Не хачу!

Ж о р а. Ах, не хочаце, ваша каралеўская вялікасць! А мне начхаць — царыца вы ці прачка! Ясна? Я табе так скажу, цыпа. Няма чаго перад Жорам нос задзіраць. У яго таксама на дне чамадана атэстат сталасці.

Н ю р а. Адны тройкі?

Ж о р а. Ну і што? Законная ацэнка. А галоўнае — кацялок варыць.

Н ю р а *(фыркнуўшы, ідзе за шырму)*. Нешта не заўважыла...

Ж о р а. А ты наогул на людзей не глядзіш. Сама сабою любуешся.

Н ю р а *(з-за шырмы)*. Хм... Табою любавацца? Падумаеш!

Ж о р а. Пагарджае! Нуль увагі, фунт зняважы. Ну, як жа не пагарджаць Жорам Цуканавым! Круціць баранку і рад. Не шукае сабе цёплага месца ў жыцці. А мог бы не горш за другіх прышвартавацца. Мог бы! А не хоча.

Н ю р а выходзіць з-за шырмы пераадзетая.

Толькі няма чаго табе перада мною фарсіць. Няма чаго і няма чым. Душа ў цябе голая, непрыкметная, дрыжыць. І няма табе дзе прыткнуцца.

Паўза.

В е р а. Бачыш, які ён. Толькі прыкідваецца прасцячком.

Н ю р а. Тым і страшны. Прагнала б ты яго.

В е р а *(пакрыўдзіўшыся)*. А табе што? Я ж цябе не асуджаю, а магла б!

Н ю р а. Вера!

В е р а. Не першы год Вера! Абыдуся без нянек!

Ж о р а *(да Нюры)*. З'ела? *(Абняў Веру.)* Ух ты! Птушачка...

Н ю р а. Цуканаў! Як табе не сорамна?

Ж о р а. Згінь! Не перашкаджай жыць.

Н ю р а *(Веры)*. На сход не пойдзеш?

В е р а. Не пайду.

Н ю р а. Я так і думала.

В е р а. Што ты думала?

Н ю р а. Што ты яе апраўдваеш.

В е р а. Хто любіць, таму не патрэбна апраўданне.

Н ю р а. Якія вы ўсе... амаральныя!

Ж о р а. Чуеш, маралістка! Шкада мне цябе. Нейкая ты дзікая, шурпатая... Не зайздрошчу таму, хто цябе палюбіць.

Н ю р а. Абыдуся! Чым такая любоў, лепш у дзеўках векаваць.

Ж о р а. Афелія! Ідзі ў манастыр!

Н ю р а. Хадзем, Вера. Не аставайся з ім. Загубіць і вокам не маргне.

Ж о р а. Згінь!

Н ю р а выходзіць, стукнуўшы дзвярыма.

Ух, язва! Ні гарыць ні тлее. Ад такіх толькі чад, нуда на свеце. Ты яе не слухай. Па-мойму: жыві, пакуль жывецца, бяры, пакуль бярэцца... *(Абдымае Веру.)*

Вера вырываецца і адыходзіць убок.

В е р а. Жора! Перастань!

Ж о р а. Дурная! Ажанюся! Ну! Ажанюся, кажу. Чаго табе яшчэ? Заўтра ж запішамся. Люблю ж! Ну!..

Вера. Не трэба мне такой любві.

Жора. А якой жа табе трэба?

Вера. Брыдкі ты цяпер. Злы. І чаму я цябе так палюбіла на сваю бяду? Чаму ты такі нядобры?

Жора. Я добры, добры! Чэснае піянерскае! Ну, люблю. Каб не любіў, стаў бы я...

Вера. Ідзі ад мяне. Не магу глядзець на цябе такога.

Жора. А я думаў, ты смелая. Любіш дык любіш! А ты... як усе! Грубасці спужалася. Любоў, называецца!

Вера. Жора! Любы мой... Як жа я буду жыць далей, калі ты мяне пакрыўдзіш?

Жора моўчкі падышоў да Веры і прытуліў яе да сябе. Паварот сцэны. Люба, закрыўшы твар рукамі, сядзіць на ступеньцы. З вуліцы ўваходзіць у вестыбюль Зорын. Спыніўся ў дзвярах, глядзіць на Любу. Горка ўсміхнуўся. Падышоў да яе, працягнуў рукі.

Люба (*кінуўшыся яму на грудзі*). Божа мой... Калі гэта ўсё скончыцца?

Зорын (*здагадваючыся*). Ты... гаварыла з Надзяй?

Люба (*з болем*). Хіба так можна гаварыць? Мы мучылі адна адну.

Зорын. Бедная мая...

Люба. Я не магу больш... Няма ў мяне сілы.

Зорын. Пацярпі яшчэ трошкі. Вырашыцца. Пацярпі, дарагая.

Люба (*уздыхнула*). Цярпення ў мяне, можа, і хопіць. А вось вера, што мы будзем калі-небудзь шчаслівыя, слабее...

Зорын. А хіба мы нешчаслівыя?

Л ю б а *(задумалася)*. Калі шчасце такое балючае, чаму людзі імкнуцца да яго? Чаму ўсё так складана? Чаму?

З о р ы н. А каб усё было проста — гэта лепш?

Л ю б а. Не ведаю. Цяпер нічога не ведаю.

З о р ы н *(летуценна)*. А помніш, ты працягнула мне рукі... вось так... і сказала: вядзі хоць на край свету! І заплюшчыла вочы... Помніш?

Л ю б а *(заплюшчыла вочы і працягвае Зорыну рукі)*. Вядзі! Чаго ж ты?

Паўза.

З о р ы н *(трывожна)*. Гэта папрок?

Л ю б а. За што? Калі чалавек уночы ідзе незнаёмай дарогай, ён спачатку прыглядваецца, ступае асцярожна, потым яму гэта надакучвае, і ён ідзе як папала. Вось і я так...

Паўза.

З о р ы н *(моршчыцца, як ад болю, хапаецца за галаву)*. Што рабіць? Што рабіць? Зусім я разгубіўся.

Люба і Зорын глядзяць адно аднаму ў вочы. З о р ы н адварочваецца і рашуча ідзе ў свої пакоі. Уся загарэўшыся, Люба глядзіць яму ўслед.

У пакоі Зорына на крэсле ляжыць расчынены чамадан, і Н а д з е я паспешна складвае ў яго свае плацці. Уваходзіць З о р ы н. Надзея зачыніла чамадан і паставіла яго на падлогу.

Чакала?

Н а д з е я. Нічога я ўжо не чакаю, Сяргей...

З о р ы н. Чаму ты так... злосна? Так, я ві-

наваты перад табой. Але я ніколі не хацеў і не хачу прычыняць табе боль.

Н а д з е я. Боль праходзіць... І каб я ведала, што ты будзеш з ёю шчаслівы...

З о р ы н. Не клапаціся аб маім шчасці!

Н а д з е я. ...калі разлюблю.

З о р ы н. Ты разлічваеш на маю велікадушнасць?

Н а д з е я. Не. *(Здымае з вешалкі паліто.)* Я пайду, Сяргей... зусім.

З о р ы н. Ты ўжо мяне пакідала...

Н а д з е я. Я хацела паспрабаваць жыць адна і не змагла...

З о р ы н. А цяпер зможаш?

Н а д з е я. Цяпер змагу.

З о р ы н. А што змянілася?

Н а д з е я. Сяргей... Я ўсё перажывала ў сабе. Мне было вельмі цяжка прыняць гэта рашэнне. Але я павінна. Даволі! Даволі! Нашто нам гэтыя пакуты? Учора, калі ты спаў, а я думала і плакала, ты шаптаў у сне — Люба... Так што... табе я чужая. Праклятая вайна. Усё забрала. І нават дзіцяці ў мяне няма ад цябе. Ну, што ж. Кожнаму сваё...

Журботная лірычная мелодыя, у якую ўступае тэма Часу.

Ч а с. Што ж ты маўчыш? Адкажы ёй. Яна ні ў чым не вінавата.

З о р ы н *(адказваючы свайму сумленню)*. Віна мая!

Ч а с. Ты шукаеш апраўдання? Але ж ты любіў Надзею?

З о р ы н. Любіў...

Час. І кінуў яе на паўдарозе. А сам пайшоў наперад. Вырваўся на прастор... І сустрэў Любу...

Зорын (*упарта*). Я кахаю яе.

Час. Ты ў гэтым пераcананы?

Зорын. Я кахаю яе!

Час. Тады ты павінен вырашыць.

Зорын. Цяпер?

Час. Цяпер. Праз некалькі хвілін будзе позна.

Паўза.

Надзея (*сама з сабой*). Ён цяпер зусім слабы, разгублены. Я магу астацца. І ён зміpыцца... А любіць не будзе... Няўжо маё шчасце не вернецца?.. Сяргейка... Родны мой! Я б табе ўсё даравала...

Час. Вырашай. Цяпер альбо ніколі.

Музыка сціхае. Зорын і Надзея пакутліва глядзяць адно на аднаго.

Надзея. Дык я пайду.

Зорын (*рэзка*). Ідзі.

Надзея. Не гневайся. Мне было цяжка адважыцца. Але я знайду ў сабе сілы... Не ўспамінай мяне ліхам! Думай пра мяне добра... Як і я пра цябе.

Зацямненне. Панарама будоўлі ў вячэрніх агнях. З'яўляюцца дзяўчаты. Спыніліся, любуюцца.

Першая дзяўчына. Прыгожа, праўда?

Другая дзяўчына. Днём неяк не заўважаеш, а вось увечары...

Першая дзяўчына. Ты толькі пагля-

дзі, якое хараство! І ўсё гэта наша, вось гэтымі рукамі зробленае!

Другая дзяўчына. Агні — як зорачкі... А раней было балота з камарамі. А цяпер горад! Новенькі, чысценькі... Як лялька!

Трэцяя дзяўчына (*панура*). Горад новы, а жывём па-старому.

Другая дзяўчына. Выказалася!

Трэцяя дзяўчына. Як раней здзекаваліся з дзяўчат, так і цяпер.

Першая дзяўчына. Яшчэ адзін абаронца знайшоўся!

Трэцяя дзяўчына. Каханне ж у іх сапраўднае...

Першая дзяўчына. Чым такое каханне, лепш у вір галавой. Праўда, дзяўчаткі? Хоць і шкада яе, а правільна, што з камсамола выключылі.

Трэцяя дзяўчына. Няправільна. І райком усё роўна не зацвердзіць.

Першая дзяўчына. Будуць яны вельмі разбірацца! Цяпер за разлажэнне ведаеш як строга... Можа ў яе і была доля чалавечай праўды, але як камсамолка...

Трэцяя дзяўчына. Калі чалавечая праўда, дык і камсамольская. А напалі на яе з зайздрасці. У сардэчных справах баба заўсёды баба. Калі свайго сапраўднага кахання не мела, дык чужога цярпець не можа.

Другая дзяўчына. Такі сорам! Не хацела б я быць на месцы Любы.

Трэцяя дзяўчына (*з панурай рашучасцю*). А я хацела б.

Першая дзяўчына (*заўважыла хлоп-*

*цаў).* Дзяўчаткі, гляньце! Хлопцы падыходзіць баяцца. Во страху нагналі! *(Прытворна ўздыхае.)* Канец любві!

Смеючыся, дзяўчаты выходзяць. З'яўляюцца хлопцы. Сямён дастае папяросы. Моўчкі закурваюць.

Мікола *(цыматзначна).* Кувыр-куль-легія...

Сямён. Заўсёды так. Дзе чорт не можа, там бабу пашле.

Хлопец. І чаго Нюрка так вызверылася? Аж трыбуну грызла! Выключыць, і ўсё. Гэта ёй даручылі, ці як?

Мікола *(спявае і скача).* Спытай у яе. А я не я, і кабыла не мая.

Сямён. Несур'ёзны ты чалавек!

Мікола. А нашто? Бачыў, што з сур'ёзнымі робяць? Каб у іх было гэта так... фіглі-міглі, тады — парадачак. А то лірыка, настрой... Вось за гэтыя настроі ім і ўсыпалі. Не, хлопцы! Любоў — тая ж зараза. Горш за вірусны грып. І для закаханых пагалоўная прафілактыка патрэбна. Гіпнозам трэба лячыць, як ад п'янства і курэння.

Хлопец. А пачынаць трэба з нашага былога брыгадзіра. *(Паказвае пальцам на Кісялёва і Нюру, якія падыходзяць.)*

Мікола. Хапайце іх. Трымайце! У іх бацылы.

Нюра. Сам ты бацыла!

Мікола. Наколькі я памятаю граматыку, бацыла — жаночага роду.

Хлопец. Што яна на сходзе і даказала.

Н ю р а. Я гаварыла праўду!

Х л о п е ц. Тваю праўду ў мех завязаць ды ў лесе на сук павесіць. Хадзем, хлопцы, пакуль на нас не накінулася.

Х л о п ц ы выходзяць. Збянтэжаная Нюра глядзіць ім услед, потым зірнула на Кісялёва.

Н ю р а. Падумаеш! Асуджаюць! Усе вы амаральныя тыпы. Ты чаго надзьмуўся, як індык? Каб ты не пачаў абараняць яе, я б і рота не разявіла. Усе вы такія... Распуснікі! Усе! Чуе маё сэрца, загубіш ты маё маладое жыццё! Загубіш і растопчаш!

К і с я л ё ў. Падумай, што гаворыш!

Н ю р а. Не, ты спачатку скажы, чаму ты так выступаў?

К і с я л ё ў. Далікатная гэта справа...

Н ю р а. Далікатная справа... Разлюбіць сям'ю?

К і с я л ё ў. А калі ніякай сям'і не было?

Н ю р а. Значыць, па-твойму, я дурная? Скажы, дурная?

К і с я л ё ў *(ускіпеў)*. Чаго ты ад мяне хочаш?

Н ю р а. Нічога! Магу пайсці. Назаўсёды!

К і с я л ё ў. Ну і характар у цябе! Наравістая...

Н ю р а. Ах, вось як! Яму ўжо мой характар не падыходзіць! Ну і роўненькай табе дарожкі! Не заплачу!

К і с я л ё ў зірнуў спадылба на Нюру, моўчкі павярнуўся і пайшоў. Спалоханая Нюра глядзіць яму ўслед.

Ваня! *(Разгублена.)* Пайшоў... Мамачка род-

ненькая! Што ж гэта я нарабіла? Ваня! Вярніся... *(Кінулася ўслед.)*

З'яўляецца Люба. Спынілася. Глядзіць невідушчымі вачамі. Здалёку чуваць: «Люба!» Яна ўздрыгнула, азірнулася і адышла ў цень за штабель цэглы. Уваходзіць Зорын.

Зорын. Дзе ж яна? Здаецца, была тут... Люба! *(Апусціў галаву.)* А што я ёй скажу? Чым уцешу? Ах, як гэта нядобра! Як пагляджу ў яе вочы? І няўжо я вінаваты? У чым жа? Перад кім? Перад ёй? Перад людзьмі? Ці перад сваім сумленнем?

Не падымаючы галавы, Зорын павольна выходзіць. Паказалася Люба, працягнула руку, хацела клікнуць яго і стрымалася.

Ганна *(за сцэнай)*. Ідзі сюды! Яна не магла пайсці далёка.

Корань *(за сцэнай)*. Выбегла сама не свая.

Уваходзяць Ганна і Корань. Люба хаваецца.

Ганна. Беднае дзіця!

Корань *(задуменна)*. Яна багацейшая за нас з табою.

Ганна *(уражаная)*. Чым жа?

Корань. Душэўным багаццем. А мы з табою, бабулька, за грукатам будоўляў часта пра душу забываліся.

Ганна. Што ты такое гаворыш?

Корань. Ну як жа! Ці забыла, як у трыццатыя гады давалі табе ў косці на камсамольскім сходзе за доўгія косы?

Ганна *(уздыхнуўшы)*. Памятаю... І падстрыглася! А якія косы былі!..

К о р а н ь. А прыпомні першую нашу сямейную сварку... Пусцячная, недарэчная... А што табе ў ячэйцы тады сказалі?

Г а н н а *(усміхнуўшыся)*. Сказалі... пакінь яго... Знойдзеш другога...

К о р а н ь. Бачыш, як мы перагібалі? І цяпер яшчэ сядзіць у нас гэта ў крыві. Вось таму і не разумеем часам уласных дзяцей...

Г а н н а. А яны хіба не перагібаюць?

К о р а н ь. Ты не верыш сваёй дачцэ? Не верыш, што яна кахае па-сапраўднаму?

Г а н н а. Не разумею я такога кахання! І не хачу разумець.

К о р а н ь. У тым і бяда наша...

Г а н н а. Ты ва ўсім вінаваты. Залішне многа ёй волі даваў. Ну, дзе ж яна? Люба!

К о р а н ь. Яна, напэўна, ужо дома. Ты ідзі. А я яшчэ пашукаю.

Г а н н а. Ох, трывожна мне... Люба! *(Выходзіць.)*

Выбягае Л ю б а і кідаецца на грудзі бацьку.

Л ю б а. Тата! Ты разумны. Чулы. Добры. Скажы, як нам жыць далей? Што мне рабіць?

К о р а н ь. А калі я скажу, ты ж не паслухаеш?

Л ю б а *(з дакорам)*. Чаму? Тата, скажы... Мне цяпер так патрэбна твая парада, твая дапамога!

К о р а н ь. Едзь адгэтуль!

Л ю б а *(здзіўлена)*. Паехаць? Мне? Адной? Без Сяргейкі?

К о р а н ь. Так трэба.

Люба. Чаму? Ніхто не можа разлучыць нас! Ніхто!

Карань. А хіба разлука перашкаджае любіць?

Люба. Я не магу без яго!

Карань. І ён без цябе. Але ж яму трэба будаваць. І гэта галоўнае. А для гэтага трэба мець светлую галаву, моцныя нервы і здаровае сэрца.

Люба. Ты думаеш пра яго галаву, нервы, сэрца. Ён табе патрэбен як будаўнік. А як жа я?

Карань. Я клапачуся і аб табе. Ты павінна скончыць інстытут.

Люба. У інстытут я не вярнуся. Педагога з мяне не будзе. Не будзе. Я ў гэтым пераканалася.

Карань. Табе трэба выехаць, Люба.

Паўза.

Люба. Добра. Я падумаю. Ты ідзі дадому, скажы маме, што я зараз прыйду.

Карань. А можа пойдзем разам?

Люба. Я зараз прыйду.

Карань. Хадзем, Любачка...

Люба. Тата... Дазволь мне пабыць адной... Я прыйду.

Карань пацалаваў Любу ў шчаку і павольна, нехаця выйшаў. Люба знікае ў цемры. З'яўляюцца Дэраш і Каляда.

Дэраш. А я табе кажу — разбэсціліся маладыя. Кожны смаркач, разумееш, нацягне на сябе штаны-дудачкі і пачынае свае прэтэнзіі выстаўляць, пачынае, разумееш, за рэспублі-

ку думаць. Ёсць каму думаць і без іх. А ты працуй, вучыся, да людзей прыглядайся ды прыклад бяры са старэйшых...

Каляда. Значыць, з цябе? А калі яны не хочуць?

Дэраш. Прымусім.

Каляда. Вось як! Па якому ж гэта праву?

Дэраш. А па такому!.. Мы будуем новы свет, і ўсіх гэтых вузкаштанных мудрацоў прыходзіцца сілком цягнуць у наша светлае заўтра...

Каляда. Памыляешся, Дэраш. Сілай людзей не ашчаслівіш.

Дэраш. Разводзіш тут мне, знаеш, ліберальныя утопіі. З падобнай філасофіяй сядуць табе на шыю, і яшчэ ўсякі дурань паганяць будзе. А трэба, каб людзі ішлі за табою.

Каляда. Каб весці людзей, іх трэба любіць, верыць ім.

Дэраш. А я, значыць, не люблю і не веру?

Каляда. Выходзіць...

Дэраш. Безадказная заява, таварыш Каляда. Мае вушы нічога не чулі.

Каляда. Магу паўтарыць.

Дэраш. Не чую!

Каляда. Калі не па шэрсці, ты заўсёды глухі. Раней я думаў, што ў табе нешта ёсць, а цяпер бачу — недарэчным жыццём жывеш. Ішоў бы ты на пенсію, ці што...

Дэраш. Я б пайшоў. Але ж боязна на вас, блазнюкоў, дзяржаву пакідаць. Загубіце!

Каляда. Калі ты не загубіў, дык ніхто не загубіць. (*Выходзіць.*)

Дэраш (*абурана*). Падпявала корансўскі!

*(Засопшыся, прысеў на штабель, выцірае хусточкай пот.)* І ён ужо чапляецца! Зусім абнаглелі...

З'яўляецца Люба. Яна хоча прайсці міма.

Дэраш *(насцярожана)*. Хто тут ходзіць? А... гэта ты, бядовая?

Люба *(са смуткам)*. Пакуль што я.

Дэраш. Ішла б дадому. Што ты тут робіш?

Люба. У небе зоркі лічу.

Дэраш. Сур'ёзны занятак. А як сябе адчуваеш?

Люба. Лепш за ўсіх.

Дэраш. Так-так... Злуешся ты на мяне. А дарэмна. Дарэмна. Я ж для цябе стараўся. Ратаваў тваю маладосць.

Люба. Дзякуй.

Дэраш. І падзякуеш, калі набярэшся розуму. Думаеш, тваю любоў парушаюць? Не. Якая тут к чорту любоў?! Гэта опіум, дурман... Бач ты яго, кавалер марцовы, спакусіў такую ягадку.

Люба. Скажыце... А вы калі-небудзь каго-небудзь любілі?

Дэраш. Э! Не ўкладвалася такое мерапрыемства ў план майго жыцця.

Люба. Гэта і відаць...

Дэраш. Нічога табе не відаць, дзеўка. Плюнь на яго. Знойдзеш сабе ў сто разоў лепшага. І маладзенькага, і табе да пары. А ты нюні распусціла. У ногі пакланіцца трэба грамадскасці, што цябе перасцерагае. Пакаешся — адновяць у камсамоле.

Л ю б а. А куды мне каяцца ісці? Да папа, ці што?

Д э р а ш. Жартуеш... Гэта добра. А можа і дрэнна. Відаць, не дайшло. Болю не адчуваеш.

Л ю б а. Скажыце, Фядот Цімафеевіч, чаму вам так прыемна, калі людзі адчуваюць боль? Які ў гэтым сэнс?

Д э р а ш *(збянтэжана)*. Не тое ты, дзеўка, гаворыш.

Л ю б а. Вось прыйдзецца вам... паміраць, і ніхто вас добрым словам не ўспомніць.

Д э р а ш. Паміраць я яшчэ не збіраюся. Не было яшчэ такой дырэктывы. Што ты на мяне глядзіш так? Як на ворага...

Л ю б а. Вы не вораг. Вы проста — вялікае непаразуменне.

*Заслона*

## ДЗЕЯ ТРЭЦЯЯ

Пакой Зорына. Ноч. У акне — водбліскі далёкіх агнёў. Цішыня. І толькі аднастайны, прыглушаны адлегласцю гул вялікага будаўніцтва ледзь-ледзь прасочваецца праз сцены. І гэты гул яшчэ больш падкрэслівае цішыню.

Л ю б а стаіць каля акна. Яна ў халаце, з распушчанымі валасамі. З о р ы н сядзіць на ложку, курыць.

З о р ы н. Дзіўная ты... Пара ўціхамірыцца.

Л ю б а. Ніколі!

Паўза.

Глядзі! Снег падае.

З о р ы н. Толькі яго і не хапала. У мяне на ўчастку самы разгар мантажных работ.

Л ю б а. А я люблю снег. Усюды бела, чыста...

З о р ы н. А мне гэта рамантыка вось тут сядзіць.

Л ю б а. Не разумею... За што ж ты мяне любіш?

З о р ы н. А ты мяне за што?

Л ю б а. Я ведаю.

З о р ы н. Сумняваюся.

Л ю б а. Чаму?

З о р ы н. Ты — выдумшчыца.

Л ю б а. Так лягчэй.

З о р ы н. А потым цяжэй.

Л ю б а. «Потым» мне не страшна.

З о р ы н. Ну, чаму ты ўсё ўскладняеш?

Л ю б а. А табе хочацца, каб усё было прасцей? *(Падыходзіць да яго.)* Пацалуй мяне.

З о р ы н. Не, я сур'ёзна. Скажы...

Л ю б а. Пацалуй мяне.

З о р ы н. Чаму ты не адказваеш на маё пытанне?

Л ю б а. Я табе надакучыла?

З о р ы н. Што ты! Што ты!

Л ю б а. А чаму ты такі невясёлы?

З о р ы н. Ах, Люба! Выдумваеш ты ўсё. Зрабіла з мяне нейкі ідэал... А я звычайны чалавек. З усімі чалавечымі слабасцямі. Ну, чаму ты не можаш мяне любіць такога, які я ёсць?

Звоніць тэлефон. Зорын падымае трубку.

Так. Ну, я. А ты куды глядзеў? І слухаць не хачу. Каб да раніцы ўсё было гатова. Ясна?

Вось што, Каляда, ты адказваеш за мантаж, і ніякіх адгаворак... Што? А ты пра мой сон не клапаціся. Зараз прыеду. Прыеду, кажу. *(Шпурнуў трубку. Апранаецца.)*

Л ю б а. Сяргейка... Ты збіраешся ехаць? Не пушчу!

З о р ы н. Ты што? Першы раз на будаўніцтве?

Л ю б а. Ты пакідаеш мяне адну? У такую мінуту...

З о р ы н. Наперадзе ў нас яшчэ многа такіх мінут.

Л ю б а. Шчаслівых мінут у нас усё менш і менш.

З о р ы н. Тым горш! Люба, ты ж ведаеш, якое становішча ў нас на сёмым.

Л ю б а *(сама сабе)*. Не прайшло і месяца...

Паўза.

З о р ы н. Я магу ісці?

Л ю б а. Ідзі.

З о р ы н выйшаў. Люба ў слязах кінулася на ложак. З о р ы н выходзіць праз вестыбюль. Заспаная Н ю р а падымаецца з канапы.

З о р ы н. Дзяжурыце, Люцікава?

Н ю р а. Ага... Цётцы Акуліне адгул далі. Таварыш Кісялёў папрасіў падмяніць. Грамадская нагрузка... А вы куды гэта ад маладой жонкі ўночы ўцякаеце?

З о р ы н выйшаў, стукнуўшы дзвярыма.

А, заела! Відаць, пасварыліся. *(Падкрадваецца да дзвярэй пакоя Зорына, слухае.)* Здаецца,

плача. Пачынаюцца дні залатыя... *(Асцярожна стукае.)* Любачка, да цябе можна?

Люба ўсхапілася з ложка, выцерла слёзы, адчыняе дзверы, упускае Нюру.

Толькі што бачыла твайго. Нешта ён не ў настроі. Падумала, што і ты не спіш. Акуліне Нічыпаровіч адгул далі. Адной мне сядзець нудна. Дай, думаю, зайду... Ой, які ў цябе міленькі халацік! Гатовы ці пашыла? Вось запішамся, і я сабе такі пашыю.

Люба. З кім жа гэта ты збіраешся запісвацца?

Нюра. А ты хіба не ведаеш? Хітрая!.. Між іншым, ён ужо цябе не абараняе. Але ты не звяртай увагі. Мужчыны ўсе такія. Сёння адно, заўтра другое.

Люба. Ты пра каго? Пра Кісялёва?

Нюра *(радасна)*. А кажаш — не ведаеш! Не такая ўжо Нюра варона, як некаторым здавалася. Хочаш, параду дам? Плюнь на ўсё, беражы здароўе. Я раней таксама пра ўсякія высокія матэрыі думала. Паверыш, абсалютна шчыра прыехала сюды на будаўніцтва. Думала, вось дзе сапраўдны гераізм! А як прыгледзелася, нацярпелася... Ой, якая я дурная была! Я ж у школе ў насценгазету крытычныя заметкі пісала. Даручэнні ўсякія выконвала. А як пажыла самастойна, пераканалася: хто як умее, той так і прыстасоўваецца. Праўда, у кожным населеным пункце ёсць свае меланхолікі, як наша Верка ці твой Зорын, альбо нават мой Кісель.

Люба. Чаму яны меланхолікі?

Н ю р а. Таму што самі не жывуць і другім не даюць.

Л ю б а. А ты ж за Кісялёва замуж ідзеш.

Н ю р а. А за каго мне ісці? За такога бандыта, як Жора Цуканаў? Што ад Веркі асталося? Адзін цень. А я перасцерагала! Не паслухала. Між іншым, скажу табе па сакрэту: ужо на чацвёртым месяцы ходзіць.

Л ю б а. А калі яна любіць?

Н ю р а. Любіць! Скажыце, калі ласка, якія тонкасці!

Л ю б а. Дзіўлюся!

Н ю р а. Што? Хіба няправільна?

Л ю б а. Не веру я табе. Гэта ты хочаш сама сабе даказаць, што жыццё такое.

Н ю р а (*задзірыста*). А хіба не такое?

Л ю б а. Калі такое, то не варта жыць.

Н ю р а. Не, чаму? Жыць можна. Толькі трэба з толкам. Ліхое абыходзь, а за добрае чапляйся.

Л ю б а. І ты гэта самае Кісялёву гаворыш?

Н ю р а. Навошта? Калі трэба будзе — скажу.

Л ю б а. І, думаеш, ён з табою згодзіцца?

Н ю р а. Будзе любіць — згодзіцца.

Л ю б а. Калі будзе любіць — ніколі не згодзіцца. Павер мне.

Н ю р а (*здзіўлена глядзіць на Любу*). Не разумею цябе. Сама няшчасная, а людзей жыць вучыш. (*Прытворна ўздыхае.*) Шкада мне цябе...

Люба падышла да акна, прытулілася да шкла. За акном падае снег. Музыка. Н ю р а ціхенька шмыгнула за дзверы.

Ч а с. Ты шукаеш большага, чым можа даць жыццё. Твае мары ўзлятаюць высока, і ты траціш сувязь з зямлёй.

Л ю б а. Яна сказала, што я няшчасная. Можа гэта і праўда?

Ч а с. Гэта будзе праўдай, калі ты перастанеш верыць сама сабе.

Л ю б а. Але навошта гэтыя пакуты? Чаму я ніколі не адчуваю сябе шчаслівай да канца?

Ч а с. Чалавечае шчасце бязмежна. Яно — як прастора і час. Час няспынна адлічвае хвіліны жыцця. На змену вам з'явяцца новыя людзі...

Л ю б а (*летуценна*). І яны будуць жыць іначай. Яны будуць жыць мудра, у згодзе і ў радасці...

Ч а с. Гэта так. Але патомкі вашы будуць зайздросціць вам!

Л ю б а. Але жыццё наперадзе яшчэ больш цудоўнае.

Ч а с. Жыццё заўсёды цудоўнае, калі яно ў барацьбе. Ці думаеш — там, наперадзе, без барацьбы?

Л ю б а. Але за другое!

Ч а с. За тое ж самае. За лепшага чалавека, за яго шчасце. А за гэта трэба змагацца!

Л ю б а. Я не радзілася барацьбітом.

Ч а с. Ты павінна ім стаць!

Л ю б а. Але ж я нічога не значу.

Ч а с. Ты нічога не значыш, калі ты адна. Ты абараніла сваё права на любоў. Цяпер змагайся за любімага... Але, змагаючыся за сваё шчасце, думай аб шчасці другіх...

Л ю б а (*адыходзіць ад акна і кладзецца на*

*ложак*). Я ўсё гатова аддаць для шчасця другіх... А толькі чаму такі боль? Так горка на сэрцы?

Ч а с. Не паддавайся, думай.

Л ю б а (*глуха*). Думаю...

Музыка сціхае. Люба ляжыць на ложку ў глыбокім роздуме.

Паварот сцэны. З пакоя дзяўчат выходзіць Ц у к а н а ў. Следам выбягае В е р а.

В е р а. Жора! Пастой! Мінутку!

Ж о р а. Стаю мінутку.

В е р а. Як табе не брыдка?

Ж о р а. Стаю пяцьдзесят дзевяць секунд...

В е р а. Нам пагаварыць трэба...

Ж о р а. Заяц трапацца не любіць.

В е р а. Ну, чаму ты сам з сябе так здзекуешся?

Ж о р а (*бурчыць*). Нядоўга дрыгала бабулька, калі яе праткнуў кінжал...

В е р а. Жора, перастань. Не прыкідвайся грубіянам.

Ж о р а. Карамбаліна! Карамбалета!

В е р а. Чаго ты перада мной рысуешся? Я ж табе не чужая. Ніхто на свеце цябе так не любіць, як я...

Ж о р а (*крычыць*). Не лезь, дзеўка, у маю душу, паслізнешся!

В е р а (*пераможна*). А!.. Значыцца, душа ў цябе ўсё-такі ёсць, хоць і слізкая.

Ж о р а. Кажу, дарэмна стараешся. (*Палажыў далонь сабе на сэрца.*) Тут у Жоры Цуканава наглуха заклёпана.

В е р а. Хлусіш ты ўсё.

Ж о р а. Паверыла, што ажанюся, так?

В е р а. Не, не паверыла.

Ж о р а *(здзіві́ўся)*. Ды ну?!

В е р а. Не паверыла!

Ж о р а. О!.. А як жа ты... гэтае самае, а? Разыгрываеш! А я, лапух, вушы развесіў. Пачакай, завыеш!

В е р а. Не бойся. Не завыю.

Ж о р а. Ух ты, якая гераіня нашага часу! Ты ж, мабыць, скардзіцца пабяжыш?

В е р а. Куды? На каго?

Ж о р а *(азадачана)*. І то праўда... Ай! Не веру я табе! Чаго ты ад мяне хочаш? Жыццё маё перакроіць?

В е р а. Тваё жыццё? Хіба ты жывеш?

Ж о р а. А што? Мая справа — круці баранку. А рэшта — няхай за мяне вучоныя думаюць. Ім за гэта вялікія грошы плацяць.

В е р а. Эх, Жора, Жора!.. Шкада мне цябе.

Ж о р а. Ідзі ты к манахам! Ну, чаго мудруеш? Чаго? Кінь, Верка! Мы з табою людзі простыя. Атам расшчапляць не збіраемся. Ясна? Ну, чаго ты хочаш? Чаго?

В е р а *(рашуча)*. Нічога!

Ж о р а. От ненармальная. Каб ведаў, абыходзіў бы.

В е р а *(гнеўна)*. А яшчэ не позна! Абыходзь! Каб мае вочы цябе не бачылі! Пустацвет! Баязлівая твая душа!.. На каленях прыпаўзеш прасіць прабачэння. На каленях! *(Стукнуўшы дзвярыма, хаваецца ў пакоі.)*

Ж о р а. Ой, мама, радзі мяне зноў! Кашмар!

На лесвіцы з'яўляецца К і с я л ё ў.

К і с я л ё ў *(спускаючыся па лесвіцы)*. Што гэта ў цябе вочы шалёныя? П'яны?

Ж о р а. Наадварот. Цвярозы ў дым.

К і с я л ё ў. Да Веры ўсё ходзіш... Ой, пара за цябе ўзяцца! Ты хоць раз задумаўся, навошта смуродзіш свет?

Ж о р а. Не.

К і с я л ё ў. Баішся?

Ж о р а. Ага, баюся. Дуба даць. Ад інфаркта.

К і с я л ё ў. Не бойся. Ад інфаркта толькі разумныя людзі паміраюць.

Ж о р а. Вось іменна.

К і с я л ё ў. Пара за цябе брацца, хлопец, па-сапраўднаму.

Ж о р а. Не трэба. Вы як-небудзь ужо без мяне. Я козыту баюся.

К і с я л ё ў. Эх ты! Філосаф.

Ж о р а. Чхаў я на філасофію. Я містык-кібернетык.

К і с я л ё ў. Свістун ты! Прасвішчаш жыццё як у дуду.

Ж о р а. Кожны свішча як умее.

К і с я л ё ў. Свіснуць бы табе паміж вачэй... Пайшоў адсюль!

Ж о р а. Но-но! Не вельмі. Я начальніка чакаю.

Недзе наверсе загаварыла радыё. Пачатак ранішніх перадач. Па лесвіцы спускаецца К о р а н ь.

К і с я л ё ў. Васіль Пятровіч! *(Выхапіў з кішэні нейкія паперы.)* То як жа будзе?

К о р а н ь. І ты тут? Сказаў, не падпішу!

К і с я л ё ў. Падпішыце. Майце на ўвазе — санітарная камісія пад кіраўніцтвам вашай

жонкі склала акт. Рабочыя павінны мець душ на кожным участку.

Корань. А ці не занадта?

Кісялёў (*развёў рукамі*). Патрэба жыцця, Васіль Пятровіч. Не забывайце, у які час жывём.

Корань (*смяецца*). Я ж табе кажу — грошай няма.

Кісялёў. Гэта для рабочага класа.

Корань. Хіцёр! Ведаеш, чым мяне купіць. Давай! (*Падпісвае паперу.*) Бяры! Што з табою зробіш... (*Да Жоры.*) Паехалі!

Корань і Жора выходзяць. Чуваць, як ад інтэрната ад'ехала машына. Кісялёў ходзіць па вестыбюлі і водзіць пальцамі па розных прадметах.

Акуліна (*выходзячы з калідора*). Ох, і ўедлівы ты! Жур — той, бывала, толькі бегаць умеў. Не правярай, не правярай! Няма пылу.

З умывальнага пакоя з ручніком цераз плячо выходзіць Нюра. Спынілася, робіць знакі Акуліне.

Вось так як станеш, дык і загаворышся. А яшчэ паўдома не прыбрана.

Акуліна выходзіць. Нюра, зрабіўшы выгляд, што не заўважае Кісялёва, ідзе да дзвярэй свайго пакоя.

Кісялёў. Нюра! Ты што ж гэта праходзіш міма і нават не глянеш!

Нюра. Ах, гэта ты! Добрага рання.

Кісялёў. Ранне то добрае... Ну, дык як жа? А? Нюра!

Н ю р а *(адразу)*. У абедзенны перапынак я цябе буду чакаць каля загса. Не забудзь запрасіць сведак. З майго боку ўжо ёсць.

К і с я л ё ў. Пачакай... Ды ты... Ды я... Не, ты... сур'ёзна?

Н ю р а. А ты што? Жартуеш? *(Усхліпнула.)* Прадчувала маё сэрца... Сёння ж афармляй нашы адносіны, альбо... я не знаю-ю-ю...

К і с я л ё ў. Афармляю! Усё! Канец майму халасцяцтву! *(Падхоплівае яе на рукі.)* Ух ты, птушачка мая шызакрылая!

Н ю р а. Несур'ёзны ты, несур'ёзны. Вось цябе і начальнікам паставілі, а ты як і быў...

К і с я л ё ў. Нічога. Ты ж у мяне сур'ёзная за дваіх.

Н ю р а. Ты яшчэ мяне не ведаеш. Я ж вельмі гаспадарлівая. І пашыць, і памыць... Акуратыстка. У мяне парадак ведаеш які будзе? І з'ясі смачна, і пасціш у мякенькім... Такое гняздзечка ў нас будзе, ну проста рай...

К і с я л ё ў. Ды з табою — хоць у пекла!

Н ю р а. Фу, які ты несур'ёзны! Ваня, золатка маё, ты ж не стой, а ідзі ў кантору, рабі, што табе трэба. І глядзі, не пазніся. Каб а палове трэцяй быў як штык каля дзвярэй загса.

К і с я л ё ў *(хныкае, перадражніваючы Нюру)*. Ой, Нюрачка, злавіла ты мяне ў клетку, загубіла маю хлапечую красу...

Абое смяюцца. Махаюць адно аднаму рукамі. Н ю р а ідзе да сябе ў пакой.

Пакой дзяўчат цяпер больш утульны. Вышыўкі, пакрыўкі, кілімы, дарожкі. У кутку кніжная паліца поўна кніг. Некалькі карцін у багетавых рамках. В е р а перад люстэркам зачэсвае валасы.

Н ю р а *(з выглядам пераможцы)*. Можаш мяне павіншаваць.

В е р а. З чым?

Н ю р а. З законным шлюбам.

В е р а. Праўда?! Віншую. Шчасця вам і доўгага жыцця. Кісялёў добры хлопец.

Н ю р а. Прыйдзеш на вяселле?

В е р а. Калі запросіш.

Н ю р а. А як жа! Усіх запрашу! А цябе і твайго брата — у першую чаргу. Мы з табою столькі перажылі! І мне цябе вельмі шкада... Я табе так спачуваю.

В е р а. Што гэта ты ўздумала мяне шкадаваць?

Н ю р а. Я ўсё бачу! Я ўсё чыста бачу!.. А толькі на тваім месцы не бегала б я за ім, плюнула б яму ў нахабныя вочы і ўсё!

В е р а *(засаромеўшыся)*. Ох, і любіш ты не ў сваё нос соваць...

Н ю р а. Калі ж бо маё сэрца разрываецца. Праўду кажуць: зрабі чалавеку дабро, дык ён табе першы і напаскудзіць.

Вера пачынае збірацца ў дарогу. У дзверы стукаюць.

В е р а. Заходзьце!

К а л я д а *(уваходзячы)*. Здарова, шчабятухі!

Н ю р а. Бягу... *(Выходзіць.)*

В е р а. Снедаў?

К а л я д а. Так рана?

В е р а. Няма табе часу і паесці. Ходзіш галодны па аб'ектах да вечара. Сядай. Чаем напаю. З клубнічным варэннем. Сама варыла.

К а л я д а. З варэннем, кажаш? Не прывык я.

В е р а. Эх ты! Бабыль беспрытульны! Ажаніўся б, ці што...

К а л я д а. Хопіць з мяне і твайго жаніхоўства.

В е р а. Усе мяне шкадуюць! І кожны ўпікае! Не прашу. Не трэба. Не трэба!.. *(Адвярнулася.)* Вось...

К а л я д а. Сястрычка, не ўпікаю я цябе. За што? Ты ж не маленькая. Сама за сябе заступішся, праўда?

В е р а. Не ведаю... Алёша... Братка мой родненькі... Дзіця ў мяне будзе... Ад яго...

Паўза.

К а л я д а *(у гневе)*. Заб'ю! Знявечу! Скаціна!..

В е р а. І мяне з ім разам... Я яшчэ больш вінавата.

К а л я д а. Падлюга!

В е р а. Ён не падлюга, Алёша. Дурны ён, няўдачлівы. Храбрыцца, робіць выгляд, што на ўсё плюе, а на душы кошкі скрабуць. Ведае, што не так жыве, а пераіначыць жыццё сілы не хапае. Вось і са мною... цешыць сваю гордасць. Думаў, на каленях буду поўзаць перад ім... Не дачакаўся. І не дачакаецца!

К а л я д а. А ты чаго чакаеш?

В е р а. Чакаю, калі ён сам да мяне на каленях прыпаўзе.

К а л я д а. А калі не прыпаўзе?

В е р а. Прыпаўзе! Абавязкова прыпаўзе.

Я ж люблю яго... А ён ніколі сапраўднай любві не ведаў. Куды ён дзенецца?

Каляда. Толькі ты глядзі... Май гонар. Нічога. Як-небудзь выгадуем. Удваіх будзем гадаваць тваё дзіця.

Вера. Дзякуй за добрае слова, Алёша...

Каляда *(са смуткам)*. Толькі добрым словам і магу табе памагчы...

Вера. Куды ж ты? А чай?

Каляда махнуў рукой і выйшаў.

Мама, мама!.. Каб ты была жывая...

Зацямненне.

Нарастае ўрачыстая мелодыя, і вырысоўваецца панарама будоўлі. Многае ўжо закончана. Задымілі першыя коміны цэхаў. Блішчаць на сонцы вокны шматпавярховых карпусоў заводскага пасёлка.

Час. Чалавек мяняе прыроду. Мільёны гадоў развіваецца жыццё на зямлі, падпарадкаванае адвечным законам матэрыі. І ніколі яшчэ чалавечы розум не пранікаў так глыбока ў асновы гэтых законаў, не выкарыстоўваў іх з такой упартай энергіяй. Змяніліся меры часу. Секунда стала прасторная, як вечнасць.

Уваходзіць Корань. Насустрач яму Дэраш.

Дэраш. Здароў, Васіль Пятровіч. Любуешся?

Корань. А так... Ёсць на што паглядзець.

Дэраш. Нішто сабе заводзік мы з табой адгрукалі.

Корань. Не мы з табой, а людзі.

Дэраш. Я ж кажу: народ... пад нашым кіраўніцтвам.

Коран ь. Ну, што да кіраўніцтва, то не вельмі зазнавайся. Куды ідзеш?

Дэраш. Правяраю. У Зорына зноў нешта не ладзіцца.

Коран ь. А я ў яго толькі што быў. Нават вельмі ладзіцца.

Дэраш. Ну, гэта як сказаць. У мяне ёсць сігналы.

Коран ь. У цябе ёсць сігналы. А ў яго рукі і галава.

Дэраш. Не цэніш ты мяне, не цэніш. (*Надзьмуўшыся.*) Дык ці не лепш нам разысціся?

Коран ь. Што ж... Сілай трымаць не збіраюся.

Не заўважаючы бацькі, праходзіць Люба. Непрыязна глянуўшы на Караня, Дэраш выходзіць.

Люба!

Люба (*падышоўшы да бацькі*). Добры дзень, тата.

Коран ь. Ты на нас зусім забылася. Не заходзіш. Ну, як жывеш?

Люба. Дзякуй. Нічога.

Коран ь. Нічога, гэта значыць — дрэнна.

Люба (*засаромеўшыся*). Не, у мяне ўсё добра. Працую.

Коран ь. А праца даспадобы? Не цяжка?

Люба. Ты на мяне не злуешся, што я не паехала?

Коран ь. Што ж цяпер злавацца? Ты свайго дабілася...

Люба (*горка*). Нічога я не дабілася. Жыву, працую, а радасці няма.

Коран ь. Ты... пачынаеш сумнявацца?

Л ю б а. Не ведаю...

К о р а н ь. А ён? Не крыўдзіць цябе?

Л ю б а. Не...

К о р а н ь. Дык у чым жа справа?

Л ю б а *(апусціла галаву)*. Я ўвесь час адна. Адна...

К о р а н ь *(узлаваўшыся)*. Ды ты што? Малое дзіця? Не ведаеш, чым заняцца? Ты толькі паглядзі, які прастор! Колькі магчымасцей! Не вучышся! Ад камсамола адарвалася! Ты што, хочаш, каб Сяргей быў табе за няньку?

Л ю б а. Тата... Ты не зразумеў...

К о р а н ь. Я ўсё зразумеў!

Л ю б а. Але ж я зусім пра другую адзіноту... Зусім пра другую!

К о р а н ь. Не хачу слухаць! Трэба выкінуць з галавы дурныя фантазіі. Гэта за цябе гаворыць твой эгаізм.

Л ю б а. Тата! Ты... ты вінаваціш мяне?

К о р а н ь. І сябе! Сябе ў першую чаргу.

Л ю б а. Добра... Я пастараюся, тата... каб нікому не было сорамна за мяне... Бывай, мой дарагі... І маці скажы. Скажы, што я вельмі яе люблю. Бывайце! *(Хутка выходзіць.)*

К о р а н ь *(у трывозе)*. Люба!

Зацямненне.

Вестыбюль інтэрната. У ім прасторна, светла. Няма нічога лішняга, паказнога. Вясновая раніца. Свята. Прабеглі д з я ў ч а т ы, асцярожна несучы на выцягнутых руках адпрасаваныя сукенкі. З вуліцы ў святочным касцюме ўваходзіць К і с я л ё ў. У яго на грудзях новенькі ордэн. З другога паверха паважна спускаюцца х л о п ц ы на чале з брыгадзірам С я м ё н а м. Амаль у кожнага на пінжаку ордэн або медаль.

М і к о л а *(выпрастаўся і вылупіў вочы)*. Смі-ірна! Раўненне на былога класнага брыгадзіра, а цяпер... ні рыба ні мяса.

К і с я л ё ў *(крывіцца)*. Пакінь, Мікола.

М і к о л а. Слухаю, таварыш начальнік! Дазвольце стаяць вольна?

К і с я л ё ў *(махнуў рукою)*. Віншую вас, хлопцы, з узнагародамі.

Х л о п ц ы *(хорам)*. Служым Савецкаму Саюзу!

К і с я л ё ў. Добра служыце. Чэрці! Сумна мне без вас...

М і к о л а. А ты не ведаеш, што зрабіць? *(Нахіляецца і гаворыць Кісялёву на вуха.)* Развалі работу, і цябе зноў турнуць назад брыгадзірам.

К і с я л ё ў *(смяецца)*. Прыйдзецца так і зрабіць.

М і к о л а. Толькі ты нам цяпер не патрэбен. *(Да Сямёна.)* Правільна, брыгадзір?

К і с я л ё ў. За што ж такая няласка?

М і к о л а. Хапае нам і тваёй мілай жонкі. Яна ў брыгадзе як будзільнік. І верашчыць, і звініць... Праўда, хлопцы? Слухай, прыладзіў бы ты яе да гаршкоў і да дзетак, а?

У новым плацці, памаладзелая і расчуленая, уваходзіць з вуліцы А к у л і н а. На грудзях у яе медаль.

А к у л і н а. Галубочкі! Родненькія! І мяне ўзнагародзілі! За доблесную працу. А што я такое доблеснае зрабіла?

К і с я л ё ў. Тады вярні ўзнагароду.

А к у л і н а. Што?! Як вярні? А калі мой муж на фронт пайшоў, хто замяніў яго каля стан-

ка? Акуліна Фёдараўна Нічыпаровіч! Вось хто! А пасля вайны хто аднаўляў разбураны горад? Акуліна! І сюды, у гэтае балота, Акуліна адна з першых прыехала! І кухаркай была, і прачкай... Для рабочых старалася! А ты... ты... *(Плача.)*

К і с я л ё ў. Цётка Акуліна! Я ж пажартаваў!

Па лесвіцы спускаюцца К о р а н ь і К а л я д а.

К о р а н ь. Значыцца, парадак такі. Мітынг адкрываю я. Даю слова Зорыну. Між іншым, дзе ён?

К а л я д а. На сёмым, як заўсёды. Перад пускам вырашыў праверыць яшчэ раз кожную дэталь.

К о р а н ь. Зусім знямогся чалавек... Пасля Зорына — ад моладзі выпусцім... Хто найбольш праявіў сябе?

М і к о л а. Хіба ўсіх пералічыш? Камсамол!

К о р а н ь. Добра! Выберам на месцы. Што яшчэ? Так! *(Да Кісялёва.)* Ордэры на кватэры — адразу ж пасля мітынгу, і няхай сёння ж людзі спраўляюць наваселле. *(Да Жоры, які ўвайшоў з вуліцы.)* Ты вольны на ўвесь дзень.

З другога паверха сходзіць Н ю р а ў квяцістым шаўковым плацці. Выгляд у яе строгі, важны. Корань прапускае яе наперад.

Н ю р а. Добры дзень, Васіль Пятровіч.

К о р а н ь. Здарова, маладзіца.

Н ю р а *(азірнуўшыся на Кісялёва, які стаіць унізе)*. Васіль Пятровіч, я да вас са скаргаю.

К о р а н ь. У такі дзень? На каго?

Н ю р а. На свайго мужа.

К о р а н ь. Нешта вельмі скора. Цікава...

Н ю р а. Скажыце, ён мае права на кватэру?

К о р а н ь. А як жа! У першую чаргу.

Н ю р а. Вось! А ён мне што кажа? У апошнюю! У нас жа сям'я!

К і с я л ё ў. Нюра!

Н ю р а *(лагодным тонам)*. Іду, іду, Ванечка... *(Да Кораня.)* Васіль Пятровіч, зрабіце нам для шчасця сям'і...

К о р а н ь. Для шчасця сям'і — можна!

К і с я л ё ў. Нюра! Не прыставай!

Н ю р а *(спускаючыся да Кісялёва)*. Я нічога... Пагаварыла трошкі з начальнікам. Такі слаўны дзянёк!

К і с я л ё ў. Ой, глядзі! Будзе табе слаўны дзянёк!

У с е выходзяць. Астаецца адзін Цуканаў. Падыходзіць да дзвярэй пакоя дзяўчат, стукае.

Ж о р а. Вера... Ты адна? Хто, хто... Ну, я! Жора... Што? А я гавару — пусці! Вось яшчэ, узяла моду... Колькі можна здзекавацца з любімага мужчыны! Упусці, кажу! Пагаварыць трэба...

В е р а *(з'яўляючыся ў дзвярах)*. Пра што?

Ж о р а. Хіба няма пра што?

В е р а. Няма! *(Хоча зачыніць дзверы, Жора падстаўляе бот.)* Выйдзі! Мне на цябе глядзець агідна...

Ж о р а. Ай! Ну, навошта так... катэгарычна?

В е р а. Заслужыў! Хопіць!

Ж о р а *(бядуючы)*. Прападзе такі чалавек...

І праз каго? Праз бабу... Ай-яй-яй! Такі чалавек!

**Вера.** Чалавек... Інфузорыя ты, а не чалавек.

**Жора.** Што-што? Інфузорыя?.. Ты мне кінь гэту заалогію!

Войкнуўшы, **Вера** з трэскам зачыняе дзверы. Цуканаў азіраецца. З другога паверха спускаецца **Корань.**

Паўза.

**Корань.** Так... Чалавекам быць не лёгка. Свінней куды лягчэй.

**Жора** *(пахмура)*. Адпусцілі б вы мяне. Паехаў бы...

**Корань.** Добра. Адпушчу. Паедзеш. А далей што?

**Жора.** Мне б толькі вырвацца.

**Корань.** Ну, вырвешся. А далей? Пустата. Адбушуеш і завянеш.

**Жора** *(з нечаканай шчырасцю)*. Васіль Пятровіч... Хочаце — верце, хочаце — не... Мне цяпер усё роўна. Толькі я ж да яе ўсёй душой... Я не ведаю, што са мною цяпер робіцца. А толькі я нібы нешта вельмі дарагое навекі страціў. Яна мяне інфузорыяй назвала, і вы... таксама. А яна ж была маім лепшым другам. Выйдзеш, бывала, ад яе, сядзеш у машыну — і такая сіла ў руках, ляціш як птушка. Гаварыць са мною не хоча. Растапталі ўсю маю гордасць... Эх!

**Корань.** Не гордасць, а фанабэрыю тваю растапталі. А калі ў цябе ёсць сапраўдная гордасць, ідзі да яе, прасі прабачэння. Можа і да-

руе, калі любіць. А прагоніць — сам вінаваты. Ідзі!

Ж о р а. І пайду!

Ж о р а рашуча адчыняе дзверы ў пакой дзяўчат. І адразу ж адтуль выбягае В е р а. Корань усміхнуўся, але робіць выгляд, што нічога не ведае.

К о р а н ь. Ты што ж, брыгадзірша, на мітынг не збіраешся?

В е р а. Скончылася маё свята, Васіль Пятровіч. Мітынгуйце без мяне.

К о р а н ь. Як гэта без цябе? Сёмы пускаем! На месяц раней тэрміну. З яго пачынае жыць наш завод. Хіба ты не чакала гэтага дня? Там жа ёсць і твая праца. Хутчэй адзявайся, прышпільвай ордэн — і на мітынг. Выступіш ад моладзі.

В е р а *(з запалам)*. А што ж? І выступлю. І скажу. Вось такім дурніцам, як сама. Скажу: дзяўчаты, як нам ні цяжка, а духам падаць не будзем. У кожнай з нас сваё маленькае, часта не вельмі ўдалае жыццё, а калі ўсе мы разам, жыццё наша становіцца вялікім і прыгожым. Мы будуем гарады і заводы. Мы асвойваем новыя землі, мы... *(Глянула на Кораня і збянтэжылася.)*

К о р а н ь. Правільныя тэзісы! Зацвярджаю. Вось так і скажаш. Прыходзь. *(Ідзе да дзвярэй.)*

Паварот сцэны. Пакой дзяўчат. Пасярэдзіне стаіць на каленях Ц у к а н а ў. Уваходзіць В е р а.

В е р а. Стаіш?

Ж о р а. Стаю!

Вера. Стой. (*Заходзіць за шырму, мяняе плацце, прычэсваецца перад люстэркам.*) Не мулка стаяць?

Жора. Мулка.

Вера. Гэта добра.

Жора. Эгаістка! Толькі пра сябе думаеш...

Вера. І пра яго.

Жора. Дык ён жа і мой!

Вера. Не. Ты яму не бацька.

Жора (*падпаўзае да яе, абдымае за ногі*). Дурная! Люблю!

Вера. Я гэта не раз чула: і дурная, і люблю.

Жора. Верачка! Даруй! Ну, памучыла, памучыла ж. Хопіць. Прападу я без цябе, прападу...

Вера. Прападай. Невялікая страта... Пайду. Мяне людзі чакаюць.

Жора. А я, значыцца, не чалавек, так? Мяне растаптаць можна... Ідзі. А я стаяць буду. Дзень буду стаяць. Тыдзень буду стаяць. Год! Усё жыццё! Увесь век! Мне цяпер усё роўна.

Вера. Стой. А я пайду. (*Выходзіць у вестыбюль і ў знемажэнні прыхінаецца да дзвярэй. Непакорная, шчаслівая ўсмешка кранае яе губы.*) Любіць. Любіць! Прыпоўз, родненькі! (*Асцярожна прачыняе дзверы, заглядвае ў пакой.*) Стаіць! Гора ты маё горкае! Ведаю, нацярплюся я яшчэ з табою, баламутам, а толькі сіл маіх больш няма... (*Ціха ўваходзіць у пакой, падыходзіць да Жоры і моўчкі апускаецца на калені побач з ім, кладзе яму руку на плячо.*)

Жора (*сумна*). І што гэта такое на мяне

найшло? Замарачэнне нейкае... Уніжаюся, а сораму няма. Нават радасна. І чым ты мяне ўзяла? Перавярнула ўсю душу...

В е р а *(прытуліўшыся)*. Дурненькі мой, не перавярнула, а на месца паставіла.

Ж о р а. Верыш?

В е р а *(цвёрда)*. Веру.

Ж о р а. Табе добра са мною?

В е р а. Добра. А табе?

Ж о р а. Яшчэ не разабраўся. Трэба пажыць. Можна ўстаць?

В е р а. Ой, што ж я! Хутчэй! Уставай! Сёння ж свята. Хадзем да людзей. Цяпер нам не будзе сорамна перад імі.

Узяўшыся за рукі, яны выходзяць у вестыбюль. І адразу ж аркестр зайграў марш. Паўз вокны праплываюць сцягі і транспаранты.

Глядзі! Вунь нашы! Хадзем! *(Выходзяць.)*

Інтэрнат апусцеў. Іграе музыка і чуваць крокі дэманстрантаў. Раптам музыка абрываецца. Шырока адчыніліся дзверы, і з вуліцы ўносяць на руках непрытомную Л ю б у. Каля яе Г а н н а і З о р ы н. Ганна машынальна папраўляе валасы. Л ю б у ўносяць у пакой Зорына.

К а л я д а. Як гэта здарылася?

С я м ё н. А так і здарылася... Стаміўся чалавек...

К а л я д а. Ад чаго?

С я м ё н. Ці мала ад чаго стамляецца чалавек... Кажуць, метал — і той стамляецца. А гэта ж чалавек!

К а л я д а. Яна ўпала?

С я м ё н. Упала... Жыў чалавек і ўпаў...

Каляда. Зверху, з рыштаванняў?

Сямён. Не, ужо спускалася ўніз... Усю работу закончылі і спускаліся ўніз... *(Сярдзіта.)* І нашто табе ўсё гэта высвятляць цяпер?

У пакоі Зорына. Ганна, скамянелая, сядзіць каля Любы ў галавах. Зорын стаіць на каленях перад канапай і, нахіліўшыся над Любай, глядзіць ёй у твар.

Зорын. Люба!.. Гэта я... Сяргей... Скажы мне што-небудзь... Я зразумею...

Ганна *(глуха)*. Што яна можа табе сказаць...

Зорын *(у роспачы)*. Люба! Даруй! За ўсё даруй! Што? Што яна сказала?

Ганна *(нахіляецца да Любы, слухае)*. Яна кажа, што ты ні ў чым не вінаваты... Што яна шчаслівая... *(Раптам устае, сурова.)* Але я не дарую! Не магу дараваць!

Абхапіўшы галаву рукамі, Зорын, хістаючыся, ідзе да дзвярэй. Усе перад ім расступаюцца. Ён выходзіць у вестыбюль. Насустрач яму ўбягае з вуліцы ўстрывожаная Надзея.

Надзея. Сяргей! Гэта праўда?

Зорын *(глядзіць на Надзею, як бы ўспамінаючы яе)*. А... Гэта ты... Надзя... Ты заўсёды побач, калі мне...

Надзея. Не адчайвайся.

Зорын. Асірацеў я... А яшчэ так доўга трэба жыць.

Уваходзіць Корань. Надзея адышла да акна, адвярнулася, хаваючы слёзы. Корань спыніўся каля дзвярэй.

Корань. Яна там?

Зорын кіўнуў галавою.

К о р а н ь уваходзіць у пакой, набліжаецца да Ганны, якая па-ранейшаму сядзіць каля Любы.

А к у л і н а. Ганна Рыгораўна... Вось і муж ваш прыйшоў...

Здалёку пачулася музыка.

Г а н н а (*здрыганулася*). Музыка...

А к у л і н а. У людзей свята.

Г а н н а. У людзей свята... І Любачка наша там... Яна ж працавала. Старалася. Праўда?

К о р а н ь. Ганна... (*Робіць знак Акуліне.*)

А к у л і н а (*абняўшы Ганну, спрабуе яе па-весці*). Хадзем, галубка. Няхай дзіцятка адпачывае.

Г а н н а. Пакіньце мяне. Не суцяшайце. Я зусім спакойная. Бачыце, я спакойная... (*Рыдае.*)

К о р а н ь. Ганна!

А к у л і н а. Няхай паплача. Выплача гора... І я, старая, каля яе пасяджу. А ты, бацька, ідзі. Табе няма чаго тут рабіць.

Зацямненне.

У вестыбюлі на лесвіцы, апусціўшы галаву, сядзіць З о р ы н. Музыка прыглушаная, трывожная. Гучыць тэма Часу.

Ч а с. Устань.

З о р ы н. Навошта?

Ч а с. Трэба ісці.

З о р ы н. Куды?

Ч а с. У будучыню.

З о р ы н. Я не магу без яе.

Ч а с. Яна не дайшла.

Некалькі рэзкіх акордаў, і шырокая, светлая мелодыя, у якую ўключаюцца ўсе інструменты, вырываецца

на прастор. Уваходзіць Корань. Зорын устае і падыходзіць да яго.

Зорын. Яна так марыла аб шчасці... І не дачакалася яго.

Корань. Думаючы аб шчасці для ўсіх, мы часта забываем тых, каго любім, хто побач з намі... І жыццё бязлітасна карае нас.

Зорын *(у роспачы)*. Дык няхай бы мяне! Мяне!

Корань. Будзь мужны, Сяргей. Ты не маеш права.

Перад імі ўзнікае блакітны небасхіл, і да яго бяжыць удалечыню шырокая, прамая дарога.

Бачыш, небасхіл наблізіўся! А за ім — наша светлая мара. Яшчэ некалькі крокаў, і мы ўбачым наш заўтрашні дзень.

Зорын. Апошні крок заўсёды цяжкі.

Корань. І мы павінны зрабіць яго! Бо навошта мы жылі? Навошта пралілі столькі крыві і поту? Навошта былі нашы пакуты і сумненні? Навошта? Пойдзем жа! Час кліча!

Яны выходзяць на дарогу. Пераможна, урачыста грыміць музыка.

*Заслона*

# 2×2=?

## *Сцэны з жыцця бацькоў і дзяцей*

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ:

Ярашэвіч Васіль Мікалаевіч
Алена Аляксееўна
Юра
Пеця
Іра
Вася Несцярок
Круглоў Цімафей Феафілавіч
Валерыя Герасімаўна
Іосіф (Ося)

*Дзе адбываюцца падзеі гэтай гісторыі?*

*Ды ў любой сям'і. У любым горадзе, у любым мястэчку і вёсцы, дзе жывуць бацькі са сваімі дзецьмі, са сваімі турботамі і трывогамі, радасцямі і спадзяваннямі, перамогамі і паражэннямі...*



## 1

Перад фасадам стандартнага дома дзесьці ў раёне мясцовых Чаромушак з'яўляюцца Юра, Ося і Іра. Яны вяртаюцца пасля заняткаў у школе.

Юра *(нюхае паветра)*. Гарым, браточкі! Гарым!

Іра. Ой, гэта ж у нас гарыць!

Ося. Гарэлым салам пахне...

Іра *(крычыць)*. Бабуля! Ба-ба Се-ра-фі-ма!

Юра і Ося *(разам)*. Ба-ба Се-ра-фі-ма-а-а!

Чуваць голас бабы Серафімы: «Чаго галосіце, быццам вас рэжуць?»

Іра. Дык гарыць жа! *(Голас бабы Серафімы: «Сала смажу. Вось і гарыць».)* А чаму такі дым? *(«Дурніца! Раз гарыць, дык і дыміць...»)*

Юра *(смяецца)*. Ну і бабуля ў цябе! Філосаф.

Ося. А наш дом з першага па шосты паверх аднымі філосафамі нашпігаваны. Музейныя экспанаты... Можна дуба даць ад самоты.

Іра. Робат ты, а не чалавек! Няма ў цябе цікаўнасці да жывых людзей.

О с я. А што цікавага? Робат — зусім другая справа! Тэхнічны цуд!

І р а. Сам ты... тэхнічны цуд! Не, хлопчыкі! Для мяне ёсць толькі адзін цуд...

Ю р а. Ты сама.

І р а. Усе людзі! І я хацела б усіх ведаць, з кожным сябраваць...

О с я. Ну і жаданні!

Ю р а. А гэта новая мода: распісвацца ў любві да ўсяго чалавецтва, а любіць аднаго сябе. Ірка ніколі не адстае ад моды...

І р а. Гэта гумар? Можна смяяцца? Ха-ха-ха.

Паўза.

О с я. Ір! А вунь твой кот мацыёніць... Глядзі, на якую верхатуру забраўся!

І р а. Вось валацуга! Вяртаецца дахаты брудны, як парсюк...

Чуваць голас П е ц і: «Юрэц! Глядзі сюды!»

Ю р а *(падняў галаву, крычыць)*. Чаго табе? Якое пісьмо? Ад бацькі? Кідай! *(Зверху падае пісьмо.)* Вось маляўка! Марку ўжо сцібрыў *(праглядвае пісьмо)*. А ведаеце, якая зараз гарачыня ў Гаване? Сорак у цяні!

О с я. Вось гэта тэмпературка! *(Спявае.)* «Гавана, Гавана-а-а-а... Цудоўны край мой!» Вось дзе рай! Хачу на Кубу!

І р а. Я таксама!

О с я. Зайздрошчу твайму бацьку. Але я буду не я, калі не пабываю там... *(Паклон.)* Сіньярыта! Ці не згодны...

І р а. Згодна, згодна! Хоць зараз!

Іра робіць некалькі рухаў у стылі іспанскіх танцаў, шчоўкае пальцамі, імітыруючы кастаньеты. Падыходзіць Вася Несцярок.

Вася. Канцэрт па заяўках, ці што?

Ося. А! Гэта ты... Гегемон!

Вася. Інтэлігенцыя!

Ося. Не прызнаеш?

Вася. Вось з'явіцеся да мяне ў цэх на практыку. Паглядзім!

Ося. Палохаеш?

Вася. Не. Цану вашу хачу ведаць...

Ося. А навошта? Купляць нас збіраешся?

Вася. Патрэбны вы мне...

Іра. Пралетарыят і інтэлігенцыя абмяняліся думкамі...

Ося. Спачатку іх трэба мець...

Вася. А ты маеш?

Ося. Маю.

Вася. Далёка пойдзеш, калі маеш.

Ося. Ды, мабыць, далей за цябе...

Юра. Старыкі! Хопіць вам пікіравацца... *(Да Васі.)* Пісьмо ад бацькі прыйшло... Усяму цэху прывітанне...

Вася. Дзякую ад усіх нашых... Ён думае вяртацца?

Юра. Піша, што чакаюць сафры. Будуць выпрабоўваць машыны ў справе...

Іра. А што такое сафра?

Ося. Рэзка цукровага траснягу.

Іра. А-а-а...

Вася. Бэ-э-э-э...

Юра. Ося, вунь твой бацька...

Вася. Увага! Увага! Нашы тэлекамеры ўстаноўлены ў двары нумар 38 па вуліцы Свет-

лая... Вы зараз бачыце на сваіх блакітных экранах Цімафея Феафілавіча Круглова! Усё прагрэсіўнае чалавецтва вітае яго. Увага! Вось ён дастае з кішэні кавалак батона... Глядзіце ўважліва! Зараз паважаны Цімафей Феафілавіч будзе частаваць галубоў... Які высакародны ўчынак! Пакуль жывуць на свеце такія людзі...

Ося. Змоўкні!

Вася. Нельга пажартаваць?

Ося. Мне абрыдлі твае бязглуздыя жарты!

Паўза.

Вася. Ты што — сапраўды пакрыўдзіўся? Даруй. Салют інтэлігенцыі! Трэба на змену... *(Пайшоў.)*

Ося *(глядзіць яму ўслед)*. І ён быў нашым сябрам...

Іра. Чаму быў?

Ося *(задуменна)*. Жылі-былі тры таварышы... Як у казцы. Але ж мы расцём... Казкам надыходзіць канец.

Іра. Я не разумею цябе...

Ося. Дзе ж табе разумець, калі ты збіраешся сябраваць з усім чалавецтвам. А я не Хрыстос, каб усіх любіць... Ну, магу я не любіць грамадзяніна Несцярка? Магу ці не магу?

Юра. Можаш. Але чаму?

Ося. Таму што, калі мы былі саплівымі падшывальцамі, Васька Несцярок верхаводзіў намі. Мы яго слухаліся, бо ён быў спрытны, смелы і кулак у яго быў мацнейшы за наш... Мы зайздросцілі яму... Я нават пайшоў у секцыю бокса... Вельмі ж мне хацелася ўзяць

над ім верх... З боксам у мяне нічога не атрымалася, але яго перавага скончылася... І цяпер Васька Несцярок будзе заўсёды зайздросціць нам...

Юра. Чаму?

Ося. Таму, што вось тут (*стукае пальцам сабе па лбе*) у нас больш, чым у яго.

Юра. Ты ў гэтым упэўнены?

Ося. А ты — не?

Паўза.

Іра. Хлопчыкі, сёння з вамі не цікава. Чао! (*Пайшла.*)

Ося. Чао! Вечарам на тым жа месцы? (*Іра кіўнула галавою.*)

Юра. Слухай... Ты заўсёды такі ці толькі перад Іркай...

Ося. Мне няма чаго перад ёю, што ты там думаеш... Вось вам з Васькай... (*Юра зрабіў рух да Осі.*) Бой не прымаю! Я за мір!

Юра. Ведаеш, што я табе скажу...

Махнуў рукою, пайшоў. Ося памкнуўся следам.

Ося. Юрка! Ты што? Ты ж ведаеш... Няма ў мяне лепшага сябра, чым ты... Ці я вінаваты, што Ірка... Юра! Пачакай...

Уваходзіць Круглоў. У руцэ — «авоська», паўнюсенькая бутэлек з-пад баржому. Глядзіць на сына. Потым перавёў позірк у той бок, куды пайшоў Юра.

Круглоў. Пасварыліся? Не любяць яны цябе?

Паўза.

Ося (*падняў галаву, уважліва глядзіць на бацьку*). А ты... Ты мяне любіш?

Круглоў. Дзіўнае пытанне!

Ося. Чаму дзіўнае?

К р у г л о ў. Я твой бацька. Ты мой сын. Гэтым усё сказана.

О с я. А ці ўсё?

К р у г л о ў *(насцярожана)*. Я цябе пакрыўдзіў?

О с я. Ды не.

К р у г л о ў. Канечне, з табою больш маці нянькалася... Ты быў, як кажуць, мамчын сынок... Ты павінен цяпер разумець... Маё жыццё поўнасцю належала народу, і вельмі мала заставалася часу на сям'ю... Але ты мой сын! І я хачу, каб ты сеў на свайго каня, добра прышпорыў яго і на ўсім скаку, алюрам, алюрам у самастойнае жыццё!

О с я *(усміхнуўся)*. Я ж не кавалерыст...

К р у г л о ў. Зразумела, зразумела... Час зараз другі. Другія і коні...

О с я. Вось іменна. А на маім матаролеры далёка не заедзеш...

К р у г л о ў. Нічога! Прыйдзе час — зменіш на «Волгу»...

О с я. Лёгка сказаць...

К р у г л о ў. Вядома — не лёгка *(ляпае сына па спіне)*. Галоўнае, каб хрыбет быў моцны і гнуткі...

О с я. Навошта?

К р у г л о ў *(пасміхаецца)*. Каб раней часу не пераламаўся. А таму — не трэба лезці на ражон. Не трэба лезці з уласнымі парадамі, калі іх у цябе не пытаюць. Не спяшайся прымаць рашэнні, пакуль іх не прыняў той, хто вышэй цябе...

О с я. Бог, ці што?

К р у г л о ў *(смяецца)*. А табе палец у рот

не кладзі! Разумееш гумар. Гэта добра. У наш час трэба разумець гумар. Ухваляю. Вось я табе і кажу: другі час, другія коні! Я ўжо свайго стаенніка з'ездзіў, а твой яшчэ дзікуном гуляе ў чыстым полі... Няхай пагуляе, спрыту набярэцца. А мне, сынок, засталося толькі пехтурою па пенсіянерскае пітво шпацырыць...

Ускінуў «авоську» з бутэлькамі і, схіліўшы галаву, павольна ідзе. Ося праводзіць бацьку задуменным позіркам. Чуваць жаночыя галасы. Ося пайшоў.

Калі ён хаваецца за вугал дома, з'яўляецца, цяжка дыхаючы, Валерыя Герасімаўна. У руцэ — паўнюсенькая сумка. Валерыя Герасімаўна ставіць сумку на лаўку і плюхаецца сама побач. Следам уваходзіць Алена Аляксееўна, маці Юры і Пеці.

Алена Аляксееўна. Ося — цудоўны хлопчык. Ветлівы, кемлівы...

Валерыя Герасімаўна. Ося! Мая радасць, маё жыццё. Я зраблю ўсё, каб ён быў шчаслівы. Ён будзе славутым скрыпачом! Як Саша Хейфіц, як гэты... дылда... Ну як яго?

Алена Аляксееўна. Ван Кліберн?

Валерыя Герасімаўна. Во-во. Ён самы... Музыка — гэта прыгожа і грошай шмат.

Алена Аляксееўна. А ці ёсць у яго талент, прызванне?

Валерыя Герасімаўна. Калі няма, дык будзе. Я не пашкадую ніякіх сродкаў! Трэба, мая дарагуша, прыслухоўвацца да пульсу часу. Музыка ў наш час — усё! Куды ні сунься — усюды музыка! Ад нараджэння да пахавання — усё пад музыку! Вы ведаеце, калі я хавала сваю бедную мамачку, у колькі ўляцеў нам духавы аркестр? Сто рублёў, як адна ка-

пейка! А што яны сыгралі? Трэнь-брэнь калі выносілі, брэнь-трэнь калі закопвалі... Я вам так скажу. Быў час, калі ўсе лезлі ў начальства. Кожны хацеў кіраваць! Цяпер на гэта мода прайшла. Вось мой Цімафей. Што засталося ад Цімафея Круглова? А вось Іосіф Круглоў будзе гонарам рускай музыкі! Не сысці мне з гэтага месца!

Алена Аляксееўна. Зайздрошчу вашаму аптымізму.

Валерыя Герасімаўна. Чаго-чаго, а аптымізму ў мяне хапае. Хапіла б здароўя. Але аптымізм аптымізмам, а галоўнае, своечасова прыняць меры. Вы ведаеце, я перадаю Осю ў рукі новага маэстры.

Алена Аляксееўна. Навошта? Аляксандра Сяргееўна вельмі вопытны педагог...

Валерыя Герасімаўна. Можа быць, можа быць. Але маэстра Куперштòк праслухаў майго Осю і вось так паківаў галавою... (*Ківае галавою.*) Ён сказаў, што метад Аляксандры Сяргееўны — анахранізм. Сёння ўся справа ў тэхніцы. А Аляксандра Сяргееўна дзяўбе, нібы дзяцел: індывідуальнасць, індывідуальнасць! Нам патрэбны віртуозы, а не індывідуалісты! Калі трэба, я магу сказаць Аляксандры Сяргееўне гэта прама ў вочы...

Алена Аляксееўна. Аляксандра Сяргееўна — інтэлігентная жанчына...

Валерыя Герасімаўна. За такія грошы і вярблюд стане інтэлігентным. Не будзе пляваць куды папала... Неяк у заапарку гэты гарбаты інтэлігент ляпнуў мне прама... (*Ляпае далонню сябе па галаве.*) А я толькі

што зрабіла перманент... Не, дарагуша, далей ад такой інтэлігенцыі... Бо з кім павядзешся, ад таго і набярэшся. Неяк я заходзіла да іх... Пакойчык, як кабіна ліфта. Ірачка спіць на раскладушцы...

Алена Аляксееўна. Мае хлопцы таксама. А што будзеш рабіць?

Валерыя Герасімаўна. Прабачце, дарагуша, але ў такіх умовах цяжка захаваць сваю культуру.

Алена Аляксееўна. І ўсё ж гэта культурная сям'я. І бабуля Серафіма, і Аляксандра Сяргееўна. А Ірачка? Цудоўная дзяўчынка!

Валерыя Герасімаўна. У вас, дарагуша, усе цудоўныя. А калі б гэта было так, дык мы б даўно з вамі жылі ў камунізме...

Алена Аляксееўна. Можа вы і маеце рацыю, але Ірачка вельмі мне падабаецца.

Валерыя Герасімаўна. Ха! Яна не толькі вам падабаецца. У гэтым і справа. Тут трэба вока ды вока. Вось мой Ося сябруе з вашым Юрам. І я нічога супраць не маю. Але ж каля іх пасецца гэты Васька Несцярок...

Алена Аляксееўна. Яны ж сябруюць... *(Голас Пеці: «Мам! А Юрэц каструлю з кісялём перакуліў!»)* Ой! Пайду. Пакуль яны кватэру дымам не пусцілі... Заходзьце, калі ласка!

Алена Аляксееўна пайшла. Увайшоў Круглоў. Павесіў «авоську» на спінку лаўкі, сеў. Цяжка дыхае, сапе, адкашліваецца, выцірае хусцінкай твар. Валерыя Герасімаўна глядзіць на яго з такім выразам на твары, быццам праглынула нешта кіслае. І раптам яна пачынае хлюпаць носам, плечы яе закалыхаліся.

Цімафей Феафілавіч скасавурыўся на яе і адвярнуўся
Валерыя Герасімаўна адчыніла сумачку, капаецца ў ё

Валерыя Герасімаўна. Ірад! Дай чым слёзы выцерці...

Круглоў (працягвае ёй хустачку). Нешта ў апошні час з цябе зашмат вады выліваецца.

Валерыя Герасімаўна. Мучыцель... Ты дачакаешся — ад мяне застанецца мок... месца.

Круглоў. Вялікае месца будзе. Куп... можна.

Валерыя Герасімаўна. Ты ўсё ж... цё купаешся ў маіх слязах!

Круглоў. Ох, любіш ты трагедыі ра... дзіць...

Валерыя Герасімаўна. А ці ж гэ... не трагедыя? Зрабіць такую памылку: звяз... сябе на ўсё жыццё з такім шэрым-шэры... лавекам!

Круглоў (пакрыўджаны). А ты ... Блакітна-ружовая?

Валерыя Герасімаўна. Якая б ... была — разумнейшая за цябе. Што б ты без мяне рабіў?

Круглоў (смяецца). Нічога б не рабіў!

Валерыя Герасімаўна. Бачыш! Гора ты маё горкае...

Круглоў. Гора тваё горкае хоча есці. Пайшлі дахаты...

Валерыя Герасімаўна. Цярпі. Ты на галоднай дыеце...

Круглоў. Хочаш голадам мяне замарыць?

Валерыя Герасімаўна. Пры чым тут я? Гэта ж лекары...

## 2

Пакой кватэры Ярашэвічаў, які можна лічыць гасцінай. Сучасная мэбля, некалькі афортаў у непафарбаваных рамках. Пакой абстаўлены з добрым густам — нічога лішняга, усё да месца.

Юра стаіць перад люстрам у дзверцах серванта і аніпуліруе гантэлямі. Пеця расклаў на стале сваю алекцыю заўзятага філатэліста. З кухні ўваходзіць Алена Аляксееўна, дастае з серванта посуд.

Пеця. Мам! Глянь! *(Маці падыходзіць да лла.)* Нічога сабе марачка?

Алена Аляксееўна. Чыя гэта?

Пеця. Бераг Слановай Косці. А ведаеш, у колькі яна мне ўляцела? *(Уздыхае.)* Усю эшту з хлеба і цукру...

Алена Аляксееўна. Пеця! Ты даў мне ...а...

Пеця *(уздыхае)*. Даў... І не стрымаў. Хобі ...не загубіць...

Алена Аляксееўна. Не, гэта вы мяне загубіце, дзеткі мае мілыя! Разам з бацькам... Той валэндаецца па ўсяму беламу свету, а гэтыя панавыдумлялі сабе розных хобі...

Юра. Ма! Шкадуй клеткі. Яны дадзены толькі на адзін раз...

Алена Аляксееўна. Дзякую за параду, мой дарагі Юры Васільевіч! Магу і табе таксама даць параду...

Юра. Ма! Твае парады для мяне закон! Давай!

Алена Аляксееўна *(смяецца)*. Баламуты! На вас і злавацца па-сапраўднаму нельга. Несур'ёзныя вы людзі. Ты ўпэўнены, што

вось гэта маханне гантэлямі завецца культурызмам? Ты памыляешся. Кажу табе як урач. У цябе ніякай сістэмы. І, шчыра кажучы, не думай, што мускулы ўпрыгожваюць чалавека...

Пецяя. Чалавека ўпрыгожваюць мазгавыя звіліны.

Алена Аляксееўна. Правільна! *(Пайшла.)*

Юра *(кінуў гантэлі пад стэлаж, глядзіць на паліцу)*. Гэй ты, разумнік! Зноў узяў «Дэкамерона»? Рана табе чытаць такія кнігі. Пакладзі на месца!

Пеця. А біблію мне можна чытаць?

Юра. Біблію? Чытай!

Пеця. Біблію можна, а «Дэкамерона» нельга? Чаму?

Юра. Таму, што ў бібліі ты ўсё роўна нічога не зразумееш.

Пеця. А ў «Дэкамероне» ўсё зразумею?

Юра. На «Дэкамерона» ў цябе звілін хопіць.

Пеця. Не, не хапае ў мяне звілін. Вось ніяк не магу зразумець! У калідоры на сценцы напісана: «Ося, Вася, Юра плюс Іра раўняецца любоў». Дык што гэта будзе? Вы ўсе жэніцеся на гэтай...

Юра. Вось я цябе зараз ажаню! *(Пеця адскочыў.)* Ці не ты сам гэту муць нашкрэбаў? Ці Валерка? Скажы яму, калі злаўлю...

Пеця. А чаго ты злуеш? Не жаніся на гэтай Ірцы, і ўсё!

Алена Аляксееўна *(на парозе)*. Пётр Васільевіч, скажыце, калі ласка, хто гэта падае голас з-пад майго ложка?

Пеця. З-пад ложка?

Алена Аляксееўна. Так, так, з-пад ложка.

Пеця. А-а! Гэта, мабыць, Вецярок.

Алена Аляксееўна. Які яшчэ «вецярок»?

Пеця. Сістэмы — звычайная дварняга.

Алена Аляксееўна. А ты не знаходзіш, што месца для гэтай сістэмы на двары?

Пеця. Ма, гэта не гуманна.

Алена Аляксееўна. Глядзі ты на яго, гуманіст аб'явіўся!

Пеця. Сабакі ўнеслі такі вялікі ўклад у навуку! Асабліва ў медыцыну, мама. Сабака — лепшы сябар чалавека!

Алена Аляксееўна. Зараз жа забяры свайго сябра з-пад ложка і памый рукі. Будзем абедаць. *(Пеця выходзіць.)* Ох, зусім вы мяне замардавалі. Але трымайцеся! Вось прыедзе бацька...

Юра. ...бацька нас рассудзіць!

Алена Аляксееўна. А што мне рабіць? Я ўжо для вас не аўтарытэт. Для вас наогул няма аўтарытэтаў! Вялікімі разумнікамі сталі.

Пеця *(уваходзячы)*. Якімі вачыма ён глядзеў на мяне! Ніколі не забуду гэты позірк... Ведаеце, што ён мне сказаў?

Алена Аляксееўна *(усміхаецца)*. А гэты размаўляе з сабакам! І разумеюць адно аднаго! А чаму ты не разумееш вось так настаўніцу нямецкай мовы? Чвэрць хутка пройдзе, а ў цябе двойка...

Пеця. Дык не выклікае!

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Чаму сам не напомніш?

П е ц я. Сама ж вучыш: трэба быць сціплым...

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Ой, загубіць цябе такая сціпласць!

## 3

Другая палова дня. Ю р а, О с я і В а с я сядзяць верхам на зэдліках пасярод пакоя. Кожны трымае шклянку з нейкім пітвом. Да сценкі прымацаваны польскі кіначасопіс з фота Брыджыт Бардо.

Ю р а (*падае шклянку*). За ББ!

В а с я. Ух! За такую красунечку — палову жыцця!

О с я. Гледзячы што гэта за жыццё...

В а с я. Ну, вядома! Тваё жыццё пойдзе па другой цане...

О с я. А я не збіраюся гандляваць маім жыццём.

В а с я. Пажывём — пабачым!

Званок. Ю р а прыслухаўся і бяжыць адчыняць. Вяртаецца з І р а й.

І р а. Распустай займаецеся, хлопчыкі? Фі! І што асаблівае знаходзяць у гэтай ББ? Я ж прыгажэй за яе! Хіба не?

В а с я. Вочы ў цябе прыгожыя...

Ю р а. Але яны не люстэрка тваёй душы...

І р а. Падумаеш! Не хапала мне, каб кожны дурань заглядваў у маю душу.

В а с я. А душа ў цябе ёсць?

І р а. Ёсць! Чыстая, нібы алмаз!

В а с я. Ай... Звычайныя яны шкельцы, што валяюцца на сметніку. Сонейка пападзе, яны і зазіхацелі...

О с я. Гэта ў цябе звычайная зайздрасць загаварыла.

В а с я. Каму зайзросціць? Ці не табе?

О с я. Мне! Яму! Ёй! Усім, хто здольны ўзяць ад жыцця больш, чым некаторыя. А табе заўсёды будзе здавацца, што цябе падманулі, аб'ягорылі, выхапілі прама з зубоў. Ці не так?

Паўза.

Ю р а. Старыкі! Ша! Што гэта з вамі? Як толькі сустрэнецеся — пачынаеце кідацца адзін на аднаго... *(Да Осі.)* Ну чаго ты чапляешся да яго?

О с я. Памыляешся, старык. Гэта ён да нас чапляецца. Мы без яго як-небудзь пражывём, а ён без нас не можа...

І р а. Нічога не разумею!

В а с я. Што тут незразумелага? Яго вялікасць Іосіф Круглоў не жадае дыхаць адным паветрам з плебеем Несцяркам... Генія корчыць! Разлічвае на асаблівае месца ў жыцці. Па якому праву?

Ю р а. Старыкі! Скончым! *(Уключае магнітафон.)* Даю Акуджаву!

Усе робяць выгляд, што слухаюць. Але настрой сапсаваны. Вася памкнуўся яшчэ нешта сказаць, але Юра робіць знак: маўчы!

Званок. Ю р а хапае шклянкі, бутэльку, часопіс з кіназоркай і бяжыць адчыняць. Вяртаецца з П е ц ь к а м.

Падонак. Чаму звоніш, як мама?

П е ц я. А таму, што калі я званю, як я, дык ты не вельмі спяшаешся адчыняць. *(Юра прымацаваў на старое месца часопіс, ставіць шклянкі і бутэльку.)* Та-а-а-ак! Бытавое разлажэнне. Жанчыны. Віно. Музычка... *(Катэгарычна.)* Скажу маме.

Ю р а. У, маляўка!

П е ц я. Дай глынуць — не скажу.

В а с я *(працягвае сваю шклянку)*. Давай, старык, глыні!

П е ц я *(паспрабаваў)*. Цьфу! Хлебны квас.

О с я. А ты што думаў?

П е ц я. Думаў — каньяк.

Ю р а. Гэць адсюль! Каша ў духоўцы, малако ў халадзільніку... *(Пеця пайшоў.)*

В а с я *(смяецца)*. Смешны ў цябе пацан.

Ю р а. Дурны яшчэ...

І р а. Я штосьці не заўважыла, каб вы былі разумнейшымі. Ну аб чым тут можна спрачацца?

В а с я *(хмура)*. Аб жыцці...

І р а. Ну і што такое жыццё?

О с я. Форма існавання бялковых цел.

І р а. І ўсё?

О с я. Усё астатняе табе растлумачыць вялікі філосаф нашага часу Вася Несцярок, а мне трэба ісці. *(Бярэ футляр са скрыпкай.)*

І р а. Ося! Я забылася табе сказаць... Мама не будзе з табой займацца.

О с я. Ведаю. Сёння я іду да маэстры Купер-штока... Слухай, старуха. А ці не пахне тут нейкай змовай? А! Пляваць! *(Ціха.)* Вечарам на старым месцы... *(Іра кіўнула галавой і пачырванела.)* Чао!

Юра. Чао...

Ося глядзіць у бок Васі — той разглядае каробкі з магнітафоннымі запісамі. Ося ўсміхаецца. Юра падыходзіць да Васі, выключае магнітафон.

Старыкі! Вашы лапы! *(Узяў руку Васі.)* Ося! Ірка! Вось так!

Яны трымаюцца за рукі. Але згоды няма. Гэтага не бачыць толькі Юра. Першым выцягвае сваю руку Вася.

Ося. Ну, іду на сваю музычную катаргу.

Ося пайшоў. Чуваць галасы: «Добры вечар, Алена Аляксееўна!» — «Вечар сёння цудоўны! Нават у хату не хочацца з вуліцы ісці... А ты, Осенька, заўсёды са скрыпкай! Быць табе вялікім музыкантам...»

Вася. Эх! Не паспеў змыцца... Зараз будзе гвалт.

Юра. Не гавары глупства!

Вася *(да маці Юры, якая ўжо на парозе).* Я прыйшоў сказаць, Алена Аляксееўна, што вашы шмоткі маці памыла...

Алена Аляксееўна. Па-першае, добры вечар. *(Вася ківае ў адказ.)* Па-другое, шмоткі — што гэта?

Вася. Ну-у, бялізну...

Алена Аляксееўна. Так бы і казаў. Юра, збегай да іх, прынясі...

Вася. Я сам! *(Пайшоў.)*

Юра. Мам... Навошта ты так з ім?

Алена Аляксееўна. Не трэба так хвалявацца. Ужо не скажы пра Васю ні слова... Ірусю! Якая ты шыкоўная! Усё табе да твару, усё з густам... Не тое, што мае абармоты! Ты паглядзі на Юру. Кожны дзень раблю напамінак: пастрыжыся! На каго ён падобны? Снежны чалавек!

І р а. А зараз мода такая.

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Ох! Гэтыя мне моды! Зараз будзем вячэраць. Іруся, ты з намі...

І р а. Не, не, Алена Аляксееўна! Я ніколі не вячэраю...

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Зусім дарэмна! У твае гады яшчэ можна не турбавацца — добрая вячэра фігуру не сапсуе... Хлопчыкі вы мае! А хлеба зноў няма! Юра, марш у булачную.

Ю р а. Няхай Пецька.

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Пецька згубіў мой давер. Не вяртае рэшту...

П е ц я *(уздыхае)*. Філатэлія патрабуе ахвяр...

Ю р а. З-за гэтай філатэліі ты вырасцеш злодзеем.

П е ц я *(пакорна)*. Усё можа быць... *(Да Юры.)* Ты ідзі, пакуль булачная працуе...

Ю р а. У, маляўка! Прыладзіўся. Ір! Ты мяне пачакай, добра? *(Пайшоў.)*

П е ц я. Ідзі, ідзі. Я яе затрымаю.

І р а *(усміхаецца)*. Чым жа ты мяне затрымаеш?

П е ц я. Пытаннем — ці верыш ты ў бога?

І р а. Ну і спытаў! Як жа я магу верыць, калі яго няма?

П е ц я. Для каго няма, а для каго і ёсць.

І р а. А ты што — паверыў у бога?

П е ц я. Ага.

І р а. І калі гэта здарылася?

П е ц я. Сёння. На матэматыцы. Я прыклады не зрабіў... А матэматычка ў нас ведаеш якая?

Усіх наскрозь бачыць. Мы яе «рэнтгенам» клічам. Ну, сяджу, дрыжыкі прадаю. І раптам падумаў: бог, калі ты сапраўды ёсць, зрабі так, каб настаўніца мяне не выклікала! *(Увайшла маці і робіць знак Іры, каб яна не звяртала ўвагі — няхай расказвае...)* І калі яна мяне не выклікае, дык абяцаю паверыць у цябе на ўсё жыццё!

Іра. І што — паслухаў цябе бог?

Пеця. Ага. Нават і не паглядзела ў мой бок! Валерку выклікала, бац — дваялу! А мне — хоць бы хны! Я цяпер да самага дзесятага класа спакойны. Калі што якое, дык бог дапаможа!

Іра. Няўжо будзеш верыць у бога?

Пеця. Ага! І ў бога і ў чорта.

Алена Аляксееўна. Можаш верыць хоць у Магамета! А ўрокі будзеш рабіць!

Пеця. З дапамогай усявышняга! *(Бяжыць з пакоя.)*

Іра. Смешны ён у вас!

Алена Аляксееўна. Такі смешны, што плакаць хочацца.

Іра *(усміхаецца)*. Мая мама таксама любіць пііліць, а калі адпусціць куды — тут жа тэлеграму дае, каб я вярталася....

Алена Аляксееўна. Тваёй маме грэх цябе піліць. Дзяўчынка — гэта не хлопцы ў сям'і...

Іра. І мая кажа: калі б у яе былі хлопцы, дык яна б гора не ведала. Вось і зразумей вас!

Алена Аляксееўна. Нічога. Пройдзе час — зразумееце. Ды яшчэ пашкадуеце, што так доўга не разумелі... Але я вельмі задаволе-

на, што ты сябруеш з Юрам. Твой добры ўплыў на яго вельмі адчувальны... Праўда, сучасным дзяўчынкам падабаюцца зусім іншыя... Вось такія, як Ося...

І р а *(сумелася)*. Ваш Юрка таксама карыстаецца поспехам...

А л е н а А л я к с е е ў н а. Няўжо?

І р а. Адна дзяўчынка ў нашым класе прама ўся змарнела... А ён нічога не заўважае...

А л е н а А л я к с е е ў н а *(усміхнулася)*. А ён не заўважае... А ведаеш чаму? Не ў яе бок глядзіць...

В а с я *(уваходзіць з вузлом бялізны)*. Вось вашы шмоткі... Прабачце, бялізна.

І р а. Да пабачэння, Алена Аляксееўна.

А л е н а А л я к с е е ў н а. А Юра прасіў, каб ты яго пачакала...

І р а. Няма часу. Я яшчэ ўрокі не рабіла...

В а с я. Я таксама пайду.

А л е н а А л я к с е е ў н а. Пачакай... Скажы шчыра — ты падгаварваў Юру кінуць школу разам з табою? Падгаварваў! Ну, кінуў ты школу. А навошта ты гэта зрабіў?

В а с я. Таму, што я дэфектыўны.

А л е н а А л я к с е е ў н а. Адкуль гэта табе вядома?

В а с я. Доктар сказаў. Паглядзеў на рэнтгене і сказаў, што ў мяне адной клёпкі не хапае...

Паўза.

А л е н а А л я к с е е ў н а. Дзіўны ты чалавек, Вася Несцярок. Ну, чаму табе хочацца быць горшым, чым ты на самай справе ёсць?

Вася (*разводзіць рукамі*). Дэфектыўны!

Алена Аляксееўна. Ну, добра. Можаш быць дэфектыўным. Мне ўсё роўна. Толькі дай мне слова, што ты не будзеш падбіваць Юру на кепскае...

Вася. А на добрае можна?

Алена Аляксееўна. Ты не хочаш мяне зразумець... Я маці! І я хачу, каб маім дзецям ніхто не перашкаджаў.

Юра (*ён стаіць на парозе*). Мама!

Вася паглядзеў уважліва на Алену Аляксееўну, на Юру і пайшоў.

Алена Аляксееўна. Юра... Я хацела...

Алена Аляксееўна пайшла да акна, прыткнулася лбом да шыбы. Юра глядзіць на яе.

Дзень павялічыўся... Ужо дзевятая гадзіна, а яшчэ светла... А бацькі нашага ўсё няма і няма... (*Званок тэлефона.*) Паслухай... Мабыць, зноў мяне ў бальніцу выклікаюць...

Юра (*у трубку тэлефона*). Ну, кватэра Ярашэвіча... Валерка? Чаго табе? А ты зрабіў тое... Сцёр? А на лаўцы? Як не ты? Я, брат, тваю чорную руку ведаю... І калі яшчэ раз убачу надпісы — абламаю рукі! (*Крычыць.*) Пецька!

Пеця (*уваходзіць, бярэ трубку*). Космас слухае! Апаратура працуе дакладна. Праз дваццаць хвілін выходзь на стыкоўку.

Алена Аляксееўна (*ціха, дакорліва*). А ўрокі, сынок?

Пеця (*цяжка ўздыхае*). Чуеш, Валера...

Выхад у адкрыты космас часова адкладваецца... Чаму, чаму... Зачамукаў... Непаладкі ў сістэме. У якой сістэме? (*Паглядзеў у бок маці і брата. Юра паказаў яму кулак.*) У сістэме выхавання...

Ю р а. Ідзі адсюль! Гэць! (*Пеця выходзіць. Юра падыходзіць да маці, абдымае яе за плечы.*) Ма! Ты на нас не вельмі крыўдуй...

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Крыўдую ці радуюся — усё роўна я жыву толькі вамі... А вы? І ты, і Пецька, і бацька...

Ю р а. Бацька наш во! (*Выставіў вялікі палец.*) Гэта ўсе кажуць. Ведаеш, як пра яго на заводзе гавораць? Чалавек з камунізма! Думаеш, гэта за прыгожыя ягоныя вочы гавораць?

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Гэта ўжо, мабыць, камсамольцы прыдумалі...

Ю р а. І нічога яны не прыдумалі! Цяпер возьмем нас з Пецькам. Не такія мы ўжо падонкі, каб такі лямант падымаць...

А л е н а  А л я к с е е ў н а. А чаму кепска вучыцеся?

Ю р а. Ну, не зусім жа кепска. Цярпіма.

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Цярпіма?! Адны тройкі. У наш касмічны век на тройках далёка не паедзеш. Дзе сядзеш, там і злезеш. Табе не поўны год застаўся. Адзін толькі год! А што далей?

Ю р а. Далей будзе відаць. Беспрацоўных жа ў нас няма! Знойдзецца і для мяне справа...

А л е н а  А л я к с е е ў н а. І табе ўсё роўна, што рабіць?

Ю р а. А ў нас любая праца — ганаровая.

Алена Аляксееўна. Вось так можна размаўляць толькі спадзеючыся, што юнацтва табе дадзена на ўсё жыццё. Дурань! Не паспееш агледзецца, а яго ўжо і следу няма! Павер мне...

Юра. Дык што, за хвост трымаць гэтыя самыя маладыя гады?

Алена Аляксееўна. Выліты ты бацька! Такі ж несур'ёзны...

Юра. Выліты?

Алена Аляксееўна. Цюцелька ў цюцельку!

Юра. А ты яго пакахала!

Алена Аляксееўна. Зрабіла такое глупства. Ён жа прыгажун, а я...

Юра. А бацька гаворыць, што прыгажэй за цябе нікога няма на свеце...

## 4

Вечар. Вокны ў доме асветлены ў блакітны, ружовы, жоўты колеры. Каля вугла стаяць Іра і Ося.

Іра. Не! Не веру! Не хачу верыць!

Ося. А ты павер.

Іра. Але ж тое, што ты гаварыў,— звычайны цынізм!

Ося. А чаму не звычайная логіка і цвярозы погляд на рэчаіснасць? У школе, у камсамоле нам даўбуць і дзяўбуць аб рамантыцы... Нават збіраць металалом рамантычна! Нас прывучаюць амаль з калыскі верыць, што наперадзе нас чакае цікавае, рамантычнае жыццё. Усіх чакае! Ну, а раз так, мы пачынаем вучыцца

абы-як. Усе турботы аб сабе мы перадаём усялякім адказным дзядзям... Кінуць яны кліч: усе на заводы звычайнымі рабацягамі — калі ласка! Усе на асваенне цаліны — гатовы!

Іра. Ну, а як жа інакш?

Ося. Інакш? Ну, а што, калі я не хачу ўсё жыццё стаяць ля станка?

Іра. Можаш быць міністрам. Хто табе не дае?

Ося. Міністрам? Не, гэта не для мяне. Мяне цікавіць электроніка — будучае тэхнікі. І тут не рамантычны лямант патрэбны, а востры розум, упартасць, уседлівасць. І набольш мазгавых звілін. А яны ў мяне ёсць, ты ведаеш. А ўся гэта паэзія дальніх дарог і ўсялякая другая рамантычная мура не для мяне.

Іра. Гэта ж няпраўда! Моладзь едзе па закліку сэрца, і працуе не шкадуючы сіл... А які энтузіязм!

Ося. Вось на энтузіязм такіх дурніц, як ты, і разлічваюць некаторыя. Ім і трэба, каб мы не шкадавалі сваіх сіл. А я шкадую! Бо хачу размеркаваць іх рацыянальна, каб прынесці больш карысці... Ты, канечне, яшчэ не станеш глядзець на свет маімі вачыма. Але пройдзе час, і ты сама ўбачыш, што нас, рацыяналістаў, стане больш, чым гэтых наіўных рамантыкаў. Мы яшчэ жывём кожны сам па сабе, але прыйдзе час і мы возьмемся за рукі... (*Бярэ Іру за руку.*) І ты будзеш побач, бо ты самы дарагі для мяне чалавек...

Іра (*задуменна*). Калі ты так гаворыш, мне вельмі хочацца верыць табе... Але вось я застаюся адна, і...

О с я. Нічога. Гэта пройдзе. Як двойчы два — чатыры... Позна ці рана, а з гэтым прыйдзецца згадзіцца...

І р а. Я так хачу табе верыць! Так хачу...

Яны абдымаюцца. У глыбіні двара з'явілася В а л е р ы я Г е р а с і м а ў н а. І р а войкнула, вызвалілася з рук Осі і пабегла.

В а л е р ы я Г е р а с і м а ў н а *(падыходзячы)*. Гм... Нічога сабе... Красуня... Толькі гэта несур'ёзна...

О с я. А чаму ты рашыла, што гэта несур'ёзна?

В а л е р ы я Г е р а с і м а ў н а. Таму, што ты не думаеш аб выніках.

О с я. Да іх яшчэ далёка.

В а л е р ы я Г е р а с і м а ў н а. Вынікі з'яўляюцца, калі іх не чакаеш. Па сабе ведаю. Ну, і што далей?

О с я. Кажу, я пра гэта яшчэ не думаў.

В а л е р ы я Г е р а с і м а ў н а. А трэба думаць, мая радасць, трэба думаць. Ну, які пасаг у тваёй красуні, апроч прыгожай мордачкі? Дачка пасрэднай настаўніцы музыкі, безбацькоўшчына, жывуць у цеснаце і крыўдзе...

О с я. Якое гэта мае значэнне?

В а л е р ы я Г е р а с і м а ў н а. Вялікае, сынок, вялікае. Самае галоўнае, не зрабіць памылкі ўпачатку...

О с я. Але я яе кахаю!

В а л е р ы я Г е р а с і м а ў н а. Ну і няхай сабе! Я гавару не пра каханне.

О с я. А пра што?

В а л е р ы я Г е р а с і м а ў н а *(шматзначна)*. Я гавару пра жыццё. Вось паслухай, ма-

лыш, сваю мамачку... Калі б дзевятнаццаць гадоў таму назад яна пайшла замуж за таго чалавека, якога кахала, дык мне нават цяжка сабе ўявіць цяпер, што гэта было б за жыццё... А ён быў малады, прыгожы. А як ён спяваў пад гітару!..

Ося. Мама, навошта такія падрабязнасці?

Валерыя Герасімаўна. Сапраўды — навошта? Адны хваляванні... Дык вось, калі б тваім бацькам стаў той чалавек, а гэта вельмі лёгка магло здарыцца, дык сёння не было б у цябе ні асобнага пакоя, ні модных касцюмаў, ні матаролера... Жылі б мы ў адным пакойчыку і лічылі б кожную капейку... Я была б ужо старэнькай бабулькай... А ён прыходзіў бы дамоў амаль кожны дзень п'яны і здзекаваўся б з мяне і з цябе...

Ося. Чаму?

Валерыя Герасімаўна. Таму, што з гэтага прыгажуна, з гэтага захаплення маёй маладосці нічога не атрымалася. Як пачаў звычайным электраманцёрам, так, бадай, і скончыць...

Ося. А ён яшчэ жывы?

Валерыя Герасімаўна. Жывы! Такія вельмі жывучыя... Аднойчы я яго нават бачыла. Ён ажаніўся. Пяцёра дзяцей. Жывуць кепска. Жонка хварэе.

Ося. А ён... п'е?

Валерыя Герасімаўна. А што яму застаецца? Цяпер ты разумееш, чаму я аддала перавагу твайму бацьку?

Ося. Не, не разумею...

Валерыя Герасімаўна. А што тут

незразумелага? Ты паслухайся сваёй мамачкі! У тваім класе вучыцца дачка дырэктара завода. Вельмі міленькая! Чаму ты яе не прыкмеціў?

О с я. Прыкмеціў, што яна вялікая дурніца...

В а л е р ы я  Г е р а с і м а ў н а. Ну і што? Думаеш твая дарагая мамачка ў такіх гадах была вялікая разумніца? Але ў яе хапіла розуму зрабіць свой выбар і пабудаваць сваё жыццё, як ёй хацелася... Дык на гэта пры тваёй дапамозе хопіць розуму ў гэтай... як яе завуць?

О с я. Тамара.

В а л е р ы я  Г е р а с і м а ў н а. Прыгожае імя!

О с я. Мама! Зразумей жа! Я люблю Іру! І гэта сур'ёзна.

В а л е р ы я  Г е р а с і м а ў н а. Я разумею. Ты ўжо надаваў ёй усялякіх абяцанняў і, як высакародны малады чалавек, хочаш стрымаць сваё слова... Глупства!

О с я. Мама! У мяне ёсць сваё асабістае жыццё...

В а л е р ы я  Г е р а с і м а ў н а (*абурылася*). Яго асабістае жыццё! Тваё асабістае жыццё — гэта маё асабістае жыццё! Ося! Ты для мяне ўсё: радасць, святло, надзеі... І калі ты мяне не паслухаеш, я памру. Вось так лягу і памру. Абяцай мне...

О с я. Я абяцаю табе...

В а л е р ы я  Г е р а с і м а ў н а (*падазрона*). А што ты мне абяцаеш?

О с я. Што ты з-за мяне не памрэш.

В а л е р ы я  Г е р а с і м а ў н а. Ну, глядзі! Стрымай сваё слова...

## 5

У Ярашэвічаў госці з выпадку вяртання з-за мяжы гаспадара. Васіль Мікалаевіч і Круглоў сядзяць за сталом. Гаспадыня раскінула на тахце перад Валерыяй Герасімаўнай заморскія падарункі. Рабяты зацікавіліся магнітафонам і транзістарам.

Круглоў. Федзю бачыў?

Ярашэвіч (*не зразумеў*). Якога... Федзю? А! Кастро... Бачыў... Некалькі разоў на мітынгах. І на сафру ён да нас прыязджаў...

Юра. Тата! Ты гаварыў з ім?

Ярашэвіч. Вось як з табой... Ён цікавіўся канструкцыяй нашых машын. Я тлумачыў... Потым нават разам абедалі...

Круглоў. Цікавы дзядзька.

Валерыя Герасімаўна. Сапраўдны мужчына! У-у-ух!

Круглоў. Можа б, прытрымала язык за зубамі?

Валерыя Герасімаўна. Падумаеш... Атэла-раўнівец знайшоўся. (*Схапіла нейкую стракатую сукенку, разглядае.*) Якая прыгажосць! Умеюць людзі рабіць прыгожыя рэчы!

Круглоў. Ну, а гэтага, які падпаліў траснікі, схапілі?

Ярашэвіч. Сам прыйшоў.

Круглоў. Сам? Контррэвалюцыянер?

Ярашэвіч. У тым і складанасць барацьбы на Кубе... Гэта быў звычайны батрак... Усё жыццё нічога свайго не меў... ні кала ні двара, ні сям'і, ні зямлі... А вось пайшоў супраць народа, падняў руку на рэспубліку...

Круглоў. Як жа гэта ён?

Ярашэвіч. Яшчэ пры Батысце задаўжаў сваймў пану-плантатару і лічыў сябе навекі яму абавязаным. А тут з'явіўся сынок гэтага пана. Вось ён і патрабаваў, каб гэты небарака падпаліў плантацыю...

Вася. Схапілі гэтага гада?

Ярашэвіч. Ледзь было ўжо не ўцёк. Але пагранічнікі ля самай ужо нейтральнай паласы далі па яго маторцы залп і — да акул...

Алена Аляксееўна. Дзе толькі страляніна — там абавязкова мой муж...

Ярашэвіч. Гэта ты дарэмна. Дзе страляюць, там я не быў... Кубінцы і самі справіліся.

Алена Аляксееўна. А навошта ў агонь сігануў?

Ярашэвіч. Аленка! Я ж табе гаварыў... Машыны мае гарэлі, як жа я мог спакойна глядзець?

Круглоў. Мабыць жа сапраўды табе, як замежнаму спецыялісту, неабавязкова было лезці ў агонь?

Ярашэвіч. Нават не пускалі...

Алена Аляксееўна. Ну вось!

Вася. Страшна было?

Ярашэвіч. Страшна, цёзка, вельмі страшна... Акіян агню! Аж да самага небасхілу палыхае полымя... Уражанне такое, быццам гарыць уся зямля... Кінуўся я ратаваць машыны, а думаў пра цябе, Алёна, пра хлопцаў сваіх... Быццам іх ратаваў...

Круглоў. Канечне... І ўсё ж... Калі цябе не пускалі — навошта лез? Гэта парушэнне дысцыпліны... Калі кожны пачне рабіць тое,

што яму хочацца,— ніякага парадку, анархія. Кожны павінен выконваць свой абавязак... і ніякай самадзейнасці!

Вася. Дык Васіль Мікалаевіч яго і выконваў...

Валерыя Герасімаўна. О! Вася Несцярок падае голас у абарону недысцыплінаванасці. Яму дысцыпліна, што сабаку ашэйнік...

Ося. Мама! Не твая справа!

Валерыя Герасімаўна. Дык мне ён, як вы кажаце, да лямпачкі! І няхай бы ён не круціўся каля вас. Цімох! Не чапай селядзец!

Круглоў. Чаму? Ён мне падабаецца.

Валерыя Герасімаўна. Ён яму падабаецца! У страўніку няма жывога месца, а ён хапае селядзец!

Круглоў. Не чапляйся ты за мой страўнік! Пры такой тыраніі я ўсё роўна дам дуба ад інфаркту. Давядзеш!

Валерыя Герасімаўна. Турбуешся аб ім, і вось... падзяка! Алена Аляксееўна! Каб вы ведалі, як я вам зайздрошчу! *(Да Ярашэвіча.)* А скажыце, вам дадуць ордэн за ваш гераічны ўчынак?

Ярашэвіч. Ну, калі пачнуць выдаваць узнагароды толькі за тое, што чалавек выканаў свой грамадзянскі абавязак...

Валерыя Герасімаўна. Як жа інакш?

Ярашэвіч. Самая вялікая ўзнагарода — гэта калі табе не сорамна за свае ўчынкі...

Круглоў *(падняўся)*. Ну, хопіць надакучаць суседзям... Пойдзем дахаты!

Алена Герасімаўна. Куды ж вы? А чай?!

Круглоў. Я па чаю не скучаю. (*Смяецца.*) Некалі ж пісаў вершы...

Ося (*здзіўлены*). Ты... пісаў вершы?

Валерыя Герасімаўна. Гэтыя вершы ён прысвячаў мне...

Круглоў (*адышоў да Ярашэвіча*). Пагаварылі мы з табою... І неяк лягчэй на сэрцы.

Ярашэвіч. А што цябе непакоіла?

Круглоў. Як табе сказаць, каб ты мяне зразумеў... Вось ішоў на пенсію, і раптам боязна стала... Як без нас у вас справы пойдуць?

Ярашэвіч. Як бачыш — ідуць! І няблага ідуць!

Круглоў. Ідуць, ідуць... Бачу. Але вось іх (*ківае ў бок рабят*) вам ужо не ўзяць у рукі... Адбіліся! Яны яшчэ вам пакажуць, дзе ракі зімуюць...

Ярашэвіч. Нам? Мы што — другая дзяржава?

Круглоў. Дзяржава ў нас адна. Ды людзі розныя! У нас быў парадак! На кулямёты ішлі, калі трэба было... А гэтыя?!

Ярашэвіч. І гэтыя пойдуць. Калі трэба будзе.

Круглоў. Чакай! Пойдуць. У рэстаран. На танцулькі. Не-е-е, распесцілі! Відаць, пасяшаліся нас на пенсіі паспіхваць... Мы такую эпоху на сваіх плячах вынеслі! І ёсць, ёсць у нас яшчэ порах у парахаўніцах!

Вася. Ёсць, толькі ўжо сыплецца!

Круглоў. Бачыш? Ніякай павагі!

Ярашэвіч. Растуць...

Круглоў (*уздыхае*). Прайшло жыццё...

Ярашэвіч. Для каго прайшло. Для каго пачынаецца. Закон жыцця.

Круглоў. Закон! А яго парушаць нельга! Нельга...

Вася (*падышоў да Ярашэвіча*). Васіль Мікалаевіч... Дазвольце мне на адзін дзень узяць японскі транзістар... Хачу разабрацца ў схеме.

Ярашэвіч. Бяры. Цікавішся? Гэта добра...

Круглоў (*смяецца*). Вася Несцярок хоча ўцерці нос Японіі! Ты спачатку майстар-ламайстар свой вытры. (*Вася машынальна шморгае рукавом пад носам*). Вось так!

Вася (*раззлаваўся*). А ну вас да... манахаў!

Круглоў. Но, но! Цішэй!

Ярашэвіч. Дарэчы, Вася, твая шасцяронка цалкам вытрымала экзамен. Абавязкова наладзім выпуск гэтых шасцяронак па тваёй тэхналогіі!..

Круглоў. Ну, хопіць гасцяваць!

Алена Аляксееўна. Не спяшайцеся. Гасцюйце... Мы так рэдка збіраемся...

Валерыя Герасімаўна. Рэдка, ды метка! (*Смяецца.*)

Валерыя Герасімаўна цалуецца з гаспадыняй, ідзе следам за Кругловым. Потым пайшоў Ося.

Алена Аляксееўна. Вася! Ты чай піць будзеш?

Вася (*беражліва трымае ў руцэ транзістар*). Не! Дзякую вам... Я таксама пайду...

Ю р а. Мы праводзім Васю...

Ю р а, П е ц я і В а с я пайшлі. Алена Аляксееўна падыходзіць да мужа, абдымае яго, лашчыцца.

А л е н а А л я к с е е ў н а. Хопіць! Больш нікуды цябе не пушчу! *(Цалуе.)* Не пушчу! Не пушчу! Не пушчу! Ты чуеш?

Я р а ш э в і ч. Не, не чую...

А л е н а А л я к с е е ў н а. Але ты павінен пачуць мяне, калі любіш...

Я р а ш э в і ч. Люблю! Люблю! Ты гэта ведаеш. І мне хочацца заўсёды быць разам з табою, з нашымі хлопцамі...

А л е н а А л я к с е е ў н а. Васілёк ты мой! Каб ты ведаў, як мне цяжка з імі цяпер! Што з імі робіцца — не разумею!

Я р а ш э в і ч. Растуць хлопцы. А гэта, кажуць, вельмі складаны працэс. Дзеці! Цяжка з імі, а без іх яшчэ цяжэй... Ведаеш, калі я кінуўся ў агонь, бачу — ляжыць тварам уніз на ахапцы трысцягу хлопчык... І шыйка ў яго танюсенькая, валасы льняныя кучаравяцца... Я аж увесь здрыгануўся: Пецька мой! Падняў я хлапчука, прыціснуў да сэрца і пабег... Бягу, а ўжо дыхаць няма чым. А тут калдобіна нейкая. Грохнуўся я ў гэтую яміну... Але гэта і выратавала — агонь верхам пайшоў...

А л е н а А л я к с е е ў н а. Не трэба! Не трэба ўспамінаць... Гэта жудасна!

Я р а ш э в і ч. Так, жудасна. Таму гэтага не павінна быць! Дык ці схаваешся за сценамі сваёй хаты, калі гэта ёсць і з гэтым трэба змагацца?

А л е н а А л я к с е е ў н а. Я ўсё разумею!

Тут *(дакранулася лба)* усё ўкладваецца! А вось тут *(паклала руку сабе на сэрца)*, тут не хоча! І нічога з ім не магу зрабіць...

Ярашэвіч прыцiскае яе да сябе, цалуе.

## 6

Зіма. З вуліцы ўваходзіць Я р а ш э в і ч. Рука ў яго яшчэ на перавязі, і ёй ён прыціскае трубкі чарцяжоў. Алена Аляксееўна дапамагае яму распранiцца.

Я р а ш э в і ч. Ну і кругаверць сёння! Сняжынкі вось такія! *(Сцяў кулак.)* Даўно такой снежнай зімы не было. Будзем з ураджаем! *(Глядзіць на жонку.)* Та-а-а-ак! Мы ў кепскім настроі...

А л е н а А л я к с е е ў н а. Васіль! Не да жартаў.

Я р а ш э в і ч. А я і не жартую.

А л е н а А л я к с е е ў н а. Што будзем рабіць з дзецьмі?

Я р а ш э в і ч. А што з імі трэба рабіць?!

А л е н а А л я к с е е ў н а. Ну, калі ты такі спакойны, дык сам займайся іх выхаваннем.

Я р а ш э в і ч. Супакойся... Што здарылася?

А л е н а А л я к с е е ў н а. Што?! Зараз сустрэла Пецькаву піянерважатую. І ведаеш, што яна мне расказала? *(На парозе з'яўляецца Пеця.)* Няхай ён сам!

Я р а ш э в і ч. Прашу вас, малады чалавек.

П е ц я *(паціскае плячыма)*. Схапіў двайлу па фізіцы...

А л е н а А л я к с е е ў н а. Да ўсяго яшчэ і фізіка!

Ярашэвіч. Абрадаваў! А што ў цябе за канфлікт з піянерважатай?

Пеця (*паціскае плячыма*). Я ішоў па калідоры. А яна насустрач. І прычапілася, чаму без гальштука... Я на яе вось так паглядзеў... І ўсё!

Алена Аляксееўна. Ён так паглядзеў! Ты сказаў: дурніца.

Пеця. Не гаварыў! Я толькі падумаў. Я ж не ведаў, што наша піянерважатая можа чытаць думкі...

Ярашэвіч (*прыкрыў рот, каб не выдаць усмешкі*). Ты павінен ведаць, што ў наш час кожны дарослы можа чытаць думкі вось такіх блазнюкоў, як ты... Чаму ты не носіш гальштука?

Пеця. А чаму ты на работу ходзіш без сцяга?

Ярашэвіч. Сцяг выносяць толькі ў час вялікіх урачыстасцей...

Пеця. Вельмі разумна робяць! А чаму ж нас прымушаюць насіць яго кожны дзень?

Ярашэвіч. Такі парадак у піянераў.

Пеця. А што — парадкі нельга мяняць?

Ярашэвіч. Але ёсць адзін стары парадак, і вельмі разумны. Бывала, бацька возьме папружку...

Пеця. Тата, мне сорамна за цябе. Я не ведаў, што ты такі... цемрашал. Дазволь мне пайсці.

Ярашэвіч (*разгубіўся*). Ідзі... (*Пеця хуценька знік.*)

Алена Аляксееўна. Ты яго распускаеш! І расце ён сваволнікам!

Ярашэвіч. Алёнка... А можа, гэта не так страшна, як табе здаецца? У іх зараз складваецца характар... І гэты перыяд жыцця самы цікавы, як цуд... Ён здзіўляе і пужае. І зараз мяне больш непакоіць Юра...

Алена Аляксееўна. Ты ж абяцаў пагаварыць з ім як мужчына з мужчынам...

Ярашэвіч. Неяк не атрымліваецца ў нас такая размова... Але мы пагаворым. Абавязкова пагаворым! А зараз добра было б перахапіць чаго, ды трэба ў тэхнічную бібліятэку...

Алена Аляксееўна. Зноў на ўвесь вечар? Не пушчу! Пасядзі сёння дома.

## 7

Каля дома з'яўляюцца Вася, Ося, Юра і Іра. Яны ў спартыўных касцюмах, праз плечы перакінуты канькі. У руках Юры і Васі хакейныя клюшкі. Усе садзяцца на лаўку, выцягваюць ногі.

Ося (*працягвае размову*). Не, я сур'ёзна! Навокал балабоняць: паважайце бацькоў, паважайце бацькоў! Ніякага канфлікту пакаленняў не існуе! Паважайце старэйшых! Паважайце тату з мамай, дзеда з бабкай, цётку з дзядзькамі! За што? За тое, што нас парадзілі?

Юра. Ці справа толькі ў гэтым?

Ося. Ну, як жа! Яны яшчэ далі нам савецкую ўладу. Вялікае дзякуй ім за савецкую ўладу. Гэта лепшая ўлада на зямлі. І другой улады ў нас не будзе і не трэба. Але ўлада — ёсць улада. Гэта мы ўсе разам. А калі мы застаемся паасобку? Адзін на адзін са сваімі

думкамі... Няўжо з нас ніхто не прыкмеціў, што чагосьці не хапае сучаснаму чалавеку?

Вася. У цябе з горла прэ, а табе ўсё мала...

Ося. Цяжка з табой гаварыць, Вася. Праз некаторы час і ты будзеш забяспечан па самыя вушы. Набудуем новых заводаў, фабрык, навучымся здымаць па тры ці чатыры ўраджаі...

Юра. Цікава, чаго ж табе не хапае?

Ося. Не ведаю, як іншым, а мне... Вы чулі аб такім абстрактным паняцці, як свабода духу?

Вася. Дух усялякі бывае...

Іра *(да Осі)*. Свабода духу? Што гэта?

Ося. А гэта, калі ніхто не стаіць над тваёй душою...

Іра. А хто стаіць над тваёй душою?

Ося. Усіх не пералічыш.

Вася. Бач ты яго! Свабоды духу яму захацелася! Чакаеш, што табе гэтую свабоду духу прынясуць на сподачку з блакітнай каёмачкай. Не! Не будзе гэтага! Вось табе свабода духу! *(Тыцнуў дулю.)*

Юра. Два нуль у карысць Васі.

Іра. Я згодна з Васем. За свабоду трэба змагацца!

Ося. Змагайся, пакуль які-небудзь вар'ят не націсне кнопку...

Вася. А калі спатрэбіцца стрымаць руку гэтага вар'ята... Калі спатрэбіцца кінуцца на амбразуру... Кінешся?

Ося. А ты?

Вася. Табе хочацца, каб за цябе гэта зрабіў нехта іншы? Ну, прызнайся!

Ося. А калі не прызнаюся — што будзе?

Вася. Што будзе?

Паўза.

Юра. Хлопцы, хопіць!

Ося (*да Васі*). Чаго чакаеш?

Вася (*раптоўна б'е Осю па твары*). А цяпер ты павінен пляснуць мне ў адказ. Бі! Ну? Я чакаю.

Ося. Не дачакаешся. (*Сустрэўся вачыма з Ірай і ўсміхнуўся.*) Не дачакаешся...

Вася. Змагайся за свабоду духу, гніда!

Іра. Ты... яму даруеш?

Вася. Даруе! Я магу яшчэ раз пляснуць яго па мордзе, а ён зноў даруе. Вось глядзі!

Вася робіць замах, але Юра стаў паміж ім і Осем. Іра адыходзіць і глядзіць на Осю здзіўлена, нічога не разумеючы...

Іра. Чаму ты яму дараваў? Чаму?

Ося. Таму, што я чалавек і не магу біць жывёліну...

Вася. Ах ты гніда! Бачыш! Ён усё можа растлумачыць, ён усяму знойдзе апраўданне. Нават баязлівасці і здрадзе... Ненавіджу такіх! Ненавіджу!

Ося. А я такіх, як ты, шкадую...

Ося пайшоў. За ім следам пайшлі Іра і Юра. Вася глядзіць у іх бок, зрабіў некалькі крокаў следам і прыпыніўся. Сеў на лаўку. Вяртаецца Іра. Глядзіць на Васю.

Вася (*глуха*). Ты прабач мне... Не ведаю, як гэта здарылася... Я не хацеў! Павер, не хацеў... Неяк само атрымалася... Прабач, га?

Іра (*жорстка*). Ніколі! Чуеш? Ніколі. Як

ты мог? А я верыла ўсяму, што ты тут гаварыў... Але не можа быць праўдзівым той, хто можа ўдарыць чалавека...

Вася. Я кажу: не хацеў! Ён даваў мяне!

Іра. Ты яго ўдарыў толькі таму, што ён... Што мы з ім... Ты хацеў яго ўнізіць перада мною... Ведай жа! Ты ўнізіў толькі самога сябе. *(Пайшла).*

Вася застаўся адзін. Сядзіць, апусціўшы плечы. Паваліў снег. Чымсьці засмучаны з'яўляецца Пеця. У руцэ — «авоська». У ёй два батоны, бутэлькі з малаком. Садзіцца разам з Васем.

Пеця. У цябе таксама кепскі настрой?

Вася. У мяне — зразумела. А чаго табе сумаваць?

Пеця *(уздыхае).* Хацеў зрабіць эканомію ў карысць філатэліі, ды прыйшлося купляць білет...

Вася. Як гэта здарылася?

Пеця. Не паглядзеў, ускочыў у аўтобус, гляджу — самаабслугоўванне. Вось і прыйшлося...

Вася. Чаму?

Пеця. Дык усе ж глядзяць! Кожны сам сабе кандуктар і кантралёр...

Вася. Так... Цяжка вам, філатэлістам, даецца самаабслугоўванне!

Пеця. Нейкі наш вораг прыдумаў гэтае самаабслугоўванне... А ў цябе што здарылася?

Вася. Дыскусія.

Пеця. На якую тэму?

Вася. Тэма, браток, адна: адкуль бяруцца ў нашым жыцці падлюгі?

Пеця. А я ведаю! Вельмі шмат настаўні-

каў. Куды ні ткніся — усюды вучаць! Вось назло ім чалавек і робіцца падлюгам...

Вася. Нешта ты блытаеш, старык.

Пеця. Нічога я не блытаю! Па сабе ведаю...

Вася. Не, старык! Трымайся. У гэтай справе галоўнае не прапусціць момант...

Пеця. Які момант?

Вася. Чуў, як рэактыўны самалёт бярэ гукавы бар'ер?

Пеця. Ага! Выстрал чуваць: ба-а-ах!

Вася. Во, во! Дык вось так і з подласцю... Спачатку робіш дробязнае глупства, потым: ба-а-ах! Глядзіш, ты ўжо закончаны падлюга. Зразумеў? *(Пеця кіўнуў галавою.)* Ну, ідзі... Дома хлеб чакаюць, а ты тут філасофію разводзіш...

Пеця. Не адным хлебам жывы чалавек.

Вася *(усміхаецца)*. Міравецкі ты пацан, Пецька! Хочаш сябраваць?

Пеця. Хачу!

Вася *(працягвае руку)*. Трымай! Вось толькі як твая маці на наша сяброўства паглядзіць?

Пеця. Яна ж добрая!

Вася. Я так і думаў... Ну, ідзі.

## 8

Ярашэвіч сядзіць за чарцёжнай дошкай. Зрабіў некалькі рысак і павярнуўся да Юры, які стаіць ля акна.

Ярашэвіч. Чаго ж ты змоўк? Гавары!

Юра. Каб жа ведаць дакладна — чаго вы ад нас патрабуеце?

Ярашэвіч. Ах, вось як! Ты загаварыў ад імя ўсяго свайго пакалення. І не палохае цябе такая адказнасць? Ну, тады і я буду гаварыць з табою ад імя майго пакалення. Улічы: палова нас ляжыць у сырой зямлі. І я буду гаварыць ад іх імя. Я буду гаварыць ад імя майго бацькі, твайго дзеда. Дарэчы, ты ведаеш, колькі было яму год, калі ён упаў з баявога каня пад Перакопам?

Юра. Дваццаць два...

Ярашэвіч. Правільна. Усяго на чатыры гады быў старэйшы за цябе твой дзед...

Юра. Ці я вінаваты, што рэвалюцыя і грамадзянская адбыліся без мяне...

Ярашэвіч. Цябе ніхто не папракае... Ты толькі павінен памятаць, што твой дзед, а мой бацька ахвяраваў сваё жыццё дзеля цябе, і дзеля мяне, і дзеля ўсіх нас... А думаеш, яму не хацелася дажыць да нашых дзён? Яшчэ як хацелася!

Юра. Тата! Я ўсё гэта разумею. Але ж гэта ўжо далёкая гісторыя! І бывае ж так — тое, што калісьці здавалася незвычайным, нават трагічным, зараз выклікае смех... Вось як у старой хроніцы. Бягуць, дзёргаюцца, як у ліхаманцы, белыя генералы на крывых ножках, тоўстыя буржуі мітусяцца... Вельмі смешна! Ці дэманстрацыя крочыць, быццам кожнага ў кіршэнь штурхаюць...

Ярашэвіч. Гэта ж хвалюючыя дакументы! Не разумею, чаму табе смешна... Але няхай! Бо туманныя малюнкі на экране гэта толькі

адбітак гісторыі... Ну, а сама гісторыя нашай Радзімы?! Наш высокі ўзлёт ад Расіі лапцюжнай да касманаўтаў! Ведаеш, колькі каштавала гэта сіл? Зараз незразумела — адкуль толькі яны браліся? І для вас гэта ўсё толькі смешныя малюнкі кінахронікі... Вы спакойна праходзіце міма вялікага цуда...

Юра. Каб мы і захацелі, дык нічога не выйдзе. Бо ўсё, аб чым ты гаворыш, нам пачынаюць гаварыць, калі мы яшчэ ў калысцы ляжым... Дзяўбуць і дзяўбуць!

Ярашэвіч (*падыходзіць да Юры, кладзе рукі яму на плечы*). Юра, я не пазнаю цябе... Калі гэта здарылася?

Юра. А што здарылася?

Ярашэвіч. Не, гэта не ты! Я не магу паверыць, што ты вось так думаеш, гэтым жывеш... Нехта другі ўклаў табе ў галаву гэта смецце. Хто ён? Пакажы мне гэтага мярзотніка, і я сваімі рукамі...

Званок. Нейкая размова ў калідоры. Потым у дзверы заглядвае Алена Аляксееўна.

Алена Аляксееўна. Госць да цябе...

Ярашэвіч. Які госць? Я не чакаю гасцей...

Ося (*уваходзіць*). Гэта я, Васіль Мікалаевіч. Вы мне абяцалі рэванш...

Ярашэвіч. Рэванш дык рэванш! Юра, а ты, калі ласка, зрабі надпісы на чарцяжы... Там алоўкам намечана. (*Юра падыходзіць да чарцёжнай дошкі.*) Толькі без выкрутасаў! Звычайныя прамыя літары...

Юра. Прамыя дык прамыя...

Ося. Зноў мне чорныя. Гэты колер не люблю.

Я р а ш э в і ч. Магу ўступіць белыя.

О с я. Уступак не прымаю.

Я р а ш э в і ч. Пахвальны прынцып.

О с я. У наш час без прынцыпаў нельга.

Я р а ш э в і ч. Правільна!

Ю р а. Ён у нас правільны!

Я р а ш э в і ч. Вось і бяры прыклад.

Ю р а. Падумаю.

О с я *(робіць ход)*. Мой стары хваліўся, што ўчора даў вам мат...

Я р а ш э в і ч. Тактыка ў твайго папашы нейкая... стыхійная! Ніякай сістэмы...

Ю р а. ...адно нахабства!

Я р а ш э в і ч. Юра! Што ты гаворыш?

О с я. У шахматах нахабствам не возьмеш.

Ю р а. А ў жыцці?

Я р а ш э в і ч. Паспрабуй, убачыш.

Ю р а. Ося, паспрабуем?

О с я. Навошта? Мы жывём у незвычайны час! У нахабстве няма патрэбы. Перад намі ўсе дзверы насцеж — заходзь у любыя! Колькі магчымасцей! Дык навошта нахабства? З гэтымі праявамі мы павінны змагацца...

Я р а ш э в і ч *(да Юры, які засмяяўся)*. Ты чаго зайшоўся? Правільна ён гаворыць! Ты не згодзен?

Ю р а. З ім? Ты хацеў бы, каб я з ім быў згодны?

Я р а ш э в і ч. А чаму — не? З кім жа ты згодны?

О с я. Ён дурыцца... Дарэчы, Юра! Заводскія хлопцы прасілі дапамагчы манціраваць новую лінію. Пойдзем? Ведаеш, вельмі цікава! Аўтаматыка і тэлемеханіка!

Я р а ш э в і ч. Схема цікавая. Вы папрасіце майстра, каб ён паставіў вас на мантаж трэцяй лініі. Вось там аўтаматыка! Гэта заўтрашні дзень усяго нашага завода.

О с я. Я вельмі хацеў... Але там Вася Несцярок камандуе...

Я р а ш э в і ч. Ну і што! Гэта я даручыў яму. Ён хлопец кемлівы. І вы ж сябры! Вось і працуйце разам!

О с я. Калі трэба для справы, дык я і з д'яблам працаваць буду... (*Глядзіць на шахматную дошку.*) Здаецца, прыціснулі...

Я р а ш э в і ч. У цябе добры ход фярзём...

О с я. Вось так?

Я р а ш э в і ч (*паказвае*). Лепш вось так... Я губляю пешку.

О с я. Ход добры. Але, прабачце, Васіль Мікалаевіч, мой прынцып — не карыстацца чужым рашэннем...

Я р а ш э в і ч. Зноў жа добры прынцып! (*Юра смяецца.*) Нешта цябе сёння разбірае смех у тых месцах, дзе табе плакаць трэба. Ося! Ты на мяне не звяртай увагі — адкажы яму як трэба!

О с я. Прабач мяне, Юра. Але я заўважыў, што твая ўспрымаючая сістэма, калі гаварыць тэрмінамі кібернетыкі, дзейнічае вельмі прамалінейна...

Я р а ш э в і ч. І прымітыўна!

О с я. Хутчэй — наіўна. Ты згодзен?

Ю р а. Згодзен! Дзякую за добры ўрок, Іосіф Круглоў, непрамалінейна запраграміраваны чалавек нашага часу!

О с я. Рад заўсёды дапамагчы! Узаемадапа-

мога — закон нашага жыцця! За выключэннем шахмат...

Ярашэвіч. Тады зрабіце ваш апошні ход, малады чалавек.

Ося. Та-а-ак... Сюды — мат. Сюды таксама... І сюды... А вось так? Я так... Вы так! І так мат, і гэтак... Рэваншу не атрымалася.

Ярашэвіч (*уважліва глядзіць на Осю*). У цябе ўсё наперадзе.

Ося. На гэта і спадзяюся... (*Да Юры.*) Ну, пойдзем дапамагаць Васілю Несцярку рухаць наперад тэхніку!

Алена Аляксееўна (*уваходзіць*). Ты ж толькі доўга не баўся...

Пеця (*на парозе*). Тата! Можна мне з імі?

Алена Аляксееўна. Яшчэ паспееш гэтага шчасця хлябнуць... Калі так будзеце вучыцца, як вучыцеся, дык дзе дзенецеся? На завод!

Ярашэвіч. А чаго ты палохаеш іх заводам?

Алена Аляксееўна. Я іх не палохаю. Самі спалохаюцца. Вось Ося малайчына! Ён пойдзе ў кансерваторыю, будзе славутым музыкантам...

Ося. А я не пайду ў кансерваторыю.

Алена Аляксееўна. Што ты гаворыш?!

Ося. Я не хачу быць славутым музыкантам.

Алена Аляксееўна. Мама пра гэта ведае?

Ося. Яшчэ не ведае.

Алена Аляксееўна. Калі даведаецца — ох і будзе гвалту...

Ося. Лепш адзін раз перажыць гвалт, чым потым усё жыццё кусаць сабе локці...

Алена Аляксееўна. Такі яшчэ малады і такі ўжо разважлівы! Куды ж збіраешся?

Ося. У політэхнічны.

Алена Аляксееўна. І маці нічога не ведае! Ах, дзеткі, дзеткі!

Ося. Да пабачэння. Мы пойдзем...

Ося і Юра пайшлі. Ярашэвіч стаіць у задуменні.

Алена Аляксееўна. Бачыш, дзеці зусім адыходзяць ад нас! Яны не разумеюць нас, бацькоў...

Ярашэвіч. Мяне непакоіць другое: я пачынаю неразумець іх!

Пеця. А Юрачка зноў без шапкі пайшоў!

Алена Аляксееўна. Вось піжон паршывы! Падхопіць грып, потым танцуй вакол яго...

Пеця. А я прыдумаў, як адным махам перавесці піжонаў! Піжоны ходзяць без шапак, так? Мода такая... Што трэба зрабіць? Няхай хто-небудзь смелы выйдзе ў самы люты мароз у адных трусіках...

Алена Аляксееўна. Што ты трызніш?

Пеця. Не, ты паслухай! Пройдзе гэты чалавек па цэнтры горада, быццам мода такая... А праз некаторы час усе піжоны вымерзнуць, як маманты!

Ярашэвіч (*смяецца*). Арыгінальны праект!

Алена Аляксееўна (*да мужа*). І ён яшчэ здзіўляецца, у каго яны? У цябе!

Ярашэвіч (*смяецца*). Нічога страшнага! Пойдзем чай піць.

Пайшлі. Праз некаторы час у пакой уваходзіць Пеця, асцярожна шыбуе да тэлефона, бярэ трубку.

Пеця. Ало... Гэта кватэра Сямёнавых? Можна Валерку... Гэта яго лепшы друг... Ага, Пеця. Я толькі на адну хвілінку! Валерка! Ты? Інфармуй! *(Слухае.)* Слухай, ты не залiваеш? Інфармацыя дакладная? А то можа ў цябе здзвіг фаз? Не? Тады ты ведаеш хто? Балда! Перадаю па літарах: баран, асёл, лапша, дурань і яшчэ раз — асёл! Вось так! Чаму ты не ўлічыў мой вопыт? Ты думаў! Каб думаць, трэба мець чым думаць... Не чакаў, што ён пачне гаўкаць? Дык гэта ён табе хацеў растлумачыць, што пад ложкам ён ужо сядзеў і з гэтага нічога добрага не атрымалася... Не зразумеў! Дзе там!.. Нават з такім разумным сабакам не мог дамовіцца... Ну і што цяпер будзем рабіць? Дзе ён зараз? На балконе? Тады вось што... Слухай уважліва. Вазьмі кошык, пасадзі ў яго Вецярка, прывяжы вяроўку і перакінь яе на наш балкон... Зразумеў? Паўтараць не трэба, а то твае пачуюць... Дзейнічай! Выходжу ў адкрыты космас... *(Кладзе трубку, асцярожна адчыняе дзверы на балкон, выходзіць і праз некаторы час вяртаецца з кошыкам.)* Калі цяўкнеш — крыўдуй на сябе. Можаш тады сам шукаць сабе прытулак... *(Прыслухаўся і паспешна ставіць кошык за сервант. Уваходзіць Алена Аляксееўна. Падазрона глядзіць на Пецю.)* Мама, ты не памятаеш, калі была другая Пунічная вайна?

Алена Аляксееўна. А іх было дзве? *(Нюхае паветра.)* Зноў у кватэры пахне псінай!

П е ц я. Ды не! Гэта я...

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Хм... Вось не чакала, што мае дзеці будуць пахнуць псінай... Ты адчыняў дзверы на балкон?

П е ц я. Хацеў праветрыць...

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Вось і напусціў з вуліцы псіны... Ідзі дапамажы мне мыць талеркі. *(Пайшла.)*

П е ц я. Іду! *(Нахіліўся да кошыка з сабакам.)* Памятай: тваё шчасце ў сваіх уласных лапах! Зразумеў? Ну, глядзі! *(Званок тэлефона.)* Гэта ты, Валерка? Поўны парадак! Назначаю цябе адказным за харч. Мне нельга! Мама адразу заўважыць... Нічога! Сам не дасі... Табе толькі на карысць. І больш не звані мне па гэтаму пытанню. Поўная канспірацыя! *(Паклаў трубку і адразу ж званок.)* Слухай, калі ты яшчэ раз... Хто? Прабачце! Зараз паклічу. Мама!

А л е н а  А л я к с е е ў н а *(уваходзіць, бярэ трубку)*. Слухаю... Гэта вы, Насця? Не, тэлефон спраўны... Так. Што вы кажаце? Насця, прашу вас, гаварыце прама: гэта Юра? Вася Несцярок? *(Перадыхнула.)* Божухна. Няхай зараз жа рыхтуюць да аперацыі! Еду!

9

Каля дома з'яўляецца В а л е р ы я  Г е р а с і м а ў н а і О с я.

В а л е р ы я  Г е р а с і м а ў н а *(трагічна)*. Дай цябе памацаць. Я павінна быць упэўнена, што ты жывы...

Ося. Жывы, жывы! Ніводнай драпіны...

Валерыя Герасімаўна. Не, не, я павінна сама... Тут не баліць?.. А цяпер прысядзь. Устань! Не баліць? Дай я паслухаю твае грудзі. *(Прыклалася вухам да грудзей Осі.)* Я чую нейкія падазроныя хрыпы!

Ося. Гэта ты чуеш свае хрыпы. А ў мяне парадак. Я цалёханькі!

Валерыя Герасімаўна. Не, не, не! Я наладжу табе строгі каранцін. Толькі тады я супакоюся. *(Падводзіць Осю да лаўкі, усаджвае.)* Высунь язык.

Ося. Мама!

Валерыя Герасімаўна. Ося, не нервіруй мяне! Высунь язык. *(Ося слухаецца.)* Чырвоны... Хіба ён павінен быць чырвоным? *(Дастае люстэрка, глядзіць свой язык.)* У мяне... таксама чырвоны. Ося! Я павінна паказаць цябе прафесару Маркаву.

Ося. Не трэба мяне паказваць!

Валерыя Герасімаўна. Ты не павінен пярэчыць сваёй мамачцы! Толькі яна цябе любіць! Калі я пачула пра няшчасце, у мяне спынілася сэрца... Хачу дыхнуць і не магу!

Ося. Дык гэта не сэрца, а лёгкія.

Валерыя Герасімаўна. Вельмі я думала ў тую хвіліну... Адной нагой я ўжо была на тым свеце... Мой хлопчык! Памятай заўсёды пра мяне! Заводаў шмат, а ты ў мяне — адзін.

Ося. Ты бачыла маці Васі?

Валерыя Герасімаўна. Сустрэла ў прыёмным пакоі паліклінікі. Яна была сама не свая... Я разумею яе гора. Як выхаваны ча-

лавек, падыходжу, каб паспачуваць, а яна глядзіць на мяне нейкімі дзікімі вачыма і маўчыць... *(Прыціснулася вухам да грудзей Осі.)* Дыхні! Дыхні на ўсе лёгкія, мой хлопчык! Я табе даю святую клятву: цяпер ні адзін валасок не ўпадзе з тваёй галавы! Ніякіх заводаў! Ніякіх фабрык! Ты павінен стаць славутым музыкантам, і баста!

## 10

Ноч. Уваходзіць Алена Аляксееўна. За нешта зачапілася. Перачакала, прыслухоўваючыся. Далей пайшла асцярожна. Дабралася да тэлефона, нізка нахіліўшыся да дыска, набірае нумар.

Алена Аляксееўна *(ціха)*. Паліклініка? Гэта вы, Фрося? Ну, як ён? Не спіць? А бром давалі? Дайце яшчэ адзін парашок... І прашу вас, Фрося, званіць мне, калі што... Дамовіліся? Ну, спакойнай вам ночы... *(Паклала трубку, павярнулася, каб пайсці, і ўбачыла на парозе Юру і Пецю.)* Ну, вось! Разбудзіла я вас...

Юра. Мы не спалі...

Ярашэвіч *(уваходзіць)*. Самі не спіце і людзям не даяце... Як ён там?

Алена Аляксееўна. Таксама не спіць.

Юра *(рашуча падыходзіць да тэлефона, набірае нумар)*. Гэта кватэра Кругловых? Можна паклікаць Осю? Спіць? Моцна спіць? А калі ён лёг? Гадзін у дзесяць... Не, няхай спіць. Няхай моцна спіць Іосіф Круглоў... Хто зво-

ніць? Адзін яго знаёмы... *(Паклаў трубку.)* Іосіф Круглоў спіць...

Алена Аляксееўна. Ну, а што ж яму рабіць? Ліха яго мінавала, яму можна спакойна спаць... *(Абдымае сыноў за плечы.)* Калі б з адным з вас здарылася такое няшчасце, я страціла б розум... *(Крычыць на Пецю.)* Колькі разоў табе кажу: не перабягай вуліцу перад машынамі!

Пеця. Я не перабягаю. Я заўсёды чакаю светафора...

Алена Аляксееўна. Я бачыла, як ты чакаеш!

Юра *(задуменна)*. Як жа ён цяпер без рукі жыць будзе?

Паўза.

Алена Аляксееўна. Пойдзем спаць...

Юра. Я ўсё пытаю ў самога сябе... Ці змог бы я? Гэта ж толькі адышоў і раптам — крык!

Алена Аляксееўна. Не трэба і думаць аб гэтым!

Юра. Чаму?

Ярашэвіч. Аб гэтым трэба думаць... Трэба!

Алена Аляксееўна. А ты маўчы! Ты ўжо аднойчы сігануў у агонь, ні пра што не думаючы.

Паўза.

Юра. А раптам бы я не змог?.. Тата! Гэта кепска?

Ярашэвіч. Ну, што табе сказаць? Калі ўлічваць, што ты яшчэ толькі палова сама-

стойнага чалавека, дык твае рашэнні могуць быць палавінчатымі... *(Да жонкі.)* Гаспадыня ты наша добрая! Можа, па шклянцы моцнага чаю... Усё роўна сон перабілі.

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Ніякага чаю! Калі хочаце — па шклянцы малака...

Я р а ш э в і ч. Малако дык малако... *(Алена Аляксееўна пайшла на кухню.)* Дык слухай, сынок. Я не хацеў бы, каб ты прымаў палавінчатыя рашэнні. Ты разумееш мяне? У гэтай бядзе ты мог бы зрабіць так, як падказала б табе сумленне. І ніхто не папракнуў бы цябе...

Ю р а. Ніхто?

Я р а ш э в і ч. Ніхто. Апрача ўласнага сумлення. Зразумеў?

Ю р а. Зразумеў.

Я р а ш э в і ч. Вось і добра!

А л е н а  А л я к с е е ў н а прынесла малако. Бацька і сын бяруць шклянкі, чокаюцца імі і п'юць.

А л е н а  А л я к с е е ў н а *(падазрона)*. Аб чым вы гаварылі?

Я р а ш э в і ч. Мужчынская размова.

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Ну, вось і добра, што пагаварылі...

## 11

На другі дзень. Каля дома стаяць І р а і О с я.

І р а. Ты вельмі хваляваўся?

О с я. Пытаеш! Адзін момант — і рукі як не было! Ты можаш уявіць мяне без адной рукі?

І р а. Цябе? Не ведаю... А яго без рукі ты можаш уявіць? Калі я зайшла ў палату...

О с я. Ты хадзіла да Васі?

І р а. А ты яшчэ не хадзіў? Ты павінен!

О с я. А можа, ён не хоча мяне бачыць...

І р а. Усё роўна ты павінен... Я зайшла ў палату, а ён ляжыць на спіне і глядзіць угару. А паверх коўдры — забінтаваная кульцяпка. Не хацелася на яе глядзець, а вочы не слухаюцца... *(Пасля паўзы.)* Скажы, Ося, а ты кінуўся б? Толькі шчыра! Вельмі прашу цябе быць зараз шчырым...

О с я. Тады дай падумаць...

І р а. Думай колькі хочаш, можаш нават сёння і не адказваць, толькі скажы праўду!

Паўза.

О с я *(цвёрда)*. Не, не кінуўся б. Чаго ты на мяне так глядзіш? Ты прасіла быць шчырым... Я разумею. Ты спадзявалася на другі адказ. Але табе я не хачу хлусіць. Скажы і ты шчыра: ты мяне любіш?

І р а. Люблю...

О с я. Я табе патрэбны?

І р а. Патрэбны...

О с я. Жывы?

І р а. Дзіўнае пытанне...

О с я. Чаму дзіўнае? Ну, вось я кідаюся ратаваць Васю ці яшчэ кагосьці, і мяне ўжо няма ў жывых... Разумееш, няма больш Іосіфа Круглова, якога ты любіш. Няма яго! Цікава, што было б з тваім каханнем? Ты таксама не спяшайся з адказам. Я магу пачакаць...

Паўза.

І р а. Не ведаю, Ося... Але мабыць, я любіла б цябе яшчэ больш...

О с я. Вялікае табе дзякуй за такое палымянае каханне да халоднага трупа Іосіфа Круглова! Толькі калі б я застаўся з адной рукой, я ўжо не змог бы любіць цябе так, як люблю з абедзвюма рукамі... Ты разумееш мяне?

І р а. А як жа цяпер Вася?

О с я. Што — Вася! Ды ён, магчыма, зрабіў свой адзіны гераічны ўчынак, які яму было прадпісана зрабіць у жыцці. І я стаў прычынай гэтага высакароднага ўчынку! Я, вядома, вельмі ўдзячны яму за выратаванне майго жыцця. Але калі б ён гэтага не зрабіў, ён бы на ўсё жыццё застаўся толькі Васькам Несцярком. А так ён герой! Нават ты стала глядзець на яго іншымі вачыма. Гэта ж так? *(Іра кіўнула ў знак згоды.)* Ну, вось бачыш! Што ж яму яшчэ трэба?

І р а. Ведаеш... Я ўжо не рада, што патрабавала ад цябе быць шчырым...

О с я. А ты хацела, каб я і з табою гаварыў, як з усімі? Хацела?

## 12

Вясна. Вокны насцеж. Ветрык уздымае фіранкі. У пакой уваходзіць В а с я, за ім Ю р а.

Ю р а. Ты есці хочаш? *(Вася круціць галавою.)* Дык можа чаю? *(Вася круціць галавою.)* А ведаеш, што яшчэ ёсць? Кісель з журавін! Смачны!

В а с я. Нічога я не хачу. Чаго ты ўсхадзіўся?

Ю р а. Само неяк атрымліваецца...

В а с я. Мне гэта непрыемна.

Ю р а. Я разумею...

В а с я. Нічога ты не разумееш! Ты, як і ўсе, думаеш: не трэба было з-за яго рызыкаваць жыццём. Ён, можа, і не варты гэтага... Была і ў мяне такая хвіліна, як убачыў сваю кульцяпку... Аж зубамі заскрыгатаў ад крыўды... Але, разумееш, якая пятрушка! Вось ляжу я ў палаце і ўсё думаю, думаю... Ажно галава пухне! Ужо і не хачу думаць, само думаецца... Ты ж ведаеш, я Оську ніколі не любіў... За што? Цяжка нават сказаць. Ведаю, што да жыцця ён лоўка прыстасуецца. Жыць ён будзе лепш за мяне ў некалькі разоў. І жанчыны будуць любіць яго прыгожыя і нават разумныя, вось як Ірка... Адным словам, жыццё выдасць яму па самай вялікай норме і па малой цане. І заўсёды ў жыцці будзе яму шанцаваць. Другія будуць за яго аддаваць рукі, ногі, розум і нервы, а ён...

Ю р а. Ну і партрэцік ты намаляваў!

В а с я. І ўсё ж я яму не зайздрошчу! Ведаеш чаму? Я вось кінуўся ратаваць, а ён — не! Ён не зрабіў бы гэтага.

Ю р а. Чаму?

В а с я. Бо ён раб. Разумееш? Звычайны раб. Вось ён пра свабоду духу ўсё гаворку вядзе. Чаму? Таму што адчувае, якая душа ў яго рабская.

Паўза.

Ю р а. Вася! Ну, даць табе кісялю? Такі смачны!

В а с я. Ды ідзі ты са сваім кісялём...

Ю р а. Мне хочацца зрабіць для цябе штонебудзь... Вось я...

В а с я. Ты не круціся... Галоўнае — хацець зрабіць нешта, а час прыйдзе — зробіш.

Ю р а. Ты ведай! Калі табе...

В а с я. Добра. Буду ведаць. І больш не будзем трапацца па гэтаму пытанню. Будзем мужчынамі.

Ю р а. Будзем мужчынамі.

В а с я. А цяпер так і быць! Цягні свой кісель... *(Юра бяжыць на кухню. Вася раскручвае свой пакунак, дастае самаробны транзістар, уключае яго. Чуваць музыка. Юра цягне вялікую каструлю і два кубкі.)* Гэта мне аднаму?

Ю р а. Хопіць на двух. Зрабіў транзістар? Японіі нос падцёр?

В а с я. Запчастак не хапіла... Ды і канчаць ужо прыйшлося без яе... *(Ківок на кульцяпку.)* Але я, братка, цяпер так зубамі прыладзіўся — хоць у цырку паказвай! Я цяпер зубастым стаў! А гэты транзістар хачу тваёй маці падараваць...

Ю р а. Яна будзе вельмі рада...

В а с я. Я на гэта не вельмі спадзяюся... А толькі прызнаюся табе, калі паклалі мяне на аперацыйны стол, убачыў яе вочы... Рот павязкай закрыты, адны толькі вочы... І зразумеў: сапраўдны чалавек твая маці!

Ю р а *(працягвае кубак)*. Гэта яна гатавала...

В а с я *(паспрабаваў кісель)*. Смачны! Ты ведаеш, чыя гэта музыка? Я ў бальніцы музыку прызвычаіўся слухаць... Раней усялякія гэтыя сімфоніі цярпець не мог...

Ю р а *(прыслухоўваецца да музыкі)*. Падобна на Моцарта. Можа Гайдн... Я ў класічнай музыцы таксама ні бум-бум! Вось Ося...

Паўза.

В а с я. Дарэмна мы самі сябе абкрадаем. Слухаеш такую музыку, і добра калі яшчэ не ведаеш, чыя яна... А калі зусім не разумееш? Быццам глухі, не чуеш і ўсё. Вось гэта шкада...

Ю р а. А па-мойму, невялікая бяда. Па гэтаму жыць можна...

В а с я. Жыць, канечне, можна. Амёба таксама жыве... Ты гэтыя настроі кінь. Ты памятаеш, якім фертам я хадзіў, калі кінуў школу? Нават цябе падбухторваў... Во дурны быў! Ну, цяжка мне было вучыцца... Бацька збег і грошы перастаў прысылаць. Маманя з гора пачала здаваць. Захварэла... А ўсё ж трэба было вучыцца! Не хапіла мужнасці... А цяпер цвёрда вырашыў: пайду на вячэрні факультэт політэхнічнага... Абы галава вытрымала!

Ю р а. Галава вытрымае! Дзесьці я вычытаў, што калі пабудаваць кібернетычную мадэль нашай галавы, ведаеш колькі яна зойме? Вялікі дзесяціпавярховы дом! Ну дык у такую махіну колькі ведаў павінна змясціцца?!

В а с я. Нічога! Тэхніка ў свой час зробіць галаву як галаву...

Ю р а. А ці трэба гэта?

В а с я. Трэба! Няхай нашай галаве будзе сорамна перад тэхнічнай. Гэта пойдзе на карысць. Вось у мяне засела адна задума... Руку сабе зраблю. Электронную. Чуў пра прынцып імпульсаў? Як сапраўдная будзе! Мне б толькі дэталі...

Ю р а (*загарэўся*). Ведаеш, мы ўсім класам дапамагаць табе будзем!

В а с я. За гэта толькі дзякуй скажу. Калі зраблю такую руку, у мяне зноў добрая жытуха пачнецца. Ёй жа нічога не страшна: ні холад, ні гарачыня, ні боль... Не, бадай, боль застанецца. Ён застанецца на ўсё жыццё... Вось жа рукі няма? А, разумееш, баліць! А ў сне, дык яна, наогул, у мяне ёсць! Нават пальцы сціскаю, рухі ўсялякія раблю... Прачнуся і яшчэ адчуваю, што рука тут! Пакуль не пагляджу...

Паўза.

Ю р а. Хочаш яшчэ кісялю? А можа, наліць табе чарачку каньяку? У бацькі ёсць...

В а с я (*не звяртае ўвагі, працягвае*). А галоўнае, забудзешся і раптам рука пачынае балець. І не ў плячы! А пальцы баляць, якіх ужо няма.

Ю р а. Гэта пройдзе...

В а с я. Думаеш? Шкада...

Званок. Ю р а пабег адчыняць і вяртаецца з К р у г л о в ы м.

К р у г л о ў. Усю хату перавярнуў — як праз

зямлю праваліўся! І шкада ж вельмі! Можна сказаць, гістарычная рэліквія...

Юра. Вы ў нас забыліся сваю гістарычную рэліквію. Вось яна. *(Падае Круглову партсігар.)* Ваш?

Круглоў. Мой! Вось і надпіс. Як на магільным помніку... «Дорогому, уважаемому, всеми любимому в день шестидесятилетия...» Тфу! Нават не змаглі сфармуляваць як трэба... *(Да Васі.)* Ну, як жыццё, герой?

Вася. Калі герой, дык і жыццё геройскае.

Круглоў. Гэта ты правільна сфармуляваў. Ухваляю. За сына я табе вельмі ўдзячны. Гэта я табе з усёй адказнасцю заяўляю. Бо я заўсёды быў скупы на пахвалу. А ты заслужыў. *(Дастае пачак грошай.)* Вось трымай... Бяры, кажу табе. Тут якраз палова пенсіі. Чаму не бярэш? Што я магу яшчэ зрабіць для цябе?

Вася. А чаму вы рашылі, што я павінен узяць?

Круглоў. Чалавек павінен браць, калі даюць.

Вася. Гледзячы які чалавек.

Круглоў. Любы! Такі, як ты. Як я! Як ён...

Юра. Сабака таксама бярэ, калі даюць.

Круглоў. Глядзі ты, якія прынцыповыя! Нечага з сябе незалежных корчыць! Вы яшчэ смаркачы і павінны слухаць дарослых. Я табе загадваю ўзяць грошы!

Юра *(уражаны)*. Загадваеце?

Вася. Гэта ён па прывычцы.

Круглоў. Чаго прычапіліся да фармуліроўкі? Бяры грошы!

В а с я. Вы што — хочаце грашыма адкупіцца?

Паўза.

К р у г л о ў. А што ты яшчэ хочаш?

В а с я. Я ж вам сказаў — нічога.

К р у г л о ў. Не верыцца.

В а с я. А вы паверце!

К р у г л о ў. Вася, паслухай. Ну, кепска я пра цябе думаў! А можа і зусім не думаў. Ці мала вас на двары, сарванцоў, бегае? І для мяне ўсе вы былі на адзін твар. Вось толькі калі ты каля Осі пачаў вярцецца, я на цябе звярнуў увагу... Жонка нагаворвала... Я і паслухаў... А цяпер бачу, што ты сапраўдны чалавек! І не крыўдуй на мяне — вазьмі грошы... Не трэба прыніжаць старога чалавека...

В а с я. Дык вы самі сябе прыніжаеце.

К р у г л о ў *(доўга глядзіць на Васю, потым хавае грошы ў кішэню)*. Можа ты і маеш рацыю... Я стары, зусім, братка, стары чалавек... Чагосьці ўжо не разумею. І разумець ужо позна... Толькі я ведаю, што ўвесь дом будзе на мяне глядзець цяпер коса — не дапамог! Ніхто не паверыць, што ты сам адмовіўся... А думаеш, мне хочацца, каб на мяне глядзелі, як на злыдня?

Ю р а. Вы не турбуйцеся, Цімафей Феафілавіч! Ніхто на вас не глядзіць...

К р у г л о ў *(горкая ўсмешка)*. Гэта ты дакладна сфармуляваў! Сапраўды, ніхто не глядзіць ужо на Цімафея Феафілавіча Круглова! Перасталі заўважаць. Наскрозь, разумееш, глядзяць. Нібы я са шкла. Як акварыум. А хто дазволіў ператвараць мяне ў акварыум? Хто?

## 13

Лета. Каля дома з'яўляюцца Васіль Мікалаевіч і Алена Аляксееўна. Яны апрануты ў святочнае, ды і самі зіхацяць святочнай радасцю. Прыпыніліся і глядзяць у бок вуліцы.

Алена Аляксееўна. Васіль, паглядзі! Бачыш, хто гэта стаіць каля тытунёвага ларка?

Ярашэвіч. Здаецца, наш сын, паважаная Алена Аляксееўна!

Алена Аляксееўна. Не, ты паглядзі на гэтага нахалюгу! Ён купляе папяросы! (*Крычыць.*) Юра! Што ты робіш?

Ярашэвіч. Паважаная Алена Аляксееўна! Не рвіце свае галасавыя звязкі. Паберажыце іх. Ваш сын ужо самастойны мужчына.

Алена Аляксееўна. Сапраўды... Наш сын — мужчына. Дзесяць гадоў я чакала гэтага моманту. І вось ён настаў: наш сын у адной руцэ трымае атэстат сталасці, а ў другой... «Беламор»!

Ярашэвіч. Мая марка. Прыйдзецца цяпер дзяліцца...

Алена Аляксееўна. Ну не! Ён яшчэ крыху пачакае, пакуль я яму дазволю курыць! (*Уваходзіць Юра з папяросай у зубах. Пускае дым і глядзіць на бацькоў.*) Зараз жа кінь папяросу! Каму я гавару?!

Ярашэвіч. Алена Аляксееўна!

Алена Аляксееўна (*збавіла тон*). Ты можаш курыць. Але як урач, я павінна цябе папярэдзіць, што толькі адзін грам нікаціну...

Юра. ...забівае каня. Тым горш для яго.

Алена Аляксееўна (*разгублена. Павярнулася да Ярашэвіча*). І гэта мы павінны цяпер выносіць?

Ярашэвіч. Не ведаю. Я першы раз апынуўся ў ролі бацькі дарослага сына...

Алена Аляксееўна. Які ён дарослы? Юрка! Зараз жа кінь папяросу! Я не дазваляю табе курыць! Ты чуеш!

Юра (*усміхаецца*). Чую. У цябе вельмі зычны голас.

Алена Аляксееўна. Ты павінен мяне чуць усё жыццё. Заўсёды! Усюды! (*Вырывае з зубоў сына папяросу, машынальна зацягваецца сама.*) Абяцай мне, што ўсё жыццё будзеш мяне слухацца!

Юра (*усміхаецца*). Абяцаю!

Ярашэвіч. А чаму ты рад? Гэта ж праляцелі твае самыя светлыя, легкакрылыя гады! А ён сабе ўсміхаецца!

Юра. Надакучылі гэтыя светлыя гады, як горкая рэдзька! Кожны дзень дрыжыкі прадаваў, каб двойку не схапіць, потым пераводныя экзамены, пераэкзаменоўкі... А здача на атэстат сталасці чаго каштавала! Не! Я гэтых гадоў не шкадую!

Ярашэвіч. Яшчэ як пашкадуеш!

Юра (*падняў над галавою атэстат*). Цяпер я ў бок школы нават і не зірну. Вуліцу тую абыходзіць буду...

Алена Аляксееўна. А інстытут на той жа вуліцы! Паступіш у інстытут і прыйдзецца табе зноў па той жа вуліцы хадзіць...

Юра. А калі не паступлю?

Алена Аляксееўна. Як гэта не паступіш?

Юра. Вельмі проста: не прайду па конкурсу.

Алена Аляксееўна. Ты не маеш права нават думаць аб гэтым! Ты павінен паступіць у інстытут, і ўсё! У цябе адна дарога — у інстытут!

Юра. У мяне шмат дарог!

Алена Аляксееўна. У цябе адна дарога з двума канцамі. На адным — інстытут, на другім — армія.

Юра. Ну і што? Трэба ж камусьці бараніць мірную працу савецкіх людзей...

Алена Аляксееўна. Ёсць каму без цябе бараніць. Абыдуцца без цябе. Цяпер хапае розных страшных ракет і бомбаў, каб ім век ляжаць у сховішчах... У армію ты не пойдзеш.

Юра. Мо дамовішся з маршалам Грэчкам?

Алена Аляксееўна. Калі трэба будзе, дык і з маршалам дамоўлюся. Бо зараз у арміі патрэбны людзі з вышэйшай тэхнічнай адукацыяй. Атрымаеш дыплом інжынера, тады маршал Грэчка даверыць табе ракету ці бомбу. Самую вялікую...

Юра. Бацька! Растлумач ты ёй, што я ўжо маю права на свае ўласныя рашэнні...

Алена Аляксееўна. Індывідуаліст! Гэтага ў нашай сям'і не будзе! Усё будзем вырашаць сумесна...

Юра. Бацька! Заступіся!

Ярашэвіч. Адно я табе скажу, сын... Не ашуквай сябе, што скончыліся цяжкасці. Яны

толькі пачынаюцца. Жыццёвы шлях, сынок, мае дзіўную асаблівасць: чым па ім далей ідзеш, тым больш цяжка робіцца... Май гэта на ўвазе.

А л е н а А л я к с е е ў н а. Навошта ты яго палохаеш? Калі паступіць у інстытут, усё будзе добра...

З'яўляецца П е ц я. Ён у лепшым сваім адзенні. На грудзях піянерскі гальштук.

А л е н а А л я к с е е ў н а. Гляньце на яго! Нават гальштук завязаў! Юра, бачыш, як паважае цябе малодшы брат?

Ю р а *(працягвае Пецю руку)*. Дазваляю яму пацicнуць мне руку.

П е ц я *(паціскае руку)*. Адчуваеш?

Ю р а. Ага, адчуваю брацкі поціск рукі.

П е ц я. А моц поціску — як?

Ю р а. Нічога... У цябе стала стальная рука, стары!

П е ц я. І ведаеш, гэтага я дабіўся ў кароткі гістарычны тэрмін. Я ж зараз павінен у школе сам сябе бараніць...

Ю р а. Быццам цябе крыўдзяць.

П е ц я. Дык гэта цябе баяліся. *(Уздыхае.)* А цяпер я застануся адзін... *(Працягвае брату зажыгалку.)* Гэта табе.

Ю р а *(разглядае зажыгалку)*. Глядзі ты! З музыкай!

Я р а ш э в і ч. Гэта му̀зыка каштуе немалыя грошы...

А л е н а А л я к с е е ў н а. Адкуль у цябе такі капітал?

П е ц я *(стрымана ўздыхае)*. Ліквідаваў калекцыю.

Ю р а. Прадаў маркі? Ну, гэтага ты мог і не рабіць...

П е ц я. Філатэлія мяне ўжо не цікавіць...

Ю р а. Ты, Пецька, малаток!

П е ц я. Ты, Юрка, таксама малаток.

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Адным словам, вы ў нас два малаткі — пара... Малодшанькі малаток, можа ты злятаеш у магазін, возьмеш бутэльку сухога віна?..

Я р а ш э в і ч. Не дадуць.

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Сухога віна?

Я р а ш э в і ч. Ні сухога, ні мокрага... Прыйдзецца мне...

Ю р а. Лепш я! Мне ўсё роўна трэба рабят пачакаць... Пецька, трымай! *(Працягвае атэстат.)* Цягні яго ў роднае бенгало...

П е ц я. Эх! Хутчэй бы і мне гэтакую кніжачку адхапіць!

Ю р а. Дык я пайду...

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Ідзі. Толькі не баўся! Мы без цябе не сядзем за стол... Пецял Ты прызначаешся галоўным цырыманіймайстрам сённяшняга свята. Ідзі рыхтуй стол.

П е ц я. Ясна. Быў я неграм, неграм і застаюся... *(Пайшоў.)*

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Смешныя яны ў нас з табою...

Паўза.

Я р а ш э в і ч. Алёнка...

А л е н а  А л я к с е е ў н а *(у трывозе)*. Ты мне штосьці хочаш сказаць непрыемнае...

Я р а ш э в і ч. А як ты здагадалася?

А л е н а  А л я к с е е ў н а. Я ж цябе ведаю,

як нікога на свеце... Сёння ты ўвесь час муляешся пачаць размову і не можаш... Дарэмна! Гавары ўжо...

Ярашэвіч. Наогул, нічога страшнага... Ты ж сама разумееш, што зараз дзеецца на белым свеце...

Алена Аляксееўна. Так, так! Я чытаю газеты, слухаю радыё, і ты можаш без гэтых уступных матываў пачынаць тваю галоўную песню...

Ярашэвіч. Ты павінна мяне зразумець... Не магу я быць ў такі час убаку...

Паўза.

Алена Аляксееўна. Куды і калі?

Ярашэвіч. В'етнам. Заўтра ў Маскву, а з Масквы самалётам...

Алена Аляксееўна. А некалькі хвілін таму назад я была такая шчаслівая... Ну, чаму ты не сказаў мне раней?

Ярашэвіч. Баяўся...

Алена Аляксееўна. Даць згоду ты не баяўся... Там жа ваююць! Страляюць...

Ярашэвіч. Страляюць. І сеюць рыс. Сеюць і жнуць. Таму трэба в'етнамцам не толькі ракеты, а і мае мірныя машыны... Ты ж павінна разумець, калі мне прапанавалі, я не мог адмовіцца...

Алена Аляксееўна. Ды я разумею! У тым вось і бяда мая... Куды лепш было б не разумець і патрабаваць сваё...

Ярашэвіч! Абяцаю табе, што гэта ў апошні...

Алена Аляксееўна. Толькі не абяцай! Не люблю, калі ты хочаш мяне супакоіць, аб-

надзеіць... Праходзіць час, і ты зноў заводзіш сваю песню... О, калі б ты ведаў, як абрыдла мне гэта твая песня, як я яе баюся... Але ты яе заводзіш, і я слухаю... слухаю...

Ярашэвіч. Цудоўная ты мая...

Алена Аляксееўна. Звычайная я, Васіль... А ты гэтым карыстаешся. Вось трымаюся, нешта табе кажу, а самой бялугай раўці хочацца... *(Патрабавальна.)* Абнімі мяне!

Ярашэвіч. Прама тут? Можа лепей дома...

Алена Аляксееўна. Не, тут! Няхай глядзіць увесь дом, горад, увесь свет, усе тыя, хто адымае цябе ў мяне... Няхай глядзяць!

Яны абнімаюцца. Ярашэвіч цалуе жонку. Потым бачыць Кругловых, якія падыходзяць да дома.

Ярашэвіч. Кругловы ідуць сюды...

Алена Аляксееўна. Пойдзем! Не хачу іх зараз бачыць...

Ярашэвічы пайшлі. З'яўляюцца Кругловы. Садзяцца на лаўку. Валерыя Герасімаўна абмахвае сябе хусцінкай, потым працягвае хусцінку мужу.

Валерыя Герасімаўна. Махай ты! Я стамілася... Дзе ж Ося? Вось разбойнік! Зікнуць у такі дзень... Схапіў атэстат з залатым медалём і нібы скрозь зямлю праваліўся...

Круглоў. Нічога! З залатымі медалямі ніхто яшчэ не правальваўся...

Валерыя Герасімаўна. Ой! Ой-ёй-ёй! Я пачынаю здагадвацца, дзе зараз наш медаляносец... Ён у гэтай распуснай Іркі... Яна зацягнула нашага бездапаможнага, даверлі-

вага Осеньку ў сваю камунальную бярлогу... Цімох! Трубі баявую трывогу! Мы губляем сына!

Круглоў. Не панікуй, Валерыя! Цэлы будзе твой Ося.

Валерыя Герасімаўна. Мой? А табе ён не сын?

Круглоў. Я свайму сыну даў вялікае імя — Іосіф! А ты ператварыла яго ў Оську. Добра, што вось гэтай часткай цела *(ляпае сябе па галаве)* ён пайшоў у мяне...

Валерыя Герасімаўна. Ты ўпэўнены, што ў цябе?

Круглоў. А ў каго ж ён такі разумны вырас?

Валерыя Герасімаўна. А хто яго вырасціў? Хто? Ты ўсё жыццё апрача свайго службовага крэсла і пуза нічога не бачыў. Ты не маеш ніякага права на сына! Гэта маё стварэнне! І я сама буду ратаваць яго. *(Павярнулася, крычыць.)* Баба Серафіма! Вы чуеце? Баба Серафіма! *(Голас бабы Серафімы: «Чаго галосіш? Не глухая. Чую я цябе. Голас у цябе такі, што і на тым свеце пачуеш... Чаго табе?»)* Наш хлопчык у вас? *(«Які гэта хлопчык?»)* Ды наш Ося... *(«А, гэты прылізаны хлюст... Няма яго ў нас. Няма, і дзякуй богу... Вось бачыш — дарэмна толькі на ўвесь квартал верашчала...»)* Фі! Якая бескультурнасць! І калі хочаце ведаць, гэты прылізаны хлюст адзін з усяго класа атрымаў залаты медаль! *(«А такі ўсё атрымае! Усяго ў жыцці нахапае!»)* Паслухайце! Я не пагляджу, што вы старая развваліна! Я вам такую характарыстыку...

Круглоў. Валерыя, змоўкні. Людзі ў вокны павысоўваліся.

Валерыя Герасімаўна. Пляваць на гэтых людзей! У нашым доме сапраўдных людзей днём з агнём не знойдзеш... І Осю я выцягну з гэтага балота! Вось паступіць ён у кансерваторыю, і мы зробім абмен кватэры... Хопіць цярпець такое акружэнне...

Круглоў. Рабі што хочаш. Толькі памаўчы ты хоць сёння. *(Паглядзеў на ручны гадзіннік.)* Тым больш час абедаць...

Валерыя Герасімаўна. А табе не здаецца, таварыш Круглоў, што ты робішся абжорам? Толькі аб ежы і думаеш! І гэта пры тваёй камплекцыі!

Круглоў. Ты паглядзі на сваю камплекцыю, а потым крытыкуй! Я маю права на трохразовае харчаванне?

Валерыя Герасімаўна. З тваёй пенсіяй ты маеш права на рацыён вярблюда — адзін раз у тры тыдні. *(Круглоў цяжка ўстае з лаўкі і тупае да пад'езда.)* Куды ты? Без Осі я... А можа ён ужо дома? Цімафей! Пачакай! *(Пайшла следам за Кругловым.)*

Уваходзяць Іра і Ося. Прыпыніліся. Іра падняла галаву, глядзіць на вокны дома. Шчаслівая ўсмешка кранае яе губы.

Іра. Пазнаеш?

Ося. Каго?

Іра. Наш дом!

Ося. Можна і не пазнаць... Глянь! Усе дамы стаяць як салдаты ў страі, і ў кожнага аднолькавы твар.

Іра. Ты сляпы! У кожнага дома свой твар! Трэба толькі ўважліва прыгледзецца. Мілы ты мой вялікі хлопчык! Гэта наш дом. Разумееш? Наш! Тут мы сустрэліся, тут скончылася наша дзяцінства і пачалося юнацтва... Мо тут прыйдзе да нас і старасць...

Ося. Не! Жыць да старасці ў гэтым камунальным куратніку?

Іра. Ну, чаму ты так не любіш наш дом?

Ося. Прабач, але гэта смешна — любіць дом. Ды яшчэ такі непрыгожы...

Іра. Скептык ты!

Ося. А ты ведаеш, чаму вучылі скептыкі?

Іра. Чаму б яны там ні вучылі, а для мяне скептык — проста зануда-крытык.

Ося. Святая наіўнасць!

Іра. Чаму — «наіўнасць»? Скептык — гэта ж тып, якому на ўсё напляваць. Ці не так?

Ося (*усмешка*). Не, зусім не так. Скептык — гэта чалавек, які добра ведае, чаго можна, а чаго нельга чакаць ад жыцця. Калі хочаш ведаць, усе нашы беды таму, што мала ў нас цвярозага скептыцызму і зашмат цялячага аптымізму.

Паўза.

Іра. Ося... Як жа ты будзеш жыць са сваім «цвярозым скептыцызмам»?

Ося. Я ведаю, пра мяне думаюць, што я кар'ерыст, будучы бюракрат, хапуга... Ну і няхай сабе думаюць. А на самай справе ў мяне ўжо дасканала распрацаваны маршрут па жыццю. У думках я па ім прайшоў з канца ў канец.

Іра. Ну і як? Гладзенькая твая дарожанька?

Ося. Я быў бы набітым дурнем, калі б спадзяваўся на гладзенькую дарожаньку. Не! Усё на ёй ёсць — і калдобіны, і аб'езды, і гразь па самыя вушы... Але я даб'юся свайго! Не можа быць, каб я не сказаў свайго слова ў тэхніцы! Так што ты за мяне не хвалюйся, ты лепш падумай пра сябе, старуха...

Іра. Ды вось я ўсё думаю, думаю...

Ося. Думай, думай, старуха. Век, калі за нас нехта думаў, даўно ўжо скончыўся. Гады, калі можна было не думаючы рубіць з пляча, таксама не вернуцца... Цяпер кожны сам за сябе павінен думаць, прымаць рашэнні і выконваць іх...

Іра. Аб чым ты гаворыш? У такі момант...

Ося. Момант зараз якраз такі, калі трэба думаць, што рабіць далей...

Іра *(рэзка павярнулася да Осі, глядзіць яму ў вочы)*. Ты любіш мяне?

Паўза.

Ося. Табе зараз добра са мною?

Іра. Чаму ты не адказваеш прама?

Ося. Ды адказаць на гэтае пытанне працей простага...

Іра. А ты проста і скажы: любіш ці не любіш?

Ося. Гэта ж падобна на дзіцячую гульню!

Іра. Дзяцінства скончылася, Ося! Ты ж гэта сам сказаў...

Ося. Так, дзяцінства скончылася. Але ў некаторых пры гэтым не наступіла сталасць, як я бачу...

Іра. Што ты хочаш сказаць?

О с я. Хоць бы тое, што з атэстатам сталасці не абавязкова прыходзіць сталасць...

І р а. Ося, не хітруй. Не круціся, як уюн на патэльні...

О с я. Я пытаюся: вось у гэту хвіліну нам добра разам?

І р а. І што далей?

О с я. Ого, каб усе закаханыя ведалі, што іх чакае далей! Мабыць, род чалавечы даўно б ужо перастаў існаваць...

І р а *(здзіўлена)*. Пачакай, пачакай... Ося! Я нічога не разумею! Вось слухаю цябе, хачу зразумець, аб чым ты гаворыш, і ніяк не магу! Што гэта са мною робіцца?

О с я. У кібернетыцы ў такіх выпадках гавораць: залішняя інфармацыя. Не кожная сістэма можа асіліць...

І р а. Можа і сапраўды я дурніца набітая... Залішняя інфармацыя, кажаш... А мне здаецца, што якраз паўнаты інфармацыі не хапае! Смешна! Чаму я не зразумела гэтага даўно? Бо ўсё ж вельмі проста! Так проста, аж плакаць хочацца... Так проста, як...

О с я. ...двойчы два чатыры!

І р а. Двойчы два чатыры. І так было заўсёды?

О с я. Не ведаю, як для цябе, а для мяне — заўсёды...

І р а. Так, так... Ты заўсёды ведаў, што двойчы два чатыры... На тры ты ніколі б не згадзіўся, бо для цябе гэта мала. А пяць, ты ўпэўнены — не можа быць... І ты кажаш, што будучыня вось за такімі, як ты? Тады я не хачу такой будучыні. Не хачу!

Ося (*жорстка*). А сапраўды ў маёй будучыні табе будзе цяжка... Там патрэбны людзі дысцыплінаваныя, без усялякіх рамантычных выкрутасаў... У маёй будучыні няма месца слюнцяйству і ныццю... Ты павінна гэта ведаць, каб потым не расчароўвацца... Таму я шчыра табе кажу: ты адзіная дзяўчынка, з якой мне пакуль што добра, але абяцаць табе, што так будзе заўсёды...

Іра (*рэзка*). Тады згінь назаўсёды!

Паўза.

Ося. Ну, што ж... Магу. А ты — малаток! Абышліся б без меладрамы... Астынеш — звані! (*Пайшоў.*)

Іра глядзіць прама перад сабою. Абхапіла галаву рукамі, заплакала. Да лаўкі падышоў Вася. З жалем глядзіць на Іру.

Вася. Віншую цябе!

Іра. З чым ты мяне віншуеш — ведаеш?

Вася. З атэстатам сталасці...

Іра. Не, Вася!

Вася. Не далі?!

Іра. Далі. Толькі ты мяне лепш павіншуй з вялікім адкрыццём...

Вася. Што ты такое вялікае адкрыла?

Іра. Што двойчы два чатыры. (*Плача.*)

Паўза.

Вася. Ір! А ты калі-небудзь бачыла, як спяць дрэвы? Я сёння падхапіўся ні свет ні зара... Выйшаў на вуліцу. Сонейка толькі-толькі пачало вылазіць вунь з-за гэтых да-

моў... Дайшоў я да нашай сажалкі... Глянуў на дрэвы. А яны спяць! Ні адзін лісточак не шалахнецца! Прыклаўся я вухам да дрэва, а яно ціха так дыхае... Не верыш? А ты павер! Можаш сама праверыць. Толькі выходзіць з дому трэба рана-ранюсенька, калі ўсе яшчэ спяць... І выходзь босай. І ідзі проста па траве. На ёй расінкі, як шкляныя званочкі... Чапляешся за іх, а яны: дзінь-дзінь... І за табою дымяны след на траве... Вось як ад рэактыўнага самалёта ў светлым небе... *(Глядзіць у твар Іры.)* Няўжо ты ніколі яшчэ не хадзіла па расістай траве-мураве?

І р а. Не, Вася... Не хадзіла я па расе, не бачыла, як спяць дрэвы... Няма маіх слядоў на траве... Няма!

В а с я. Будуць! Трэба толькі не праспаць...

Падышоў Ю р а з бутэлькай віна ў руцэ. Паглядзеў на Іру, потым на Васю. Той паціснуў плячыма. Юра сеў на лаўку. Іра зноў заплакала. Вася і Юра сядзелі побач з дзяўчынкай разгубленыя і ўстрывожаныя, бо яшчэ не ўмелі суцяшаць...

*Канец*

# ЗМЕСТ


Твой заўтрашні дзень . . . 3

Чалавек вярнуўся . . . . 75

Любоў, Надзея, Вера... . 163

2×2=? . . . . . . . . 253

**Васілеўскі П.**

Твой заўтрашні дзень. Мінск, «Беларусь», 1968. 332 с. 2000 экз. 72 к.

У зборнік п'ес Пятра Васілеўскага «Твой заўтрашні дзень» увайшлі чатыры п'есы: «Твой заўтрашні дзень», «Чалавек вярнуўся», «Любоў, Надзея, Вера...» і «2 × 2 = ?». У занімальнай драматычнай форме ў іх расказваецца аб жыцці савецкіх людзей, лёс якіх звязаны з вялікімі гістарычнымі падзеямі, вырашаюцца маральна-этычныя праблемы.

7-5 / 183-68 Бел2 В 19

На белорусском языке
*Петр Савельевич Василевский*

Твой завтрашний день

Издательство «Беларусь»
Минск, Ленинский проспект, 79

Рэдактар
*Г. Матвеенка*
Мастак
*І. Андрыянаў*
Мастацкі рэдактар
*М. Шырокаў*
Тэхнічны рэдактар
*Т. Сокал*
Карэктар
*А. Сачкова*

АТ 11055. Здадзена ў набор 28/II 1968 г. Падпісана да друку 12/VI 1968 г. Тыраж 2000 экз. Фармат $70\times90^1/_{32}$. Папера друк. № 2. Ум. друк. арк. 12,14. Уч.-выд. арк. 11,43. Зак. 970. Цана 72 кап.

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа

## У ВЫДАВЕЦТВЕ «БЕЛАРУСЬ» ВЫЙШЛІ З ДРУКУ:

**Сачанка Б.** АПОШНІЯ І ПЕРШЫЯ. Аповесць. На беларускай мове. 12,8 аркуша, цана 59 кап.

**Казлоўская М.** МОЙ СТАРЭЙШЫ БРАТ. Апавяданні. На рускай мове. 4,26 аркуша, 12 кап.

**Копанеў М.** СВЯТЛО ЗОРКІ. Вершы. 1,6 аркуша, 16 кап.

**Грахоўскі С.** РУДАБЕЛЬСКАЯ РЭСПУБЛІКА. Дакументальная аповесць. На беларускай мове. 14,8 аркуша, 65 кап.

**Лакербай Ю.** У БОК ПЕРАВАЛУ. Вершы. На рускай мове. 2,32 аркуша, 24 кап.

**Шлег А.** ТРЫВОЖНАЯ ПАМЯЦЬ. Апавяданні і нарысы. На беларускай мове. 6,64 аркуша, 21 кап.